УДК 882.6-3
ББК 84(4Беи)6
А 28

**Адамчык В.**
А 28 Развітальная аповесць: Аповесць, апавяданні, дзённікі. — Мн.: Маст. літ., 1999. — 448 с.
ISBN 985-02-0231-9

У новую кнігу прозы лаўрэата Джяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і Літаратурнай прэміі імя І. Мележа Вячаслава Адамчыка ўвайшла аповесць, прысвечаная нашаму сённяшняму жыццю, супярэчліваму і нялёгкаму, праблемам чалавечай годнасці, роздуму над жыццём і смерцю, пошукам свайго на сваёй і не сваёй спрадвечнай зямлі. Гэтую ж тэму ўдакладняюць і развіваюць навелы і апавяданні празаіка.

Дзённікі ж адгортваюць яшчэ адну старонку ў яго творчасці («Берлінскі дзённік») — свая, яшчэ незабытая і прыгнечаная вёска, убачаная з далечыні чужога горада, і свой народ, разгледжаны праз прызму сталых, нацыянальна самастойных і велічных народаў.

**УДК 882.6-3**
**ББК 84(4Беи)6**

**ISBN 985-02-0231-9**
**© В. У. Адамчык, 1999**
**© Афармленне. А. Р. Барташэвіч, 1999**

# РАЗВІТАЛЬНАЯ АПОВЕСЦЬ

Чырвоным запыленым «Ікарусам», што таксама знямог ад гарачыні і дарогі, Гэнрык Самец, маладжавы, з лёгкім серабрыстым інеем на чорнай ганарыста-густой чупрыне, прыехаў у далёкі і нібы адцураны і забыты ўсімі павятовы гарадок з шара-блочнымі, як усюды, мікрараёнамі і даўнейшымі, яшчэ не знесенымі — асабліва ў цэнтры — драўлянымі дамамі з двухскатнымі дахамі і эліпснымі ў франтонах вокнамі. Яны, гэтыя драўляныя хаты, калісьці ўзнёсла-прыгожыя ў кроплях залаціста-бурштынавай смалы, цяпер — аселыя і аблепленыя касабокімі верандамі і кухнямі, баязліва хаваліся ў засень старых гузаватых ясеняў і вілаватых, разложыстых клёнаў.

У сілікатна-белым, нібы голым ад сваёй белізны, чатырохпавярховым гатэлі, дзе за шкляным бардзюрам сонна пазяхала, свецячы ржава-іскрыстай пераафарбованай галавою, сумная адміністратарка, быў ужо загадзя заказаны нумар.

На рып і ўзмах аселых дзвярэй на шыбе страпянуўся і зашорхаў аксамітнымі крыльцамі чуйны залётны матыль.

Паставіўшы з прыходу чорны, апаясаны дзвюма алюмініевымі паскамі пластыкавы дыпламат, Самец асцярожна ступіў да акна. Матыль, як асвойтаны і прыручаны, даверліва распасцёр цёмна-аксамітныя крыльцы, паказваючы ўсе чатыры свае блакітна-ліловыя вочкі. «Махаон? — намагаўся ўгадаць Самец. — А можа жалобніца?». І яму прыгадаўся даўні жнівень, смолка-задушлівы, разамрэлы на сонцы чэзлы хвойнік і свежы, але падзёўбаны ўжо дажджом капец магілкі ў танных папяровых вянках і асмалены, у рудых плямах, нізкаваты крыж з чуйна-трапяткім матылём. Гэтакім самым — чорна-жалобным. Пад асмаленым крыжам і шархоткімі папяровымі вянкамі, што неяк занадта глуха ўкрылі магілку, ляжаў бацька. Трапіўшы якраз у далёкую камандзіроўку, у дзіўную і першабытна-нязвыклую Каракалпакію, у жоўты ад пылу горад Нукус, ён, Гэнрык Самец, на пахаванне бацькі спазніўся — прыехаў толькі на трэці дзень ужо да гэтай, падзёўбанай дажджом магілкі.

Самец правёў рукою па заплюшчаных вачах, сціраючы з іх стому і выплываючы з непамернай глыбіні, успомніў, з далёкага і разамрэлага ад спёкі замшэла-чэзлага хвойніку, пад якім вусцішна прытаіліся вясковыя могілкі, сюды, у непрытульны ад цёмна-зялёных сценаў, напоўнены застоенай духатою нумар, з люстэркам у чорных воспах амальгамы і фарфоравым умывальнікам кафейнага колеру, дзе з пацямнелага крана нудна цадзілася ржавая вада.

Ложак палохаў серабрыста-белай, ненатуральнай, нібы вытканай са штучнага шкла,

посцілкай. Якраз, здаецца, кавалачак гэтакай ненатуральна-блішчастай матэрыі са шкла паказваў Гэнрыку Самцу яго стрыечны брат, ваенпрэд танкавага завода.

Каля стала, падкурчыўшы зломаную ножку, гаротна і знябожана асела мяккае зялёнае крэсла. За ім, у покуці, сляпым выпуклым экранам пазіраў жоўта-мядовы, старое мадыфікацыі тэлевізар. Каб пацвердзіць сабе, што ён даўно прыпсаваны, Самец уваткнуў відэлец чорнага шнура ў кружок зжоўклай прадаўгаватай разеткі — матава-папяловы экран густа зашыпеў і заіскрыўся, нібы бітае шкло, свецячы мярцвяна-белым экранам. Пакруціўшы ўсе ручкі, Гэнрык Самец нарэшце вырваў з разеткі чорны шнур — шыпучае жвірыстае святло згарнулася, нядоўга дагараючы ліловаю кропкай.

Уманціраванае ў сцяну люстэрка, калі Самец незнарок зірнуў у яго, маланкавым зігзагам трэшчыны разрэзала жаўтлява-схуднелы і здарожаны Самцоў твар. Гэтакая ж чорная, у лукаткі, шчыліна раскалола і тоўстую губу кафейнае ракавіны. Самец зморшчыўся. Але не ад таго, што праз шчыліну на падлогу прасочвалася ржавая вада, дзе кісла вільгаць, а таму, што брыдзіўся ўмывальнікаў, якія былі ў некамфортных, без туалета і ванны, недагледжаных нумарах павятовых гасцініцаў.

А пачалося ўсе з таго, што аднойчы ён пачуў ад свайго знаёмага, з якім апынуўся разам у камандзіроўцы: «Ды ты, даражэнькі, па малой справе бегаеш у туалет? А хіба ў цябе ў нумары ўмывальніка няма?»

Пасля такога запытання Гэнрык Самец пачаў падазрона і скоса паглядаць на гасцінічныя ўмывальнікі. Ну, добра, ну, няхай сабе мужчыны, а жанчыны што?.. Таксама? Фу, не можа такога быць.

Дарэчы, той жа ж знаёмы з прыкрым смяшком, з агіднаю брыдкасцю расказаў наіўнаму і сарамяжліваму Самцу, як аднаго разу ў гасцінічным нумары гвалтоўна пасадзіў на ўмывальнік юрлівую масквічку, жонку афіцэра, што ехала ў адведкі да мужа, і як яна, аддаючыся яму, пэўна, у экстазе, — ашалелая ад нясцерпнага жадання, прагнасці і асалоды, так дзіка, з балючым адчаем, заенчыла, што ён, перапалоханы гэтым бяспамятным віскам, уміг астыў, перагарэў і рэзка адхіснуўшыся ад яе, тут жа выскачыў з ванны, а праз гадзіну ўжо выпісаўся з гатэля, каб болей не трапіць на вочы не менш, пэўна, перапуджанай і асаромленай жанчыне.

Па-хлапечы праставатага і цнатлівага Гэнрыка Самца так збянтэжыла і зняважыла цынічна-адкрытае апавяданне свайго знаёмага, што ён доўга не мог пераджыць усяго і, не раз успамінаючы, нават з салодка-балючай хваравітасцю, брыдкі выпадак, да агіды ўзненавідзеў неўтаймаваную чалавечую разбэшчанасць і грубавата-ганарлівую, нахабную пахвальбу мужчын.

Вядома, з цягам часу ўсё прайшло і забылася, аднак жа расколаты з іржавай ручаінкай умывальнік вярнуў у памяці той даўнейшы цынічны расказ.

«Няўжо папраўдзе чалавек бывае горшы і

агіднейшы за жывёлу?» — уздыхнуў ужо спакойна-абыякавы Самец і пакруціў за чорны крыжык на латунным кране, які, нібы смаркатае дзіця носам, глыбока захлюпаў і ўсцягнуў у сябе астатак іржавай вады. «Так-с, — скрыва ўсміхнуўся Самец і закруціў кран. — Тут усё, як кажуць, у комплексе: ні туалета, ні вады». А чамусьці моцна, ажно да прагнасці, Самцу захацелася піць — яго смажыла яшчэ ў аўтобусе.

Павярнуўшыся да чорнага пластыкавага дыпламата, ён шчоўкнуў двума блішчастымі замочкамі, дастаў бутэльку малдаўскага «Кабернэ», купленага ў камерцыйным латку на аўтавакзале. Наліўшы застоенай вады з жоўтацьмянага графіна, спаласнуў шклянку і потым ужо, не скупячыся, наліў у яе іскрыста-рубінавага віна, глытаючы цягучую слінку, радасна палюбаваўся, падняўшы перад вачмі грубаватую гранёную шклянку, з спакусліваю густою вадкасцю. што духмяніла кменным водарам і плаўна пакалыхвалася, ломячы палоскі шкла. Не адрываючыся і цяжка задыхнуўшыся, выпіў кіслае, з гаркаватым прысмакам, віно.

Трымаючы ў руцэ пустую шклянку, падышоў да акна і раптоўна ўчуў, як яснее за ім мройна-жоўты, завешаны нерухомаю смугою спякотны дзень. Унізе, як і летась, як пазалетась, на шара-чорнай асфальтнай пляцоўцы, дзе дрыжала сіняватая лужына, стаялі турысцкія аўтобусы, — цяпер, праўда, сярод іх адзін замежны, па-святочнаму ўзнёслы, з таніраваным ёдзістым шклом у вокнах і нашмат вышэйшы. За мігатлівым сітцам агароджы, што акружала заасфальтаваны двор,

хадзіла рабая насцярожаная кураводка з бясхвостымі цыбатымі куранятамі. І за недагледжаным, зарослым крапівою і дзікаю мальваю дваром, дзе на вяроўцы пакалыхваліся беларужовыя просціны, у халадок, пад старыя раскідзістыя ясені ціснуліся два тыя ж самыя, на высокіх падмурках, цёмна-карычневыя дамы. З прыгожага, ашалёванага ў елачку франтона на гасцініцу пазірала цёмна-патайное эліпсавае акно.

Памяць, нібы пякучая агністая маланка сярод чорна-ліловай ночы, негадана высвяціла прыхаваную ў разрослых прысадах вёску, бацькаву хату, да палавіны абкладзеную ўжо сілікатнай цэглай, і бацькаў здзічэлы сад, у якім звілі свае гнёзды нахабна-небаязлівыя дразды, і Гэнрыку Самцу, калі ён ішоў каля паломаных і падмерзлых яблыняў, было балюча і неяк вусцішна бачыць, як з глініста-шэрых гнёздаў выцягвалі хісткія галовы на тонкіх шыях і разяўлялі чырвоныя дзюбы брыдка-агідныя, яшчэ не апераныя, толькі ў сівым пуху, сляпыя драздзяняты. Самец доўга не мог перажыць і перагарэць сінявата-голых сляпых пташанят і адчайна-траскучага верашчання ўстрывожаных драздоў. Нечым чужым і ўжо непрытульным палохала яго да палавіны абкладзеная белаю цэглаю бацькава хата, прададзеная іншым гаспадарам малодшай прыроднай сястрою. Яна, мусіць, баялася што хата дастанецца яму, старэйшаму брату. Напытаўшы купца, — ім аказаўся чыгуначнік з Моўчадзі, — сястра, лічы, за бясцэнак аддала яшчэ спраўны будынак. Дакараць ды папікаць яе

Самец не стаў — ёй, аўдавелай у сорак, жылося не соладка, тым больш у далёкай і галоднай Самары.

Летась, у канцы ліпеня, на той раз грымотнага і дажджлівага, што не раз здараецца і выпадае ў жніво, Самец, як кожны год, па сваёй ужо свядомай традыцыі прыязджаў пакланіцца і бацькавай вусцішнай хаце, і бацькавай нямой магілцы: за жалезнаю агароджаю стаяць два шара-іскрыстыя «ветразі» з мармуровай крошкі і пацямнелымі ўжо залацістымі літарамі, якімі адціснуты бацькава імя — Люцыян і мачашына — Вікторыя.

Дзе зарасла і апала недагледжаная матчына магілка, ён дакладна не ведаў: на яго роспыты бацька калісьці толькі няўважна і нехаця аднекваўся: «Не помню. Недзе там». — І паказаў на высокі частакол чужых магільных агароджаў, пафарбаваных найбольш у блакітны колер.

Перажыўшы мачаху на тры гады, бацька памёр неверагодна-таямніча і далёка ад дому. Яго агледзілі за пяць кіламетраў ад вёскі ў лазе, пры рэчцы, нежывога і да паловы раздзетага — ён скінуў толькі кашулю. За дзён тры перад гэтым суседзі бачылі, як бацька, паклікаўшы з сабою сабачку, адлучыўся з дому. І каб не гэты сабачка, што пачаў падвываць у лазе, то наўрад ці скора знайшлі б труп.

Гэнрыку Самцу помнілася — ён дзесьці чытаў, што пажылыя людзі, асабліва перад хваробаю, уцякаюць з дому, — іх гоніць прадчуванне блізкае смерці, як выгнала гэтае прадчуванне ў бездарожны свет Льва Талстога.

Прыгадваючы бацькаву смерць, Самец кожны раз міжволі прыгадваў і пра тое, што ён старэйшы за дзвюх сваіх зводных сясцёр і чарга ўжо за ім. Хоць, здаецца, і ранавата было думаць пра смерць — яму ішоў пяцьдзесят чацвёрты, — але сэрца спадцішка ўсе роўна абвяваў лёгкі скразняк холаду. Зрэшты, пра смерць думае кожны, нават незнарок высунуўшыся на невялікі і высокі, як буслінае гняздо, балкон восьмага ці дзевятага паверха, або неўспадзеў пачуўшы ўзрыўны і балючы віск тармазоў маланкавага таксі. Як чалавека тады апалошча спярша гарачы, а потым халодны ліпучы пот. Але гэтае нервовае ўзрушанне як уміг скалыне, так уміг і аціхне. Тое, што цяпер адчуваў Гэнрык Самец, было зусім іншым: у ім жыла як аддаленасць, так і блізкая немінучасць смерці, нейкая наканаваная непазбежнасць, якая ўспрымалася з халоднай развагай і сталым разуменнем, што ён цяпер, як старэйшы ў сям'і, першы падышоў да чорнага вечнага абрыву, што ўслед за бацькам яго чарга. І да гэтага ён ставіўся без адчаю і таго ўзрыўнага сполаху, які адчуваў, часам высунуўшыся на чужы высокі балкон.

«Чалавечыя пакаленні, як вада ў рэчцы, безупынна наплываюць і безупынку адплываюць, незаўважна змяняючы адныя адных. Так, змяняюць...» — Самец няўцямна зірнуў у акно, і яго думкі перабіла злосна надзьмутая курavодка, што, распасцершы крыллі, кінулася ў пагон за чорным з белаю грудзінкай катом — ён хацеў быў перабегчы блізкаю сцежачкаю з аднаго дома ў другі.

Гэнрык безгалоса, адным уздыхам, усміхнуўся і, адышоўшыся ад акна, на стале, пры недапітай бутэльцы, паставіў шклянку. Наступаючы на пятку, зняў адзін туфель, потым — другі. Прылёг на нізкаваты, засланы серабрыстаю капаю ложак, заклаўшы рукі за галаву і скрыжаваўшы на біле стомлена выцягнутыя ногі.

Перад вачыма, калі ён зморана іх заплюшчыў, яшчэ раз праплыла нядаўняя дарога, што пахла ў аўтобусе чамусьці знаёмым з забытага дзяцінства цёплым пахам глінянай печы, і Самец нават учуў саладжава-прэсны смак гліны. Ён усцешана дзівіўся, што ўсяго гэтага не засцерушыў халодны сыпкі снег далёкіх гадоў.

З мройна-гарачай дарогі помніліся шарыя сцены чужых хатаў, цесныя гародчыкі з вялікімі вачмі ружовых мальваў, сівалобыя каменні, што ляжалі пры развілцы тлустаклейкай асфальтнай шашы пад крывымі залацістымі хвойкамі. І ланцужок Самцовае памяці з чорна-тлустай шашы незаўважна саслізнуў і пацёк да калматых затравелых межаў і смутных хвоек, што адзінока старэлі на абветраным прасторы поля, да вайны, да тых дзён, што бачацца, як праз далёкі сіне-бялёсы туман, у якім ужо іншыя рэчы траццяць сваю выразнасць, — усё праглядвае нейкімі белаватымі плямамі.

Памяць выкрасліла спадзісты груд з трымя крывавымі, нібы неапалітанскімі, хвойкамі, глыбакаватую пад імі яму, дзе людзі з блізшых вёсак для току і печаў капалі тлустую гліну і дзе ўлекту сорак першага ляжалі набрынялыя,

як горы, і пачарнелыя трупы забітых байцоў, пасцяганыя сюды з недалёкай шашы і прыкрытыя іхнімі ж шынялямі. Адтуль, з ямы, срабрыстымі замкамі і рулямі паблісквалі абы-як скіданыя вінтоўкі. Праўдзівыя і надта ж зваблівыя. І ён, сямігадовы Гэнрык Самец, не стрываў і палез да гэтых пачарнелых, набрынялых трупаў. Дзіва бярэ, ён тады не баяўся нябожчыкаў, як баіцца ці наровіцца цяпер нават самога сябе, калі ўяўляе сябе мёртвым. Але тых атрутных вінтовак, дзякуй Богу, ён не ўзяў, — да іх не падпусціў нязносны саладжава-густы смурод, што патыхаў ад трупаў, і гідзіла ад чырвоных жучкоў, што працьмаю гвіжэлі на іхніх чорна-сiняватых тварах.

Задыхнуўшыся ад атрутнага трупнага паху, Гэнрык яшчэ выбраўся з ямы наверх, каб аддыхацца каля старое шурпатае хвойкі і, заткнуўшы адною рукою нос, спусціцца да зваблівых вінтовак зноў. Але дыхаць адным ротам Гэнрык не ўмеў і адкрыў нос. Гэтага было даволі, каб яго тут жа пачало ванітаваць.

З глінянай ямы, заваленай трупамі, ён вылез без прагна жаданай, спакуслівай вінтоўкі. Яна, гэтая найдарожшая ў яго падлеткавым жыцці цацка, знайшлася на другі дзень проста каля ядлаўцовых кустоў, зводдаль ад палявое дарогі, дзе перад прыходам немцаў адпачывалі гнаныя з-пад Беластока савецкія байцы, — а поруч з ёю пакінутая палатняная сумка, мусіць, ад процівагаза, поўная залацістых патронаў з чорнымі дзюбкамі, як потым даведаўся Гэнрык, — узрыўных. Адзін з іх Гэнрык

загнаў у затвор. Але на спуск не націснуў — ні тады, калі заклаў патрон, ні тады, калі да яго, целяпаючы незавязанымі шнуркамі на сівых суконных галіфэ, падышоў Габрыель Жагала, гаспадар старога саламяна-шарага хутара, дзе граду капусты падпасвіў, забаўляючыся з гэтаю ж вінтоўкаю, ён, Гэнрык Самец. Пашэнціла тады абоім — і яму, Гэнрыку, што не забіў чалавека, і Габрыелю, што застаўся жывы. Як жа ж шчаслівым бывае ў жыцці тое, што іншы раз не здзейснілася.

Надзейна і таямніча прыхаваная ў ядлаўцовых кустах пад прысадзістай хвоечкаю вінтоўка назаўтра ж знікла.

І вось Самцу яна ўбачылася зноў — цёмна-карычневая з бліскучым замком і страхатліва настаўленай чорнай рурай. І была яна ні то ў руках раз'юшанага Габрыеля Жагалы, ні то ў руках незнаёмага мужчыны, падобнага да партызана ў пляскатай фуражцы і падперазанага шырокім вайсковым рэменем. Гэнрык, поўны дзікага жаху, правальваючыся ў твань, уцякаў, бег па чуйна-топкім балоце, акружаным з усіх бакоў бурнымі пеністымі ручаямі. Яны, гэтыя ручаі, у міг вока шырыліся, вадаспадна шумелі і зліваліся ў адну глыбокую рэчку. Яна плыла ўжо, як вялікае, раскалыханае і ўспененае штормам мора. Ні прайсці яго ўброд, ні пераплысці ўжо. І тут грымнуў стрэл, магутны і нечаканы. Пранізаўшы нібы халодным ветрыкам, праз Гэнрыка прайшла куля. Але ён пабег, не чуючы нават болю. Гэнрыку Самцу, ужо каторы раз, снілася невідочна вялікая, бурная паводка і незабытая вайна.

У кіпучай, вірлівай вадзе тапіўся шархотка-чуйны троснік і рэдкі сінявата-карычневы алешнік. Каля саміх ног у Самца, падмываючы і абвальваючы дзярновы бераг, глыбокімі лейкамі круціў цёмна-патайны вір. Самец са сполахам адступіўся назад, але чорны зігзаг глыбокай шчыліны перагарадзіў яму дарогу. Бераг раптоўна адкалоўся і разам з Гэнрыкам нячутна і плаўна пайшоў пад ваду. Бурлівая каламуць лядовым холадам ажно па пахі абняла змярцвелага Самца. Ён адчайна замахаў рукамі, кінуўшыся ўплаў да берага, але бераг, падмыты бурлівым патокам, абвальваўся і тануў.

Магутны, нястрымны вадаварот плыні падхапіў Самца і панёс, як нямоглае ягня. Адчуваючы, што топіцца, Самец з усіх астатніх сіл зноў замахаў рукамі, намагаючыся даплысці да берага, але сілы ўсё меншалі і меншалі. Ад дзікага страху, што ідзе на дно, Самец заенчыў здушаным безгалосым крыкам і... прачнуўся. На плячах у яго доўга астываў ліпкі гарачы пот.

Развейваючы варухлівы поцемак, у нумары шырылася чуйнае сіняватае святло блізкага дня. Самец нарэшце агледзеўся, што спіць не распрануўшыся, але трохі змерзлы, працяты лёгкаю дрыготкаю, прахапіўся, як заўсёды, у адну і тую ж пору, — у чатыры раніцы. Самец падкруціў залацісты з жоўтым цыферблатам гадзіннік і падняўся з бела-серабрыстага ложка. На двары пад вокнамі гасцініцы натужана падвываў маторам некаторы з трох турысцкіх аўтобусаў. На сцяне, як ад месяца,

мройна дрыжала мярцвяна-белаватае святло зеленаватага ліхтара, што асвятляў абгароджаны сеткаю тыльны гасцінічны пляц для заезджага транспарту.

Самцу прыганулася дача — невялікі ашалёваны дошкамі і пафарбованы на блакітна аднапавярховы дамок, змучаная працаю на гародзе жонка, з якою ён ужо другі год быў у разводзе, яе непадступна-злосная сварба, што ён ізноў прыехаў п’яны. І ён, як малое дзіця, да слёз пакрыўджаны, наліў яшчэ сабе ў шклянку прывезенага віна і, забыўшыся на дачы сваю лёгкую куртку, вярнуўся назад на аўтобусны прыпынак. Сеў у жоўты, не менш людны «Ікарус», напаткаўшы ў ім паўнявамалочную курносенькую маладзіцу з недалёкай ад дачнага пасёлка вёскі, што ездзіла з горада і ў горад, найбольш у святнія і нядзельнія дні з чатырохгадовым хлопчыкам або іншы раз з мужам, чарнявым жылістым мужчынам, як можна было ўгадаць, на гадоў пяць ці восем старэйшым за яе.

Гэтая выпадковая сустрэча з сакаўною белаю і чыстаю целам курносенькаю маладзіцаю так таемна і так спакусліва хвалявала Самца. А пачалося ўсё з пазалеташняй светлай маёвай нядзелькі ў гэтым жа людным вечаровым аўтобусе, што завальваючыся набок, варочаўся астатнім рэйсам у горад, падбіраючы на прыцемненых паўстанках купкі запозненых, стомлена маўклівых дачнікаў і асалавелых ад чаркі гараджан, якія ехалі з вёскі ў горад з набухлымі цяжкімі сумкамі і чародкамі дзяцей. І ён, Гэнрык Самец, з радасна-шчаслівай удзячнасцю

ўчуў мяккае цяпло блізенька і нібы аддана прытуленай маладзіцы, а потым і сам, нібы падштурхнуты пасажырамі, пачаў цесненька хінуцца да яе, салодка і сарамліва-радасна хмялеючы ад гэтае прытуленасці. І яна, з бялявай зваблівай шыйкай, паўнявая маладзіца, нібы не чужалася знарок ці незнарок горнучыся да яго і прымаючы, мусіць, таксама яго ненахабнае, у меру далікатнае прытулянне.

Так і пачалося ў іх выпадковае, непрымусовае потым, маўклівае, але з даверлівай радасцю і адданасцю прытулянне, асвечанае адчужанай, нібы не сваёю, але ўсё ж неадлучнаю і шчаслівую закаханасцю, праўдзівей, толькі яго, Самцовай.

Асвечаны зеленаватым святлом вулічнага ліхтара Самец безуважна пазіраў у гасцінічны двор, адкуль, палаючы чатырмя рубінавымі заднімі ліхтарамі і стомлена, сонна пафырквачы, выязджаў белаваты аўтобус. Там застаўся стаяць толькі высокі, з зацемненымі шыбамі. Трэцяга, даежджанага старога ЛАЗа з трубкаю — сігнальным клаксонам над кабінаю — ужо не было.

Самцу чамусьці зрабілася шкада самога сябе. Гэтае адчуванне вынікала заўсёды, калі ад'язджаў выпадковы аўтобус ці адыходзіў, панёсшы за сабою аціхаючы грукат, прахадны пасажырскі цягнік. Самец адчуваў балючую смутную забытасць і шчымлівую пакінутасць, і нясцерпны холад адзіноты.

У гушчыні цёмных, яшчэ без праяўленага зялёнага колеру вулічных прысад пульсаваў адзінокі светафор. У шарым блочным доме,

што паўставаў над вострымі дахамі блізкіх ад гасцініцы драўляных дамоў, жоўтымі палосамі свіціліся дзве лесвічныя клеткі і між імі, у сярэднім акне, блакітна-ружовым маланкавым сполахам мільгаў экран тэлевізара — у некага чуйна лавіла далёкі свет спадарожнікавая антэна. Злева ад гэтага роўненька зрэзанага блочнага дома зелянела неба з малінавым паскам і на яго наплывалі сіне-ліловыя валакністыя хмаркі. На далёкай, нябачнай за срэбна-зялёным жытам вуліцы, што выбягала на седлаваты груд, за горад, згас залацісты ланцужок вулічных ліхтароў.

Там, за цёмным паскам лесу, абвеянага лёгкаю смугою, як спусціцца з пагоркаў па вузкай асфальтнай шашы, і будзе яго, Самцова, вёска з блізкаю чыгуначнаю станцыяю, што перапаясана тугімі, як струны на гітарным грыфе, рыжава-бліскучымі рэйкамі, з нязвыклым, што нагадвае белы карабель, яшчэ польскім будынкам вакзала, упрыгожаным мансардавым, накрытым чарапіцаю дахам, з халодна-сцюдзенаю і па-вужынаму вывівастаю ў чорным алешніку крынічнаю рэчкаю, за якою, ужо на стромым беразе, над чэзлымі і замшэлымі хвойкамі туляцца шчодра зарослыя росна-вільготнаю кашкаю незнакамітыя местачковыя магілкі. Там, акружаныя вострымі пруткамі жалезнай агароджы, нібы плывуць два шарыя «ветразі» з пачарнелымі залацістымі літарамі, пад якімі спачываюць бацька з мачахаю... і недзе поруч, сярод пахаваных суседзяў і блізкіх апала і заросла невядомасцю магілка маці.

...Неяк у год пасля мачашынае смерці, калі яны з бацькам, наламаўшы ў гародчыку сініх касачоў, цёплым чэрвенем прыйшлі да аселай пасля зімы магілкі і ён спытаў у бацькі, а дзе ж пахавана маці, той зноў, як і ў першы раз, махнуў букетам сініх касачоў: «Тут недзе!.. Ці я помню. Праз тыдзень пасля Аблажэявай Вікці памерла. Яны абедзве ў тую зіму на тыф ляжалі».

Блакітны нягегла-крываваты помнік з няроўным, надрапаным цвіком польска-беларускім надпісам — «Вікторыя Аблажэй жыла 40 лят. Памерла 14.03.1944 року» — Самец знайшоў адразу ж. Абапал нізкага блакітнага помніка ціснуліся пазарасталыя капцы з драўлянымі спарахнелымі крыжамі і замшэлымі камянямі. «Няўжо ж тут, пад адным з гэтых, апалых і зраўняных з зямлёю капцоў, ляжыць маці? І няўжо бацька не ведае, дзе яе магілка?»

Той далёкі жалобны дзень, белая з ружовымі стрыжнямі труна, у якой ляжала маці, прыгадваецца даволі цьмяна. Помніцца найбольш чырванашчокі ў чорнай сутане ксёндз, што ўвайшоў у хату, каб прыняць ужо астатнюю матчыну споведзь, і матчына смерць, калі ён, васьмігадовы Гэнрык, уваліўшыся з разломанай крыгі ў лядовую рэчку, мокры па пахі, прыбег дадому, каб пераапрануцца, і некаторая з суседак, што сядзелі пры матчыным ложку, злосна на яго закрычала: «Ціха! Маці паміpae!» І ён, як абязвечаны страшна-нечаканай навіною, усцішна затуліўся за печчу каля парогу, не бачачы ні таго ложка, дзе канала

маці, ні суседак, што пакленчылі пры ім, а толькі чуючы іхні паспешны даверліва-набожны шэпт і ловячы вачмі на абразе трапяткі залацісты сполах, якім адсвечвала запаленая грамнічная свечка. А з яго тоненькім шнурком ледзь чутна цурчэла вада, расплываючыся наўкруг ног цёмнаю лужынаю. Ад мокрай адзежы, што абвіла яго ліпкім холадам, ад усяго таямніча і нечакана страхатлівага, што рабілася ў хаце, Гэнрыка калаціла і турзала нервовая гарачка...

Усё астатняе прыкрыла ўжо цяжкая, нібы надмагільная пліта гадоў, — ён болей, здаецца, нічога і не помніў, калі не лічыць бацькавага ўхажорства ды сватання да старэйшай на пяць гадоў незамужняй Янэчкавай Міхаліны — трохі сіпатай і з яго ростам.

Гэта быў ужо іншы, неспадзявана агідны страх ці, можа, дзіцячая цікавасць, перамешаная з брыдкасцю, злосцю і помстаю за мацеру, калі бацька, не заўважыўшы яго, малога Гэнрыка, пачаў дзікавата і брыдка рагатаць і кідаць на сена ў палувеньцы таўставатую Міхаліну. Ці ад таго, што Гэнрык ужо быў на год старэйшы, ці ад таго, што ўжо трохі чуў ад большых за сябе хлопцаў, ён ужо з помслівым, недаравальным і злосным адчаем шпурнуў туды, у палувеньку, падхватны камень...

Гэтая першая маўклівая сутычка з бацькам не забываецца. Як і тая патаемна-спакуслівая помста, якая салодка яднала яго з хлопцамі-падлеткамі з суседняе вёскі, што, застаўшы бацьку на хутары ў каханкі, асеннім слотным вечарам, стрэлілі ў яго з абрэза. Падахвочаны

гэтай нечувана-страшнай нагодаю, пра начное забойства пачаў сам-насам набыльваць і Гэнрык Самец.

Балазе, у свой астатні прыезд да ледзьве жывога, схуднела-бяскроўнага ў твары, пазначанага ўжо прыкметаю блізкае смерці адзінокага бацькі, што нечакана жаласліва пачаў успамінаць пра жаніцьбу на другой жонцы, яго, Гэнрыкавай мачасе, пакрыўджаны Самец усё ж не прагаварыўся пра той страшны абрэз і свае спакусліва-патаемныя, здрадлівыя думкі. Хоць бацька і сам здагадваўся пра Гэнрыкаву затоеную помсту, бо тут жа ж сказаў: «Ведалася мне — не любіў ты мяне за мачаху, не любіў... і ўсе тут!»

Тая маўклівая помслівая злосць, той падлеткавы адчай і абраза, нават нянавісць, перамешаная з агідаю, тая першая сутычка з бацькам усплываюць у памяці, праяўляюцца, як адбітак на фатаграфіі, кожны раз, калі Самец прыгадвае мацеру, і кожны раз спадысподу душы зноў высачыцца холад забытае злосці і крыўды.

«Чаму ў чалавечым сэрцы жыве так шмат благога і помслівага? Чаму чалавечая душа не можа ачысціцца ад бруду, як ачышчаецца ад яго пасля каламутнай паводкі звычайная рэчка?»

Самец злавіў рукою халаднаватую раму акна, — за ім ужо святочна і ўрачыста яснела вадзяніста-блакітнае неба, не патушыўшы яшчэ сіняватую, дрыготкую, як слязінка, зорку на малінавым, настылым занач небасхіле.

Склаўшы аксамітныя чорныя крыльцы, на шыбе яшчэ драмала ўчарашняя чуйная

матылька. У пакоі яшчэ не растаў сіне-дымнаваты начны змрок. Але гасцініца ўжо прачнулася і ажыла: з калідора чуўся задушлівы, не прагананы першаю зацяжкаю кашаль заядлага курца, і ржава, раздражнёна — да марозу на скуры — парыпвалі дзверы суседняга нумара.

Азіраючыся на фаянсавы таўстагубы ўмывальнік і ўспамінаючы тое даўняе дакаранне свайго знаёмага, Самец уступіўся ў туфлі і крутнуў у дзвярах ключ, які павярнуўся толькі на палову абароту — дзверы былі не замкнутыя. Штурхнуўшы плячом, ён адчыніў іх насцеж.

«Няўжо ніхто не абмыліўся, не пастукаўся сярод ночы? А ўчора ў вестыбюлі і на лесвіцы было столькі п'яных», — не паверыў сам сабе. — Гэта, мусіць, толькі смерць прыходзіць неспадзявана. А злодзей тады, калі ты яго найбольш баішся і чакаеш».

Вясёлкава-паласатыя пакоўныя сумкі, выстаўленыя ўжо на калідор, і чародка маладых хлопцаў і дзяўчат у світрах і сіне-злінялых дудкавых джынсах заступілі Самцу дарогу. Прыслухоўваючыся да шапялява-мяккай прыемнай польскай мовы, Самец адзначыў сабе, што ў ёй чулася нейкая асаблівая, не ганарыстая інтэлігентнасць і пекната. І якою грубавата-пагрозліваю здавалася руская гутарка. Мо таму, што рускую мову Гэнрык Самец пачуў толькі пасля вайны і доўга да яе прывыкаў, зарабляючы ў школе заўсёдныя тройкі.

Польскія турысты ў злінялых, дзеля моды надрэзаных на каленях джынсах і, як стара-

жытныя рымляне, у сандалях на босую ногу абселі ўжо сталы ў гасцінічным кафэ, калі туды трохі прыпозненым, паголены і пахнучы не густым, не задушлівым адэкалонам, увайшоў памаладзелы Гэнрык Самец. Месца пуставала толькі за кутнім сталом, дзе над талеркаю з сасіскамі нагнулася і поркалася відэльцам немаладая, неяк трохі ненатуральная, пад маладых дзяўчатак падфарбованая даўганосая жанчына. Яна падазрона азіралася то на залу, то пад сталы, то сабе пад ногі.

— Яна кожнае нядзелі да нас прыходзіць і садзіцца за гэты столік, — падказала высокая рыжавата-залацістая афіцыянтка, прыбіраючы талерку і шклянку з недапітым кампотам, калі жанчына разлічылася і выйшла з кафэ.— Яна нам казала, што малою яе брат біў аб сцяну галавою. Робіць яна прыбіральшчыцаю, грошы ў яе ёсцека, і адзяецца добра. — І дадала, злёгку ўсміхаючыся:— Дзеўка яна.

— Відаць, — нехаця і горка ўсміхнуўся Гэнрык Самец, угадваючы ў вобліку ярка і ненатуральна падфарбованай немаладой кабеты трохі хворую на галаву дачку Сабіны, гэтак жа хворай, адзінокай з іхняе вёскі жанчыны, што ледзьве не штогод радзіла дзіця, якое ў яе адбіралі і аддавалі ў прытулак.

«Няўжо гэта яна, старэйшая Сабініна дачка, — дурнаватая Ганаэфа?»

— А як жа ж завуць яе? — ажно прыпадняўся, упіраючыся локцямі ў стол, здзіўлены і ўражаны Самец.

— Аня яна, Анця, — некалькі разоў паўтарыла афіцыянтка. — А прозвішча яна кожны

раз называе новае, а якое ж праўдзівае, то я і не скажу.

Перажываючы сам-насам гэтую нязвыклую выпадковую сустрэчу, на новы, абліцаваны аўсяна-жоўтаю пліткаю аўтавакзал Гэнрык Самец прыйшоў прыпазніўшыся, — каля касаў ужо цісналіся мурлатыя загарэлыя дачнікі з выцвілымі рукзакамі, з якіх стырчма вызіралі драўляныя замурзаныя чаранкі малаткоў і ручкі свярдзёлкаў. Двое асалавелых, непрацвярэжаных яшчэ з ночы мужчын галосна пакрыквалі, падспешваючы кароткую чаргу.

На чарнявага, чыстага, пры касцюмчыку, сутулавата-рослага хлопца, што быў запярэчыў ім, мядзведзяваты, густа кучаравы здаравіла, прыплюшчыўшы мройна-сонныя валошкавыя вочы, пагрозліва замахаў сцятым кулаком.

— Ідзі-ідзі, варушы поршнямі!

Гарбаносы з сівымі скронямі стары, што стаяў за імі, не стрываўшы гэтай грозьбы, злосна падняў доўгія, як мётлы, чорныя бровы:

— Ціха, злыдні!

— А ты, дзед, не дзяўгай! — зверавата азірнуўся другі, асадзісты, шыракатвары і дзён колькі не голены.

І ў Самца схмурнела, зацягнулася нечаканым смуткам неспадзяваная светлая радасць, што была прасачылася ў душы, тая кароткашчымлівая радасць, якую ён адчуваў заўсёды, калі ехаў дадому, у радзімую старану.

Душа парывалася да сцішанай пясчанай дарогі, што перабягала седлаватыя груды з бэзава-сівым ці серабрыстым, зеленаватым жытам,

з доўгаю, як ланцужок, песняю жаваранка над ім, да цёплай адзіноты маладога, абвеянага цягучым смолкім пахам хваёвага лесу; душа шукала чагосьці замілавана-чыстага, не асаромленага ні злым словам, ні благім учынкам, да светлай, як снег, пакоры і набожнасці. Нібы магнэзам цягнула да ўсяго даўняга, што здавалася ўжо найдаросшым і беззваротна страчаным, да тых сцежак, якія помніліся змалку, да старых дзікіх грушаў у святочным белым цвеце, да пыльных і смутна-ціхіх скрыжаванняў палявых дарог і сценак, на якія набягала завіткамі хваляў шапаткое жыта...

Перацярпелая, засмяглая душа вырывалася і ўзнёсла ляцела з цеснаты цэментна-халоднай кватэры ў высотным доме з запляваным і пракураным ліфтам, што з гудзеннем і натужным парыпваннем не раз мінаў пляцоўку, з аднастайна шэра-панельнага мікраараёна з сабачымі ганнямі ў дварах, з табунамі машын, сярод якіх паблісквалі цёмна-графітныя ці серабрыста-перламутравыя «Форды», «Мерседэсы», «Аўдзі», з грукатліва-звінючага метро, запруджанага чужымі людзьмі і чужою гутаркаю, з чаднага аўтобуснага дыму на гарачых, расплаўленых асфальтных вуліцах, ад мноства абыякавых і панурых, занятых сваімі таемнымі мыслямі людзей, ад мармытлівых, п’яных целяпайлаў, ад таўкатні ў чэргах, ад людской сваркі.

І Самцова душа расчаравана і балюча апала — наўкруга была тая ж зласлівасць, чалавечая спрадвечная жорсткасць, атручаная помслівасцю, патаемная нялюбасць і халодная не-

прыязнь, — усе тое, што разлучае людзей і змушае іх варагаваць.

Чуючы, як пад сэрца плыве халодная паводка нечаканае крыўды і злосці, ён апануръўся і сцяўся ўвесь, маўкліва дакараючы сябе, што выбраўся ў дарогу, каб адчуць яшчэ большы смутак і пераканацца, як пераконваўся ўжо не раз, што ратунку нідзе няма і што з гадамі ўсё цяжэй прыязджаць на бацькаўшчыну, дзе кожны раз пацвярджаецца, што ты ўжо зусім чужы і безнадзейна і нязмерна адзінокі, і перад вачмі меркне маляўнічы зыркі і звабліва-пекны свет, засланяючыся, як абложнаю хмараю, прыкрасцю, адчужанасцю і золкасцю тугі.

Узнервавана-неспакойны Гэнрык Самец ужо адчуваў, што перад ім была «Vice versa» — невядомая, неспазнаная зямля, і нешта таксама ўжо невядомае і млосна цяжкае, як сардэчны прыступ, абдымала і прыгнятала яго. Нарастала дэпрэсія, вяласць, апатыя...

Узяўшы нарэшце білет — папяровы прастакутнік з ажурным узорам, — Самец вышчаміўся з чаргі, што ўжо доўгім шнурком закруцілася за ім, і выйшаў з непрытульнага вакзала, дзе застояўся затхлы пах, якім звычайна аддаюць неправетраныя аўтобусы і прыгарадныя цягнікі.

На шарым асфальтным двары, дзе каля пляцовак прыткнуліся чырвоныя ў белых пасках «Ікарусы» і блакітна-белыя ЛАЗы, пад якімі перабягалі, паблісквaючы зялёна-ружовымі шыямі, рахманыя галубы, дзе цярпліва і задумліва адзінока чакалі сваіх рэйсаў сціша-

ныя пасажыры, было поўна светлага прастору, сіняга густога неба, на якое спадцішка белаю чародкаю наплывалі першыя хмаркі. Тлуставатым, перагрэтым на летняй спякоце лісцем паблісквалі чорныя, як негры, камлі старых ліпаў за гуртам тупалобых аўтобусаў. Выцягнуўшы вострую стралу, узняўся высокі ажурны кран. Пад ім у прагале растуленых кронаў свяцілася жоўта-ружаватая сцяна новага будынку, які велічна, нібы разломлены айсберг, уздымаўся там, дзе, як помніцца Гэнрыку Самцу, калісьці ўладна, па-гаспадарску стаяў драўляны дом з двума чубатымі ганкамі, падпёртымі прыгожа выштукаванымі калонамі. Ад гэтага драўлянага дома з пацямнелым чарапічным дахам веяла таямнічаю даўніною, заможнасцю, шляхецтвам, покуль Гэнрык не пачуў ад бацькі, што перад вайною і па вайне тут была павятовая бальніца і што ў ёй ад менінгіту памерла старэйшая Самцова сястра, пра якую ён ведаў усяго са скупых бацькавых успамінаў.

Вядома, папярэдняя ўзнёсласць і таямнічасць пасля гэтага трохі згасла, але ў душы ўсё роўна тлела цеплыня ці, праўдзівей, светлая павага да гэтага аднапавярховага дома з выштукаванымі драўлянымі калонамі і падаўнейшаму яшчэ накрытага чарапіцаю. Душу абдымаў холад шкадавання, што ўжо няма знаёмага будынка, як абвейваў халаднаваты скразняк, калі Самец чуў, што памёр нехта з яго равеснікаў, з якім ён калісьці таварышкаваў і з якім, спатыкаючыся праз шмат гадоў на аўтобусным прыпынку, шчыра і даверліва

вітаўся і заходзіў разам у сталоўку, каб прычасціцца якім-небудзь танным гаркавата-церпкім віном. І тады з празрыстай, светлай захмялеласцю ўспаміналася якое-небудзь даўняе здарэнне або падлеткавая злосць ці крыўда, або з навалакаю гарачых ад захмялеласці слёз на вачах абгаворвалася гвалтоўная дзікая смерць аднакласніка, што забіўся, наскочыўшы матацыклам на прышашыйныя цэментныя слупкі, аслеплены сустрэчнай машынай.

«Як нялітасціва, няшчадна і жорстка адыходзіць усё, нават знаёмыя дрэвы і будынкі», — Самец яшчэ раз уважліва паўзіраўся на ружаваты недабудаваны дом з чорнымі і шматлікімі, як клавішы, праймамі для вокнаў і падышоў да пасадачнай пляцоўкі, дзе ўжо гуртам збіліся пасажыры. Утрапёна, з насцярогаю ўцікоўваўся ў знаёмыя і нібы незнаёмыя твары, але нікога не пазнаваў. Гэта, як здагадаўся Самец, быў блізкі з дзяцінства тыпаж, і чуваць была тая ж самая прывабная, праўда, нават спярша нязвыклая родная гутарка, тыя ж дзіўна вымаўленыя словы: «казоў», «броў», «проўда». Яны былі кароткія, нібы сціснутыя абручамі, а гэтыя, якімі ўжо гаварыў сам, здаваліся па-жаноцку мяккімі, працяжнымі і нагадвалі мяўканне катоў — «ка-за-у-ў», «бра-у-ў».

Светлы, з блакітным паскам пад вокнамі, даезджаны аўтобус падышоў трохі прыпазніўшыся. Ён здаваўся сіратліва-недагледжаным, дашчэнту разбітым, асабліва ў сярэдзіне, — з расхістанымі, умятымі сядзеннямі, з нявымеценым пылам і пяском на іх, як быва-

юць такія даезджаныя да крэсу, неадрамантаваныя і саржавела-старыя аўтобусы на раённых аўтастанцыях.

Счакаўшы, пакуль усядуцца нецярплівыя пасажыры, займаючы пярэднія, нібы выгаднейшыя месцы, бліжай да шафёрскай кабіны, увешанай рознакаляровымі сцяжкамі і вымпеламі, пасярод якіх пакалыхваўся партрэт вусатага Сталіна ў маршальскім кіцелі, злоснамаўклівы і панура-адзінокі Самец прайшоў у канец салона, дзе аказалася нават некалькі пустых сядзенняў.

Нарэшце аўтобус натруджана і ржава заскрыгатаў усім сваім надломленым падмосткам, заляскаў адарванаю дзесьці бляхаю, зарыпеў расхістанымі сядзеннямі, зазвінеў запыленымі шыбамі, за якімі невыразна, як у каламутнай вадзе, паплылі знябожаныя садкі, упрыгожаныя сарамяжай чырванню няспелых яблыкаў перад драўлянымі пачарнелымі хатамі ў белых сцягах расхрыстаных аканіцаў. За вострымі трохкутнікамі шыферных дахаў з ражкамі антэнаў на іх, душачы і прыгнятаючы гэтыя нізкія драўляныя дамы, падымаліся халодна-непрытульныя каробкі панельных дамоў з цёмнымі нішамі глыбакаватых лоджыяў, густа завешаных падсіненаю бялізнаю.

Мінуўшы сівавата-серабрыстыя прысады, белую блочную сцяну з чорным, нібы дзёгцевым надпісам «Шынмантаж» і адзінокую хатку з ярка-малінавымі сподкамі мальваў перад малымі, па-даўнейшаму нізкімі вокнамі, раскалыханы, рыпучы аўтобус выкаціўся за го-

рад, да седлаватага груда з запалавелым ужо жытам і цёмна-зялёнымі круглымі ў кронах дубамі, што, як добрыя суседзі, стаялі на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго. Далей шаша рассякала гарбатую, злёгку засіненую ранішняю смугою непрыступную сцяну ялова-га лесу. І Самцова сэрца зашчымела, зайшлося салодкім болем, — там была радзімая старана, да якое заўсёды, дзе ні быў бы Самец, нібы компасная стрэлка ў кірунку палярнай зоркі, паварочваліся яго ўспаміны і думкі.

Рамантычна-бесклапотнымі белымі гускамі на вадзяністай сінечы неба за гарбата-зубчатаю сцяною лесу выплывалі тры хмаркі. У іхняй пеністай зыркасці, у іхняй грудаватай форме было заўсёды нешта знаёмае і блізкае з дзяцінства. І Самцу ўбачыўся скошаны, ад гэта-га жаўтлявы і калючы поплаў, па-аднаа-собніцку абгароджаны ў дзве столкі іржавым дротам, нізкае кружэнне дзвюх кнігавак з несціхана-адчайным, горкім плачам, і грудава-тыя белыя хмаркі, што наплываюць на падлет-ка Гэнрыка Самца то вялікімі чалавечымі гало-вамі, то разбушаванымі быкамі, то рахманымі кучаравымі авечкамі. А ён, Гэнрык, заклаўшы за голаву рукі, ляжыць на прахалоднай пако-шы і ўтрапёна пазірае, як растае, мяняецца вялікая кучаравая галава, падобная да Зеўса ў падручніку гісторыі, як выцягваецца курносы нос і робіцца падобны да склюдаватага носа на-стаўніка матэматыкі, што мае прывычку шмор-гаць рукою пад сваім носам, сціраючы набры-нялую празрыстую кропельку, якая раз за ра-зам набягае, як бярозавы сок на латачыне.

У дзяцінстве ёсць нямала дзіўнага і патаемна шчаслівага, падумалася Самцу, чаго няма ўжо ў чалавечай прытупленай сталасці.

Яму ўжо трохі са смехам прыгадалася, як калісьці, прачынаючыся ў рэдкую хвіліну святочнай радасці, калі яго ніхто не трывожыў, ён утрапёна ўзіраўся ў столь, бачачы на сукаватай дошцы прыгожы тварык кучаравай дзяўчыны, падобнай да валавокай Каралінкі з іхняга класа, у якую ён, Гэнрык, быў патаемна і да бяспамяцтва, да самазабыцця закаханы і, помніцца, вельмі гэтак жа таемна, адзінока і балюча тужыў, калі наступнай восенню яна разам з сям'ёю і старэйшым братам, ужо дзевяцікласнікам, выехала ў Польшчу... Не, брата яе тады, здаецца, не пусцілі. У той дажджлівы, дрыготка-халодны верасень ішлі павальныя арышты. Самцу выразна помніцца сцюдзёная, з першым шорсткім замаразкам раніца, калі яны, хлопцы-пяцікласнікі, ужо адныя, без дзяўчатак, разам з ваенруком і старэйшым пры ім вучнем, гэтым самым братам Каралінкі, сабраліся ў цемнаватай ад керасінавай лямпы пачакальні вакзала, каб зацёмна ехаць на лясны паўстанак. Тады ж іхняя школа нарыхтоўвала для сябе дровы. Танюткі, як чараціна, хоць і на два гады старэйшы Петрык Гранкоўскі, з якім Самец неяк проста і па-хлапечы даверліва падружыўся, нашча ўжо накурыўшыся, дыхнуў тытунёвым дымам у Гэнрыкаў твар: «Чуў? Напэўна, яшчэ не. Сёння ўночы Платона Губарэвіча і Віцю Крыжаноўскага арыштавалі. І Мароза з Сідарчыкам, кажуць... Ледзьве не палавіну дзевята-

га класа павалаклі. Астаўся хіба ён, Каралінчын брат».

Чуйна-азызлы і халодны, як вуж, скразняк нечаканага ўжо, дарослага страху прапоўз у Гэнрыка па спіне: душа скалыхнулася ад прыкра-агіднага адчування, што наступным можаш быць ужо ты.

— А хто іх?— жахнуўся ад боязні Гэнрык.

— Ну хто ж?.. Краснапагоннікі.

І зноў было жудаснае адчуванне свае беззабароннасці, таго колішняга страху, які холадам падмываў душу, калі Гэнрык бачыў ганарыста-цыбатых і зялёных, як гарохавыя конікі, нямецкіх афіцэраў, толькі цяпер гэтае агіднае адчуванне і патайны страх сыходзілі ад маўкліва-панурых салдат у шарых шынялях з чырвонымі пагонамі, што занялі белы, запэцканы для маскіроўкі ў зялёныя плямы даўнейшы будынак ортскамендатуры.

«Як усё аднакава паўтараецца на свеце, — думаў Самец, перажываючы даўнюю халодную восень і безуважна пазіраючы за акно аўтобуса, дзе ўжо кружыўся, набліжаючыся цёмным гарбом, пануры яловы лес. — Бо не толькі само забойства, а нават зброя ў руках чалавека зневажае ўсе чыстае і святое: яна ж прызначаецца дзеля аднога — забіваць».

Але ў той асыраваты вераснёвы надвячорак, калі яны, прытомленыя, але ўзбуджана-вясёлыя, прапахлыя дымам ад ляснога вогнішча, тым жа прыгарадным поездам, у якім заміж электрычных лямпачак у незашклёных бляшаных ліхтарах над дзвярыма гарэлі свечкі, вярнуліся на вакзал, іх на шапаткім жвірыстым

пероне сустрэў невысокі курносы мужчына, у абшморганым зношаным паліто і велікаватых, пэўна, яму не па назе, зморшчаных неваксованых ботах. Сутулячыся, трымаючы руку за пазухаю і пахрумстваючы сваімі ботамі па рыпучым жвіры, ён падышоў да ваенрука і тыцнуў ледзьве не пад самы нос, выцягнуўшы з-за пазухі і спрытна разгарнуўшы на далоні, чырвоныя «корочки». Што ён гаварыў, Гэнрык, стоячы тады зводдаль, не дачуў. Ён толькі ўбачыў, як адхіснуўся ад гэтых распасцёртых «корочков» здзіўлена-насцярожаны ваенрук і, падняўшы руку, нібы засланяючыся ёю, паказаў спярша на клятчатую кепку Каралінчынага брата, а потым — на Петрыка Гранкоўскага, што неяк дзікавата і ненатуральна зарагатаў, калі яго ўладна схапіў за локаць нізенькі мужчына ў велікаватых зморшчаных ботах. Збялелы, але па-даросламу спакойны дзевяцікласнік толькі недаўменна, з нейкім трохі горкім дзівам азірнуўся на ўсіх і няспешна пайшоў да бакавога ходу белага двухпавярховага вакзала, адкуль звычайна з'яўляўся ў чырвонай фуражцы асадзісты і мурлаты дзяжурны па станцыі, а цяпер неўспадзеў высунуўся худзенькі, як падлетак, прыгожы з твару і заўсёды інтэлігентна-спакойны, паважны Хунт, усім вядомы лейтэнант НКВД.

Што напаткала дзевяцікласніка па прозвішчы Попель, што напрарочыў яму Бог, невядома і да сённяшняга дня. Перапалоханы, чуйнапудкі Петрык Гранкоўскі вярнуўся дадому на трэці дзень, каб ужо ціхенька, закрываючыся

далонямі, пярэшаптам пераказаць не менш уражанаму ды перапуджана-нервоваму Гэнрыку Самцу, што яго, Петрыка, разам з Попелем пратрымалі ноч у вакзальным склепе, куды ўвапхнулі яшчэ двое зарослых барадамі маладых мужчін, — мусіць, дэзерціраў, — і назаўтра раненька, спыніўшы спадарожную палутарку, павезлі ў раён, у аддзел НКВД, дзе іх паасобку ўжо дапытваў капітан бяспекі. У Петрыка выведвалі найбольш пра стрыечнага брата, што ў часе вайны вучыўся ў наваградскай гімназіі і пра нейкія ўлёткі, што былі раскіданы ў раённым клубе.

Абарваўшы свой шэпт, на роспыт астатніх вучняў Петрык толькі цяжка соп, унурваючы шылаваты нос у чорную, скрэмсаную ножыкам лаўку і зацята-цярпліва маўчаў. На худых, упалых шчоках, на твары ў яго ірдзелі густа-ружаватыя плямы, а на лобе тлустаю расіцаю пабліскваў пот. Трохі распусны і баявіты, а з слабейшымі нават жорсткі, калі садзіўся каму-небудзь з іх на плечы і «конна» ехаў па класе, цяпер Петрык Гранкоўскі прывяў, згарнуўся, нібы ліст на агні, і нібы пачужэў, зрабіўшыся адрошаным, маўкліва-панурым. Ён нібы прычуваў сваю блізкую смерць, бо праз месяцы два, а менавіта на пачатку лістапада, калі ў клубе святкавалі кастрычнік найбольш наезджыя чыгуначнікі, яго, Петрыка Гранкоўскага, застрэліў капітан НКВД, начальнік часці ўнутраных войскаў, што незадоўга перад гэтым занялі колішнія будынкі нямецкай ортскамендатуры.

Самцу здарылася нават быць тады ў клубе, у тым цесным з цьмянай лямпачкай калідорчы-

ку, дзе збіліся яны, падшыванцы, і дзе заўсёды пры дзвярах у залу стаяў дужы і нібы трохі неразважны Нупрэй. Ды, зрэшты, можа, і не Нупрэй, а Нікодым — імя яго Самцу ўжо выразна і не помніцца. Помніцца толькі тое, што ў той вечар ён быў злы і недаступны: надоечы распусная дзетвара заміж пакамечаных, спацелых рублёў, за якія Нупрэй сцішком прапускаў на трафейныя фільмы, падсунула ў чарпак растапыраных нупрэевых пальцаў некалькі хрумсткіх, навошчаных мылам ці воскам пустых паперак. Агледзеўшыся, напэўна ж, ужо дома, Нупрэй цяпер помсціў усім, хватаючы за каўнер і шпурляючы з калідорчыка за дзверы ўсю басатву і раз'юшана пры гэтым гукаў:

— І вон адсюль, шантрапа! І не смярдзі тут!

Пасля таго як Нупрэй, распасцёршы рукі, нібы пудкіх авечак, вытурыў на двор у золкі поцемак купку разбэшчаных падшыванцаў, у цесным дашчаным калідорчыку засталіся стаяць яны ўдвух — Гэнрык Самец і Петрык Гранкоўскі. І гэта, мусіць, не менш, як тыя падробленыя фальшывыя рублі, зняважыла і ўзнервавала малахольнага Нупрэя. Вытрашчыўшы свае белаватыя вочы, раз'ятраны і злы, ён ступіў да іх. Яго дужая рука, мінуўшы меншага, недарослага Самца, схапіла і зграбла загрудкі яго, большага і дзябёльшага Петрыка Гранкоўскага.

Саракагадовы, у самай моцы мужчына кінуў няроўнага сабе па сіле, шчуплага падлетка спярша на дзверы, потым, калі яны адчыніліся, — у чорна-ружовы поцемак сцюдзёнага восеньскага вечара.

З калідора на двор Самец выскачыў ужо ў адзін дух, без прынукі.

— Я табе пакажу, брыда, гаўно сабачо! — крыкнуў яшчэ сюды, у поцемак, на двор, дзе ў разбоўтанай, як зацірка, гразі ляжаў, смешна задраўшы ногі, асарамачаны перад усімі Петрык Гранкоўскі.

Рыпучыя дзверы, забраўшы скупое святло, зачыніліся і з таго боку, у прабоі, забразгаў жалезны крук.

Зашыпеўшы, як ушчэмлены гад, і ўжо пасталаму мацюкнуўшыся, Петрык у міг вока падхапіўся з сцюдзёнай, размешанай перад парогам, па-гнойнаму смярдзючай гразі і моцна, з усяго разгону гахнуў плечуком у дзверы.

Самец ужо не ведае ці, дакладней, не помніць, ці дзверы праламаліся, ці іх ужо адчыніў капітан. Ва ўсякім выпадку, у пройме адчыненых насцеж дзвярэй паўстала яго сутулаватая постаць. З боку Гэнрык бачыў, як асвечаны скупым святлом калідорнай лямпачкі пагрозліва і страхатліва блішчаў яго левы пагон і як дзюбок яго шыракаватага, таксама падсвечанага носа па-савінаму драпежна апускаўся да злосна падцятай губы.

— Ты что, сволочь делаешь? Ведь сейчас избирают почетный президиум во главе с Иосифом Виссарионовичем!..

— Ідзі ты, ведаеш... — Самец ужо не дачуў, што болей сказаў Петрык, бо голас яго перакрыў па-бабску тонкі ўскрык і да гідлівасці нечувана брыдкі і ў Бога і ў маці рускі мат.

Капітан сутаргавата, нібы ў эпілептычным прыпадку, спярша выпрастаўся, потым саг-

нуўся да свайго крута адстаўленага клуба, дзе адтапырвалася і правісала кабура, абедзьвюма рукамі нервова зашоргаў па ёй.

Счуўшы гэты шоргат, у фіялетавай сляпучай чарнаце першым знік ён, Петрык Гранкоўскі. Халодны, казытлівы пад сэрцам страх услед за Петрыкам штырхануў і Гэнрыка Самца, гонячы ад расчыненых дзвярэй, ад п'янаватага, пэўна, і здзічэлага, ашалелага ад злосці капітана-чырвонапагонніка.

Усе астатнія сыпнулі ў разнабой, з лопатам прападаючы за блізкімі хлеўчыкамі і прыбудоўкамі. На шчаслівы ратунак Самец завярнуўся за вугол доўгага клуба, у неасыпаны ад лісця бэз, што тхнуў смярдзючым сметнікам. Наўпраста да блізкай шашы ўцякаў толькі Петрык Гранкоўскі — спадзяваўся, пэўна, на свае лёгкія цыбатыя ногі. Самец, затаіўшыся за неасыпаным, што чакаў першага замаразку, густым бэзам, учуў, як крохка, нібы па мерзлым снезе, зарыпелі новыя капітанавыя боты — ён даганяў спорнага ў бегу Петрыка Гранкоўскага. Невядома толькі, ці ён бег наўгад, ці ўсё ж распазнаваў у поцемку Петрыкаву постаць.

Але там, над шашою, нечакана закалыхаўся і заслізгаўся па тлуставата-мокрым бруку не вельмі яркі, вадзяніста-малочны веер святла — на чыгуначны пераезд высунуўся ЗІС — трохтонны тагачасны грузавік з дашчанай скрыняй. Што гэта быў менавіта ЗІС — завод імя Сталіна — Гэнрык Самец распазнаў потым, а спярша з свайго схрону, з-за бэзу, убачыў, як на гэтае вадзяністае святло з разгону выскачыў і палахліва, у нейкай замешцы на міг пры-

пыніўся, узмахнуўшы па-птушынаму рукамі, Петрык Гранкоўскі.

Як сёння здаецца Самцу, ён пудка ўзмахнуў імі ад першага ўжо стрэлу, што адначасна з снапком агністай успышкі не вельмі гучна разарваўся за нізкім шчыкетавым плотам. Услед за першым стрэлам неўзабаве луснуў другі, ад якога ўжо Петрык Гранкоўскі закружыўся і пачаў асядаць на цьмяны блішчасты брук. Ён быў яшчэ жывы, ён нават намагаўся ўстаць, шукаючы нямоглымі, няцвёрдымі ўжо рукамі сабе апору.

Праехаўшы яшчэ метраў колькі, ад другога стрэлу спыніўся і грузавік. Фары яго, падсвечваючы Петрыка, які яшчэ курчыўся і вывіваўся, канаючы ўжо тут, на бруку, трохі прыгаслі, але не выключылся. І на фоне іх Самцу было відаць, як да шафёркі паспешна і спорна ступіў сутулаваты рослы капітан, запіхаючы тым часам у кабуру гарачы, яшчэ з дымком, зашчэмлены пісталет.

Першы казытліва-халодны страх, ад якога чутка ўсталі на галаве валасы, у Самца прайшоў, але яго ўсё роўна трасла нервовая ліхарадка, калі ён пачаў падкрадацца да плоту, да шашы, на якой, смуродзячы гарам, натужліва вуркатаў ЗІС.

— В больницу или в морг его, подлеца, завези! — адчыніўшы дзверцы шафёркі, пагрозліва сказаў капітан. Шофер марудзіў, мусіць, знарок гаворачы пра нейкую сваю пільную справу ці патрэбу, пакуль зноў, на гэты раз брыдка і агідна вылаяўшыся, не закрычаў капітан:

— Да ты что, в Бога мать твою?!

Шофер, прысадзісты і паўнаваты мужчына, нарэшце вылез з шафёркі і паволі, з чуткаю асцярогаю, пайшоў туды, дзе ў жоўтым святле фараў курчыўся і турзаўся, пэўна, у астатняй ужо агоніі паранены насмерць Петрык Гранкоўскі.

— Памажэце ж, — азірнуўся шофер на капітана, але той, суха і крохка парыпваючы новымі ботамі, заварочваў на сцежку да клуба, дзе ў пройме адчыненых дзвярэй, прыпёршыся плячом да вушака, стаяў малахольны Нупрэй.

Петрык Гранкоўскі сканаў у тую ж ноч на кушэтцы ў чыгуначнай амбулаторыі, куды яго, ужо бяспамятнага, прывёз на сваім бразгатліва-рыпучым грузавіку той прысадзісты мардаты шофер.

Услед за самаходам Гэнрык Самец прыбег ажно да самага ашалёванага прыгожага дамка пад векавечнымі ліпамі і клянамі, каб ужо праз няшчыльна завешаныя фіранкі ўбачыць, як акрываўленага Петрыка паклалі на белую пры сцяне кушэтку. Балазе, у амбулаторыі нехта дзяжурыў ці незнарок пазнавата затрымаўся.

Ганарысты прыгожы дамок пад купаю высокіх, сашчэпленых кронамі старых дрэў, у якім сканаў Петрык Гранкоўскі, яшчэ і цяпер трывожыць Самцову памяць, калі ён, бывае, пройдзе міма вузкіх у многа шыбаў старамодных вокнаў, як і раней, завешаных белымі фіранкамі. Яму тады чамусьці думаецца: неразважны, трохі баламутны Петрык мог дажыць да яго гадоў і мог, як і ён, мець пасярэб-

раныя скроні, але Петрык на ўсё далейшае жыццё застаўся ўсяго толькі падлеткам, равеснікам спачатку Самцовым дзецям, а цяпер — унукам.

Чым ты болей жывеш, тым болей чужых жыццяў і лёсаў укладваецца ў тваё жыццё, і яно робіцца нібы не тваім, расплываючыся і растаючы ў глыбокай далечыні гадоў, у бачаным і перажытым. Вядома ж, маладыя гады былі больш уражлівымі, святлейшымі, яскрава-прыгожымі, імпульсіўнымі і больш уласнымі. Самцу помнілася недзе ўжо вычытанае, што ў старажытных грэкаў улюбёнцамі багоў рабіліся тыя, хто памёр маладым. У маладосці чалавек да неразважнасці і адчаю болей рашучы, таму, пэўна, маладому лягчэй паміраць: з гадамі ён ашчадна даражыць гэтым сваім і не сваім жыццём. Ён ужо не кладзе яго на алтар ахвярнасці.

Парыпваючы ўсім сваім саржавелым нутром, аўтобус трохі нахіліўся і, гамуючы, прыткнуўся да заасфальтаванага чатырохкутніка з размытым у дождж жоўта-пясчаным краем.

За зялёным аднабокім грудом, дзе палежвалі навязаныя ў роскід і ўжо наетыя пярэстыя бычкі, пры зацішанай сцяне зялёна-сіняватага лесу прытуліўся рознакаляровымі, як пчаліныя вуллі, дамкамі дачны пасёлак. Бліжэй да шашы, пры светла-шарай дарозе, між жоўта-сонечных зрубаў з цёмнымі праймамі лоджыяў і вокнаў бялелі піраміды сілікатнай цэглы і гіпсавых блокаў, чорныя кажухі рубероіду прыхоўвалі штабелі аранжавых дошкаў.

З задушлівага люднага аўтобуса, пакалыхваючы яго і штурхаючыся ў затораных дзвярах, адна за адною пачалі выскокваць разамрэла-ружовыя маладзіцы. Махаючы перад тварам кісцямі рук, нібы галубінымі крыллямі, здзьмухвалі гарачыню. Выпінаючы мокрую ніжнюю губу, цяжка соп насаты дзябёлы мужчына з пукам звязаных штапікаў і планак і вялікаю брызентаваю сумкаю, з якое выпірала сталярскае начынне: крывыя рогі гэблікаў і корбы свярдзёлкаў. І ўвесь гэты дачны люд, напалавіну вызваліўшы аўтобус, расцякаючыся на ручаіны, павольна паплыў да светлых домікаў, што яшчэ не зараслі купамі садкоў, затоенымі абмовамі ды сварбою за межы.

Лёгка, спорна ступаючы і спакусліва паварушваючы мяккімі клубамі, астатняю ішла стройная, як вераценца, прывабная ў паставе маладзіца. Голыя да пляча загарэлыя рукі і гэтакія ж смуглявыя, з залацістым адлівам ногі, акуратна і гладка зачасаная галоўка з касою, дбайна завітаю ў цяжкую куклу, вярнулі Самцу на кароткі міг школьныя гады, яго першую закаханасць у Тарэзу Нарушэвіч, дачку станцыйнай буфетчыцы, што без мужа нечакана з'явілася ў іхнім глухім, яшчэ без электрычнага святла мястэчку. Дарэчы, у прывабную, нібы гладзенька вытачаную ў паставе і прыгожую з тварку Тарэзу закаханы быў не адзін толькі Гэнрык Самец, а, як потым высвілася, ажно іх трох дзесяцікласнікаў, бо яны ўтрох, нібы змовіўшыся, уцяклі з урокаў і запрасілі з сабою бойкую і жартаўлівую Тарэзу, прагуляўшы з ёю цэлы дзень на маёвых,

душных ад расквітнелага бэзу вусцішных магілках. Тады ж яны першы раз выпілі віна і ўсе трое прызналіся Тарэзе ў каханні. Яна, вядома, прытворна і бесклапотна-шчасліва рагатала над імі. А праз тыдзень увесь клас з дзівам пачуў, між іншым, ад іхняга лысаватага прыгорбленага матэматыка, які жыў з Тарэзай у адным доме, што ў яе, у Тарэзы Нарушэвіч, сёння вяселле. «Даўно ў яе быў ухажор — сімпатычны афіцэр, — пасмейваўся матэматык, ловячы запэцканымі ў крэйду пальцамі дзюбок носа і падфарбоўваючы яго. — Між іншым, і я, грэшны, во гэтак выхапіў з гімназіі сваю будучую жонку. Магу пахваліцца — генеральскую дочку».

Пэўна, наўмысна прынесеная ў клас і расказаная навіна і зняважыла, і раззлавала Гэнрыка Самца, і ён затаіў бурлівую крыўду чамусьці не на Тарэзу, а на старога матэматыка з белым, упэцканым у крэйду носам і за расказаную навасць, і за хрыпата-пракураны здзеклівы рогат.

Прытарна выпешчаны і шчуплаваты афіцэрык, якога разы са два ўбачыў Самец, адразу ж пасля нягучнага, нібы патайнога вяселля забраў Тарэзу да сябе, некуды, пагаворвалі, у Польшчу, дзе ён служыў, так і не даўшы ёй скончыць школу.

Праз гадоў пяць у надвячоркавым перапоўненым трамваі, ужо ў Мінску, здзіўлена ашалелы ад нечаканасці Гэнрык выпадкам убачыў стомлена-чужую, зблажэлую — яна была цяжарная, але ўсёроўна прывабную сваім ужо не ганарлівым хараством Тарэзу. Праз люд-

скую штурханіну на задняй пляцоўцы, дзе яны ачуціліся, праз сваю рахманасць і збянтэжанасць, а Тарэзіну ніякаватасць і сарамлівасць, пагаварыць па-належнаму так і не пашэнціла. Знарок ці не знарок, папрасіўшы прабачэння, праз два прыпынкі Тарэза выйшла. Самец, як помніць, не асмеліўся нават выскачыць услед за ёю з трамвайнага вагона. Не даваў ні то дурнаваты гонар, ні то помсліва-дзіцячая крыўда, што яна чакае дзіця. Ён усяго толькі прабіўся паміж чужымі спінамі да акна, каб убачыць, як яна ў ружаватай, трохі непрыемна балючай да рэзі ў вачах сукенцы асцярожна і марудна пераходзіла шары асфальт да млоснасці нагрэтай вуліцы, гэтаксама па-дзявочы лёгка і спрытна трымаючы сваю галоўку з залацістаю, туга завітаю куклаю. Да слёз Самцу зрабілася шкада самога сябе, і нейкі халодны скразняк адзіноты завіўся каля сэрца.

Мы заўсёды шкадуем сябе, і сірацее наша душа, калі нехта адыходзіць ці пакідае нас. Нават птушыны вырай, што знікае за хмарным небасхілам.

Пасля тое выпадковае сустрэчы ў перапоўненым трамваі, дзе пасажыры непрыемна і блізка пахнуць тытунём, потам, гарэлкаю і з прыхаванай гідлівасцю адварочваюцца адзін ад аднаго або, наадварот, як гэта бывае з п’янаватымі мужчынамі, знарок туляцца да спакусліва прыгожай маладзіцы ці дзяўчыны, ён, Самец, здагадваўся, што Тарэзе было сорамна ды ніякавата пры чужых людзях расказваць

пра сваё патаемнае, занадта ўласнае — замужства і сям'ю.

Аддаляючыся разам з трамваем ад паўстанку, Гэнрык Самец уважна ўзіраўся ў шары дом з блакітнаю шыльдаю «Пошта», дзе знікла Тарэзіна агніста-ружаватая, нацягнутая выпуклым жыватом сукенка, і ён ужо ці не з варожа-мсцівыю перавагаю пашкадаваў Тарэзу, падумаўшы, што ў яе з тым хлюставатым афіцэрам не ўдалося жыццё. Чалавек не раз бывае помсліва-злаславы, калі некага абступае бяда, калі ён хоць на міг можа ўзвысіцца над іншым.

Цяпер Самец нават учуў сорам за тую прытоеную зласлівасць і даўнюю агідную ўцеху з чужое бяды.

Аўтобус ціхенька, з лёгкім падскокваннем і клейкім шапаценнем колаў на падагрэтым асфальце каціўся, нібы імкліва падаў у даліну да маладога цёмна-зялёнага алешніку. Седлаваты груд, пярэстыя бычкі, што ляжалі, нібы раскіданыя валуны, на гэтым грудзе, дачны, падобны да светлай пчалярні, пасёлак, прыгожая ў паставе маладзіца на шара-жоўтай пясчаной дарозе, — усё знікла за Самцовай спіною. Ужо насустрач аўтобусу пеністымі зялёнымі хвалямі нізкага прылеску — грабу, ляшчыны, бярэзніку, — набягаў векавечны бор, на грэбяні якога няроўнымі зубцамі ўздымаліся крыжаватыя верхавіны хмурых елак.

За непадступнай сцяною засмужанага лесу пагрозлівым гарматным дулам уставаў белы, апаясаны чырвонымі пярсцёнкамі грубавататоўсты комін, над якім вісеў, падобны да

ранішняга воблака, капялюшык пухкага дыму. Поруч насуплена ўздымалася шчарбатая, як вежа старога замка, абсечаная каробка цэментнага завода, што, як помнілася Самцу, засыпаў сіва-белаватым пылам блізкія ад сябе хаты з агародамі і прысадамі. Усё кругом выдавала нежывым, мярцвяным, як асвечанае начною поўняю.

Заставалася ўжо не болей як восем кіламетраў дадому. Хоць які гэта быў дом? Пасля бацькавай смерці шэрая, скіданая з старых, прыкупленых хлявоў, паточаная шашалем, уся, нібы рэшата, у чорных дзірачках хата раптоўна аглухла і пачужэла, а пасля таго, як сястра прадала яе, аглух, пачужэў і нібы аддаліўся ўвесь зыркі, знаёмы і велічны свет бацькаўшчыны, усіх навакольных даляў, засіненых смугою лясоў на седлаватых горах. Усё нечакана змізарнела, накрылася павалокаю хмурнасці і страціла свой ранейшы ясны колер і ўзнёслы сэнс роднасці. Усё наўкруг было не толькі незнаёмым, чужым і інакшым, але нават непрыхільна-абыякавым.

Там, дзе цяпер тупа і велічна шарэла маналітная каробка цэментнага завода і дзе дыміўся белы, апаясаны чырвонымі кольцамі тоўста-грубаваты комін, некалі наіўна і міла жаўцеў густа ўсыпаны маслістым люцікам мяшчанскі лужок. На яго ўкрадкам падлетак Самец пускаў прыпасваць галодную карову, што, зачмыхаўшы ад радасці, прыпадала да аксамітнае муравы, покуль з блізкага хутара, абгароджанага шчытным плеценым плотам не высоўваўся заўсёды пільны, шыракаплечы і за-

гарэла-чорны, як смальняк, Габрыель Жагала. А недалёка ад таго масляніста-жоўтага лужка, у чэзлым хваёвым ляску, дзе пад замшэлымі ялаўцовымі кустамі ў неглыбокіх, прыцярушаных сівым пушком лежбішчах спалі гультаяватыя, небаязлівыя зайцы, была яшчэ адная Гэнрыкава таямніца — праўдзівая, што прыемна і страхатліва халадзіла рукі і саладжава пахла ружэйным маслам чорна-карычневая вінтоўка — вагкая, калі возьмеш яе ў рукі. Вінтоўка прыхоўвалася пад нізка навіслымі лапамі разложыстай хвоечкі ды яшчэ шчыра абкладзеная сівым хрумсткім мохам.

Халера, ажно смешна Гэнрыку Самцу цяпер успамінаецца, як ён гэтаю чорна-карычневаю вінтоўкаю смяртэльна, напэўна, да халоднага поту напалохаў урэднага Габрыеля Жагалу. Але ж каго не пройме страх, калі ва ўпор наставіць сапраўдную вінтоўку з чорна-сіняватаю руляй, што нясе смерць?

А пачалося ўсё з таго, што Гэнрыкава пярэстая, дападная да шкоды Падласка, прарваўшы калючы дрот агароджы, убегла ў гарод і пахрабустала колькі каліў лапушыстай, яшчэ не ўвабранай у галоўкі Жагалавай капусты, покуль ён, Гэнрык, лавіў маладзенькага, што выскачыў з-пад самых ног, і не вельмі, як здавалася, шпаркага зайца. Але злавіць таго шэрага камячка, што мігам ускочыў у блізенькі лубін, так і не ўдалося. А калі, расчараваны і збеднены ад крыўды, Гэнрык вярнуўся назад, то зніякавеў — яго бязрогая няўдаліца стаяла пасярод сіва-зялёных градаў, а туды, да гароду, скінуўшы з плячэй

радзюжку з нажатаю травою і памахваючы сярпом, загаласіўшы, як па нябожчыку, прыспешвала, перавальваючыся, нібы качка, хваравітая, тоўстая нагамі Габрыелева Антоля. Самога гаспадара на гэты раз не было. Але ён не даравbooў, цярпліва і доўга падпільноўваючы супакоенага ўжо Гэнрыка, якому нават падалося, што помслівы Жагала забыўся пра задаўненую патраву. Аднак, як пасля аказалася, у гэтым была свая хітрасць і тактыка. Бо аднаго разу, калі асмялелы Гэнрык падпусціў бліжай да гароду сваю бязрогую Падласку, сутулаваты і пануры, падобны да крумкача, Габрыель Жагала, трымаючы ў руцэ ружовы канчар адрэзанага кабелю, нарэшце выскачыў з свайго схрону — з-за самай блізенькай ад дарогі серабрыста-зялёнай хвоечкі. Дагнаць жа шпаркага басаногага падлетка саракагадоваму мужчыне было не пад сілу. Аднак упарты і помслівы Габрыель Жагала не адступіўся. Не спускаючы вока, ён ішоў назіркам, — туляўся за кустамі і дрэвамі, покуль не загнаў ужо задыханага Гэнрыка за чыгунку, у топкае балота, што мякка і страхатліва пагойдвалася пад нагамі.

Сам, вядома, у рудую, зацягнутую сінявsituую плеўкаю смярдзючую багну, што шыпела і пухкала, як хлебная рошчына, не палез — нецярпліва паходжваў і вычэкваў на сушэйшым. Спадзяваўся, што загнаны да дыхавіцы Гэнрык выйдзе сам, бо на калматай, затравелай дарозе пры жоўтым лужку засталася яго недагледжаная карова. І праўда, пастаяўшы сярод асакі, дзе вухкалі і стагналі, як чэрці, балотныя жа-

бы, Гэнрык неўзабаве выбег з вусцішнага гнілога балота.

І за ім гэтак жа назіркам і неадступным павольным крокам ішоў, трымаючы ў руцэ ружовы канчар кабелю, раз'юшаны і помслівы Габрыель Жагала.

Загнаны і бездапаможны, ад знявагі і крыўды гатовы на ўсё, Гэнрык дабег да свае патаемнае сховы — прысадзістае хвоечкі — і выцягнуў з сівога моху чуйна-халодную, вагкую вінтоўку. Высунуўшыся трохі з чэзлага ляска, прылёг каля сухавата-замшэлага ядлаўцовага куста і струнка, дрыгатліва чакаў, бачачы, як блізіцца, неяк трохі клышанога ступаючы босымі жаўтлявымі нагамі, сутулаваты, смуглява-загарэлы Габрыель Жагала.

— Стой, гад, застрэлю! — не стрываўшы, покуль падыдзе бліжай ненавісны Жагала, сарваным, нервова-адчайным голасам закрычаў перапалоханы, парывісты Гэнрык.

Але Жагала, не дабачыўшы ці не распазнаўшы вінтоўку, уладна, з лядоваю злосцю на панылым твары, падыходзіў да ялаўцовага куста, нават, мусіць, пераварочваў у руцэ, каб ямчэй было трымаць, ружаваты кавалак кабелю. Яго высокая сутулаватая постаць у пляскатай кепцы з абшморганым да рыжаватага картону брылём, у выцвілай, некалі яшчэ польскай кашулі, ад якое даўно згубіўся адшпілены каўнер, ужо навісала над падсохлым хвішчаватым кустом ялаўцу.

— Стой, кажу, гад печаны! Заб'ю! — І трымцівыя Гэнрыкавыя рукі прыўзнялі над імшыстаю купінкаю настыла-халаднаватую і

прапахлую ружэйнаю змазкаю вінтоўку.

І тут адбылося ўжо нешта негаданае: у Жагалы нервова тарганулася і страхатліва забегала адно вока, шыя выцягнулася і пачала гарэць чырвонымі плямамі. Пахіліўшы набок галаву, ён узіраўся гэтым адным вырачаным і насцярожаным вокам сюды, пад куст, мусіць, верачы і не верачы, што на імшыстай купінцы, за якою прылёг чуйна-нацяты, адчайны і гатовы на ўсё Гэнрык, паблісквае чорна-сіняватаю руляю праўдзівая вінтоўка.

Босыя жаўтлявыя жагалавы ногі неяк паволі, як на палатне кінаэкрана, калі замірае праектны апарат, пачалі цяжэць і спыняцца. Жагала, здзіўлены і ашаломлены ўбачаным, нарэшце аслупянела застыў на месцы.

— Ідзі бліжай, гад, укакошу на месце! — ужо зларадна, чуючы сваю перавагу, закрычаў узбуджана-радасны Гэнрык.

Габрыель Жагала, зябка сутулячы плечы, з нейкаю асцярогаю, нібы на гібкай кладцы, каб не ўпасці ў ваду, павярнуўся і, маўчучы, уцягваючы ў плечы галаў з застрэшкам нястрыжаных даўно валасоў, што лезлі з-пад пляскатае кепкі, выкіраваўся на пясчаную дарогу. Паблісваючы жаўтлявымі пятамі, зноў гэтаксама нячутна ступаў па замшэламу аблогу.

— Ага, нябось напусціў у порткі! — ужо здзекаваўся ды гідаваў Гэнрык Самец.

Як яму, тады васьмігадоваму падлетку, праўдзівая вінтоўка дадала непадуладнай, нейкай ажно вар'яцкай адвагі. Якую ж ён адчуваў тады свабоду ці, праўдзівей, волю, што можа нікога не баяцца, нават застрэліць. Ажно

страшна самому ўспамінаць пра гэта, і дзякуй Богу, што гэтага не ўчынілася, як учынілася ў тое ж самае лета ў мястэчку, калі старэйшы вартаўнікоў сын, што хадзіў у адзін клас з Гэнрыкам, незнарок, забаўляючыся, застрэліў бацькавай, прынесенай з варты вінтоўкай свайго меншага брата. Але Гэнрык у тыя дні ўжо далёкага пасляваеннага лета ўсё ж адчуваў шалёна-бяспамятную радасць, што пад прысадзістаю хвоечкаю, прысыпаная сіва-галубенькім мохам, ляжыць вінтоўка, якая чуйным, лёгкім халадком студзіць яго рукі, калі ён цішком, падлезшы пад хвойку і разгробшы мох, выцягвае яе.

Праўда, тая шалёная радасць пасля здарэння ці сутычкі з Габрыелем Жагалам была кароткаю — на трэці ці на чацвёрты дзень вінтоўка знікла: пад шырокай у падоле хвоечкай застаўся толькі раскешканы, быццам грыбнікамі, волкі, ласкава-мякенькі пасля дажджоў мох.

Што вінтоўку забраў менавіта ён, Габрыель Жагала, можна было здагадацца па яго прытоенаму нечаканаму тулянню: Габрыель знарок ці незнарок, але не паказваўся на вочы Гэнрыку, калі той, таксама знарок і нават блізенька, падпускаў да гарода з капустаю непаслушна-памаўзлівую бязрогую карову.

Пераажыць страту вінтоўкі было нялёгка, як потым і страту гэтага чэзлага ляска — крывых, нязграбна-недарослых і замшэлых хвоечак, што раслі ўперамешку з сухавата-марнымі, у дымных, пасярэбраных ягадах, ядлаўцовымі кустамі, якія неўзабаве падтапталі

пад сябе шырокія з сілікатна-белымі сценамі і чорнымі насмоленымі дахамі райспажыўсаюзаўскія склады і базы, абкружаныя высокімі дашчатымі платамі. Сёння тыя дашчатыя платы заменены на шара-сіняватыя панельныя пліты. Няма ўжо і даўнейшай брамы, якую адчыняў і зачыняў перад грузавікамі Гэнрыкаў бацька, паходжваючы ў выданай яму і з часам выцвілай вайсковай куртцы з залаціста-бляшанымі гузікамі. Цяпер там стаіць іншы вартаўнік і каля іншай, металічнай з ужо зялёнымі сетачнымі форткамі, брамы, якую выгодна адчыняе паслушны электраматор.

Гадоў з дзесяць назад, у халодна-дажджлівы верасень па ходніку, выкладзенаму з квадратных цэментных плітаў і засыпаных жоўта-бурачковым мокрым лісцем, апалым з маладых клёнаў, ён, Гэнрык Самец, падышоў да прахадной — прыбудовачкі з трыма акенцамі, адно з якіх выходзіла на браму і дзядзінец, два другіх — на занядбаны, недагледжаны пустыр, з незараўнянымі ямамі, з абломкамі труб, жалеза і цэментных блокаў, дзе на разрослы куст распушанага асоту чародкаю селі прыгожыя шчыглы.

Цераз невялікае закурэлае аконца прахадной бацька, мусіць любаваўся імі і, заўважыўшы яго, Гэнрыка, бяззуба, паказваючы чырвоныя дзёсны, сарамяжа, па-дзіцячы засмяяўся.

Колькі аднак прайшло часу, а яму помніцца гэтая бяззубая дзіцячая ўсмешка і ружаваты, таксама па-дзіцячы сарамлівы бацькаў твар.

У старых, пачарнелых скрынках, складзеных недалёка ад праходной бацька знайшоў тады прыхаваную бутэльку віна, спаслаўшыся, што яго пачаставалі шоферы. Сам ён толькі прыгубіў, а Гэнрыку наліў нават поўную шклянку. І трохі захмялелы Гэнрык пачаў успамінаць, як тут, у даўнейшым ляску, хаваў праўдзівую вінтоўку і як аднойчы да бяспамяцтва настрашыў тутэйшага хутараніна Габрыеля Жагалу, у якога быў прыпасвіў капусту. Балазе не прагаварыўся, што гэтую ж знойдзеную вінтоўку набыльваў падняць і на яго, на бацьку, і што Гэнрыка тады спакушала, пад'юшчавала неадольная, ажно да вар'яцтва страшная помста.

— Няма хутара, няма і Жагалы тут, — уздыхнуў бацька, слізгаючы рукою ў кішэню да паласатай пачкі «Севера». — Вунь, дзе асот разросся, яго хата стаяла.

— Як? Памёр? — здзівіўся ўражаны Гэнрык.

— Ён? Ды не! Яго Антоля толькі. Помніш, кульгавая была? Кажуць, ён... — бацька чагосьці не дагаварыў.

— Што ён? — перапытаў Гэнрык.

— Дужы халера, зносу на яго няма, — бацька павярнуўся да акна і задумна паглядзеў на высокую купу забялелага асоту, дзе, трапечучы стракатымі крыльцамі, пералятала з каліва на каліва прыгожыя, як размалёваныя, шчаглы. — Яшчэ і прыжаніўся, і ліха на яго, нават на маладой. Мужык яе сп'яна пад поезд трапіў. Ды ты, мусіць, чуў пра гэту прыгоду? Асталася ўдава, кабета відная. Многа да яе

сваталася, адно ж пашла за яго — старога, і чым жа ж ён яе прываражыў?..

Як здалося Гэнрыку, самотны, аўдавелы ўжо другі раз бацька, мусіць, недалюбліваючы ў нечым Жагалу, з непрытоенай зайздрасцю ўсе ж паўтарыў:

— Але ж нечым прываражыў... Праўда, дужы, халера на яго... Не чалавек, а камень... А хата яго стаяла акрас тут, дзе падняўся асот. І кажнае восені поўна на ім гэтых самых, як на іх кажуць? Шчаглоў ці што?. О-о, любяць яны асот, як пчолы малісу. — І нечакана бацька зноў усміхнуўся тою ж самаю дзцячаю ўсмешкаю, у якой таілася ранейшая смутная гарката:

— Не раўняючы, як Жагала любіў баб. І чорт яго ведае, чым ён іх прыманваў ды прынаджваў? І гэтую во, маладую ды гладкую, удаву прылашчыў. А сам жа ж, не такі каб... Летась да яе ў прымы прыстаў, а хату прадаў на дровы ў пякарню. Ого, кручаны ён...

Пасля жончынай смерці, Гэнрыкавай мачахі, бацька нібы адмяніўся, пачужэў, зрабіўся вусцішна-адчужаны, маўклівы і задумлівы, а калі і гаварыў, то не з прыхаваным інтэрасам пра аўдавелых мужчын, пра тое, хто жаніўся ў другі раз ці на колькі гадоў пеpажыў жонку. З таго далёкага вераснёвага дажджлівага дня Гэнрыку Самцу запомнілася бацькава апавяданне, расказанае раптоўна, нібы спадцішка, пра страшна-нечуваны выпадак, што здарыўся ў мястэчку:

— Ты чуў ці не? Тут была Нямірава жонка з прыезджым шоферам злюбілася. Ты ж Паўла

Няміру ведаў: на станцыі вагаўшчыком рабіў. Высокі мужчына, а яна — маленькая, як мыш. Але праўду кажуць, мыш капы не баіцца, — колькі ж мужчын у яе перабыло. Падходжваў нават і Габрыель Жагала. Спала з кожным стрэчным-папярэчным. Нарэшце спазналася з шоферам з Гродзенскай аўтабазы. І Няміра, пэўна, за валасы яе пацягаў. І во як адпомсціла яна, змовіўшыся з тым шоферам, — забіла мужыка. А потым упіхнулі труп у мех і на возера ў праломку завязлі. Ужо на згоне зімы рыбакі вылавілі гэты мех... Шофер схаваўся, недзе ўцёк, а яна пад следствам сядзіць. Во як бывае...

Ажно не верыцца, што ўжо і бацькава, абнесеная жалезнаю агарожаю магілка з шарасіняватым ветразем, на якім залацяцца чатыры радкі літараў і лічбаў, суседнічае з недагледжаным, апалым капцом таго самага, забітага жонкаю Паўла Няміры.

Як усё ідзе па няспынным і вечным коле сваім: спярша не стала той страхатліва спакуслівай, знойдзенай вінтоўкі, потым жоўтазалацістага ад густога люціка местачковага лужка, потым глухога замшэлага Жагалаўскага хутара, нарэшце — рупнага бацькі каля сетачнай брамы, як не стане калі-небудзь панельнага плота, прысадзіста-шырокіх цагляных складоў з шарэнгамі каміноў пад бляшанымі капялюшыкамі на чорных, насмоленых дахах...

За шызавата-мурзатымі, цьмянымі шыбамі, што прасвечваліся, як памутнелая поліэтыленавая плёнка, прабеглі чорныя камлі велічных

дрэў — клёнаў і ясеняў, — і аўтобус спыніўся каля кантовага слупка з няшчадна пагібанай шыльдай. Пасажыры — колькі вясковых кабет у накрухмаленых святніх хустках, — што схаваліся былі ў цянёк, пад прычолак блізкага ад шашы сіняга дамка дарожнага майстра, — усе разам заспяшаліся да стомленага, нахіленага набок аўтобуса. На лаўцы, пад прычолкам, падпёршы далоняй шчаку, засталася драмаць сутуленая кабета, і каля ног у яе жмурыў асалавелыя вочы, паклаўшы на выцягнутыя лапы пасівелую мызу, стары, не чуйны сабака, абыякавы, мусіць, і да пасажыраў, што збіраліся на паўстанку, і аўтобусаў, што спыняліся тут.

Уражлівага да ўсяго, нязвыклага Гэнрыка Самца яшчэ з падлеткавых гадоў хваляваў гэты дагледжаны, і заўсёды чамусьці выфарбаваны на сіні колер высокі з востра-ўзнёслым дахам фанабэрысты дамок. Было ў ім нешта светла-рамантычнае і нязвыклае, і гаспадар яго — дарожны майстар, чорны насаты мужчына, вясковаму падлетку здаваўся чалавекам загадкавым, адукавана-мудрым, нібы быў з іншага, не тутэйшага свету.

Цяпер жа ж дамок выдаваў пачужэла-недагледжаным, старым і нібы трохі забытым, як здавалася забытаю самотная кабета, што, падпёршы рукою шчаку, драмала ў цяньку пад прычолкам разам з чорным пасівелым сабакам.

Зводдаль дамка на падраўнянай грэйдэрам абочыне шашы ў жалобнай паставе пакутна сутуліліся дзве жанчыны, пасярод якіх стаяла цыбатае дзяўчо ў светлай, караткаватай су-

кенaчцы. Пры нагах у іх, на невысокай, выкладзенай з каменняў крушні, што нагадвала магілку, ляжаў букет з белых і малінавых флёксаў. Каменныя крушні ці невялікія земляныя капцы з крыжыкамі, жалобнымі вянкамі і букетамі прывялых кветак на абочынах ці на зялёнай паласе аўтамагістраляў Гэнрык Самец бачыў не раз, як знак сённяшняй бяды, што абязвечвае найбольш зачаравана-шчаслівых дзяцей, якія ловяць трапяткі зваблівы матылёк, і ганарыста неасцярожных падлеткаў, якія, даганяючы імкліва зіхоткі свет будучыні, зусім не зважаюць на цяперашні, як ім здаецца, марудны і адсталы век, і трапляюць пад яго колы. Хоць досыць часта гэты век карае і сталых людзей, што намагаюцца, але не ўскорваюць пераскочыць рубінавы агеньчык перасцярогі.

Нервова-ўражліваму Гэнрыку Самцу зноў прыгадалася страшная нагода, якую ён бачыў надоечы ў горадзе і якую балюча перажыў: перад бетонным мостам, што ўздыбіўся над пасмаю блішчастых рэек з яскрава-сінімі светафорамі, на шарым асфальце, ззаду КрАЗа, што вёз гарбатыя панельныя пліты, рапластана ляжаў мужчына ў зашмальцаванай рабочай фуфайцы, а зводдаль валяўся яго сарваны з нагі туфель на тоўстай літой падэшве.

«А што ж адбылося тут, на вузкай шашы напроці сіняга дамка дарожнага майстра?» — сіліўся ўгадаць здумелы Гэнрык Самец, узіраючыся ў тры жаночыя постаці, горна і пакутна схіленыя над лішне і, здаецца, непатрэбна агністым букетам свежых флёксаў. І старэй-

шая з іх, у чорнай махрыстай хустцы ці шаліку на галаве, трымаючы ў руцэ разгорнуты кішанькговы малітоўнік, звялымі, зморшчанымі вуснамі шаптала, пэўна, жалобную малітву.

І чым болей насцярожаны і здзіўлены Самец узіраўся ў твар немаладой, знябожанай кабеты ў чорнай хустцы і пыталеным, даўнейшай моды, даўгаватым сачыку, тым болей угадваў у ёй штосьці знаёмае ў абліччы, у паставе, у худаватых сутуленых плячах, покуль нарэшце не здранцвеў ад утрапёнасці ці нават імгненнага шоку: там, над бела-малінавымі, яшчэ не прывялымі, свежымі флёксамі, над грудкай каменняў стаяла, схіліўшыся ў жалобным смутку яго стрыечная сястра Вераніка, па-тутэйшаму ды вясковаму — проста Вера, што была замужам у блізкай адсюль вёсачцы з прыгожаю і нечувана мілаю назваю — Дольная Рута.

У Самцовай памяці ўжо выразна высвеціліся словы, калісьці чутыя ад бацькі: «Гэта ж нашае Веры зяць забіўся. Забіў сябе і свайго таварыша. Ехалі на матацыкле, а, мусіць, падвыпіўшы былі, і перад Дольнаю Рутаю ўрэзаліся ў ліпы. Надта ж, кажуць, крычма крычаў яго таварыш, калі ўбачыў, што матацыкл ляціць у дрэвы».

— Го-о, шафёрка, пачакай! — усунуўшыся ў пярэднія адчыненыя дзверы, ускрыкнула старая кабета ў залаціста-зялёнай хустцы і перапыніла Самцовы ўспаміны. — Я зараз гукну, бо нібы беспрытомныя яны. — І, павярнуўшыся да жанчын, што стаялі на абочыне шашы,

галосна паклікала: — Вера, ці чуеш, аўтобус чакае!

Шофер уважыў — матор глухавата вуркатаў на пустых абаротах. Тры знябожана-смутныя постаці, азіраючыся назад, на паваротку чорна-графітнай шашы, няспешна ішлі да стомленага аўтобуса.

Вышэйшая сярод іх, пэўна, Веранічына дачка, якую Гэнрык Самец бачыў упершыню, стройная паставай, далікатная з твару, прыгадвала яму маладую, яшчэ не замужнюю Вераніку, у якую ён, шаснаццацігадовы юнак, нагледзеўшыся ў местачковым чыгуначным клубе трафейных фільмаў, трохі быў закаханы і якую прымаў за галівудскую кіназорку. Яна і праўда, сваім харавством, тонкімі рысамі бялявага твару, мяккай, далікатнай гутаркай і зычлівымі, узнёслымі адносінамі да яго вылучалася сярод усіх вясковых дзяўчат, якіх ён за іхнюю прастату і грубаватасць вельмі недалюбліваў. І як ён шкадаваў, калі яна выйшла замуж сюды, у няблізкую вёску з мілай, паэтычнай назвай Дольная Рута, за гарбаносага, цыганіста-смуглявага гарманіста па мянушцы Чмель.

Гэнрыка Самца, як і ўсіх яго равеснікаў, хто скончыў школу і выстараўся пашпарт, неўзабаве закруціў і панёс тагачасны вір невядомага, але зваблівага жыцця, — усе ўцякалі з глухое, збрыднелае і беднае вёскі, з разбэрсанага калгаса ў непрыветна-чужы, невядомы горад, тады яшчэ неадбудованы, з шэра-мурзатымі руінамі спаленых і разбітых дамоў у пустых вачаніцах дзвярных і аконных прой-

маў. Пасля нізкай, атуленай ліпучым, як павучына, поцемкам недабудованай хаты з двума аконцамі, адным ложкам і дашчатым мулкім палком пры печы, дзе спаў звычайна ён, пасля шара-саламянай нуднай і вусцішнай вёскі Гэнрык ачуціўся ў людным, але нечакана самотным горадзе, у чатырохпавярховым інтэрнаце, дзе згодна жылі ўсе разам — і выкладчыкі і студэнты, у светлым пакоі з васемнаццаццю гнутымі з паласавога жалеза нізкімі ложкамі.

Там, у прыцемненай вясковай хаце з мулкім, нават не засланым саломаю дашчаным палком, спадзяванняў ні на што не было, тут жа, у гаманкім інтэрнаце, дзе дураслівыя студэнты шуткавалі адзін з аднаго і дзе гэтыя жарты і хіханькі канчаліся кулакамі і чырвонай юхай, ціхаму, сарамяжнаму Гэнрыку Самцу, што стоена ляжаў на нізкім ложку з парванаю, шчэпленаю з металічных кручкоў сеткаю, думалася пра ўсё ўзнёслае і светлае, што мае спраўдзіцца. Якая ж, зрэшты, шчаслівая маладосць у сваім памкненні і парыве да патаемнае і зваблівае будучыні. Але як негадана і паіншаму складваецца жыццё. Мурлаты абібока, гультаяваты студэнт непрыкметна, слізкім вужом выпаўз наверх і зрабіўся ганарыста-важным, непадступным начальнікам, шумлівы штукар і весялун, знакаміты інстытуцкі сэрцаед ціха і бясследна знік, той-сёй заўчасна і ўжо назаўсёды пакінуў гэты свет. Як усё, зрэшты, празаічна і сумна скончылася.

Праз усе доўгія гады, што склалі ўжо цэлае жыццё, Гэнрык усё радзей і радзей наведваўся

дадому і ўсё радзей бачыўся з Веранікаю, кожны раз заўважаючы, як прыкметна і значна мянялася яна: спярша ў зграбную маладзіцу, потым у прывабную раздабрэлую кабету і вось нарэшце — у сутулаватую немаладую жанчыну з пажоўклым, звялым тварам. «Каб любіць сталую кабету, трэба помніць яе маладою» — Самцу прыгадваўся нечы афарызм, і ён з крыўдаю, але мусіў пагадзіцца, што старасць жорсткая і неміласэрная, і старога, папраўдзе, паважае і цэніць толькі стары.

Узрушаны і ўсхваляваны Самец зажмурыўся, у скрусе і страху, ужо думаючы пра сябе: «А як жа ж выглядаю я? Як глядзяць і ўспрымаюць мяне тыя, з кім я не бачыўся па дзесяць ці дваццаць гадоў, хто помніць і ведае мяне маладым? Няўжо з каламутнай глыбіні часу я выплываю да іх дзіўна пачужэлым і пастарэлым незнаёмцам?»

Узбуджаючы сябе гэтымі нервова-страхатлівымі думкамі, Самец намагаўся, але не мог не глядзець за цьмянае закурэлае акно, за якім да аўтобуса набліжаліся тры чорныя постаці.

— Людцы, дайця ж зайсці! — высокім голасам гукала вастраносая кабета ў квяцістай хустцы з залацістым адлівам, торачы месца сабе і тым траім.

Панура-маўклівыя пасажыры нехаця паціснуліся ў глыб салона. Матор за спіною ў Самца ржава і надрыўна завуркатаў, набіраючы абароты, аўтобус скалыхнуўся і, асядаючы на задні мост, з цяжкім жалезным скрыгатаннем і рыпам скрануўся з месца, — за ва-

рухлівай, што танютка затрымцела, і цьмянай, як сілікатны клей, шыбай паплылі зноў зеленавата-чорныя камлі векавечных дрэў.

І Самцу нават убачылася, як на іх ляціць, узняўшыся ў паветра, чырвоны матацыкл з двума праставалосымі, без шлемаў, хлопцамі і вецер прылізвае іхнія валасы... Ад жаху ён нават заплюшчыў вочы, а калі адкрыў іх, то ў далечыні салона, каля шафёркі, у прагале паміж чужых плячэй, прасвечаных сонцам жаночых валасоў, мужчынскіх кепак убачыў жаўтлявы спакутаваны твар, абрамлены чорнай жалобнай хусткай з вострым чубком, з-пад якога бялела пасма сівых валасоў. Твар быў спакойны, нават урачыста-задуменны, вочы глядзелі ў сябе і нешта толькі сваё бачылі. Сашчэмленыя, як у малітве, рукі на вышыні грудзей трымалі круглы, падобны да амялы, сівавата-зялёны, нібы аплецены павучынай, просты і наіўны букецік сціплых кветак. Значыць, з дачкою і ўнучкаю яна едзе яшчэ на адну магілку ці пахаванне.

«Хто ж памёр?» — Самцова сэрца сутаргава тузанулася ў схаладзелай роспачы. Але ён застаўся сядзець на праваленым мулкім сядзенні: ці чэрствая разважнасць, ці чаканне нечага яшчэ больш страшнага неадольна і моцна прыціснулі Самца да сядзення, не даючы падняцца і падысці да шафёрскай кабіны, да Веранікі. «Досыць ужо смерцяў! Досыць! Для мяне ўжо ўсе памерлі. Перад чорнай стромай, на краі абрыва стаю толькі я. Засталася хіба толькі мая смерць, — у гарачай і нейкай вар’яцкай запальчывасці кіпелі Самцовы

думкі. — Але чаму, уласна, я так баюся смерці? Паміраюць жа ўсе, ніхто не вечны. Адышлі бацькі — чарга за мною, тым больш, што самы старэйшы ў сям'і застаўся я. Гэта будзе несправядліва, калі пачнуць паміраць маладзейшыя. Як, напрыклад, у яе, у Веранікі. Але ж тут смерць гвалтоўная і заўчасная... Зрэшты, кожная смерць, якою яна ні была б, — гэта страта неабдымна-велічнага чалавечага свету, за якім ужо пачынаецца цёмная і неразгаданая бясконцасць».

Ціхім украдкам Самец зноў зірнуў уздоўж салона, на шафёрку, каля якое шчыльна сціснуліся пасажыры, але Веранікі не ўбачыў — чужыя спіны і галовы закрывалі яе бяскроўны, спакутаваны твар, яе жалобную чорную хустку і той сціплы, падобны да набэрсанай павучынкі, букецік невядомых Самцу кветак.

Цяжка асядаючы на заднія колы, натужліва вуркочучы і чадзячы гарам, які зацягвала ў салон, аўтобус выпаўз на груд да шарага нежывога дуба з выпаленым камлём. За дубам, навотлі ад шашы памірала чорная адзінокая хата без хлява і гумна, акружаная па-старэчы прыгнутымі яблынямі, а далей ужо — раскалыханым жытнім палеткам. Да чорнай недагледжанай хаты, падцягваючы адну нагу і абапіраючыся на кіёк, клыпаў нямоглы мужчына ў злінялай блакітнай кашулі. Чорная, ababітая толлю хата з угнутаю, апалаю страхою, што звекавала тут, на хутары, як падтоплены карабель, усё глыбей і больш, нават, здаецца, увачавідкі, асядала і танула ў бязмежнае жытняе мора.

«Якая самотна-непрытульная старасць, — падумалася Самцу, — але як не лёгка і як не проста дажыць да гарэхавага ці ядлаўцовага кійка, якім адзінокі чалавек у блакітнай выцвілай кашулі мацае перад сабою затравелую дарогу».

Перад лесам, што паўкругам пачаў абдымаць шашу, аўтобус падняўся яшчэ на адзін грудок і ўжо з яго далечыні Самцу выразна ўбачылася чорная аселая хата з белымі аконнымі ліштвамі. Да яе нават не спяшалі адзін за адным шарыя слупы з пражаю ледзьве прыкметных чатырох правадоў: зверху — электрычныя, знізу — радыёсеткі. Значыць, у чорнай хаце з белымі, нядаўна пафарбаванымі ліштвамі ніколі не было ні электрычнай лямпачкі ў чорным патроне пад рассохлаю балькаю, ні каляровай скрынкі рэпрадуктара на палічцы, прыбітай да сцяны між вокнаў.

«А, можа, і добра, зрэшты, — падумалася Самцу, — не чуць у прыглушаным, але не выключаным рэпрадуктары ні даўнейшых паведамленняў пра пасяджэнні палітбюро і высокія надоі малака, ні сённяшняга абрыдлаістэрычнага крыку дэпутатаў, ні шапялявых прафесараў, ні дзяўчатак-каментатараў з трымціва-пісклявым голасам лялькі. Аднак, як жа ж дзіка і непрытульна жыць у спрадвечнай цішыні і гаротнай адзіноце. Дзіўна, але чалавек прывыкае да натужлівага гуду машын, рэзкага і віскслівага скрыпу іхніх тармазоў, жалезна-звінючага грукату электрычкі ў чорным тунэлі метро, да гарачай духаты і цеснаты ў людных аўтобусах, да абыякавых паса-

жыраў, іхніх затоеных вачэй, што глядзяць міма цябе, да іхніх скрыўленых і сцятых у горкай балючай міне твараў, іхніх цяжка і панура апушчаных насоў. Але з іншага боку, як можна выцерпець, пераЖыць, перанесці гэтую вар'яцкую мітусню, злосны чалавечы вір і мурашнік?

Самцу на памяць выплыла ўчарашняе, ужо далёкае адсюль метро, калі на станцыі з дзікавата чужою назваю «Пралетарская» рослыя, сыта адутлаватыя хлопцы, адчыніўшы наросхрыст цяжкія шкляныя дзверы, не прытрымалі іх і яны з усяго размаху паляцелі на Самца. Балазе першы і самы моцны ўдар прыйшоўся па дыпламату, а потым — па руцэ. А яна, гэтая джынсавая басата, па-блазенску здзекліва рагатала. І потым яшчэ, не зважаючы на пасажыраў, на іхні злосна касаваты зірк, дзеразавалася і папіхалася ў вагоне.

І Самец учуў такую помслівую нянавісць, перамешаную з крыўдаю і адчаем да няголеных, з доўгімі, перахопленымі гумкаю на патыліцы каўтунаватымі валасамі рослых, адутлаватых дзецюкоў у сінявата-выцвілых, патрэпаных джынсавых касцюмах, да іхняга маладога сытага рогату, што, здаецца, зненавідзеў не толькі сябе, а ўвесь навакольны свет. А потым ужо, адышоўшы і ачахнуўшы ад злосці, дакараў і папікаў самога сябе. Бо гэта было, мусіць, не толькі помслівая злосць і крыўда, а нешта агіднае і брыдка-старэчае, тое, чаго ён, Самец, раней не ведаў і не адчуваў. Адначасна гэта была ўжо крыўда на сваю безабароннасць, бясконцую тугу і адзіноту.

«Няўжо я так незаўважна пастарэў? — Самец нават прыўзняўся на крэсле, няўцямна і неасэнсавана азіраючы пасажыраў і нечакана спыніўшы свой зірк на паўнявай ружовашчокай дзяўчыне з наміткаю цёмнага пушку пад курносым, задзірлівым носам. — А мне ж, як маладому, падабаецца гэтае круглявае дзяўча. Хоць не, тут ужо не маладосць: маладзейшых звычайна прывабліваюць старэйшыя раздабрэлыя кабеты, а пасівелых мужчын спакушаюць найбольш малады дзяўчаты ці сыценькія, яшчэ не звялыя маладзіцы».

У Самцовай памяці ўжо з далечыні пазалеташняга года выплыў яго знаёмы, выкладчык інстытута, гісторык, з якім яны ішлі міма студэнцкага інтэрната, узіраючыся на грумадкі борздых, жвава-вясёлых дзяўчат, што апярэджвалі іх, і тады пасівелы, але яшчэ па-маладому пастаўны прафесар з насмешлівым гонарам прызнаўся:

— Паверыш ці не, а я ж яшчэ заглядаюся на дзяўчат. Помніш, у даўнейшай вёсцы такія, як я, сямідзесяцігадовыя дзяды ўжо на печы косці грэлі ці ўлетку сядзелі на прызбе, акрыўшыся кажухам.

І яго, гэтага інтэлігента-паважанага, разумнага дзеда, што заглядаўся на студэнтак, з леташняй восені няма. Паехаў слатою на дачу і, каб запаліць грубку, пайшоў па дровы ў хлеўчык і там ужо ўпаў з бярэмем дроў...

Мусіць, праўда, што нас падцікоўвае і вартуе смерць там, дзе мы яе найменш чакаем. І як трэба быць гатовым да яе штодня, а кожны пражыты божы дзень лічыць за ра-

дасць. Асабліва тады, калі табе за пяцьдзесят.

«А, можа, і грэшна, і зарана ў гэткія гады думаць пра тое, што немінуча прыходзіць само? Аднак, і страшна, і вусцішна ад таго, што яно немінуча. Хоць праўду кажуць, хто доўга пакутуе, вінаваты ў гэтым сам, — неяк ужо занадта няпэўна суцяшаў сябе Гэнрык Самец. — Не трэба толькі чужым розумам мераць навакольны свет, найперш варта жыць дзеля самога сябе і сабою ацэньваць пражытае».

На новай, пераключанай хуткасці аўтобус тузануўся і ржава, натужана заскрыгатаў: у салоне нечакана прыцямнела — на галовы і на плечы пасажыраў раптоўна хлынуў і вадаспадна паплыў сінявата-бэзавы цень. Завальваючыся на адзін бок і прыціраючыся да абочыны, аўтобус уехаў у лес. На закругленні, тручыся аб падлесак грабу і гарэшніку, шаша стрымгалоў спадала ў лагчыну.

Смуродзячы сіняватым дымам, што нізка вісеў і не разыходзіўся тут, у лясным зацішку, насустрач аўтобусу паўзлі цяжка наладаваныя грузавікі і між іх абсэсам высоўваліся на абгон настырныя легкавыя машыны.

— Во лезуць, — прагудзеў у Самца над галавою густы мужчынскі голас.

— Шукае галава гуза, — у тон яму адказаў слабейшы і хрыплаваты.

— А ты думаеш, цяперака смерці баяцца? — зноў адазваўся той самы густы голас. — Вунь колькі маладых мужчын вешаюцца, рукі на сябе накладаюць.

— Чаму толькі мужчыны? — запярэчыў слабейшы, хрыплаваты. — Надоечы з пятага

этажа дзяўчына выкінулася... Семнаццаты гадок ішоў.

Сцяўшыся, уцягнуўшы голаў у плечы, Самец слухаў страхотлівую гутарку, ад якой па спіне трохі пацягвала шорсткім марозам, і ўспамінаў сваё — тое, што здарылася тыдні тры назад у іхнім чатырнаццаціпавярховым панельным доме, які ён за заўсёдны бруд, пабітыя плафоны, паскручваныя ў калідорных дзвярах ручкі і падпаленыя, абгарэлыя паштовыя скрынкі страшна, нават з неадступнай помстай ненавідзеў.

Ды за што можна было любіць свой дом? За два маленькія, як камора, пакойчыкі ў кватэры з сумешчанай ваннай і туалетам і цэментнай падлогай, накрытай шара-сiняватым, пад колер ліверу, халодным лінолеумам. У дадатак, паверхам вышай, якраз над Самцом, нехта адчыніў майстэрню — рабіў на заказ рамы, якімі цяпер усе пачалі застаўляць лоджыі, — і зранку да вечара, асабліва ў святнія ці нядзельныя дні, не сціхаў грукат дошак, шоргат пілы, стук малатка і звінючы, што ўпіваўся і пракручваў, здаецца, голаў, гук электрадрыля. Наогул, у доме што-небудзь адбывалася: то абкрадалі кватэру, то спрабавалі згвалціць дзяўчынку-падлетка, то білі міліцыянера, падпільнаваўшы на цёмнай лесвіцы і зацягнуўшы яго ў закутак за смеццепровад... А на гэты раз здарылася найгоршае: у той самай кватэры, што была над Самцом, выбіўшы шыбу ў зашклёнай лоджыі, разам са звінючым шклом на асфальт каля жалезнага круга санкалодзежа ўпала суседава жонка. І трэба ж было на гэтую несу-

цешную бяду, спусціўшыся раненька яшчэ незасмечаным ліфтам, натрапіць яму. Праўда, пад панельным казырком на масіўнай лаўцы, дзе ў вечаровым поцемку дурэла і дзеразавалася гарадская басота, тым асыратавым ранкам ужо сядзелі старэнькія кабеты, што першымі займаюць чаргу ва ўсіх харчовых магазінах. Самец найперш і пачуў іхні сіплаваты роспачны крык.

А потым зірнуў туды, куды паказвала жаўтляваю дрыготкаю рукою адна з гэтых дзвюх, пасінелых ад ляманту кабет, — каля ржава-чыгуннага круга, у лужыне распырсканай цёмнай крыві адзетая ў байкавы чырвонаквяцісты халат плазам ляжала суседава жонка. Халат неяк нядобра падвярнуўся на ёй, паказваючы сінявата-белыя ногі... Лепей, каб ён гэтага не бачыў. Уражліва-нервовы Самец захварэў ажно сам. А пазаўчора, як ужо на новую бяду, каля таго ж іржава-чыгуннага круга, дзе нават цямнела нязмытая кроў, напаткаў вясёла-п'янаватага суседа з прывабначарнявай, але збялелай ад выпітай чаркі невысокай маладзіцы, па гадах дык годнай яму ў дочкі. Самец ажно злякнуўся ад дзіва, з гаркатой падумаўшы, што ні бяда, ні гора не асцерагаюць чалавека ад новай нягоды.

У Самца над галавою рэзкім электрычным разрадам трэснуў і зашыпеў дынамік, і з яго, ледзьве не разрываючы барабанныя перапонкі, упала ржава-драцяное трымценне гітары і хрыпаты мужчынскі голас нечакана завыў: «...снег, сне-ег, сне-ег».

Шофер чамусьці ўключыў польскую касету,

і Самец, напружваючы слых, разабраў усяго два радкі: «Як добжэ, што пшышла зіма: які сне-ег, які сне-ег!»

Ды што можна было ўчуць ды распазнаць праз трэск, разарваныя гукі, звон, свіст, лязганне жалеза, бульканне вады?

Усе цярпліва моршчыліся, гнеўна падціналі губы, але, тоячы ў сабе злосць, у нейкай сугладнасці маўчалі, — ніхто не крыкнуў, нават не папрасіў шофера, каб выключыў або прыглушыў магнітафон.

Тым часам гітара, набіраючы моц, густа і раз'юшана звінела, рэзка тромкала, і цягучы, млява, нібы сп'яна, голас сіпата выў і выў, а рот у спевака, здавалася, так глыбока раззяўляўся, што ў яго можна было кінуць абломак цэглы.

Напоўнены варам злосці, Гэнрык Самец раптоўна схамянуўся, падумаўшы, як блізкі чалавек да помсты, і досыць было нейчага слова, каб яна вадаспаднай лавінай крыку, ляманту і гневу пералілася цераз край. Дзіўна, як благое спакушае чалавека. І хапіла б, пэўна, ціха-нядужага голасу, каб увесь аўтобус закіпеў адчайным гневам і рынуўся на шофера. Але гнеўнага голасу не было, і злосць, паволі спадала, ператвараючыся ў халодна-празрыстыя крышталікі спакою.

Самцова разнерваванасць таксама зацягнулася крохкім лядком раўнавагі, і ён нават не змеціў, як у магнітафоннай прыстаўцы змяніліся, памякчэлі гітарныя гукі і плаўным вадаспадам паплыла празрыстая сінявата-ружовая мелодыя, даверлівы і мякка-чуллівы муж-

чынскі голас адзінока спяваў жалосную песню, што шчымлівым і замілаваным смуткам атуляла душу, і Самец ужо ляцеў, выпярэджваючы аўтобус і ўздымаючыся ў сваім уяўленні над уладарна разложыстымі дубамі з тоўстымі, пакручастымі, як пітоны, замшэлымі лапамі, над залаціста-цёплымі соснамі, што спадалі на шашу сіва-зялёнымі кучаравымі галінамі, над панурымі і ацяжэлымі смарагдавымі елкамі ў вянках ружаватых, яшчэ няспелых шышак, над усім густым і высокім навалам лесу ў бэзава-сіняватую халодную далечыню, і сэрца занывала ад салодка-балючага смутку, і памяць вяртала Самца ў даўнюю зіму з адлежным сіва-туманным, волкім днём, калі душа неадольна і ўладарна прагла куды-небудзь ехаць ці ісці, але знаходзіла найперш дарогу на радзімую старану. І не паспее яшчэ заднець, а ён ужо, шчасліва-сцішэлы, як зайчаня, сядзіць у сцюдзёным ранішнім аўтобусе, які неўзабаве выплываў з пасівелых ад маразі, настылых муроў горада на белы абрусовы прастор з рудымі дарогамі каля чорных і, здаецца, забытых і пакрыўджаных усімі вёсак на лагодных, спадзістых узгорках, насустрач адзінокім, пачарнелым ад старасці прыдарожным дрэвам, што заўсёды тояць у сабе загадкавую вечнасць, насустрач унуранай, соннай фурманцы з абсіверaным калматым конікам, насустрач шарай бацькавай хаце, абкладзенай ружаватымі алехавымі дрыўмі, што горка і даўка запахнуць, калі пройдзеш паўз іх, да здзіўленага тваім прыездам і зняверанага бацькі з яго незабытаю сарамяжна-

кволаю ўсмешкаю і яшчэ больш пачужэлай мачахі.

— А во — госць! — нарэшце ачуціўшыся і асмялеўшы ад нялоўкасці і замешкі, бацька падасць цвердую шурпатую руку.

Цяпер жа ён едзе да іхніх магілак, што таямніча і вусцішна маўчаць, да таго шчытнага частаколу расфарбованых агароджаў, якія наўкруга абступаюць адзінокія нахіленыя хвоі, да тых аселых капцоў пад цяжкімі помнікамі з мармуровай крошкі, між якіх заўсёды стаіць шкляны слоік з кветкамі, — іх ахвярна прыносіць мачашына каляжанка, колішняя пеўчая з царкоўнага хору.

І на гэтай светлай дарозе дадому яго нязменна страчала, як прыветная сівая кабета, прыпасваючы пры шашы карову, дзікая груша, расхінутая цэлым веерам шышкаватых, нібы калючы дрот, доўгіх галін. Зімою яна помнілася васількова-белаю ад шчодрага інею, вясною — светла ці снежна-белаю ад цвету, улетку — смарагдава-зялёнаю з серабрыстым, цьмяна-сухаватым водсветам густога лісця.

Самец сутаргава прыпадняўся, каб убачыць зноў яе, прыветна разложыстую дзічку трохі на водшыбе за старавечнымі панура крывымі дубамі. За дуброваю ўжо, як скінуць вокам, адкрыецца непарушаны залацісты збожжавы прастор з вёскамі, што нібы спачываюць у ім, закалыханыя шэптам жыта, а потым астатні груд з трыножкаю маяка і трыма лабатымі валунамі, папраўдзе падобнымі да наетых крутабокіх валоў і чалавека. Самцу нязменна ўспомніцца свая вясковая легенда, што валоў і чала-

века, які выйшаў на вялікдзень араць, Бог ператварыў у каменні. Яны і відаць пад трыножкаю маяка на макаўцы гары: два крутабокія, прадаўгаватыя — гэта валы, а наводдаль выкрышаным абломкам падымаецца трэці, — ён, чалавек.

І як рэзка, парывіста Самец прыўзняўся на праваленым крэсле, так імгненна і асеў: уздоўж шашы на светлай шыракаватай і, здаецца, бясконцай высецы ўпокат ляжалі зваленыя і ўжо ацярэбленыя, там-сям нават парэзаныя на двухметровыя калоды векавечныя і магутныя, як Лаакаоны, шурпата-карэлыя дубы, якімі ён так зайздросна, што яны яшчэ зберагліся, і ганарліва любаваўся. А паміж шарых дубовых калод дзе-нідзе паблісквалі і ільсніліся мядзяна-ружовыя палены гэтак жа ж гвалтоўна і нялітасціва зрэзаных хвояў, заўсёды і ўсюды блізкіх і па-свойску даверлівых сваім мяккім, знаёмым змалку цёпла-рахманым шэптам. І нібы ў жалобным заломе ўздымала зялёныя галіны і балесна схілялася над усёю мёртваю лядаю адзінокая, што цудам уцалела, гонка-танюткая елка.

«А дзе ж яна, дзікая груша, што заўсёды па-моладу цвіла і красавала перад лесам?» — зноў прыўзняўся і дрыготка злякнуўся, быдта падаючы ў ваду, да непрытомнасці ўзрушаны і ашаломлены Самец.

— О-о, як спляжылі — і не знайся! — упапад Гэнрыку Самцу басавіта гукнуў шырокі мужчына ў чырвонай, з белымі клеткамі, байкавай кашулі, што ўчэпіста трымаўся за поручань і вісеў над Самцом. — А па радзіве ўсё

трубяць, што берагуць прыроду, ці, як грыцца, экалогію.

Самец нават здумеўся, што немаладому мужчыну з цяжкім адвіслым падбароддзем і дужаю валасатаю рукою знаёма сучасная тэрміналогія.

«А дзе ж яна, груша-дзічка?» — косячы вачмі і ажно ломячы зрок, Самец напружана глядзеў, як за пыльнаю, трымціва-дрыготкаю шыбаю адплывала пустэльная, усланая нежывымі дрэвамі, смутная, быдта магільнік, высека, і намагаўся пазнаць, дзе, пад якімі калодамі ляжыць бязлітасна-жорстка зрэзаная дзікая груша, што, чуйна распасцёршы доўгія галіны, калісь чаравала і прынаджвала яго сваім светлым, нібы жаночым, хараством.

Шыба нарэшце перастала раздражнёна дзынкаць — аўтобус, сцішаючы ход, як недалужны дзед, пачаў хіліцца на абочыну, каб перадыхнуць. Высека скончылася, і да шашэйнай канавы, падкрашанай ліловым чаборам і белым крываўнікам, густою гарачаю лавінаю падышло шапаткое, як устрывожаны мурашнік, хоць тут, у аўтобусе, і не было чуваць, ужо ацяжэлае ад налітых зярнят і запалавелае жыта. Тую мясціну, дзе на заберзі лесу красавалася дзічка, аўтобус мінуў, і Самцу ажно балюча засмактала пад сэрцам, — здавалася, ён мінуў і страціў найдарожшы кавалачак свайго жыцця.

У зраджайна высокім жыце патанула і заблудзілася палявая дарога. З-за васкова-карычневага грудка, узняўшы свае цёмна-зялёныя кроны, нібы падступіўшыся на пальчыкі, нека-

га вызіралі і выцікоўвалі старыя прысады, — там, як помнілася Самцу, была вёска, што называлася па-агароднаму зялёна і наіўна, — Лапушанка.

Аўтобус заскрыпеў і закалыхаўся — цераз абое дзвярэй пярэднія і заднія, на падсыпаны бардзюр, які падпіраў выкрышаны слуп з белым шчытком, саскоквалі расчырванела-млявыя пасажыры.

У жанчыне, што стаяла ўжо на палявой дарозе спіною да аўтобуса і папраўляла на галаве жалобную чорную хустку, Гэнрык Самец зноў угадаў стрыечную сястру Вераніку.

— Куды ж яна?.. Хто ж там памёр? — Самец міжволі пацягнуўся да акна.

І, нібы ўчуўшы яго бязгучны грудны голас, Вераніка ўважліва абярнулася і, змружыўшы вочы, зіркнула сюды, на аўтобус: на міг яе позірк застыў якраз на тым акне, да якога прыхіліўся зніякавелы Самец.

І гарачы вар сораму і вінаватасці абліў усяго, што ён не памкнуўся праціснуцца да дзвярэй, не пагаварыў з сястрою ды нават па-чалавечы не павітаўся, а баязліва і затоена сядзеў, не хочучы выдаваць сябе, не хочучы ведаць яшчэ пра адну смерць.

Вераніка, трымаючы аберуч сціплы павуціністы букецік з дробных, як макрыца, кветак, чакала дачку і ўнучку, што замарудзілі, выходзячы з аўтобуса. Дачка выдавала спакутаванай, сутулена-схуднелай, як зблажэлаю здавалася і танютка цыбатая дзеўчына з мілым, прыгожым тварком, абвітым кольцамі светлых кучаравых валасоў.

«Ці не з Лапушанкі быў родам зяць Веранікі? — пачаў здагадвацца і аціхаць душою Самец. — І, напэўна, сёння нейкая гадавіна яго смерці».

Зачыніўшы складныя ржава-рыпучыя дзверы і чадзячы ў салон бензінавым перагарам, аўтобус канвульсіўна турзануўся: за вокнамі паволі паплыў, закружыўся ружавата-залацісты, прасвечаны сонцам, абшар жыта з першаю, крута загнутаю, нібы марскою, хваляю, што набягала на глеістую дарогу ў закіслых лужынах і на пасажыраў, што спыніліся на ёй у нерашучым роздуме. І там, сярод лёгкіх летніх хустак і касынак, вязаных шапачак-каптурыкаў і кучаравых пышных валасоў нейкім непатрэбным, лішнім горам чарнела цяжкая жалобная хустка Веранікі.

Клейка шапочучы коламі на залітай тлуста-блішчастай смалою вузкай шашы і секучы, як градам, па днішчы пасыпаным дробным гравіем, аўтобус няспешна аддаляўся ад чорствай, у сініх лужынах, палявой дарогі, ад Веранікі, што, угнуўшыся, стомлена і цяжка, уваходзіла ў ружавата-васковае, прасвечанае сонцам жыта, ад спадарожных пасажыраў, што, мільгаючы хусткамі, светлымі валасамі, кепкамі і чупрынамі, спускаліся ў нябачаную лагчыну.

«Вось так і мы аддаляемся адзін ад аднога, несучы кожны ў сабе сваю помсту ці літасць, злосць ці спагаду, разыходзімся спярша на палявой дарозе, потым у ад’ездах, замустве ці жаніцьбе, нарэшце — у труне і ўжо назаўсёды», — Самцовыя думкі, раскалыханыя аўтобусам, то рваліся, то звязваліся ў шнурок ней-

кай высновы, покуль памяць зноў не высвеціла бацьку і зноў у тую ж астатнюю восень. Ён стаяў з торнікам у руцэ сярод двара, зацярушанага ружаватымі алехавымі стружкамі, пры парозе горбаю ляжалі абструганыя клёпкі.

Бацька, давольны, шчасліва-радасны, як малое дзіця, што знайшло нарэшце цікавую назвыклую забаўку, па-блазенску пахваліўся:

— Сам з сябе навучыўся і ні ў каго не пытаўся... Кадушку вунь зрабіў, балею папраўляю і на сялёдзеўку клёпкі гатую.

Ён прыгнуўся і падняў ружаватае, ачэсанае сякераю паленца: — А на кадушку клёпка ў ніжнім канцы шырэйшая... Шкада, што нямашука дуба. Але ўжо напытаў — куплю дубовую калодку... Даўшы бутэльку, можна расстарацца.

Уражаны бацькавым стараннем, Гэнрык шчыра здзівіўся: нашто чалавеку на схіле гадоў гэтыя кубельцы, балеі, кадушкі і сялёдзеўкі, як даўней называліся малыя бочкі? А сёння, ужо з далечыні часу, разумее: бацька збіраўся жыць.

А праз тыдні тры пасля гэтай сустрэчы з бацькам Гэнрыку прыйшла тэлеграма — якраз у часе яго звароту з таго нязвыклага, першабытнага Нукуса. Не, спачатку быў званок з пошты. У трубцы пачуўся, як здалося, абыякавы, хрыплавата-пракураны мужчынскі голас: «Шукаем вас другі дзень. Тут вам тэлеграма, але ўкінем у паштовую скрынку заўтра, а цяпер толькі прачытаем. Паслухайце: «Умер отец. Приезжайте. Ваш сосед».

Назаўтра Самец дастаў з паштовае скрынкі

тэлеграмны бланк з цёмна-блакітнаю палоскаю і трыма чорнымі радкамі адрасу і ўжо знаёмага, прачытанага хрыпатым голасам тэксту, які прабег вачыма ажно двойчы, чуючы, як шчыміць і млее ад гарачыні сэрца.

І ён паехаў, сазваніўшыся са знаёмым інжынерам, у якога быў саржавелы, ужо ледзьве жывы «Масквіч». Перад Баранавічамі на вузкай паваротцы на Мір, недзе перад самым ужо замкам, уехаўшы ў хмару густога ліловага туману і мінаючыся з грузавіком, што асляпіў іх, «Масквіч» выскачыў на вялікае ці не пяцітоннае кола дарожнага катка. Самец, згледзеўшы на абочыне шашы нешта чорнае, нават не паспеў ускрыкнуць «стой!», як інжынер усё ж ускораў выруліць машыну.

Сапраўды, за смерцю нас чакае смерць.

Успомніўшы тую прыгоду, Самец глыбока здрыгануўся: адзін Бог ведае, як ён тады застаўся жывы.

Дома ж нечаканае дарожнае здарэнне перабіла ўсё тое, што пачуў ад суседзяў. Надвячоркам бацьку з бярэмем дроў яшчэ бачылі ў двары. Але як ён апынуўся ажно за пяць кіламетраў ад дому, нават маючы пры сабе сякеру, і чаму памёр каля кладачкі ў вусці, дзе ў рэчку бяжыць крыніца і дзе яго ўжо знайшлі, дзякуй Богу, на другі дзень, ніхто дакладна сказаць не мог.

Псіхіятары кажуць, што прадчуваючы хваробу альбо смерць, старыя людзі не раз сыходзяць з дому. Але чаму ж ён і словам не абмовіўся пра гэта?

Нервова і балюча скрыпнуўшы жалезам,

аўтобус нібы прыпыніўся перад глыбокаю спадзістаю лагчынаю і ўжо ціхенька, без нуднага раздражнёнага вуркатання мякка пакаціўся, нібы паплыў, у лагчыну да зялёнага алешніку і прытоенай у яго цяньку крынічна-халоднай рэчачкі. За лагчынаю, на пагорыстым даляглядзе ў пазалоце спела-ружовага жыта, што падыходзіла да залітага нерухомаю, як асенняя вада, смугою далёкага лесу, светлымі плямамі выступалі новыя будынкі забытых і незабытых Самцу вёсак. І туды, да іх, пэўна, па асфальтнай стужцы палявое дарогі марудна бег ледзьве бачны за жытам кароценькі аўтобус.

Самцова сэрца, нібы ён падаў з вышкі, зашчымела даўняю, успомненаю святочнаю радасцю: наўкруга быў сіні прастор, поўны густога, што нібы чулася на вобмацак, сонечнага святла, ласкава-прыязнага неба, цёмна-блакітнага ў зеніце і святлейшага ці зеленавата-бялявага на небасхіле, і адначасна нешта адчужана-незнаёмае, амаль чужое было ва ўсім наваколлі без даўнейшых старых дрэў, што помніліся з падлеткавых гадоў, без жоўта-пясчаных палявых дарог, зарослых круглымі, як царкоўныя купалы, мяккімі ядлаўцамі, без шэра-саламяных хутароў з даверліва прытуленымі да іх садкамі. А заміж іх у затопленых бэзаваю смугою далінах серабрыліся, пабліскавалі ацынкованаю бляхаю паўкруглыя ангары, якія ўжо нагадвалі тлустых кольчатых вусеняў. Праўда, серабрыстых ён не бачыў, а толькі зялёных з кароткім і пагрозліва загнутым рогам.

Наперадзе зноў жа, як адзінокі стражнік, упарта стаяў вышынны комін з жаўтлява-едкім грыбком дыму над ім. Яго падпіралі дзве вузкія, нападобе гарадскіх маналітаў, канто-вые каробкі, наўкруга якіх у цярплівай цеснаце збіліся крамнёва светлыя цагляныя асабнякі з вострымі ромбамі зыркіх бляшаных дахаў. За імі, нібыта таўставатая кегля на тонкай ножцы, высунулася чырвона-ліловая старая вадакачка, і ўздымаў двухскатны чарапічны дах таксама даўнейшы, яшчэ польскі будынак вакзала, — там была чыгуначная станцыя.

Калісьці, у незабытыя юначыя гады Гэнрык Самец любаваўся гэтым светлым, прываблівым будынкам, што нібы знарок ганарыста ўздымаў свой цьмяна-чырвоны чарапічны дах з мансардай, з белым картушом, у крузе якога стаяла лічба «1935». Заўсёды помнілася і неяк асабліва і таемна хвалявала тое, што аднога разу прыгадаў бацька: «А мы з тваею мацерою спазналіся, як будаваўся вакзал. Яна саўсім маладзенькаю была, лічы — падлетак, падвозіла мулярам рошчыну, а я з кар'ера, з жвіравіска, пясок на тачцы вазіў. Тады спазналіся, а праз два гады пабраліся. Во як было...»

Як жа ж захапляла яго, падлетка, гэтая невялікая, на адзінаццаць пуцей чыгуначная станцыя з цяжкімі адвесамі і ліхтарамі каля стрэлак, з двума жураўлямі водакалонак, з масляна-чорнымі і, здаецца, заўсёды задыханымі, у срэбных скалках вады паравозамі каля іх, з адзінокімі вагонамі пад навесамі складаў і пакгаўзаў. І ўсяго адным, калі не лічыць пры-

гараднага, недагледжана-разбітага, заміж лямпачкаў са свечкамі ў незашклёных ліхтарах, прыгожым цёмна-сінім кур'ерскім цягніком, што спыняўся тут на хвілін восем, найбольш, каб прапусціць цяжкія грузавыя саставы, якія засыпалі наваколле і станцыю чорным пылам, — з Польшчы цугам ішоў сілезскі вугаль. А туды, у Польшчу, як помніцца Самцу, у доўгіх саставах, што складаліся з цяплушак, уквечаных зялёным бярозавым веццем і польскімі чырвонымі арламі, намалёванымі на лістках паперы, вярталіся спакутаваныя, схуднелыя і ўсе нейкія занэнджаныя польскія сем'і. Але ж у таго-сяго з мужчын над гарбатым носам ганарыста і зухавата сядзела дзюбатая рагатыўка альбо, праўдзівей, канфедэратка — шапка з квадратовым верхам — неадлучны сімвал польскага войска.

У Самцовай памяці ізноў паўстаў худзенька-зблажэлы твар і шарыя, поўныя таямніцы вочы Петрыка Гранкоўскага, а потым учуўся і той даўні гарачы шэпт, калі яны аднойчы падышлі да доўгага чырвона-цаглянага саставу:

— Ты ведаеш, я хаджу тут ужо трэці дзень...

Петрык тады ўважліва зіркнуў гэтымі шарымі задумлівымі вачмі і, паўхвіліны счакаўшы, нарэшце прызнаўся:

— Прашуся, можа ў які-небудзь вагон возьмуць мяне. Ты чуў ці не, а Казік Казакевіч, кажуць, упрасіўся і паехаў. Праўда, там былі свае, што з нашых вёсак.

— А гэтыя недзе ажно з Сібіру варочаюцца. Гэтыя не бяруць. Каб свае...

Няўжо, прадчуваючы сваю блізкую смерць, Петрык Гранкоўскі ўцякаў у невядомы для яго свет? Нібы блізкі зазімак, што гоніць у вырай ацяжэлых, стомленых жураўлёў, Петрыка гнаў чэрствы смутак і неперажытая крыўда. Ён нават таямніча-даверліва прызнаўся Гэнрыку Самцу: «Ты не ведаеш, як мне збрыдзеў дом, гэты бежанец, што прыбягае да маці. Ён жа ж нейкі нехрышчоны, бо гаворыць: «не — я пайшоў, а мая пайшла».

Здзіўлены і ўражаны пачутым, Гэнрык, як ніхто, мусіць, разумеў адзінокага, чуйнага да няпраўды Петрыка і таму іншы раз жорсткага за сваю крыўду да іншых, але пра тое, што сам можа яшчэ больш ненавідзіць сваю хату і мачаху, цярпліва і ўпарта маўчаў.

Але Петрыкава крыўда, як імгненна разлівалася, так імгненна ападала, тачылася, як вада ў пясок. І шэрыя задумліва-патаемныя Петрыкавыя вочы раптам вясёла падміргнулі Гэнрыку:

— Ідзем, убачыш, як адпомшчу гэтаму нехрысцю.

Петрыкава рука, шмыгануўшы ў кішэню, дастала бліскучы сталёвы клапан:

— Гэта з матора ў самалётах... Узрываецца ў вадзе, трэба толькі зрабіць дзірку. А тады пастаўлю каля бежанца вядро з вадою і ціхенька ўкіну гэты клапан. Бо будзе, — і Петрык, зласліва салодзенька зарагатаў, — дух вон і кішкі на ціліфон.

А Гэнрык тады чамусьці не ўважыў на Петрыкаву просьбу. Узрыў і, дарэчы, моцны, ад якога нават дробна задзынгалі шыбы ў вокнах,

Гэнрык Самец пачуў ужо тады, калі Петрык Гранкоўскі ўкінуў той клапан не ў вядро з вадою, а ў коўш ад ваганеткі, што стаяў пад вуглом школьнае канцылярыі, поўны збросненай вады. Ружовы, сыценька дагледжаны і, мусіць, занадта палахлівы дырэктар школы, што вёў якраз у іхнім класе ўрок гісторыі, вобмельгам забег у канцылярыю і пазваніў участковаму, насатаму Шчарбаку, што хадзіў заўсёды пад газам, начаставаўшыся ў вядомых местачковых самагоншчыц або адабраўшы самагонку ў тых, хто гандляваў ёю на прывакзальнай таўкучцы. Праўда, у школу Шчарбак не прыйшоў, мусіць, наперад ведаючы, што такія клапаны местачковай распусце сцішком і ўжо не раз перадавалі салдаты лётнае часці.

Гэнрык Самец, аднаўляючы ў памяці даўні пасляваенны час, тую местачковую школу, дзе ён, вясковы хлопец, беларус, які чуў толькі роднае слова і зрэдзь польскае, пішучы першае рускае сачыненне ці мо пераказ апавядання пра мора, якога ён яшчэ не бачыў, з нечувана дзікай і незразумелаю назваю «Вперед смотрящие», зрабіў несусветную колькасць памылак, — цяпер з дзівам жахнуўся, як даўно гэта было — ледзьве не паўвека назад. Ажно не верыцца, што так непрадбачліва і непазнавальна змяніўся і перайначыўся свет. Вырасла і, глядзі, ужо састарэла, маючы ўнукаў, новае пакаленне людзей, для якіх вайна і пасляваенны час здаюцца беззваротным рэхам. Яно ўжо, мусіць, не ўяўляе жывое вайны, не чуе і не перажывае той боль, які перажылі і адпакутавалі яго папярэднікі — дзяды і бацькі. Да яго

даўніна вяртаецца пераказанаю ў няпраўдзівых і фальшывых кнігах ці паказанаю ў прыгожакаляровых, выдуманых і смешных да дзікунства кінафільмах, або прыходзіць у падхарошаных байках старых людзей, якія, чым болей жывуць, тым болей выдумляюць, утойваючы тое, што яны кагосьці забівалі, катавалі, дралі скуру і вешалі. Яны ўжо баяцца пахваліцца тым, пра што расказвалі, вярнуўшыся з вайны ці партызанкі.

Для Гэнрыка Самца ўсё даўняе прыходзіць найбольш перад сном. У вечаровых бясконцых успамінах ці ў часе вось гэтакай заўсёднай дарогі дадому. І гэтая дарога не толькі дадому, але дарога да свае памяці. А ў памяці найбольш ажывае даўні, няхай і прыглушаны, але не забыты боль, адпакутаваная крыўда, нараканне ці нават няспраўджаная помста. Помста малога хлопца, падлетка, пакрыўджанага за нішто, які спадзяваўся, што калі вырасце, то абавязкова адпомсціць.

«Можа, усе людзі, як старажытныя іудзеі, верацьу такога Бога, які не ёсць, а які прыдзе, — Самцу прыгадалася недзе прачытанае, але ўжо паўзабытае, таму і не вельмі дакладнае. — Усе чакаюць на ратунак у будучым. Як жа мала чалавек верыць у сённяшні дзень і зусім не зважае, праўдзівей, вельмі мала зважае на пражытае. Але ж яно было і яно ў нечым паўтараецца зноў...»

І Самцу зноў убачыўся, выплыў з цёмнага і глыбокага віру памяці той белы чыгуначны вакзал, які ён, ужо семнаццацігадовы хлопец, падумваючы пра каханне, пра нязвыклую, не-

тутэйшую дзяўчыну, падобную да якое-небудзь кіназоркі, якую з асаблівай і шчымліва-салодкаю тугою любіў, як любіў чамусьці хмуры, мякка-цёплы асенні дзень, нават з марасістым дожджыкам, можа, таму, што пад гэты дождж найясней думалася пра будучы неспазнаны свет, да якога так ляцела, так імкнулася яго трапяткая душа. І мо таму яго звабліваў чыгуначны вакзал, дарога, шчымлівае гуканне цягнікоў... Ды ўсе амаль яго равеснікі з нейкай асаблівай урачыстасцю ці замілаванасцю паважалі вакзал — гэты светлы будынак з мансардавым дахам і круглымі вокнамі ў шчыпцах, з адзінаю залай ці, як яе тады называлі, — пачакальняй, з высокімі кафейнага колеру кафельнымі грубкамі, да якіх у зімні холад можна было прытуліцца спіною і, мрэючы ад цяпла, цікаваць, як марудна снуюць стомленыя, здарожаныя пасажыры, як упокат, адзін пры адным пад чырвонай вялікай коўдрай на шашачнай кафельнай падлозе, падаслаўшы лахманы ці зношаную пярыну, спяць цэлай сям'ёю гнаныя нейкім сваім лёсам з месца на месца беспрытульныя, але, здаецца, і бесклапотныя цыганы.

Але самая найвялікшая ўзнёслая і ўжо чаканая радасць была тады, калі на вакзале збіраліся гаманкою, па-мурашынаму неўтаймавана-кіпучаю грамадою маладзенькія, і амаль усе прыгожыя, па гарадскому прыбраныя студэнткі (хлопцаў сярод іх чамусьці не было), што высаджваліся з прыгараднага цягніка, каб ехаць ужо вузкаю калейкаю, тымі чатырма вагончыкамі, у блізкі павятовы гарадок, дзе бы-

ло, як помніцца, ажно два тэхнікумы і школа медсясцёр. Зачараваны, па-наіўнаму ўражаны Гэнрык, выбраўшы, як здавалася яму, самую прыгажэйшую з іх, постаццю і тварам, затоена цікаваў ужо за ёю адною, дзе яна ні паварочвалася б, куды ні ішла б — вочы яго былі там. А дзяўчаты, быдта чародка цвіркатлівых вераб'ёў, паўшы на спарышнік, нечакана заціхалі, па-сталаму і заклапочана займаючы чаргу каля мурзатага аконца касы, каб закампаставаць ужо білеты на «кукушку».

Праз гадзіну-другую, падхопліваючы свае фанерныя куфэркі, картонныя чамаданы з блішчастымі кантамі ці нават плеценыя карзіны з вісячымі замочкамі, яны зноў гэтакаю ж шчабятліва-гаманкою грумадкаю перабягалі ў зялёныя вагончыкі вузкакалейкі, што стаялі на другі бок вакзала пад старымі соснамі недалёка ад чырвона-ліловай вадакачкі. Яны ад'язджалі, а нечы мілы твар, погляд сарамлівых вачэй, нечая прываблівая постаць, колер залацістых валасоў, што кольцамі віліся па беражку суконнай ці вязанай пуховай хусткі, надоўга заставаўся ў Гэнрыкавых вачах, і які смутак стыў тады ў яго юначай, яшчэ леткай і крохкай, як першы неакрэплы лёд, чуйнай душы. Як яна, гэтая чуйная душа, з матылінаю трапятліваю радасцю ляцела насустрач таямнічаму каханню, дзявочай прыязні і таварыскасці. Самотны, не вельмі падкі на знаёмствы з дзяўчатамі ў тыя юначыя гады, ён нёс аднак у сваёй душы патаемны гонар і, цураючыся цёмнага, панурага і нецікавага вакол сябе мястэчковага жыцця, як стомлены, але ўпарты па-

дарожнік, неадольна марыў пра неадкрыты яшчэ кантынент свайго жыцця, вядома, нашмат цікавейшы і святлейшы, што абступаў яго.

У свае падлеткавыя і юнацкія гады мы наіўна і аддана верым не ў жыццё, што акружае нас, а ў выдуманы і выснены свет, у свет дабраты, справядлівасці, спагады і свайго чалавечага ўзвышэння. Якім па-райску агністым і залатым выдае той нязведаны, неспазнаны свет, і якое балючае, нават смяртэльнае расчараванне можа прынесці ён, калі мы яго спазнаем.

«Але ж мы ўсё роўна, як Калумбы, плывем да свайго неадкрытага кантынента», — думалася ўсхваляванаму і ўстрывожанаму Самцу ад блізкай сустрэчы з вёскаю і знаёмымі людзьмі, што з кожным разам рабіліся ўсё болей пачужэлымі і аддалёнымі.

Чадны, вуркатлівы аўтобус зрабіў нечаканы паварот, хіснуўшы яго на высокім папярочным сядзенні, што прыходзілася якраз над колам, і за трымціва-звінючымі шыбамі насустрач здзіўленаму Самцу адзін за адным пачалі выплываць светлыя сілікатныя домікі з чорнымі праймамі дзвярэй і вокнаў, з рэбрамі недакрытых кроквaў, з штабелямі дошак і пірамідамі цэглы пры іх. І ўжо нібы прыбіты і абязвечаны тым, што бачыў, Гэнрык Самец не мог яшчэ асэнсаваць і даць веры, што на яго прыцішаную, прытуленую да зямлі вёску, ужо счарнелую ад старых гонтавых дахаў, так уладна і нахабна наступала блізкае мястэчка. Высокая сцяна зялёных таполяў, што шчытнаю вартаю абступалі даўнейшы гасцінец, з аднога боку

была ўжо зрэзана — там жаўцеў насып свежага пяску, утыканага калочкамі з туга нацягнутымі белаватымі шнуркамі: ад шашы цярэз-паля да чыгуначных ангараў, пакгаўзаў і складоў адлучалася папярочка новай дарогі.

Уражаны і здзіўлены Самец ажно баязліва заплюшчыўся і сцяўся, уявіўшы сабе, як на замшэлыя валуны, на якія ён пастушком узбягаў, каб убачыць яшчэ краёк сонца, што апускалася за далёкі груд, як на чэзлы лясок, дзе пад хвоечкай, прысыпаўшы кастрыцаю і мохам, ён хаваў памятную вінтоўку, крыжам лягла папярочная дарога, ужо навечна заваліўшы пяском і гравіем жывое поле дзяцінства.

А за акном аўтобуса, засланяючы і заступаючы адзін аднога, усё кружыліся светлыя новыя дамы, што, здаецца, самапраўна, нязрушна і ўладна паўсталі на нядаўным вясковым полі, зарослым ужо здзічэлаю травою.

Балюча-нервовая і разам з тым нясцерпнаадчайная крыўда гняла і душыла Гэнрыка Самца — як усё наўкруг змянілася, пачужэла для цябе, або наадварот — пачужэў ты. Але ж калі быў той лясок, што не рос, а толькі марнеў на нішчымнай пясчанай зямлі, тыя рабавата-сівыя, замшэлыя каменні, тая праўдзівая вінтоўка, якою ён да смерці напалохаў Габрыеля Жагалу? Ажно не верыцца — сорак пяць гадоў назад. Не, нават болей, бо толькі пачалася вайна, калі ў яме, дзе капалі гліну, ляжалі пачарнелыя, набрынялыя, як горы, трупы забітых савецкіх байцоў. Яны ляжалі адзін на адным, прыкрытыя іхнімі ж шынялямі, а па

шынялях мітусліва гвіжэлі* чырвоныя жучкі-магільшчыкі і звабліва для падлетка Гэнрыка паблісквалі накрыж кінутыя вінтоўкі...

«Якое, зрэшты, беззваротнае жыццё і як гіне, знікае ўсё, расплываючыся ў бясконцай прасторы часу», — ні то вінаватасць, ні то дакор, ні то страх апаноўвалі Самца: ён ужо бачыў, што светлыя сілікатныя дамы стаяць якраз там, дзе былі ямы са смярдзюча-пачарнелымі, набухлымі трупамі.

«Дык што ж я шукаю ў гэтым жыцці, якое зараўняла даўнейшыя ямы і на чалавечых касцях збудавала новыя дамы? — у гарачай запальнасці думаў Самец. — Няўжо страчанага і забытага самога сябе ў тым далёкім і беззваротным свеце? Свае маладосці, нечага нязздзейсненага або няспраўджанага? І ці не дарэмна намагаюся я запыніць непадуладнае мне жыццё? Але, напэўна, каб вярнуў усё забытае і страчанае, якое меў бы расчараванне і крыўду, і які бы моцным і пакутным здаўся б забыты боль, і як засмылелі б загоеныя раны. Яны ж заўсёды поруч — радасць і мука».

За кантовымі слупкамі ганарыстых дамоў, збудаваных ужо на гарадскі манер — з лоджыямі, мансардамі, тэрасамі — і накрытых рыфленым шыферам, а там-сям нават сінявата-сляпучай ацынкованай бляхай, завірыў шчытны малады лясок, што намагаўся аддзяліць і асцерагчы знябожаную вёску ад неадступнага, пагаспадарску ўжо ўладнага мястэчка. За густым, неацярэбленым хвойнікам, што нечакана

* *Гвіжэлі* — мітусіліся, паўзалі, кішэлі.

абарваўся глыбокім ровішчам, пацягнулася даўнейшая стайня, пераробленая ўжо на кароўнік, бо перад ім у жардзянай загарадзі збіліся пярэстыя цяляты-пярэзімкі, пабег крыты ток, каля якога туліўся вялікі чырвоны камбайн, мусіць, — «Дон», і ржавела шматрадная сеялка, наводдаль уздымалася цьмяна-серабрыстая вежа з калючым лаўжом чорнага busловага гнязда, дзе на адной назе стаяў малады чарнадзюбы бусел. Нібы ў агорклым смутку страчаў спешныя рэйсавыя аўтобусы.

Нарэшце, імкліва замільгаўшы па-над зялёнымі прысадзінамі, пабеглі хаты з вострымі трохкутнікамі шчытоў, пафарбаваных у сонечна-жоўты, густа-сіні ці блакітны колер, а за імі ўжо, нібы з нерэальнай даўнасці, выплыла саламяная страха ў струпаватай воспе карычневага моху — змалку знаёмае суседскае гумно, з цёмнымі, павыгніванымі ўжо ямамі, у якіх балюча шарэлі спарахнелыя латы.

І нарэшце з-за ўзнёслага, падобнага да канапліны, сохараня* паказаўся косы чатырохкутнік яшчэ не пацямнелае шыфернае страхі з адным ружаватым лістом — як з глыбокага віру выплыла і патанула зноў, схаваўшыся за чужымі дахамі і прысадамі, бацькава хата.

У ёй Гэнрык Самец па-належнаму і не жыў: дзяцінства прайшло ў цеснаватай, скіданай з няспелае маладнічыны — саракагадовых сосна ў — непрытульна цьмянай хатцы з трыма вокнамі, што стаяла абкружаная новым жоўта-васковым зрубам, які бацька дакончыў, на-

* *Сохарань* — таполя.

крыўшы гонтавай дошчачкай ужо тады, калі Гэнрык быў у інстытуце, на трэцім, здаецца, курсе. У новай бацькавай хаце, што пахла горка-цягучай смалiною, ён стыкаўся толькі ў часе светлых і гультаяватых студэнцкіх канікулаў, а потым кароткімі — на дзень, на два — выпадковымі наездамі.

Але аднадзённыя прыезды, гэтае лятучае наведванне і гасцяванне, мусіць, патрэбныя і жаданыя былі душы, як кропля расы для прывялага лістка, як вільгаць для перасохлых вуснаў, як сляза запарушанаму воку.

Пасля бацькавай смерці нязмушанае, непрымусовае, аднак неабходнае ачышчэнне душы ці вяртанне яе да гнязда свайго дзяцінства, якое чамусьці заўсёды выслана мяккім перыйкам шчымліва-салодкіх успамінаў, гэтая кароткая дарога дадому, устрывожаная чуйным хваляваннем і шчымлівым болем сэрца, пачала няждана абрывацца, натрапіўшы ўжо на стромы, абрывісты бераг, за якім пачыналася глыбокая пустата і глухая адзінота. Як жа ж смерць іншых ды асабліва блізкіх ці родных табе забірае часціну тваё душы!

Пякуча-шчымлівы боль абліваў Самцова сэрца: ён ужо бачыў, як, павялічваючы хуткасць на роўнай асфальтнай шашы, разагнаны аўтобус спехам мінаў прыхаваную кудзеркаватымі садкамі родную вёску, бацькаву хату, што аблушчана-карычневым шчытом зноў вызірнула з-за чужых шарых дахаў, як аддаляўся цёмна-зялёны, гонкі, нібы канапліна, сохарань, — пара была падымацца і, як заўсёды, прасіць шофера, каб на хвіліну спыніўся, але

нешта нявыказнае, нешта неспазнана-невядомае дагэтуль, прыгнятала і ціснула Гэнрыка Самца да няроўнага, праваленага сядзення. Яму на памяць набег той даўні, ужо трэці пасля бацькавай смерці год, дажджлівы жнівень, смутны ў нізкіх ацяжэлых хмарах дзень, і яго, Самцова, блуканне наўкруга адзінокай, забытай хаты з пацямнелымі ад часу фіранкамі, з выбітай форткай у перадпечным акне. Вясніцы, гародчык ды ўвесь двор паверх пачарнелага плота быў абнесены калючым дротам. Як дагадаўся Гэнрык, гэта зрабіў швагер, сястрын муж, што разам з ёю зрэдку наведваецца сюды, у Янава. Яму, не тутэйшаму чалавеку, усе тут, пэўна, чужое і абыякавае, таму і пазнікалі, — спярша дзікая грушка, што сядзела на замежку, а потым — дужы перад хатаю каштан, пасаджаны калісьці бацькам. Балазе застаўся гэты сохарань, як нешта жывое, што помніць і ведае цябе.

З раптоўнаю крыўдаю і агіднаю злосцю на швагра Самец расчапіў калючы дрот і пералез у двор, дзе да калодзезя праз вялікую здзічэлую і някошаную траву тачылася глыбокая, пратоптаная да чарнаты сцежка з чужога, суседняга двара, — з занядбанага калодзезя суседзі яшчэ чэрпалі ваду. Дарэчы, Самец і ўбачыў за раз'еханым частаколам прыгнутую над градамі старую Палусю, гукнуў ажно два разы, прывітаўшыся з ёю, але яна, ужо, мусіць, глухая, не ўчула яго і, не падняўшы галавы, усё гэтак маўкліва стаяла над прылеглым гурочнікам. Ён махнуў ад крыўды рукою і падышоў да дзвярэй, на якіх вісеў даўнейшы

бацькаў замок, вагкі, нібы выкаваны вясковым кавалём. Пляскаты, той самы па-маладому ружовы камень, зарослы навокал спарышнікам (адно каліва па-вужынаму запаўзло на шары, падзёўбаны сякераю парог), нібы прыскам апёк Самцу ногі. Асцярожна, як за што жывое, ён узяўся за жалезную, пакрапаную воспаю ржы халодную клямку і нават націснуў на лапатку язычка, вусцішна стаіўшыся і чакаючы, што зараз адклікнецца бацька тым нямоцным і спакойным голасам: «Хто там?». Але за дзвярыма, абуджаная бразгатам клямкі, зашапацела і апала порсткая цішыня. Толькі з далёкага двара чуйным брэхам заліўся сабака і каля ног у Гэнрыка расцяжна і жалосна замяўкаў нэндзны, умурзаны ў сажу каток. З чыйго ж двара ён заблукаў сюды, пад апусцелую чужую хату? Беспрытульны і галодны, ён таксама шукаў чыейсьці ласкі і спагады.

«Як аднакавыя мы ўсе ў сваёй бядзе і смутку, як шмат нас, самотных і беспрытульных», — здумелы Гэнрык Самец яшчэ пастаяў тады пры глухіх дзвярах на вуглаватым ружовым камені і, чуючы як стыне непрыветна-мярцвяная цішыня хаты, выйшаў з зарослага быльнікам і баркуном запусцелага двара, зноў закруціўшы за сабою ржавы калючы дрот. Невядома толькі дзеля чаго ён быў начэплены гэты, ржава-калючы дрот, ды яшчэ нават паверх плоту? Бо з недагледжанай сіваватай папяроўкі дзеці ўсе роўна атраслі і абабілі недаспелыя яблыкі, пакінуўшы на знявечаным галлі канчары і абломкі палак.

Цяпер Гэнрыку Самцу зноў убачыўся і той калючы дрот, слабка нацягнуты над старым пачарнелым плотам, і глухая, панура прыгорбленая над градамі Палуся, і холад пакрапленай іржою клямкі, і вусцішная шапаткая цішыня за глухімі дзвярыма асірацела-пустое, пачужэлае хаты, і ён неяк бязвольна, сам нават таго не хочучы, яшчэ глыбей уціснуўся ў правалянае мулкае сядзенне.

Перад скрыжаваннем, на якое безуважна высунуўся, нецярпліва паміргваючы падфарнікам, блакітны грузавік з бруднаю ад засохлага гною жалезнай скрыняй, разагнаны гарачы аўтобус нібы прыцішыў свой ход, але вёска ўжо засталася ў Самца за спіною і нешта гнятлівае, што так балюча сціскала трапяткое сэрца, раптоўна апала і адсланіла свет, — Самец ажно глыбока, на ўсе грудзі ўздыхнуў.

Іншы раз мы доўга і ўпарта ідзём да свае мэты, але, убачыўшы яе зблізку, нечакана адступаемся назад. Які ж, зрэшты, зменлівы і бязвольны ў сваіх памкненнях чалавек. Гэнрыку Самцу думалася пра самога сябе. У глыбі душы яшчэ гарэў дакор, што не сышоў каля свайго Янава, якое, нібы здарожаны хадок, стомлена замерла, чакаючы чужое спагады, але забруілася і радасць, што мінуў яго, адначасна мінуўшы свой боль і жальбу, бо цяпер шкада не столькі вёску, што немінуча звodзіцца і памірае, прыціснутая і растоптаная непрытульна-халоднымі блочнымі дамамі з адчужанымі і непрыязнымі ў іх людзьмі, а найперш самога сябе, што адыходзіш менавіта ты сам. І з кожным разам гэтае прыкрае, млоснае

адчуванне большае, робіцца невылечным, прыносячы востры і нясцерпны боль.

Жыццё сваё мы намагаемся кожны раз пачаць спачатку, гэтым самым прычыняючы сабе найвялікшую шкоду, бо скарачаем тое, што маем, якое ў нас ёсць.

Даезджаны, няшчадна дабіты на выбоістых вясковых гасцінцах, на даўнейшых брукаваных, але не рамантаваных шошах светлы аўтобус з двума блакітнымі пасачкамі ніжай незашторaных вокнаў, трохі пакалыхваючыся, з тым знаёмым іржава-ўедлівым скрыгатам жалеза, звінючым паляпваннем адарванай бляхі, з дробным, балюча-крохкім дзынканнем шкла нёс нервова-чуйнага Гэнрыка Самца да першых местачковых хатаў, што паўсталі на даўнейшай заваленай цэглаю яме, якая асталася ад спаленага партызанамі ў вайну тартака, тых чорных катлоў ад знявечанае паравое машыны, пакарэжаных і пакрыўленых рэек...

І Самцова памяць высвеціла далёкі дзень вайны, калі яны, падлеткі, прыкацілі ў вёску жалезныя, нападобе вагонных, толькі нашмат меншыя колы ад ваганетак, на якіх у пілараму падаваліся тоўстыя неакораныя дзеравіны. Убачылася знямоглая ад старасці суседская хата, пад сточаную шашалем і жоўтую ад парахні падрубу якое яны, падлеткі, падкацілі нізкія ваганетачныя колы. Убачыліся і абедзве трухлявыя сцяны, наскрозь прабітыя снарадам, якраз у тую ж ноч, калі партызаны падпалілі тартак. Нямецкая ахова і рускія палонныя, што разам з ёю вартавалі чыгуначны мост, перапуджаныя і ўспалошаныя пажарам

тартака, пачалі абстрэльваць тутэйшыя ровішчы і пералескі, а найперш блізкае ад мястэчка і ні ў чым не вінаватае Янава. І не толькі з кулямётаў, а нават з лёгкае гарматы. Тады ж кароценькі снарад упаў у іхнім, самцовых, хляве, забіўшы котную авечку, але балазе не ўзарваўся, другі ж — адразу прашыў абедзве сцяны трухлявае суседскае хаты, у якой паміраў зжоўклы, спакутаваны ад раку ўдавец Янка Гнаінскі, пакідаючы без догляду чацвёра хлопцаў: сярэдняму з іх, як і Гэнрыку Самцу, было восем.

Ён яшчэ пажурыў іх, неразважных дзяцей, за гэтыя, прыкочаныя ў вёску ваганетачныя колы, а потым загадаў старэйшаму сыну хоць анучамі заткнуць прабітыя снарадам дзіркі і нарэшце, ужо з горкім смехам пераказаў, як з гадзіну назад, калі ён застаўся сам-насам у хаце, да яго прыходзіў чорт. Толькі не з рогамі і хвастом, а перарабіўшыся ў сытага шэрага пацука. Янка ўбачыў яго якраз на спарахнелым вушаку, калі ён зашавяліўся, звесіў ажно на дзверы ружовы хвішчаваты хвост. Ён і не ўцякаў, покуль Янка не заварушыўся на рыпучым у падцёках ад вару, якім ашпарвалі смярдзючых клапоў, драўляным ложку.

Сыты, доўгі, нібы панчоха, пацук як раптоўна і незаўважна з'явіўся на вушаку, так незаўважна і імгненна знік.

І перапалоханы Янка Гнаінскі сваім ледзьве жывым голасам пачаў цвердзіць і бажыцца, што на вушаку сядзеў не пацук, а — чорт, бо ўміг вока знік, адно дыхнуў над ложкам халодным скразняком.

— Кажу, гэта не бац, нячыстая сіла была! — задыхаючыся ад болю, Янка сіліўся падняцца на ложку і нямогла ападаў. — Чорт гэта быў, па мяне прыходзіў...

Уразліваму Гэнрыку, можа, і не запомнілася б гэтая нагода з пацуком, каб не той страшны сон, што прысніўся яму адразу ж у першую ноч: у Гэнрыка не толькі адымаліся ногі і гінуў, прападаў голас, калі ён нема енчыў, уцякаючы ад нячыстае сілы, што кружыла па хаце, ператвараючыся то ў пацука, што бег па сцяне, то ў віхор з ружаватым пацучыным хвастом, што вірыў каля самага вуха. І раптоўна, апярэдзіўшы ўжо ледзьве жывога, бяспамятнага Гэнрыка, віхурны клубок шугануў у паз між дзеравін і, мільгануўшы гэтым ружовым хвастом, згінуў у сцяне.

Змучаны ад свайго безгалосага крыку, Гэнрык прахапіўся ўвесь абліты гарачым потам, што тут жа астыў, ператварыўшыся ў халодную ліпучую расу. У тую ноч чуйны, перапалоханы Гэнрык заснуць не мог: заплюшчыць вочы і зноў бачыць, як па сцяне бяжыць доўгі і шэры, нібы суконная панчоха, страшны пацук.

А назаўтра зранку, як помніцца ўжо Гэнрыку, пад лёгкі перагоністы дожджык і рахманае пагрукванне перуна ён прыбег пад хату да Гнаінскіх, каб расказаць свайму равесніку Вацю пра нечувана страшны сон. Ён доўга стаяў за цэдам дажджу, што сплываў з капяжа, покуль з хаты выйшаў з ледзьве прыкметнаю навалакаю слёз на вачах Вацяя Гнаінскі і, здаецца, спакойна і безуважна-абыякава, хібы

толькі дрыгатлівым голасам сказаў: «Тата памірае...»

Гэтак і запомнілася Гэнрыку Самцу на ўсё жыццё — свой дзіўна-страшны сон і чужы каротка-грудны, балючы ўздых: «Тата памірае...»

Астатні раз Вацю Гнаінскага ён бачыў на пахаванні ці, праўдзівей, — на саракавінах па сваім бацьку. Ён тады, добра захмялелы, у лёгкай паркалевай кашульцы ў цёмна-сінюю палоску, стаяў каля Самца і, сіратліва апусціўшы голаву, з тою даўняю дрыготкаю ў голасе пытаў:

— А помніш, Гэнрык, як я страдаў? — у Гнаінскіх тады ўслед за бацькам памерла, захварэўшы на водру, адразу двое хлопцаў. — Ці ты забыўся?

— Чаму ж, Вацлаў? Помню-помню, — як мага мякка і спагадліва сказаў Гэнрык, успамінаючы і свой страшны сон, і дажджлівы ранак з глухаватым перуном, і той цяжкі Вацяў уздых: «Тата памірае».

— Гэта ж я зрабіў вунь той доўгі ўслон, што стаіць у вашай хаці, — шмаргануўшы носам, нечакана пахваліўся ён. — Альбо на вяселля, альбо на хаўтуры — усе пазычаюць. Некаму ж трэба было зрабіць і такі ўслон. Ці не праўда, кажу? І твой швагра пазычыў во...

Доўгі, на шэсць ножак, услон спатрэбіўся і самому гаспадару, калі праз гады тры ў баразне на полі, ідучы за плугам (садзілі якраз бульбу), упаў хворы на сэрца Ваця Гнаінскі — якраз жа ў той дзень патрапіў прыехаць у Янава і Гэнрык Самец, і нават бачыў, як мужчыны,

паклаўшы ў радзюжку, ужо нежывога, яго няслі дадому.

«Як жа мы, аднак, жывём мінулым, — думалася Самцу. — І імкнемся да будучага, падлічваючы ці ўспамінаючы найперш тых, хто адышоў. Не дзіва, што мы, жывыя, помнім найбольш пра нябожчыкаў, чым пра жывых. Нават кніжкі з цікавейшаю ахвотаю пачынаем чытаць тады, калі ўчуем пра смерць аўтара. А можа, павага да мёртвых ідзе ад таго, што нябожчыкі бясшкодныя і нікому не замінаюць? Як усё ж мы цэнім і паважаем маўклівую пакорнасць іншых, не хочучы быць пакорнымі самыя».

За зялёнымі фантанамі маладых імклівых таполяў, што шарэнгаю абступалі шарую стужку новай вуліцы, адкрывалася мястэчка, — невядомыя ўжо Самцу ружова-цагляныя трохпавярховыя карпусы недабудаванай школы ці бальніцы, а за ёю, закрываючы свет, шарэлі дзве маналітныя каробкі і ўзвышаўся той самы, што бачыўся з далечыні, выносны бетонны комін, упрыгожаны двума бела-чырвонымі кольцамі. З-за яго вызіралі закурэлыя ад цэментнага пылу, тоўсценькія і пераціснутыя ў поясе, як флаконы, нізкія загрузчыкі. І ўвесь краявід ад зялёных прысадаў, з якіх вострымі чубкамі выступалі шыферныя дахі, да шарых маналітаў, — усё было ўвабрана пад велічны купал чыстага і крохкага, нібы крышталь, неба і заліта праменіста-сляпучым сонцам.

І Гэнрыку Самцу чамусьці прыгадаўся светла-блакітны Арал і велічны і незабыўны палёт

над ім — палёт між двума нябёсамі: унізе — густа-блакітным ад салёнае вады, у вышыні — светла-сіняватым і трохі бялёсым ад разрэджанага паветра. Якая ж, зрэшты, нязрушная праўда ў тым, што ўсё спазнаецца ў параўнанні, бо для Самца было неспадзяванасцю, што на свеце маецца нешта яшчэ прыгажэйшае за колер неба, як для прыкладу, салёная вада ў тым жа ж Аральскім возеры, якое з кожным годам катастрафічна высыхае, пакідаючы на сваім беразе, на пясчаных плёсах баржы і лодкі. Але якою ж уражліваю і памятнаю была гэтая камандзіроўка з еўрапейскага Мінска ў азіяцкі Нукус — нізкі і, здаецца, ад саманных домікаў плоскі гарадок, завешаны бела-жаўтлявым непраглядным пылам, у якім меншае і меркне сонца, з асаблівым, па-азіяцку бруднаватым рынкам, дзве на тратуарах гарою ляжаць сырыя вярблюжыя шкуры, дзе рыкаюць не выпражаныя з двухколкаў сіва-цёмныя вушатыя ішакі, нацэджваючы пад сябе бурыя лужыны, якія сцякаюць пад паласатыя кавуны, што прадаюцца з гэтага ж самага тратуара, як і тытунь тоўчаны з канаплямі, — поўнымі шклянкамі і найбольш дзецям. І многія жуюць яго, цэдзячы ў куточках рота зеленаватую сліну.

Аднак, якою светлаю была дарога туды і якім чорным было вяртанне назад, дадому, у родную старану, дзе памёр ужо бацька. І той непаўторна-прыгожы свет, той палёт між двух бясконцых і ўрачыста-велічных блакітных колераў насуплена прымерк і счах, як высокі дзень у часе зацьмення. Хоць даўні жнівень,

калі хавалі бацьку, быў пякуча-зыркі, акроплены кароткаю навальніцаю і абуджаны нязлосным перуном, што адазваўся тады, калі з хаты выносілі труну... І што таксама засталося ў памяці: упоруч з бацькавай труною спадзістаю сцежкаю на абочыне шашы, а то проста закурэла-бруднаю канаваю ішла хворая на галаву іхняя Янаўская Сабіна, што знарок ці незнарок спаліла сваю хату і жыла цяпер, туляючыся ў пад'ездах і падвалах новых панельна-блочных местачковых дамоў. З усіх Янаўскіх суседзяў у яе, напэўна, найбольшая была павага да бацькі, і, мусіць, за тое, што пасля мачашынае смерці ён аддаў ёй кольвекшто з жаночых кофтаў, спадніц і хустак.

Аўтобус, наскочыўшы яшчэ на даўнейшы незаасфальтаваны брук, нечакана заракатаў коламі і казытліва задрыжаў увесь, абуджаючы ад цягучых мысляў Самца, які павярнуўся зноў да акна. Лёгкі скразняк шархоткім халадам прабег па спіне: на месцы белага дома з пажарнаю вежаю святлеў жаўтаваты, як парахня, друз. І там, змарана прыгнуўшыся, капашылася сутулая немаладая кабета.

«Няўжо яна, Сабіна?» — прыпадняўся і чуйна выцягнуў шыю ўражаны Самец, але жанчыну не пазнаў.

Борзды, дрогкі аўтобус, што ракатаў на няроўных глыжаватых каменнях, абмінуў маруднага мужчыну, які, азіраючыся і паварочваючы назад ружова-гарбаты нос, з краю накатанага бліშчастага бруку вёў пацямнелы, даезджаны веласіпед. У сухашчавай з растапыранымі локцямі постаці яго ўгадвала-

ся таксама штосьці знаёмае, але хто ж гэта быў, успомніць Самец не мог.

«Як паводка часу адносіць нас усё далей і далей ад роднае зямлі, ад тых людзей, якіх ты ведаў, запаўняючы гэты знаёмы змалку свет і новымі будынкамі, новымі дрэвамі і новымі пакаленнямі людзей, — з жалем і шкадаваннем да самога сябе думалася ўжо Гэнрыку Самцу. — Але ж у новым жыцці, у новым пакаленні, як неадпаведнасць яму, застаецца пакутлівая зайздрасць, нязводная помста, спрадвечная няроўнасць і чалавечая адзінота. І покуль ёсць на свеце чалавек, датуль, мусіць, жыцьме ў ім поруч з дабратою і прыязню лютая злосць і нянавісць, датуль ён будзе ўзводзіць і руйнаваць ім жа ж збудаванае».

Падплываючы да доўгага цугу брудных грузавікоў і чырвона-зялёна-светлых кароткіх самаходзікаў, што паморгвалі рубінавымі агеньчыкамі стоп-сігналаў, аўтобус неўпрыкмет спыніўся — наперадзе быў чыгуначны пераезд: на апушчаным паласатым шлагбауме пульсавала вялікае чырвонае вока светафора. Дзве немаладыя кабеты, ківаючыся ад цяжару сумак у руках перад блізкім дызелем, трушком перабеглі пераезд і бяззуба смяяліся, азіраючыся на паўнатварага шофера, што, высунуўшыся з кабіны грузавіка, трос мурзатым кулаком. І калі яны падышлі бліжай, Самец зніякавеў, пазнаючы ў ніжэйшай з іх, у той, што была ў чырвонай хустцы, з якой шкляною павучынкай паблісквaў люракс, суседку Матруну — гэта ж яна ў астатні яго прыезд у Янава расказ-

вала яму і ўжо з новымі падрабязнасцямі пра бацькаву смерць.

Ён тады, выйшаўшы на вуліцу з пачужэлага, зараслага ажно па калені дзікаю травою роднага двара і з млосным заміраннем у сэрцы пазіраючы на бацькаву хату, абнесеную паверх плоту калючым дротам, адчуў у душы такі сцюдзёны і мярцвяны смутак, якога дагэтуль яшчэ ніколі не адчуваў. І ачуціў яго, вярнуўшы да жыцця, нерытмічны, збоісты і глухаваты стук цапа. Самец павярнуўся на гэты блізкі стукат і за рэдкім мігатлівым плотам каля летняе дашчанае кухні, якія звыкла робяць у цяперашніх вёсках, убачыў лёгкую жаўтаватую хустку і размашысты ўзлёт гладкага біча.

Матруна ж яшчэ раней, мусіць, прыцікаваўшы яго, палажыла цэп, падвязала раз'еханую хустку, уладна падышла да плота, рассунула частаколіны і аблакацілася на шарую, аблушчаную ад кары жэрдку. Што яна ўмее прымахляваць, Гэнрык ведаў здаўна, але не паверыць у тое, што яна расказвала цяпер, не мог:

— Помню, па ваду ішла. Няўзнак зірнула на ваш надворак, адно ж ён з бярэмям дроў стаіць, твой бацька. Я павіталася, а ён мне ў адказ: «Здрастуй і прашчай, Матруначка!». Так і сказаў. А на другі ці трэці дзень яго знайшлі ў лазе каля рэчкі, блізенька ўжо ад Садкава. Ці не туды ён ішоў? Каханка ж у яго тамака была — Вольга Бязменава, што рабіла з ім разам на базе. Праз яе ён нават пабіўся з Габрыелем. Як жа ж яго? Дай Бог, памяць — Жагалам. Грэх ужо і казаць, але ж і смехаты было, на іх, старых, гледзячы...

І не здымаючы падбародка са сваіх, аблакочаных на жэрдку загарэлых рук, загаварыла яшчэ пра адно:

— За два гады, лічы, паўвёскі смерць выкаціла. Вуньдзека на наш канец тры бабы асталося. Ужо змовіўшыся, зранку пагрукваем адна адной у дзверы, ці жывыя асталіся, ці не памерла каторая?

Маючы больш як за семдзесят, Матруна выглядала здароўчаю і нават са смехам пахвалілася тады, калі Гэнрык дзеля прыліку абмовіўся пра яе здароўе:

— Ат нічога, кавалеры яшчэ сватаюцца.

Было трохі сорамна і ніякавата за пахвальбу сталай кабеты пра кавалераў ды сватанне. А цяпер па-іншаму разумеўся той жарт і кароткім святлом маланкі нават успыхвала радасць, што ёсць нехта жывы, і ён, як рэліктавая сасна, убірае ў сябе імклівы час, што ёсць сведка тваіх далёкіх гадоў. Значыць, ты не адзін у гэтым пачужэлым і непрытульным свеце.

«А той, хто доўга пражыў, — думалася Самцу, — хто стаяў, нібы, на стромым беразе, бачачы, як глыбока ўнізе няспыннаю ракою праплыло жыццё, той, мусіць, болей шануе яго і інакш цэніць».

Прагрукацеўшы спярша на блізкі мост, потым назад, на станцыю, дызель з чатырма вагонамі — прытуліўшыся да задняга, на падножцы вісеў счэпшчык у аранжавай камізэльцы, — напаследак аслабаніў пераезд. Згас трывожны светафор, падняўся паласаты шлагбаўм і паволі скрануўся з месца доўгі цуг машын. З задняга грузавіка, з перапоўненай

скрыні пацякло шара-зеленаватае зерне, пакідаючы на ружавата-блішчастым бруку балючы раўчучок.

За пераездам у развілцы ўжо заасфальтаваный шашы лёгка і ўзнёсла, як мададая гонкая сасна, падняўся, прыязна распасцёршы крыжавіны, ясна-жоўты, яшчэ не пафарбованы крыж. А Самцова памяць вярнула той, даўнейшы, карычневы, акружаны штакетавым плоцікам, што стаяў якраз тут у гады вайны: за крыжам, у жвіровішчы, якое ўжо зарасло і зараўнялася, разам з палоннымі байцамі і местачковымі яўрэямі сядзеў незнарок схоплены на вуліцы Самцоў бацька. Яго, чорнага і насатага, нямецкія салдаты палічылі, мусіць, за яўрэя.

Абышоўшы валасныя і павятовыя ўправы і нарэшце дабіўшыся да гэбітскамісара, толькі праз два месяцы, і ўжо з Баранавіцкага лагера, бацьку дадому выпатрабавала блізка перад сваёю смерцю Гэнрыкава маці. Бацька вярнуўся як з таго свету, — худы, нэндзны і хворы на жаўтачку, але са жменяю махоркі ў кішэні — ён пачаў курыць, каб ужо не расставацца з курывам да астатніх сваіх дзён.

У звязку з бацькавым прыходам дадому шнурок Гэнрыкавых успамінаў вышморгвае яшчэ дзве памятныя і страшныя нагоды. Першая з іх тая, калі ў вёску разам з Габрыелем Жагалам, што быў тады загадчыкам склада ці наглядчыкам на чыгуначнай станцыі, прыйшлі двое рослых маладых немцаў у чорнай форме чыгуначнай аховы. Невядома толькі, ці яны самыя агледзеліся, ці ўжо ўдаў Жагала,

што Гэнрыкаў бацька, яшчэ не акрыялы пасля лагера, адчуўшы недамаганне і млявасць, самапростам, пэўна, не сказаўшы нікому, пайшоў дахаты з той рампы, дзе янаўскія мужчыны, сагнаныя немцамі, грузілі ў вагоны скрыні з меднымі апілкамі, снарадныя гільзы і знятыя з тутэйшых цэркваў і касцёлаў вялікія шматпудовыя званы.

Бацька толькі спаласнуў твар, скінуўшы злінялую кашулю і стоячы пры калодзезі ў белай палатнянай сарочцы, як на дарозе, што адлучалася з шашы і пераходзіла ў вясковую вуліцу, каля пахіленага старога крыжа паказаліся двое немцаў у чорнай форме. Ідучы трохі зводдаль і, нібы прыспешваючы, іх вёў Габрыель Жагала.

— Чаго ж гэта немцы ідуць? — прыжмурылася маці, бо, як помніцца Гэнрыку, яна была нізкая на вочы.

— Ці не па мяне? — бацька, схапіўшы ў мацеры з рук срабрысты кужэльны ручнік і выціраючы на бягу шыю, вобмельгам шмыганўў у сені.

— Няхай выходзіць, лепш будзе. Мы ж бачылі — схаваўся ў хату, — спыніўшыся пры калодзезі ў ружавата-зялёным кучаравым спарышніку, сказаў Габрыель Жагала.

Немцы, падымаючы высокія ганарыстыя фуражкі, падазрона маўчалі. Адзін толькі раз за разам коса цікаваў на няшчыльна прычыненыя сені.

Пакліканы мацераю, бацька і выйшаў адтуль у расхрыстанай белай сарочцы і трохі, як сам не свой, гатовы да страшнага.

— Шамец? — бялявы немец гэтым самым лупаватым вокам зіркнуў на Жагалу і ададаў яму скураныя чорныя пальчаткі, борзда зняўшы іх з рук.

— Ага, Самец, — пацвердзіў Жагала і пастараніўся, даючы дарогу немцу, што напорыста ступіў да чутка-насцярожанага і збялелага бацькі.

Гэнрык з жахам убачыў, як вялікая закасаная рука, на якой паблісквалі залацістыя валасінкі, злосна схапіла бацьку загрудкі і, згробшы кашулю, падцягнула яго да сябе.

Першы ўдар, нават сцятым кулаком і нават з хрустам прыйшоўся ў нос — і ў бацькі на губе, быдта спелымі чырвона-цёмнымі брусніцамі, высачылася і заліла сарочку страхатлівая кроў.

— Габрыелька, за што ж яго гэтак? — палахліва ўскінула ўгору рукі перапуджаная маці. — Хворы ж ён пасля лагера.

— Сам вінаваты — з работы ўцёк, — адступіў ад маці і павярнуўся спіною Габрыель Жагала.

— Кажу ж — нямоглы яшчэ ён! — маці падбегла да немца і спляла яго закасаныя да локцяў, касматыя рукі.

Цяпер жа Гэнрык убачыў, як другі немец, трохі ніжэйшы за бялявага, але дзябёльшы ў плячах, чорны і вуграваты, і саўсім не падобны да немца, падышоў да маці і з усяе моцы турзануў яе і кінуў плячмі на густы кучаравы спарышнік.

— Сынок, ратуй, дальбог заб'юць бацьку! — тонкім, ужо бездапаможным голасам закрычала маці, устаючы на каленкі.

Перапалоханы Гэнрык, чуючы як у самога трымцяць і млеюць ногі, асцярожна падступіўся да чорных немцаў у ганарыстых фуражках і шчытных высокіх ботах, што, трымаючы загрудкі, ужо абое білі бацьку, кідаючы яму ў твар цяжкія, упырсканыя ў кроў кулакі.

Але калі акрываўлены бацька нечакана выслізнуў з іхніх рук, чорны, вуграваты немец, расшпіліўшы чорную кабуру, выцягнуў з яе гэтакі ж чорны пісталет.

— Аво-ой, а Божачка! — падняўшы рукі, зноў загаласіла маці. «І праўда, застрэляць», — зніякавелы Гэнрык моцна і балюча заплюшчыў вочы.

— Дзіцятка, не давай!

Аднак нечувана-гарачы страх, што вось перад ім, перад Гэнрыкам, зараз упадзе застрэлены бацька, штырхануў яго і ў міг вока панёс за вугол хаты.

Прытуліўшыся шчакою да цёплае шурпатае дзеравіны, Гэнрык з адчайна-балючым заміраннем сэрца чакаў кароценькага стрэлу, але яго, здаецца, не было.

Высунуўшы адно вока, Гэнрык асцярожна зіркнуў з-за шурпатага, патрэсканага вугла і зноў апаў душою: чорны вуграваты немец усё гэтаксама трос перад акрываўленым расхрыстаным бацькам цёмна-сіняватым кароценькім пісталетам, а Габрыель Жагала адпіхаў праставалосую, з аб'еханаю на плечы хусткаю бяспамятную маці. Бялявы рослы немец ужо адмываўся пры калодзезі, льючы сабе на рукі з поўнага вядра.

«Мусіць, застрэляць», — Гэнрык зноў пры-

ціснуўся да шурпатае цёплае дзеравіны і, зноў напружваючы слых і заміраючы сэрцам, чакаў кароткага стрэлу, але за хатаю чуўся толькі ўспалошаны і адчайны матчын енк. Але раптоўна і падазрона аціх і ён.

«Няўжо застрэлілі?» — перапалоханаму Гэнрыку чамусьці ўбачылася, як на калматым спарышніку, распластаўшы рукі, ляжыць забіты бацька, як ляжаў на сцежцы пры шашы застрэлены баец, на якога ён, Гэнрык, спяшаючыся да рассыпаных залацістых узрывальнікаў, ледзьве не наступіў.

Задыхаючыся ад страху, Гэнрык уміг перабег гародчык з прывялым ад гарачыні лічаннем і парасонамі жоўтай, нібы ўкроп, але смярдзючай, як зялёныя блышчыцы на жытнім коласе, высокай каляндры і апынуўся на другі бок хаты. Зноў, сцінаючыся ад страху, вызірнуў на надворак. Узмахваючы перад сабою рукамі і заломваючы іх, як па нябожчыку, галасіла маці, раскалмачаная, з аб’еханаю хусткаю.

— Застрэлілі? — ледзьве вымавіў Гэнрык і цяжкімі, што не адымаліся ад зямлі, нагамі ступіў да яе.

— Не, сынок. Вунь павялі, арыштаваўшы, — маці кіўнула растрапанаю галавою на пясчаную дарогу, што ўзбягала на шашу, і ледзьве жывым, ледзьве чутным голасам папрасіла: — Збегай, сынок, у хату, вынесі бацькаву марынатку, а то ж скалее ў аднусенькай сарочцы.

Бацьку ён дагнаў ужо за крыжам, перад самаю шашою: яго трохі худаватая знябожана-

прыгорбленая постаць у палатнянай кашулі бялела між двух чорных немцаў, што ішлі трохі ззаду, шырока ступаючы высокімі шчытнымі ботамі. Клышаногі Жагала, нібы спутаны, спешна соўгаў босымі нагамі з пляскатымі ступнямі і ледзьве паспяваў за імі.

— Тата, вазьмі, акрыйся.

На Гэнрыкаў голас бацька недаўменна павярнуўся, паказаўшы свой распухлы, быдта пакусаны восамі ці шэршнямі, чужы і пабрыдчэлы твар, і, ужо маўкліва зірнуўшы на немцаў, узяў шорсткую суконную куртку на чырвонай радзюжнай падшыўцы...

Гэнрыку Самцу ўжо і не помніцца, ці звяла вокам у тую ноч знерваваная і збедаваная маці, але раненька, прачнуўшыся ад скрыпу дзвярэй, ён учуў яе здзіўлены і моцны ад радасці голас:

— А во-ой, матка святая, адпусцілі цябе!

— Ціха! — зіркнуўшы на ложак, дзе спаў Гэнрык, бацька ўважліва падняў палец. — Уцёк я.

— Як? Якім жа-ж спосабам? — зноў здзіўлена запытала маці.

— Пасадзілі ў дашчатую прыбудоўку, а я адарваў дошкі і во... — Бацька, не здымаючы сівай суконнай курткі, усё гэтаксама стаяў у парозе.

— Садзіся ж снедаць, — маці павярнулася да печы.

— Тут не да жыру, як кажуць, быць бы жыву. Дай хлеба ды скварку ў руку ды пабягу, покуль не засталі.

— Куды ж ты, Юлісь?

— Да дзядзькі Каруся ў Нагорнікі... і ты з хлопцам услед ідзі.

— А скаціна?

— Папрасі, няхай Матруна прыгледзіць.

— Што ты, Юлісь, як жа ж я кіну хату?

— Слухай, што кажу, бо павалакуць і цябе.

І Гэнрыку Самцу помніцца ўжо другая, але не менш уражлівая і страшная нагода. Маці ўсё ж паслухалася бацьку і, звязаўшы ў чыстую хустку з большага ўсё сваё лепшае ды святняе і ўзяўшы за руку яго, Гэнрыка, у тую ж раніцу пайшла ў Нагорнікі. З вайны Гэнрык Самец і не быў у далёкай глухаватай вёсачцы, што апоўзлымі шара-саламянымі будынкамі спускалася з грудка да вузкае, ледзьве жывое рэчачкі, як болей і не гасцяваў у адзінай сярод іх бела-жаўтлявай атынкаванай хатцы, дзе яны ўсе трое спалі на мулкім гліняным току, разаслаўшы пад бок тоўсты куль слізкай шапаткой саломы.

Тады ж, у першую начлежную ноч у атынкаваную нізкую хату да дзядзькі Каруся, свецячы слепаватым жоўтым вокам кішэннага ліхтарыка, увайшлі двое, як мог Гэнрык разабраць, напалавіну ў вайсковым, напалавіну ў цывільным убранні. Не, спярша яны пад'ехалі, зарыпеўшы і заляскаўшы возам на вуліцы і затупаўшы конна на надворку.

З'явіліся яны ранавата, яшчэ як след і не прыцямнела. Дзядзькава жонка, цётка Карусіха — імя яе Самец ужо і не прыгадае — каб, мусіць, лішне не высмальваць газу, якой у вайну было не дакупіцца, як і солі, толькі дзьмухнула на газоўку, што стаяла на мурку коміна і

пакалыхвала залаціста-курным касніком полымя, як да акна, спаткнуўшыся на выкладзенай каменнямі прызбе, прыпала постаць у пляскатай вайсковай фуражцы і разам з ударам кулака ў раму пачуўся сіпаваты голас:

— Хозяин, открой! Свои...

— Не па-нашаму гаворыць — парцізан ці што? — спытала і зашлупалася з печы цётка Карусіха. — Пайду, адчыню сама.

Яна не падпусціла да дзвярэй нашмат старэйшага за сябе і менш рухавага дзядзьку Каруся.

Ён толькі згодліва закашляў, падымаючыся з свайго рыпучага ложка. Яны спалі паасобку: яна, цётка, — на печы, ён, дзядзька Карусь, — на адзіным у хаце драўляным ложку.

Падхапілася і маці, спешна нацягваючы на сябе спадніцу.

Пасля маруднага і ржавага грукату жалезнай засаўкі і неразборлівага голасу ў сенях, у хату з адчыненых дзвярэй раптоўна пырснула жаўтлявае ад аселай батарэйкі святло кішэннага ліхтарыка. Абабегла куткі і спынілася на разасланым сярод хаты кулі порсткай саломы, на якой яшчэ ляжалі Гэнрык з бацькам.

— А это кто такие? — спытаўся другі, што яшчэ стаяў у парозе.

— Пагарэльцы яны, пагарэльцы, — двойчы і цвёрда, з належнай пэўнасцю сказала цётка Карусіха. Змахлявала наконт пагарэльцаў, мусіць, знарок, каб было праўдзівей.

Асвечаны ліхтарыкам падняўся і бацька, як арыштант, падтрымліваючы свае слабкія ў паясніцы споднія порткі.

Пук цьмяна-кволага святла зноў забегаў па хаце, дрыготка асвяціў зажмуранага дзядзьку Каруся, што сядзеў на ложку, спусціўшы цяжкія босыя ногі, напаследак натрапіў на зялёны ў жоўтыя хвалістыя пасачкі куфар і тут учэпіста заціх.

Той, што стаяў у парозе, нарэшце, высунуўся на скупое і дрыготкае святло ліхтарыка, і Гэнрык змеціў, як у прыспушчанай яго руцэ памахваўся доўгай руляй, падобны да дзіцячага пугача, страхотлівы наган. Ці гэта быў пугач, ці праўдзівы наган, Гэнрык, вядома, вызначыць не мог. Ва ўсякім выпадку, дзеля страху і перасцярогі махнуўшы ім і абышоўшы яго, малога Гэнрыка, што палахліва скурчыўся на разасланым кулі саломы, партызан размашыста ступіў да выпуклага зялёнага куфра і, нібы ўмеючы, нібы не ўпершыню, звыклым, кароткім рухам адкінуў вечка, глуха стукнуўшы ім аб блізкую сцяну.

Зніякавелы і здзіўлены Гэнрык бачыў, як туды, у асветлены ліхтарыкам куфар, уткнуўся трохі зацемнены і прыхаваны брылём пляскатай фуражкі курносы твар. Слабодная рука, што саўганулася ў куфар, адразу падняла пакунак, увязаны ў чыстую хустку, з якім Гэнрыкава маці прыйшла сюды, у Нагорнікі, потым ужо пад паху паляцеў і прыціснуўся локцем таўставаты сувой палатна.

— Ах, Божа літасцівы, што ён робіць, недавярак! — запляскала па глінянаму току босымі нагамі старая Карусіха. — Я ж на смерць хаваю, а ён забірае!

— Тише, маманя, после войны отдадим, —

з непрыхаваным смехам аказаўся той, што свяціў ліхтарыкам.

Але Карусіха, падбегшы да куфра, абедзвюма рукамі схапілася за тоўсты сувой палатна, што вытыркаўся з-пад локця і турзанула яго да сябе. А потым заенчыла, пазнаючы ў курносым з пляскатаю вайсковаю фуражкаю некага ўжо знаёмага:

— Айво-о, дак гэта ж Іван, меншы Сымонаў сын з Еляньві!..

— Какой я тебе Иван, старая стерва! — курносы локцем і з усяго размаху навотліў адкінуў ад сябе старую Карусіху.

— Дальбог, Сымонаў Іван! — нібы з радасным дзівам пабажылася Карусіха.

— Ну, ты чё, маманя? — ужо не стрываў і той, што свяціў ліхтарыкам, і з грукатам — мусіць, быў у нямецкіх шыпаватых чаравіках — ступіў да куфра і грабянуў рукою старую Карусіху, кідаючы яе на Гэнрыка. Старая праехала па слізкай жытняй саломе, але не павалілася.

— Што ж гэта вы, панове-партызаны, робіце? — з поцемку аказаўся стары Карусь.

Гэнрыкаў бацька з мацераю прытоена маўчалі.

— Вишь ты, панов не забыл, — святло ліхтарыка, адсунуўшы чорна-ліловы поцемак, асвяціла старога, што прыгорблена стаяў, абапіраючыся доўгаю худою рукою аб біла ложка.

— Иди-ка, старый хряк, открой сарай, — уладна загадаў нізкі сіплаваты, асіверաны голас.

— Што ж там адкрываць? Яны ж, хлявы, ад цябе не замыкаліся. Ды хіба ад гэтакіх злыдняў замкнешся?

— Давай, дед, шевелись, — Гэнрык убачыў, як на старога махнуўся той самы матчын пакунак, які трымала ўжо чужая рука.

— Куды ж вы яго гоніце? Сляпак ён, нічога не бачыць, — босымі нагамі старая заляскала па гліняным току, блізячыся да парога. — Можа я за яго пайду? Нічагутка ж не бачыць ён.

— На ощуп найдет, — слупок рэдкаватага святла зноў уздрыгнуў і спыніўся на Гэнрыкавым бацьку, што апусціўшы рукі, неяк здранцвела стаяу сярод хаты, бялеючы споднняй бялізнай. — Вот енты погорелый ему пособит.

...У хату мужчыны вярнуліся пасля таго, як на вуліцы, трапіўшы колам на камень, прагрукала і аціхла фурманка. Яны, мусіць, прывыкалі да цемнаты, стоячы ў парозе, адкуль спакойна, нават флегматычна аклікнуўся дзядзька Карусь:

— Падсвінакаў як не было.

— Ах, Божачка! — жахнулася старая Карусіха, шоргаючыся на лаве каля печы. — І ты двое аддаў?

— Нібы яны пыталіся, — з нейкім цяжкім уздыхам і гаркатою ўсміхнуўся бацька.

— Мужчыны, каб на вас, — упікнула, пасмялеўшы ўжо маці. — Можа, яшчэ і на воз занясли?

— Каб мы былі з ружжамі, то насілі б, пэўна, яны, — зноў тым самым непатрэбным смехам засмяяўся бацька.

— Не-е, я пайду, я ўжо так не аддам, што ўжо не будзе! — зашастала ўпоцемку каля печы, каб знайсці ў што акрыцца, і закрычала цётка Карусіха.

— Ну, ідзі, калі розуму не маеш, калі хочаш палучыць шомпалаў, — дзядзька Карусь, упёршыся лобам у аконную раму, цікаваў на двор, пэўна, пазнаючы ў нізкім асеннім поцемку цьмяныя сілуэты фурманкі і коннікаў. — Ідзі, можа, і цябе прывяжуць да воза, як прывязалі Піліпа Раманьчука і гналі, покуль дух вон. Ідзі...

Першаю і ўжо з ім, з малым Гэнрыкам, дадому вярнулася маці — немцы з чыгуначнай аховы ў вёску так болей і не прыходзілі. Потым назіркам з'явіўся бацька. І першае, як помніцца Самцу, што яны пачалі рабіць — гэта быў схрон. Прывёзшы з пажарышча ў тартаку сінявата-ліловай абпаленай цэглы, бацька з мацераю ўкрадкам, старонячыся чужога вока, замуроўвалі сутарэнне, перад гэтым склаўшы ў прамежак між сцяною і печчу ўсё святняе і лепшае з адзежы.

Там і выхаваўся бацькаў чорны з ледзь прыкметнаю шараю палоскаю яшчэ польскі касцюм, у якім ужо пасля вайны бацька любіў зухаваць на вясковых вяселлях і вечарынках, а выпіўшы скупую чарку, запрашаць да танца, асабліва на абэрак з прысяданнямі і фігурамі, маладых дзяўчат, за што на яго крыўдавала, злосна жмурачы свае чырванаватыя, нібы заплаканыя вочы, і надзімалася, як ззелянелая кураводка, Гэнрыкава мачаха.

У тым падношаным польскім касцюме бацьць-

ку і пахавалі. Гэнрык нават быў зазлаваў на прыродную сястру, што апранула нябожчыка менавіта ў старамодны і падношаны, бо колькі навейшых касцюмаў ён аддаў бацьку.

— Не падышлі твае, яны — то светлыя, то вялікаватыя. Усё во акраз яму, — і паказала на швагра. — Прапіўся наўнэт гэты скабар і нічога не купляе.

Аўтобус рэзка і парывіста засігналіў, ачуціўшы Гэнрыка Самца і варочаючы яго з каламутнай і ледзьве пpаглядна глыбіні гадоў у сённяшні дзень, што зырка і сляпуча зіхацеў над прымрэлым мястэчкам, на чорна-тлустую, расплаўленую сонцам асфальтную шашу, сярод якой, павярнуўшы набок вушатую галаў і цікаўна ўтаропіўшыся на чорнага катка з белым нагруднікам, што асцярожна ступаў па жэрдцы штакетавага плоту, стаяла маладая цёмна-бурая карова.

— Во ўставілася і стаіць, як царыца, — нязлосна засмяяўся малады кучаравы шофер, азіраючыся ў салон аўтобуса.

— Як Тэтчар, — падказаў нехта з пасажыраў, і ўсе давольна зарагаталі, як рагочуць з нязначнага, пустога жарту.

Аўтобус, паволі з'язджаючы на край шашы, мінуў безуважную, загледжаную на пацешнага катка цёмна-бурую карову.

Замільгаў, зліваючыся ў празрысты пас, дашчаны плот, пабег зялёны гарод з цёмна-свежымі загончыкамі падкопанай ужо бульбы, пацягнуўся жаўтлявы цагляны дом з трыма ганкамі, што помніўся Самцу з таго часу, як ён помніў мястэчка, паплылі дашчаныя, яшчэ

ацалелыя з вайны нямецкія склады з высокімі штабялямі скрынак пры іх — парожніх і з посудам, пірамідамі цэглы, скруткаў металічнай сеткі, шарэнгамі прыстаўленых адна да аднае пляскатых скрынак з аконным шклом.

Накрыўшы чорным асфальтам усё даўняе, у мястэчка ўбягала новая шаша. Толькі маўклівымі сведкамі, якія ведалі і бачылі, што было і што чынілася наўкруг, зводдаль шашы прыгнуліся, па-сястрынаму аддана сашчапіўшыся сухаверхімі ўжо кронамі, старыя змарнелыя хвойкі. Але іх разлучаў ужо ржавы металічны гараж, што ўціснуўся між іхніх пабіваных, заплаканых смалою камлёў.

На выгарэлым і стоптаным трохкутніку прыстанцыйнага аблогу, дзе адно бялелі марныя кветкі сухотніку і кучаравіўся сіва-серабрысты палын, гарбатая, як жабка, кабета ў бурачковай спадніцы і шарай, зношанай камізэльцы, апранутай на чырвоную кашулю ў чорныя гарошынкі, навязвала гэтакую самую старую, як і сама, гарбатую казу, што ўпарта і наравіста рвалася з доўгага ланцуга.

На звінючы і натужлівы гуд аўтобуса кабета абыякава і безуважна падняла цяжкую галаў, захутаную ні то ў анучу, ні то ў старую хустку, і па яе даўгавідым, жаўтлява-зморшчаным непрыгожым твары Самец ледзьве ўгадаў Петрыкаву маці, ад дзіва трохі жахнуўшыся, што яна яшчэ жывая. На памяць чамусьці адразу набегла адно тры імёны — Анэта, Анюта, Антоля... Самец ажно спацеў, але прыгадаць якое ж з іх сапраўды было яе, не здолеў. Затое памяць выразна высвеціла той час, калі ў дні

студэнцкіх канікулаў ён прыязджаў дадому і яна, Петрыка Гранкоўскага маці, прыпасваючы тут, на прышашэйных канавах, падласую карову, заўсёды перастрэне яго на вузенькай сцежцы, зарослай высокімі бадылямі цыкорыя ў сініх, па-матылінаму растапыраных кветак, першаю заўсёды павітаецца, ажно яму, Самцу, зробіца брыдка, і абавязкова прыгаворыць: «Во, як убачу цябе, Гэнрычак, так і свайго Петрыка ўспомню. Табе ж равеснік быў, таварышкавалі вы...»

Няхай было ніякавата за старэчую расчуленасць, мройную навалоку слёз на яе пачырванелых вачах, але Гэнрыка Самца патаемна кранала і цешыла тое, што сталы чалавек помніць цябе, нават болей — з павагаю і дабратою гаворыць з табою. І пасля гэтых неспадзяваных і выпадковых спатканняў Самец да шчымлівага болю адчуваў, што і сам дабрэе душою, і разумеў, як трэба шанаваць чалавечую павагу і як трэба асцерагацца, каб не адказаць каму-небудзь злосным і няўважлівым словам.

Расчулены і, можа, знябожаны сам ад гэтага нечаканага ўспаміну, Самец яшчэ раз азірнуўся на старую кабету ў шарай камізэльцы. Яна стаяла каля схуднела-перахлябленай казы і неяк адным вокам, па-курынаму цікавала на шашу, дзе з звінючым гудам нёсся светлы аўтобус, нібы ўгадвала, што пра яе, адзінокую і старую, нехта яшчэ, спагадаючы, думае.

Лёгкі сцюдзёны скразняк ні то шкадавання, ні то дакору абвеяў Гэнрыка Самца, што ён, мусіць, ужо назаўсёды размінаецца з самот-

наю, знябожанаю кабетаю, на якую так імкліва набягае купка невысокага вішанніку і наплываюць доўгія, у адзін пашарак, даўнейшыя хаты, абкладзеныя толькі да сяней сілікатнаю цэглаю.

«Як усё даўняе засланяецца новым і саступае яму месца, — прыкмеціў сам сабе ўзбуджаны Самец. — Але ж боль і пакута застаюцца тыя ж самыя, якія зведаў і спазнаў народжаны перад табою».

Злёгку прыгамаваўшы, аўтобус скіраваў убок, і ў Самцовы вочы пырснула калюча-прамяністае сонца, і ён прыжмурыўся і ад сляпучай яснасці, і ад сваіх затоена-смутных думак. Падкінуўшы яго на мулкім сядзенні, пад колы пабег і заракатаў сінявата-ружовы брук. Пачыналася галоўная вуліца. У салон аўтобуса клубкамі падаў і ўзнімаўся ліловы цень, што кідалі старыя струпаватыя ясені з тоўстымі куксамі кароткіх, у кожную весну абцінаных лап. З нервова-трапяткою радасцю Гэнрык Самец узіраўся ў знаёма-забытыя двухпавярховыя камяніцы, што адсвечвалі белымі фасадамі з патаемнаю цемнатою ў вокнах.

З-за іх насустрач аўтобусу выбегла атынкованая мураванка — даўнейшая яўрэйская крама, што нагадвала нечым прыдарожную капліцу, толькі без крыжа, з закладзеным цэглаю дзвярным праёмам і збітым балконам, заміж якога з сцяны вытыркаліся рыжавыя рэйкі.

Горка ўсміхнуўшыся, Гэнрык Самец прыгадаў, як насупраць гэтай крамы, тады яшчэ з ажурным балконам, яго запынілі двое маладых

немчыкаў — унтэр-афіцэраў ці што? — у шараблакітнай форме сувязістаў з чорнымі, павешанымі на грудзях лейкамі, моднымі іхнімі фотаапаратамі, з якіх потым быў скапіраваны савецкі ФЭД.

Не! Спярша яны заступілі дарогу іхняму янаўскаму Мацею. Нязграбна вялікі, можа, з тыдзень няголены, зарослы па вочы сіваю шчацінаю і па-бабску, на голаву і плечы, накрыты суконнай радзюжкаю, з кошыкам перасыпаных мякінаю ружаватых яец, які ён трымаў на сагнутай руцэ, Мацей, мусіць, найбольш заінтрыгаваў жартаўліва-нахабных афіцэраў.

Пад здзеклівы, трохі, пэўна, падвяселены бенедыктынам ці ромам смяшок, яны пачалі паварочваць на заснежаным бруку старога нямоглага сагнутага Мацея, а потым паставілі ўжо з ім поруч падлетка Гэнрыка, што натрапіў якраз пад руку.

Ім, мусіць, яшчэ не абстрэляным лейтэнантам у новай, з іголкі, форме, надта хацелася паслаць дадому — радні ці нарачоным — фотакарткі з двума тутэйшымі нязвыклымі тыпамі — няголеным сіваватым дзедам, накрытым радзюжкаю і ў вялікіх, раскіслых на адлежным снезе, зморшчаных хадаках і васьмігадовым падлеткам у бурачковым паліто, пашытым з падношанай матчынай спадніцы, і ў ружовых, выразаных з алехавай калоды, дзеравянках, за якімі, як потым агдедзеўся Гэнрык, цягнулася раскручаная мокрая ануча.

Пазалетась, трапіўшы з турысцкаю групаю

ў аб'яднаную ўжо Нямеччыну, ён, Гэнрык Самец, як дзівак і шызік, спатыкаючы ў акуратных і дагледжаных нямецкіх гарадах інвалідаў, нямоглых старых ды наогул пажылых мужчын, успамінаў менавіта гэтую адлежную зіму і, чамусьці, тых двух хлюставата-ганарыстых унтэр-лейтэнантаў, і нават намагаўся ўгадаць і распазнаць іх сярод нямогла і нездароўча-худых састарэлых немцаў. А на рынку антыкварыяту, дзе пад навесамі на століках ляжалі старыя фотаапараты, а поруч, у прадаўгаватых картонных скрыначках шчытнымі калодамі, як у бібліятэчнай картатэцы, былі стусаваны фатаграфіі даваенных і ваенных гадоў, ён, ажно вар'яцеючы ад спакусы знайсці менавіта тую картачку, дзе яны былі знятыя са старым Мацеем, можа з паўгадзіны капаўся у картонных скрыначках з даўнейшымі фатаграфіямі, але апроч ганарыстых бюргераў, маладзенькіх усмешлівых дзяўчат з салдатамі ды афіцэрамі ды сытых маладзіц з чародкамі дзяцей на плячах, нічога не было.

Цяпер, праз колькі гадоў, можна пасмяяцца з самога сябе і свае глупоты. Але ж чалавек упарта шукае і намагаецца вярнуць страчанае.

За трымціваю, звінючаю шыбаю аўтобуса да самцовых вачэй блізіўся ружавата-ясны, як любілі нядаўна фарбаваць, двухпавярховы дом з адзіным балконам, які паабапал падпіралі кованыя, завітыя, як вінаградная лаза, два жалезныя пруты, упрыгожаныя тонкімі, таксама вінаграднымі выкаванымі лісцямі. Надзьмутая скразняком штора з цяжкім уздыхам ападала на злёгку адчыненыя балконныя дзверы. У ак-

не, апраўленым выштукаванымі ліштвамі, загадкаваю таямніцаю прываблівала адчыненая ўсярэдзіну пакоя вузкая фортка. «Хто ж там цяпер жыве?» — міжволі прыўзняўся Самец.

Як помнілася яму, у гэтым непрыемна-ружовым доме вайною была нямецкая гасцініца, тады — белая, у зялёныя касаватыя палосы, замаскаваная ад авіяналётаў, пасля вайны — не менш гаманкі, запруджаны наўкруга вясковымі фурманкамі і пераафарбованы ў карычневы колер савецкі райвыканком, а калі цэнтр перавялі ў павятовы гарадок — ужо недагледжаны жылы дом нападобе інтэрната: сюды пасяліліся наезджыя сем'і то лётнае часці, то чыгуначнікаў, то работнікаў пошты, а сярод іх — станцыйная буфетчыца, яшчэ маладая прывабная кабета, з дзвюма дарослымі дочкамі. Тады ж у восьмым класе і з'явілася яна, хударлявая, з далікатным смуглявым тварком і карымі лупаватымі вачыма, Тарэза Нарушэвіч ці, па-местачковаму, — Тэрэня.

У Самцовай памяці маланкаю ўспыхнула і пачало высвечвацца ўсе даўнейшае: гэтакі самы задушлівы аўтобус і яна — Тарэза, нечакана распаўнелая, але ўсё ж гэтак жа прываблівая, якою была ў школе, калі яны, наіўна-ўражлівыя вясковыя і местачковыя хлопцы, ледзьве не ўсе захапляліся ёю, але ўсе, акрамя хіба яго, Гэнрыка Самца, не надавалі гэтаму захапленню асаблівай увагі, зводзячы ўсё на жарт і хіханкі.

У тым даўнім аўтобусе яна прысела да яго на сядзенне і, не баючыся, нават блізенька, і калі яны разгаварыліся, пераказваючы свае

навіны, і ён, трохі саромеючыся пасля нядаўнага вяселля, прызнаўся нібы жартам, што ўжо жанаты, яна, нечакана змяніўшыся ў твары, нейкім ціхім і здушаным шэптам ад свае роспачы і слёз, што ільдзінкамі заблішчалі на яе поўных карых вачах, ледзьве ўжо вымавіла: «Ці хоць ведаў ты, што я любіла цябе?» Ашаломлены і здзіўлены Гэнрык толькі памкнуўся спытаць: «А ён — афіцэр?» Але яна здагадалася сама: «Я спазналася з ім яшчэ ў шостым класе і ў вашу школу прыехала нібы... ужо яго жонкаю». Яшчэ больш уражаны і здумелы і, можа, нават абражаны пачутым, ці не са здзеклівым ужо смяшком ён намагаўся з ёю пажартаваць. Яна ж ціха заплакала і, прыкусваючы ніжнюю губку, каб стрываць свой плач, паднялася з сядзення і, знябожана прыгнуўшыся, пачала прабірацца да выхаду. Адзінокая, сутулена-гаротная, Тарэза выйшла тады з аўтобуса на глухаватай палявой дарозе. І ён ужо не ведае, трэба ёй было там сыходзіць ці не?

Потым зноў, калі здаралася нагода ўбачыцца, яны, нібы знябыўшыся адно па адным, вясёла жартавалі і праманвалі, не помнячы пра слёзы, дакор і адчай у тым задушлівым, людным аўтобусе. Зноў была міласць, лёгкасць у словах, нязмушанасць у абыходжанні. Пасля разводу з афіцэрам, маючы на руках ужо дачушку, Тарэза выйшла замуж за загадчыка тутэйшай аўтабазы і жыла цяпер, як яна казала, у мураванцы ці бітцы са шлаку недзе за чыгуначным вакзалам, на новым местачковым прадмесці.

Аднак пасля таго яе прызнання, тых раптоўных слёз у людным аўтобусе, у Гэнрыка Самца на душы ўжо назаўсёды астаўся шнарок ці нарасць, як застаецца яна светлым маладзіком на парэзаным пальцы.

І зноў, як прыгаслы жар, затлела жаданне ўбачыцца з Тарэзаю, нібы ступіць на скрыжаванне сваіх даўнейшых гадоў, што так салодка і шчымліва вярэдзяць душу. Але Самец не ведаў, ці гэтага вымагаў узрост, каб спаткаць каго з равеснікаў альбо знаёмых, якія адзін за адным сплывалі ў вечную невядомасць, ці гэта было нешта іншае, з гадамі забытае, але ізноў абуджанае ўспамінам.

«Чым болей мы жывем, — з жалосным і горным шкадаваннем развражаў Самец, — тым цясней нас абступае адзінота». Яму падумалася пра ўласнае жыццё: пражыўшы дваццаць чатыры гады і ажаніўшы адзінага сына, яны з жонкаю, застаўшыся сам-насам у трохпакаёвай кватэры, негадана разышліся, — патаемная злосць перарасла ў сварбу, а задаўненая крыўда — у помсту. Сёлета, ужо зусім даканаўшы сябе, з цяжкасцю і прыгодамі яны разменьвалі кватэру. І вось у сталыя гады, калі нялёгка быць адзінокім, а яшчэ цяжэй шукаць новую жонку, ён, Гэнрык Самец, застаўся, як адзінец — стары вепр ці воўк — у аднапакаёвай кватэры непрытульнага панэльнага дома, да якога не можа прывыкнуць, і ў мікрараёне, што чужы і невыносны яму.

Засланіўшыся рукою ад сонца, Самец уважлівым вокам акінуў купку жанчын, што млелі ў гутарцы каля насцеж адчыненых дзвя-

рэй, над якімі ўздымалася шыльда з разбітым шклом і недакончаным надпісам — «Куліна...», і гурт маладых, падсушаных, загарэлых і абшморганых мужчын, што, затуліўшыся за газетны кіёск, пілі з цёмна-ёдзістых бутэлек, падымаючы іх над шырока, па-жабінаму разяўленымі ратамі, і нікога не пазнаваў: ні сярод паўнагрудых атлусцелых кабет, ні сярод закажанелых, абшморганых мужчын.

Былі знаёмыя адно толькі белыя мураванкі, аблушчаныя і недагледжаныя, з пазбіванымі балконамі, ад якіх асталіся балючыя зломкі ржавых рэек. І сэрца абмыў вусцішны холад, што ён, Самец, заўчасна старэе, не пазнаючы ўжо маладзейшых за сябе людзей.

Мінуўшы двухпавярховыя з прыгожымі фасадамі мураванкі, злучаныя між сабою драўлянымі і там-сям жалезнымі, неразломанымі даўнейшымі брамамі, што нагадвалі магільныя арадкі, аўтобус выбег да нізкага частаколавага плота і ледзьве не наехаў, уміг тармазнуўшы, на карычневага калматага сабаку, якога трымаў за повад зарослы шчацінаю прыгорблены мужчына ў выцвілай вайсковай кашулі і ў сівых, пэўна, ад старых валенкаў атопках.

«Сляпы ці што?» — намагаўся ўгадаць Самец, і па нерухома нахіленай галаве, па насцярожана чуйнай паставе, з якою ходзяць невідушчыя людзі, вызначыў, што гэта быў сляпы. І нечакана для самога сябе, яшчэ з няпэўнасцю і здагадкаю падумаў, што мужчына ў злінялай вайсковай кашулі нагадваў кагосьці з даўнейшых знаёмых. Толькі ж каго? І Самец ажно зніякавеў і жахнуўся ад гэтага — ён быў па-

добны да неразважнага, трохі малахольнага Нупрэя, што стаяў пры дзвярах у чыгуначным клубе, калі энкавэдзіст на вачах у Гэнрыка застрэліў Петрыка Гранкоўскага.

«Але ж Нупрэй быў даўгавіды і даўганосы, — схамянуўся і апомніўся раптоўна Самец. — А ў сляпога круглявы, нават трохі скуласты твар і шырокі, нібы расплясканы нос. Дык хто ж гэта можа быць? А ці не той капітан, начальнік часці ўнутраных войскаў?.. — млявая гарачыня абліла Гэнрыка Самца, але, перамагаючы яе, ён зноў супакоіў сябе: — Не, не адважыўся б забойца жыць тут! Яны ж, забойцы, вельмі ж баязлівыя. Хіба пасмеў бы капітан жыць у тым мястэчку, у якім забіў невінаватага падлетка? Аднак, ці лічыць сябе ён вінаватым?»

Зніякавелы, устрывожаны Самец азіраўся на сляпога прыгорбленага мужчыну, якога ўпарта, напінаючы повад, цягнуў карычнева-агністы калматы сабака, і з няпэўным, ужо раздвоеным адчуваннем паволі адплываў, аддаляўся ад яго, — аўтобус выязджаў на даўнейшы брукаваны, а цяпер заліты шаравата-чорным асфальтам шырокі пляц, дзе ўздымаўся двума вежамі гонкі барочны касцёл, ад якога святлела і перайначвалася ўсё наваколле і дзе між белых мураванак уціснуўся навес аўтастанцыі з бакавым пакоем для касы, за шырокім акном якое залаціліся кудзеркі маладое касіркі, што ветла ўсміхалася шоферу.

Узіраючыся на прыветны і прыгожы яе твар, Гэнрык Самец і забыўся пра сляпога мужчыну з калматым карычнева-агністым сабакам.

Пачмыхаўшы, счах матор, і да пярэдніх дзверцаў па вузкім праходзе, абіваючы калені, пасунуліся няўседныя пасажыры. Нехта з нецярплівых нават закурыў і на Самца завіўся трохі задушлівы, але не забыты і спакуслівы пах тытунёвага дыму. І Самцу, як гэта здараецца з тымі, хто кінуў курыць, заманулася зноў узяць у зубы папяросу, перад гэтым падзьмухаўшы ў доўгі муштук, каб разам з дымам не глытаць тытунь, і, прыкурваючы, учуць гаркавата-прыемны смак дыму, што апякае грудзі і хмеліць трохі галаву, асабліва, калі закурыць нашча.

А да атрутнага курыва, якое потым разрывала ад кашлю грудзі, а вечарам, перад сном, забівала дух, прычасціўся ён яшчэ тут, у мястэчковай дзесяцігодцы, пробуючы зацягнуцца, вядома, з чужых рук, а потым, калі яны, дзесяцікласнікі, уцякалі з урокаў і гулялі на зацішаных зарэчных магілках разам з Тарэзай Нарушэвіч, у ягонай кішэні заўсёды муляў пачак таннага «Норду» або тоненькіх, як цвічкі, папяросаў «Красная Звезда» ці, як тады на іх казалі, «звёздачкаў».

Мястэчковыя падшыванцы яшчэ ў сёмым класе, збіраючыся паступіць у мараходку — марское вучылішча — зухавата і ганарыста закурвалі нават перад дырэктарам школы. З далёкага Кранштата ці ўжо блізшай Клайпеды той-сёй ціхенька і сарамліва вяртаўся дадому, проста не прайшоўшы медкамісіі, бо ўступныя экзамены вартасці не мелі, а той, хто паступіў, праз колькі гадоў згубіўся назаўсёды. І шмат ужо з кім Гэнрык Самец так ні разу не

спаткаўся, а, можа, не пазнаўшы, проста размінуўся.

Як не пазнае ўжо нікога з тых, што сядзяць на лаўцы ў халадку, пад навесам аўтастанцыі, — усе нібы чужыя. Незнаёмаю выдае і пажылая кабета ў фіялетавай кофце, што, паставіўшы пры сходцах эмаліраванае вядро і прысеўшы пры ім на кукішкі, прадае гранёнаю шклянкаю цёмна-агністыя, налітыя сакаўною спеласцю вішні.

Брала ўжо дзіва, што ў свае падлеткавыя ды юначыя гады ён ведаў не толькі адных мястачковых людзей, а нават шмат каго з навакольных вёсак, асабліва тых, хто не раз быў у мястэчку, прыносячы на торг поўны кошык сіва-дымных чарніц альбо воселак жоўценькага, укручанага ў капусны ліст масла.

Лёгка саскочыўшы з аўтобусных прыступак на засмечаны лускою ад семечкаў шурпаты асфальт, Самец растапыранымі пальцамі абедзвюх рук прыгроб чорныя, падсярэбраныя сівізною валасы, абцягнуў і паправіў светлы, пясочнага колеру касцюм і, як на край сцэны, наблізіўся да купкі мужчын, пазнаючы сярод іх толькі асадзістага, у зашмальцаванай кепцы і залітым тлустымі рудымі плямамі камбінезоне, меншага з чатырох братоў Жалязніцкіх. З серадольшым, Жорыкам, гэтакім самым невысокім і шыракаплечым, Самец разам вучыўся ў школе і разам паступаў у політэхнічны. Праўда, Жорык тады не прайшоў па конкурсу і ўжо восенню шмаргануў у вайсковае вучылішча. Афіцэрская служба, мусіць, прыйшлася не да смаку. Ён правінаваціўся — яго дэмабіліза-

валі. У той астатні год, калі Самец напаткаў Жорыка вось тут жа, на аўтастанцыі, і яны нават зайшлі ў буфет, каб прычасціцца, Жорык рабіў ужо настаўнікам і вучыўся завочна на матфаку педінстытута.

Як не раз здараецца ў жыцці, калі зводзіцца сям'я, то зводзіцца яна даастатку.

Першы з братоў (Самец яшчэ вучыўся ў школе), разагнаўшыся на каньках па слабым, неакрэплым лёдзе, шыбануў ажно на сярэдзіну возера і ўскочыў у праломку. На беразе ўчулі толькі яго ашалелы крык — ён прасіў ратунку... Жорыка, дужага саракагадовага мужчыну, у сваім жа пад'ездзе запарола нажамі мястэчковая шантрапа, адпомсціўшы, можа, нават за пастаўленую двойку...

Гады са тры назад, як чуў уражаны Самец, старэйшага Жалязніцкага, па мянушцы Авечка, што рабіў дзяжурным па станцыі, падбіў вагон, які штырханула дрызіна.

І вось з усіх братоў Жалязніцкіх, падобных, як блізняты, з твару, трохі даўганосых, асадзістых і шырокіх у плячах, застаўся толькі самы меншы — Лёнік ці Натоль? — Самец ужо дакладна не помніў.

Ён яшчэ раз краем вока абвёў купку нецярплівых мужчын, што злосна азіраліся, пэўна, змовіўшыся на выпіўку і кагосьці чакаючы, але апроч Жорыкавага меншага брата нікога не ўгадаў.

Пад брылём навеса, дзе стаяла адзіная лаўка і дзе шчыльненька адна пры адной сядзелі кабеты, трымаючы на каленях малінавыя сеткі, поўныя карычневых баханак хлеба, Сам-

цу нібы знаёмым падаўся жаўтлява-белы, зморшчаны твар хударлявай старой жанчыны ў клятчатых тапках на босую ногу. Ён напружыў памяць, перабіраючы абліччы знаёмых здаўна тутэйшых жанчын, але адгадаць, хто і адкуль яна была, не змог. Толькі заўважыў для сябе, што такія даўгавідныя твары былі ў людзей з далёкіх Лудзіч, адкуль гаманкія і вясёлыя ганчары, што пацешна барабанілі палачкамі ў сярэдзіне звонкіх гаршкоў, прывозілі на кірмаш поўныя вазы глінянага посуду.

Уважліва прачытаўшы расклад і прымеркаваўшы, што добра было б патрапіць на слонімскі альбо ваўкавыскі аўтобус, што ішлі ледзь не адзін за адным, Гэнрык Самец павярнуўся, каб выйсці з аблепленага пры столі ажно трыма ластаўчынымі гнёздамі і засмечанага растоптанымі акуркамі навеса, і нечакана ўбачыў перад сабою ружавата-жылістую руку, што цягнулася ні то да яго, ні то да рослага хлопца з наміткамі чорных вусікаў пад ганарыстым, востра задзёртым носам.

Перад вышчарбленымі сходамі, абапіраючыся на скобкі падпашнікаў і трохі прыгнуўшыся, на выпуклых кастылях стаяў інвалід. Шыя ў яго выцягвалася і да чырвані напружвалася. Пад усечаным тулавам, там дзе належала быць правай назе, пустою торбаю пацялепвалася згорнутая ў некалькі столак і прышпіленая нікеляванай прышчэпкай, якою карысталіся даўнейшыя веласіпедзісты, калашына сівых штаноў, левая ж нага, нібы трохі прыкурчаная ад стомленасці, пабліскваала нават новым чорным туфлем. Інвалід быў апра-

нуты па-святняму: чорны, яшчэ не зношаны, пінжак з двума радкамі залацістых гузікаў, напрасаваная блакітная кашуля з расшпіленым у меру каўняром і сівыя шарсцяныя штаны з гэтаю, у некалькі столак згорнутаю калошаю. Самцу, як помніць, і самому некалі заманулася купіць падобны аўстрыйскі ці французскі касцюм: чорны пінжак з двума радкамі залацістых гузікаў і сівыя штаны. Модна і арыгінальна.

Сарамліва пасмехваючыся і падымаючы сіва-цёмную, коратка стрыжаную галаву, інвалід памахаў дужаю рукою і сінія, глыбока запалыя вочы яго нібы слязіліся і прасілі — «Памажэце!» І Самец, апярэдзіўшы хлопца, падбег і схапіў за гэтую ўладна-дужую руку, учуўшы яе шурпаты і гарачы поціск. Яны нечакана сустрэліся вачмі і нібы няўзнак, і неўпрыкмет, улавіўшы штось знаёма-загадкавае ў сустрэчным зірку, абое ўгнулі галовы.

Мажны ў плячах інвалід, падняўшыся пад навес, шырока сягануў адзінаю нагою і, востра паскрыпваючы кастылямі, борзда накіраваўся да лаўкі, дзе, уступіўшы месца, падымаліся жанчыны з малінавымі сеткамі.

Асцярожна ловячы нагамі сходцы, Гэнрык Самец яшчэ ўсё бачыў перад сабою лісліва-ўгодлівую, нібы трохі сарамяжную ўхмылку і хітравата-прымружаныя слязліва-сінія вочы. І раптам, як выбух, як узрыўная хваля, як блізкі ўдар перуна на міг спаралізавалі яго — няўжо ён, Габрыель Жагала? Няўжо яшчэ жывы?.. І такі яшчэ дужы? Няўжо той самы хутаранец Жагала, якога

Гэнрык так перапалохаў сапраўднай вінтоўкай і які потым усё ж хацеў дзіка адпомсціць, калі яны выпадкова сышліся ў хмызняку за чыгуначным мостам...

У Самца казытліваю кропелькаю па спіне пакаціўся пот. Ён яшчэ раз азірнуўся туды, пад навес аўтастанцыі, дзе на лаўку ўжо ўмошчваўся нізкаваты, але шыракаплечы інвалід.

«Не, не можа такога быць! — не верылася разгарачанаму Гэнрыку Самцу. — Жагала быў рослы мужчына, а гэты нібы ў палавіну яго. У дадатак — калека. Але ж мурлаты твар з угодліваю ўсмешкаю нібы яго. Так няўжо ж гэты кілавы д'ябал — ён, Габрыель Жагала? А можа ўсё ж — не».

Самец перабраў пальцамі гузікі на планцы кашулі, расшпіліў два верхнія — млявая гарачыня распірала грудзі: «Няўжо папраўдзе ён — Жагала?» І тут жа ж перасцярог сябе, бо колькі разоў абмыляўся, убачыўшы ў вулічным патоку чый-небудзь знаёмы твар, але, калі чалавек набліжаўся, твар яго паволі расплываўся і рабіўся чужы. Пэўна, да блізкіх, ледзь прыкметных абрысаў фантазія дамалёўвала ўсё астатняе, каб зрабіць твар ужо зусім праўдзіва знаёмым.

«Але ж хто гэта?» — Самец прыпыніўся і яшчэ раз уважліва зіркнуў пад навес на лаўку, дзе поруч з кашчаваю кабетаю ў засіненай падаўнейшаму і па-даўнейшаму, на востры ражок, завязанай хусты, сядзеў ён, прызнаны і непрызнаны Самцом, Габрыель Жагала. Прыстаўленыя да лаўкі, спачывалі і два яго кастылі

з гумовымі наканечнікамі і абшморганымі да белаватасці падпашнікамі.

Самец учуў, як, мусіць, ад свае глухаватасці занадта галосна загаварыла кабета:

— Ты нават не пастарэў. Вогір-кавалер. Удавец жа ж, пэўня?

— Ды прыжаніўся, — глухавата адказаў інвалід, усміхнуўшыся тою ж лісліва-шырокаю ўхмылкаю і ямчэй усаджваючыся на лаўцы.

— А што ж з нагою?

— Палец параніў... З пальца прылучылася... А потым і ногу аднялі. Восьмы год ужо скачу на адной.

— Во як! — здзівілася прыгорбленая, кашчавая кабета.

«Значыць, ён — Габрыель Жагала», — упэўніўся Самец і ўчуў, як задушлівая гарачыня зноў распірае грудзі: яму зноў убачылася нізкая шара-саламяная, у адзін пашарак хата, наўкруга абгароджаная высокім плеценым частаколам, і сцежка, якая, абягаючы хвішчаватыя ядлаўцовыя кусты, на якіх заўсёды, уздрыгваючы хвосцікам, пачэквалі ўстрывожаныя янчыкі, вілася міма гэтага сцішнага, па-воўчы адзінокага хутара. Прыехаўшы на кароткую пабыўку дадому, ён ішоў гэтаю тупкаю сцежкаю, па калені засланаю ружовым дымам дрыготкай мятліцы і падвяселяную нястомнаю траскатнёю конікаў, што пырскалі з-пад ног, мільгаючы і пастрэльваючы, як вугольчыкі, — тады Гэнрыку Самцу заманулася зірнуць на тое ўрочышча з незразумелаю і трохі таямнічаю назваю Юрашча, дзе прайшлі гады горкага і адзінокага пастухоўства, усцешаныя рэд-

кай і кароткай радасцю, дзе засталося нямала крыўды і смутку, што так шчымліва і балюча высмоктвалі дзіцячую душу.

Можа, і тады на сэрцы шчымеў даўні, незабыты смутак, і ўражаны ўспамінамі, расчулены і задуманы Самец не дачуў, як ціхаю, нібы кашачаю, украдкаю яго насціг Габрыель Жагала, мусіць, падрыхтаваны ўжо па-належнаму. Невядома, што змусіла Самца азірнуцца якраз у тое імгненне, калі над галавою ўзнялася Габрыелева рука. Можа, звычайная інтуіцыя, выпадковая перасцярога, што жыве ў кожным чалавеку. І што было зашчэмлена ў дужым кулаку — шыла, нож, абломак жалеза? — таксама невядома. Але судзіў Бог — Самец рэзка і нечакана адхіліў голаву, і цяжкая Габрыелева рука спярша баязліва застыла ўгары, а потым — крутнулася за спіну.

Вырачыўшы чырванаватыя ангорскія вочы, Жагала спіною пачаў адступацца за блізкія маладыя хвоечкі і нарэшце пудка і ціха, як успуджаны лось, знік у раскалыханым гушчары хмызняку. Толькі тады здумелы, яшчэ не апомнены Самец здагадаўся, што значыла гэтая паднятая над галавою рука. Але ён і цяпер не можа як след вызначыць: ці Жагала не рашыўся ўдарыць, ці на які міг замарудзіў?

Праз колькі гадоў ужо, у наступны прыезд дадому Гэнрык няспадзявана пачуў ад бацькі: «У нас зноў чалавека забілі... Падазрэнне падае на аднога і тога ж. Але не дакажаш... Ды людзі баяцца, маўчаць».

Як помніць Гэнрык Самец, гінулі тады, або прападалі без ніякага знаку найболей мяшчане

і найболей тыя, хто варочаўся ў мястэчка з багатых камандзіровак ці ад заможных сваякоў. Забойцу, пэўна, ніхто не шукаў. Скідалі ўсю справу на наезджых, як цяпер кажуць, прыблудаў ці навалач — былых дзетдомаўцаў, салдатню, засуджаных, што ўцякалі, даязджаючы сюды, з далёкае Расіі.

«Няўжо ж гэтая рудаватая загарэлая рука, моцны, шурпаты поціск якое я нядаўна адчуў, падымалася не толькі на мяне?» — у Самца па спіне пабегла і заказытала зноў гарачая кропля поту.

«Але ж Габрыель Жагала быў рослы мужчына, а гэты... — да разгарачанага і ўсхваляванага Самца зноў спадцішка падкрадвалася сумненне. — Хіба можа паменшаць чалавек, страціўшы нагу? Няўжо калецтва гэтак змяняе і перайначвае яго?»

Адышоўшыся ад аблушчанага навеса аўтастанцыі, куды, паблісквaючы пярэднімі, нібы слюдзянымі шыбамі, ужо зварочваў прытомлены чырвоны «Ікарус», Самец прыстакнуў у рваным ліловым цяньку, што падаў ад нахіленай за плотам чарэшні, падсвечанай першым ужо жоўтым лісцем, і здзіўлены ўсім убачаным, расчараваны ад няпэўнасці, глыбока ўздыхнуў: «Але хто ж аднак гэта быў — хутаранец Габрыель Жагала ці выпадковы мужчына, падобны да яго?»

З правадоў з узнёслым, вясёлым цвіркатам, як зярняты са жмені, пырснулі і разляцеліся, мільгаючы ў светла-блакітным, недасягальным небе мададыя, жаўтадзюбыя і стомленыя ад свайго лёту ластаўкі. Чорная, пасыпаная назд-

раватым сіне-ліловым шлакам сцежка, непрыкметна перабегшы шашу, наўскос праз іржавыя, зарослыя валошкавай цыкорыяй запасныя пуці спяшала ад аўтастанцыі да чыгуначнага вакзала: з карычневымі чамаданамі і цёмнымі пакоўнымі сумкамі адтуль марудна валакліся адзінокія пасажыры.

Самец счакаў, покуль прасунуцца, выкіраваўшы недзе ад чыгуначных базаў, два цёмназялёныя фургоны і лабаты, з блакітнаю кабінаю грузавік, і нарэшце перайшоў ліпучую ад растопленага асфальту вузкую шашу. Злева пазвоньваў, падсоўваючыся на ваганетках і падымаючы чырвона-карычневыя кантэйнеры, падобны да пераходнага моста ці каркаса пад'ёмны кран, справа — саржавелым шырокім дахам, што нагадваў дах кітайскай фанзы, падымаўся шары драўляны пакгаўз, і каля яго, на пагрузачнай рампе, што падыходзіла да самых пуцей, як і даўней, ляжалі штабелі свежых дошак, паблісквалі скруткі ацынкованых сетак і двума шарэнгамі жаўцелі шчыльна складзеныя аконныя блокі.

Над пакгаўзам устрывожанаю чародкаю кружыліся і не знаходзілі, пэўна, дзе сесці, шарыя галубы. А сярод іх нейкім першародным анёльскім хараством паблісквалі два снежна-белыя. І Самцова душа зайшлася ад чуйнае радасці, што ён ідзе незабытаю сцежкаю, пераступаючы цераз іржавыя рэйкі запасных пуцей, зарослыя голымі сцяблінамі цыкорыі ў лёгкіх, па-матылінаму раскрытых валошкавык кветках, і зноў бачыць знаёмыя контуры чыгуначнага вакзала з мансардавым

дахам, а поруч з ім, — тыя ж самыя сосны, што помняцца змалку, — пастарэла-знябожаныя і пацямнелыя, нібы прыцярушаныя сажаю. І ўсё, што было перад вачыма, — і шырокія, нібы надзьмутыя, склады, і паласатая пасма пуцей з алавяным бляскам, і чырвона-ліловая вадакачка, што самотна ўздымалася на водшыбе, — усё было знаёмым і незнаёмым, сваім і пачужэлым. Нават неба выдавала іншым, падаўнейшаму не зыркім, а выцвіла-белаватым, нібы захмараным смуткам адзіноты.

Аднастайна сівымі шыфернымі дахамі, сярод якіх там-сям іскрыліся багацейшыя, цынкавыя, за станцыяй сціснуўся новы пасёлак. І яго нібы прыгнятаў маналітны корпус завода з велічным гарматным комінам, за які зачапілася едка-жоўтае воблачка атрутнага дыму.

Абмінаючы пагрузачную платформу, Гэнрык Самец нават з горкім смехам прыгадаў, як калісьці яны з Петрыкам Гранкоўскім падкрадваліся да жоўта-зеленаватых цюкоў тытуню, што цэлымі тарпамі ляжалі тут, каб выцягнуць з іх доўгія пахучыя пампушкі, туга перавязаныя льнянымі вяровачкамі. І назаўтра іхнія кішэні адтапырваліся ад шчодра і тонка нарэзанага, зморшчанага гармонікам, мякенька-пяшчотнага тытуню. Курыва было, вядома, і для самых сябе, і для ўсяго класа — у Гэнрыка, як помніцца, ажно пажоўклі на правай руцэ тры пальцы, як жоўкнуць яны ў заядлага курца.

Але звадыячнаму і распуснаму Петрыку заманулася яшчэ паспрабаваць «Казбека», які курыў толькі маёр з лётнае часці, муж іхняе

зласнавата-строгае, што няшчадна ставіла двойкі, матэматычкі. У сельмагаўскім магазіне, дзе разам з халвою (яна вялікаю неадольнаю гарою, дарэчы, ляжала на прылаўку), кількаю, алеем прадаваліся папяросы з запалкамі, Петрык Гранкоўскі падцікаваў, адкуль прадаўшчыца дастае прыгожыя каробкі з чорным, намалёваным на іх, ганарыстым коннікам у касматай папасе. І покуль яна, акружаная чарадою ўвішных пакупнікоў,важдалася з крохкаю халвою, Петрык паспеў выцягнуць, перагнуўшыся за прылавак, ажно дзесяць каробак «Казбека».

Ці ўляцела Петрыку за ўкрадзеныя папяросы, Самец не помніць, але яго, агледзеўшы гэтыя прыгожыя каробкі з баявітым каўказцам на кані, бацька добра такі пачаставаў чорным, у зарэзах ад брытвы, якую звычайна вастрыў на ім, нямецкім паскам, што захаваўся яшчэ з вайны.

І вось ужо няма ні Петрыка, ні бацькі, і Гэнрык ужо забываецца, як пахне тытунь...

Ад тугіх, як струны на грыфе гітары, бліскучых пуцей пахла мазутам, нібы пахла забытым і зноў уваскросшым дзяцінствам, і Самцу нават здавалася, што ён пераступае тыя самыя ржава-чорныя, укатаныя да бляску шматтоннымі саставамі чуйна наструненыя рэйкі. Ён азірнуўся на пераезд — ці няма цягніка? Але чыгунку занадта меланхалічна пераязджала фурманка. На возе з тоўстымі гумовымі коламі горбіўся самотны фурман. Пераезд ужо быў той і не той — знікла сіняя, ашалёваная будка з прадаўгаватым аконцам,

як знік даўнейшы плот, — шчыльны і высокі, з тоўстых, на стаяка пастаўленых шпалаў, а замест яго цягнулася сцяна з пабеленых панельных плітаў.

Не гэтакім, калі ўважна прыглядзецца, выдаваў і будынак вакзала: яго ганьбіла абліцованая жаўтлявою пліткаю доўгая прыбудоўка, а на мансардавым даху замест густа-чырвонай рымскай, з жалабкамі, чарапіцы цямнела залітая плямамі ржы недагледжаная бляха. Над карнізам падымаўся заломлены ветрам ліст. Калісьці прыгожыя, па-касцельнаму ўзнёслыя вокны з паўкруглымі шыбамі цяпер былі глуха закладзеныя зверху цэглаю, і ў іх уставілі металічныя рамы на адну вялікую шыбу з вузкаю фрамугаю. Абітыя тонкімі ліштвамі і палакіраваныя дзверы нагадвалі да агіды і брыдкасці непрыязны ўваход у занядбанае кафэ.

Узбуджаны Гэнрык Самец нават са злосцю адчыніў іх, неспадзявана апынуўшыся ў вялікай гулка-пуставатай зале без знаёмых кафельных печак шакаладнага колеру, без той сцяны, за якою былі калісьці білетныя касы з двума аконцамі, убранымі ў шырокія выштукаваныя ліштвы. У халаднаватай пачакальні, дзе ў некалькі радоў стаялі нізкаватыя, недарэчна-раскідзістыя блакітныя лаўкі, нехта драмаў, паказваючы з-пад калошаў ружовыя пяты. На Самца толькі няўважна азірнуліся дзве лупаваценькія дзяўчыны ў чырвона-едкіх спартыўных куртках, і ён, не заходзячы далей у пачакальню, рэзка павярнуўся і зноў папхнуў перад сабою непрыветна-чужыя, рыпучыя дзверы.

Прыгорблена сцішыўся на пероне і доўга, нават з нейкім шчымліва-жалосным утрапеннем азіраў спаласаваную бліскучымі рэйкамі, нудна-сцішэлую пад сухім ліпучым сонцам чыгуначную станцыю з нерухомым саставам, што схаваўся ў цень за пакгаўзам. Нешта даўнейшае ажывала ў Самцовай душы і бясследна, як вада ў пяску, прасочвалася і знікала.

З чуткаю насцярогаю, каб не натрапіць зноў на нешта нечакана-балючае, Гэнрык Самец абышоў прыткнутую да вакзальнага будынка нягеглую прыбудоўку, дзе з буфета, з пасудніцы чуўся востры перазвон нажоў і талерак, і апынуўся насупраць пристанцыйнага скверыка. З аднога боку яго абступалі даўнейшыя, нашмат пастарэлыя клёны, з другога — як старыя грыбы, знябожана нахіліліся змарнелыя хвойкі. Пасярод шарага, нібы астылае вогнішча, круга векаваў яшчэ вянок густа-калючых, абсыпаных пылам акацыяў, з краю ўжо прымятых і растоптаных колам грузавікоў, што паварочвалі тут да чыгуначных складоў і пагрузачных платформаў.

Пасярод вянка чорна-сіваватых, густа пераплеценых акацыяў, дзе некалі над магілкаю забітага немца з чыгуначнае аховы ўздымаўся шары цэментны абеліск, старчма высоўвалася бетонная пліта: магілку ці то раскопвалі, ці то раўнялі. Каля пліты, у дзіравым лопусе з дымна-ружовымі галоўкамі цвету і чырванаватым конскім шчаўі вусцішна пахілілася, нібы прыкленчыла, крывая, скалечаная яблынька.

Гэнрык Самец стомлена азірнуўся: чарада худых, перахлябленых і, здаецца, заўсёды га-

лодных козаў, целяпаючы рагатымі вымямі, доўгім шнурком цягнулася сюды. За імі, шлыгаючы нейкімі атопкамі, паволі сунуўся пастух з рудаватым мяхом на плячы.

Падышоўшы да вянка сівых акацыяў, пастух — не малады, гадоў пяцідзесяці мужчына ў злінялай штармоўцы і дзюбатай жакейцы, — спусціў з пляча мех і доўгім кіем, які трымаў у руцэ, пачаў спрытна выпорваць і выкочваць з кустоў пустыя, мутна-закурэлыя бутэлькі. Кідаючы іх у рудаваты мех, скоса азіраўся на Самца, нібы прасіў, каб той адышоўся. Самец, таксама чуючы ніякаватасць і сорам, адступіўся ў рваны ліловы халадок пад навіслыя лапы балюча, да мязгі — абабітага клёна. Ужо адтудь зглядзеў, як сюды, да пастуха, пэўна, на помач, цяжка перавальваючыся і накульгваючы, ідзе немаладая жанчына з капою залаціста-аранжавых, пераафарбованых валасоў і ў занадта яркай для яе немаладых гадоў малінавай сукенцы. Пад пахаю яна таксама нясла скручаны мех. У яе твары, адутлавата-жаўтлявым і хваравітым, Самцу ўгадваліся нібы знаёмыя рысы. І раптам усё разам — неспадзяванасць, роспач, ніякаватасць — балюча турзанулі сэрца: да пастуха падыходзіла Тарэза Нарушэвіч. Божа, як час змяніў і састарыў яе! Хіба тая прыгожая і стройная паставаю Тарэза Нарушэвіч і сённяшняя адутлаватая жанчына, што баіцца сваё заўчаснае сівізны, адно і тое ж? Няўжо гэта праўдзівасць, а не здань, не галюцынацыя, не здрадлівы сон? Нібы правальваючыся ў бяздонне, у чорную прорву, здумелы Гэнрык Самец якую хвіліну стаяў, заплюш-

чыўшы вочы, потым зноў уважна зірнуў на жаўтлява-звялы, зморшчаны жаночы твар, пазнаючы і ўгадваючы ў ім рыскі даўнейшага светлага і наіўнага жаночага хараства. Самца зноў абліла гарачая млявасць і перад вачыма зноў прымерк і паніжэў высокі, іскрысты дзень. Ён паволі і з прыгнечанасцю павярнуўся, як паварочваюцца ад нябожчыка, і паволі пайшоў на сумна-шары асфальтны перон.

Белы гмах вакзальнага будынка з двума фасадамі схаваў усё — і чараду памаўзлівых козаў, і пастуха з мяхом пустых бутэлек, і яе, Тарэзу, у агніста-малінавай, што адбірала вочы, даўгаватай сукенцы. У адзін міг знікла цікавасць да сустрэчы, шчырасці, роспытаў, тым болей не хацелася глядзець адно аднаму ў вочы, бачыць пачужэлы, амаль незнаёмы твар і чуць на сподзе душы прытоены боль і непамерную крыўду на сябе, на Бога, на цэлы велічны свет.

Раптоўны абвальны грукат, а ўслед за ім парывісты віхор і дрыготкае пагойдванне перону ачуцілі задуманага Самца: праз станцыю, не спыняючыся, імчаў, рытмічна грукаў на стыках рэек і едка скрыпеў жалезам цяжка наладаваны таварняк.

«Куды ж усё ляціць і спяшаецца ў гэтым кароткім жыцці?» — Самец бачыў перад сабою то цагляна-чырвоныя вагоны, то платформы, гружаныя залацістаю сасною, то паўвагоны з чорна-сівым, насыпаным вугалем, то тлуста-рудыя цыстэрны, што зліваліся ў адзін суцэльны пас. І калі адсланіўся свет і адплыў халаднаваты віхор і цяжка-гнятлівы грукат, Самец,

уважліва азірнуўшы пустую далечыню пуці ў рудаватых, залітых мазутай шпалах, між якіх яшчэ пакалыхваўся адзінокі кусцік баркуну, нарэшце пераступіў жывыя сталёва-блішчастыя рэйкі, поўныя, як тугая струна, звінючага водгаласу.

Засыпаная лілова-чорнымі шарыкамі шлаку сцежка, зноў вяла да соннага, заседжанага мухамі аўтавакзальнага навеса, дзе, прымасціўшыся на сходах, жанчына прадавала цёмна-чырвоныя вішні ў блішчастых, як вочкі, водсветах і дзе яшчэ, напэўна, сядзеў ён, аднаногі кілавы д'ябал з угодліваю, шырокажабінаю ўсмешкаю на мурлатым твары.

Насустрач, мусіць, да станцыйнага буфета валаклася купка падвяселеных, чырвона-разамрэлых мужчын.

— Піва ёсць тамака? — вяла падняў руку пярэдні з іх, сутулена-рослы, з пышнымі чорнымі вусамі.

— Піва?.. Не, не ведаю, — пакруціў галавою Самец.

— Ага, выпіў нябось, — п'яна засмяяўся, крывячы шчарбаты рот, у якім страшным іклам тырчаў усяго адзін жаўтлявы зуб, сівакучаравы, загарэлы мужчына, што цягнуўся астатнім і падвалокваў калекую ногу.

«Няўжо гэты дэбіл з адным страшным іклам у роце — колішні зух і прыгажун Косця Мазуркевіч? — жахнуўся і саступіў са сцежкі здзівёны Гэнрык Самец. — Той самы ганарысты, запальны і баявіты над усё мястэчка Косця Мазуркевіч?»

Уражаны Гэнрык Самец яшчэ раз засмуча-

на азірнуўся ўслед недагледжанаму мужчыне ў раз' еханай, выпушчанай са штаноў кашулі, што натужліва валок аднятую, мусіць, паралюшам правую ногу.

«Аднак, як люта і нялітасціва-жорстка абыходзіцца лёс з чалавекам», — пецярнёю Самец згроб на грудзях узмакрэлую кашулю — пад ёю тахкала і пульсавала штуршкамі болю ўстрывожанае сэрца.

Каля белага навеса аўтастанцыі, дзе ўжо не было відаць ні кабеты з паліваным вядром вішняў, ні аднаногага інваліда ў святочным французскім касцюме, чадзячы саляркай і адлюстроўваючы цяжкі зад у плыткай лужыне, стаяў светлы аўтобус з двума чырвонымі паскамі ніжай вокнаў, з-за якіх ужо вызіраді твары абыякава-спакойных пасажыраў. «Наваградак» — прачытаў Самец на даўгаватай дошчачцы за лабавым шклом, што адсвечвала калюча-прамяністым сонцам, і, прыспешваючы крок, скіраваў у адчыненыя пярэднія дзверцы. Шофер, што ўвайшоў услед за Самцом, уважна азірнуў аўтобусны салон, прытаптаў у чорнай папцы пуцявы ліст і ўключыў матор. На Самцовыя працягнутыя грошы абыякава і няўважліва махнуў чорна-рудаватаю выгаранаю чупрынаю — «Потым». Задыханы Гэнрык Самец прысеў на пярэдняе, што стаяла ўпоперак іншым, чорнае сядзенне з дэрмацінаваю карычневаю спінкаю. За вокнамі аўтобуса пачаў адбягацца зялёны плоцік з шарымі цэментнымі слупкамі, белыя двухпавярховыя мураванкі з круглымі вокнамі ў ступеньчатых фасадах, і, нібы стомле-

ны карабель, уздымаючы спічастыя вежы з тонкімі пазалочанымі крыжамі, пачаў адплываць выносны барочны касцёл, потым зашугала сцяна цёмна-зялёных прысадаў — старавечных ліпаў і кленаў з недагледжанымі пачарнелымі хаткамі пад імі. Прабег, прамільгнуў ашалёваны з аблушчанаю ўжо фарбаю карычневы дамок, дзе некалі была чыгуначная амбулаторыя і дзе за белымі фіранкамі акна, на кушэтцы паміраў застрэлены капітанам НКВД у той сцюдзёны і ўжо далёкі, як вечнасць, восеньскі вечар Петрык Гранкоўскі.

Але ўражаны і здзіўлены ўсім убачаным пад навесам аўтастанцыі і на чыгуначным вакзале, Гэнрык Самец ужо ўпусціў з-пад увагі тую страшную прыгоду. Яго бурна хвалявала і глыбока трывожыла нечаканая сустрэча з бязногім Жагалам, што калісьці памкнуўся забіць яго, але на які міг замарудзіў, і гэта ўратавала Самца. Неміласэрна балючым джалам у сэрцы шчымеў боль ад няжданага спаткання з заўчасна пастарэлаю і занядбана-гаротнаю Тарэзай Нарушэвіч, у якую Гэнрык у свае школьныя гады быў наіўна, ажно да страты розуму закаханы. Як усё тое даўняе і наіўна-ўзнёслае было нібы зняважана і зганьбена гэтаю нядаўняю сустрэчаю з ёю.

За вокнамі аўтобуса, што імгненна набіраў хуткасць, нібы ў калаўроце, плылі, засланяючы адзін аднога, смольна-чорныя бітумныя дахі прыстанцыйных складаў, паласаты ўзняты шлагбаўм над пустым пераездам, і аўтобус напаследак выбег за мястэчка.

У трапяткой Самцовай душы ўспыхваў і

шырыўся пранізаны прамяністым сонцам чуйны спакой, душа нібы выплывала з цёмных сутарэнняў і непраходных лёхаў на ясны, увабраны ў велічны блакіт неба прастор жыцця, на жывы прасцяг вечнага хараства.

Сцішаны ў думках, чуллівы, як дзіця, Гэнрык Самец адчуваў ужо і балючы дакор і пасвятлелую радасць, што пуставаты, не людны аўтобус так хутка і так спешна аддаляе яго ад шчарбатага, разбітага палярушам Косці Мазуркевіча, ад кілавага, аднаногага, на чорных мыліцах Габрыеля Жагалы з яго лісліваю шырокаю ўсмешкаю на мурлатым твары, ад нечакана і пачужэла-старое і перафарбованае ў едкі каштанава-залацісты колер Тарэзы Нарушэвіч, ад апалай ужо бацькавай магілкі, якую ён збіраўся наведаць, але так і не наведаў, ад усяго таго, на што наляцела, як матылёк на зваблівы агонь, і балюча апяклася прыхільная душа.

Дык чаго ж тады шукала гэтая кволая і безабаронная, як аксамітны начны матылёк, спакутаваная чалавечая душа? Хараства, якое даўно адкрасавала і адцвіло? Радасці, якая змянілася няшчасцем і горам? Сцежку маленства, якая ўжо глыбока заарана? Старавечнага дрэва, якое зламала віхура? Тых людзей, якія даўно адышлі? Чаго ж тады шукала яна, збалелая чалавечая душа? А, можа, усяго толькі самую сябе, загубленую ў гэтым неспазнаным і бясконцым свеце? І, вядома, не знайшла. Як жа ж на старасці гадоў душа размінаецца з чалавекам.

Неспакойны, усхваляваны Гэнрык Самец парыўна прыўзняўся: за белаватымі шыфер-

ымі дахамі цямнейшым чубком старой страхі мільганула бацькава хата і стары, узнёсла-адзінокі сохарань над ёю.

Глыбокі, нібы перадсмяротны ўздых вырваўся з Самцовых грудзей. Першы раз гэтак самотна і адчужана-абыякава пакідаў ён бацькаўшчыну, неспадзявана чуючы ў душы хвіліну ўжо вечнага развітання.

А з-пад сэрца плыў і слізка цурчэў, нібы сухі пясок з-пад сыпкага стромага берага, халаднаваты і шчымлівы смутак.

Утрапёны, абязвечаны і ўражаны тым, што ўбачылася і перажылося ў кароткі час, Гэнрык Самец уцякаў ад свае адзіноты і адчужанасці, ад страху перад чужымі магілкамі і гнятлівага адчування свае блізкае смерці, але хіба можна ад усяго накаванага ўцячы? Не!

*1993—1994 гг.*

# АПАВЯДАННІ

## *ЦІ ЁН АДЗІН?..*

Ён — невысокі, з размашыстай не па росту хадою, некалі у пасляваеннай вёсцы наш сусед і сірата з няспраўджанай марай выбіцца ў людзі, самы, пэўна, мудрэйшы і здольны да навукі сярод двух сваіх братоў, што засталіся з хвораю, разбітаю раматусам маці, пазней — адутлаваты і апушчаны, у белавата-злінялым, нібы абсыпаным мучным пылам касцюмчыку, у замусоленай цёмна-сіняватай кепачцы, з ліловым набрынялым носам і штодзённаю тужліваю прагай у чырвоных запухлых вачах, каб дзе пахмяліцца.

З усіх сваіх братоў ён застаўся, як кажуць у нас, самы няварты: хата ў яго па-даўнейшаму — не абгароджаная, з нізкімі малымі вокнамі, затуленая ад вуліцы развесістаю дзічкаю-грушаю і шапаткім топалем, што вышугаў над калодзежам у выноснае, крохка-слабое дрэва, якое любіць расці на нашай пясчанай зямлі.

Са свайго старога гнязда — той трухлявай, уцепленай пад вокны пухкай кастрыцай хаты,

што стаяла па-суседству з нашай, — яны выбіраліся па чарзе. Першы, жаніўшыся ў дзевятнаццаць, яшчэ пры маці, аддзяліўся, пайшоў з хаты старэйшы брат. Ён, селядоршы — гэта значыць сярэдні — Федзя, вярнуўшыся з вайсковай службы, адкуль прынёс не знанае яшчэ ў вёсцы захапленне футболам, жыў у трухлявай прадзедавай хаце, што дзівам уцалела ў ваенным пажары, занадта доўга, ужо нават ажаніўшы і аддзяліўшы малодшага брата і пахаваўшы маці.

Паслухаць трансляцыю футбольнага матча, асабліва калі гуляла тбіліскае «Дынама» (Федзя служыў у Грузіі), ён бегаў ажно за чатыры кіламетры ў мястэчка на чыгуначную станцыю, дзе на слупе вісела і не выключалася, пачынаючы з шасці гадзін раніцы і канчаючы боем курантаў, серабрыста-белая труба гучнага рэпрадуктара.

Вёска ведала, чула і бачыла гультаёў ды махляроў, карцёжнікаў ды канакрадаў, разумела, што мужчына можа ўцягнуцца, ці, як казалі ў нас, уружыцца ў гарэлку, прапіць усе заробленыя мазалём грошы, нават астатнюю сарочку, ды ці мала да якога граху можа дайсці чалавек, але каб сталаму хлопцу мець інтарэс да футбола, да мячыка, за якім бегае басата, то такога дзіва яшчэ ніхто не бачыў і ўсе ніякавата пацiскалі плячыма: «Ну, чакай ты ўжо з яго дабра».

Але сапсаваў Федзю не футбол, а стайня, што спачатку, калі арганізаваўся калгас, была ў нашым гумне і куды сагналі ўсіх вясковых коней і дзе Федзя даглядаў іх — паіў і карміў.

Яго прыхільнасць і любоў да коней не мела нічога супольнага з ганарыстасцю і форсам, каб праскакаць на дагледжаным, выпешчаным стаенніку, гэта была простая чалавечая замілаванасць да жывёлы, калі не сказаць — язычніцкая пашана ці нават пакланенне ёй.

Яна пачалася з вайны, калі ён прывёў у свой плецены з трысця хлеў бельгійскую з параненай нагою каштанавую кабылу, якую, адступаючы, у алешніку пакінулі немцы і ад якой ён выгадаваў жарабятка, а потым ужо і святлейшую буланую жарабіцу, прыгожую і статную, і таму, пэўна, шкадуючы яе і баючыся пакінуць на іншых, Федзя папрасіўся ў конюхі, каб ужо даглядаць самому.

А дзе коні, там і людзі, і не толькі тады, у даўняй вёсцы, а і цяперашняй, — раненька з ліслівым словам, а вечарам ужо з пачастункам і абавязкова сівухай, а як жа без гэтага — уважыў, даў каня вывезці гной ці пасадзіць картоплю.

Ды не толькі częставалі, давалі яшчэ, каб не спаткнуўся, і з сабою. І Федзя хадзіў, кісла і асалавела пасміхваючыся, не толькі вечарам, а ўжо нават і зранку.

Новы, ці не трэці ўжо, дырэктар саўгаса здаў коней на мясакамбінат, з трыццаці пакінуўшы толькі пяцёра для падсобнай работы на ферме, і Федзя, парабіўшы простым рабочым у саўгасе не больш як год, перакінуўся ў мястэчка грузчыкам на перавалачную базу. Работа там была не лёгкая, але там быў, як кажуць, свой навар — шафёры з далёкіх раёнаў, што прыязджалі па шыфер, цэмент, шкло,

клікнуўшы на помач грузчыкаў, мусілі раскашэліцца, бо грузчыкі, як вызначылі самі, «адвячалі» за базу — выгружалі толькі з вагонаў у склад ды парадкавалі ў складзе. Тады-сяды іх пасылалі памагчы сельпоўскай загадчыцы Тані, якую чамусьці асабліва прывячаў высокі і не брыдкі з твару загадчык перавалачнай базы. Гэта я ўжо ведаю з апавяданняў бацькі, які працаваў там на базе ў пазаведамаснай ахове.

Рыжавата-агністая, спакусліва-паўнаватая Таня была разводная — кінула мужа і цішком займала маладых мужчын і хлопцаў.

Грузчыкі, калі не было чаго рабіць, лавілі местачковых коз, што прыходзілі сюды на перавалачную базу, залазячы на складзены пад навесам шыфер, на бочкі з селядцамі, на цэмент, і прывязвалі ім да хваста бляшаную банку, абавязкова з каменьчыкамі. Бляшанка бразгацела, і перапуджаная каза ляцела стрымгалоў, не помнячы ўжо і сама, куды ляціць, нават пад таварняк, што, не спыняючыся і трохі сцішыўшы ход, мінаў станцыю, і на дзіва ўсім выскоквала з-пад яго жывая.

Вагоны пад разгрузку, бывала, не падавалі суткамі і пасля нуднай лежні ў халадку на мураве пад старымі клёнамі, што наўкруга сябе рассцілалі варухлівы цянёк, хто-небудзь з грузчыкаў здымаў зашмуленую кепачку і пускаў па крузе, і ўсе з нейкай радаснай ухмылачкай абмацвалі кішэні, дастаючы пакамечаныя рудаватыя рублі, а потым крадком беглі да Тані на гарэлачную базу. Прыносілі пад поламі пінжакоў, падтрымліваючы пад дно, тры гусакі, або, як казалі, тры паўтаракі віна.

Схаваўшыся за награмоджаныя пустыя скрынкі ў сутачках між складаў, пілі спачатку там, закусваючы якімі-небудзь сушкамі хлеба, што астаўся ад полудня, і добра хмялелі, а надвячоркам ішлі дабавіць у чубе да старой Казмерчыхі, што, задраўшы чырвоны аблуплены нос і мільгаючы худымі выпетранымі нагамі, шмыгала то ў сенцы, то з сянец, носячы заткнутыя папяровымі размоклымі заткаламі бутэлькі слабенькай, што нават і не гарэла, самагонкі, якую яна перакупляла ў вясковых маладзіц, што прыбягалі ў мястэчка, накінуўшы на плечы вялікія хусткі, і пад гэтымі хусткамі прыносілі карзіны з цяжкімі трохлітровымі слоікамі.

Пасля такога гасцявання, а калі яно здаралася пасля палучкі, дадому Федзя прыходзіў без рубля ў кішэні. Непадступна-маўклівы, яшчэ не вычханы ад перагару, злы, крыўдны на сябе і на цэлы свет, ён толькі і чакаў, калі адзавецца, акажацца яго нязграбна-высокая сутулаватая Люба, каб схапіць што-небудзь падхватнае ў руку і вытурыць яе з хаты, і не проста вытурыць, але яшчэ прабегчы за ёю ўпагон праз усе вясковыя агароды; у Любы тады быў адзін ратунак — дабегчы да блізкага, што ўжо зліўся з мястэчкам, хутара, да стрыечнай сястры і там засунуць дзверы.

Назаўтра ж уся наша вёска траслася ад нечаканай навіны — сустрэўшыся на вуліцы або пры калодзежы, жанчыны перапытвалі адна ў адной: «Людцы, ці ж бачылі, як учора Федзя гнаўся за сваёю, балазе не злавіў, а то зняве-чыў бы. Гэтакі шалёны быў».

Любу сваю, ад бядоты ды нэндзы схуднелую панурую маладзіцу, якую ўзяў з суседняй вёскі разам са старою зрубленаю на даўнейшы лад, але яшчэ моцнаю хатаю, Федзя не любіў.

Калі ж мая маці сарамаціла яго, што ці варта гэта біцца, каб людзі потым смяяліся і каб самому брыдка было, Федзя цвёрда, па-цвярозаму ўжо злосна і, не тоячыся, адказваў: «Цётка Броня, ну не люблю яе. Збрыдзела яна мне. І смярдзіць, не падысці».

Пэўна ж, грузчыкам на перавалачнай базе Федзя доўга не ўтрымаўся. Астаўшыся без работы і без рубля ў кішэні, ён трохі прыпыніўся і перастаў піць.

Стоячы неяк на местачковым рынку каля каляскі з яблыкамі, нарванымі, пэўна, недзе ў сваякоў, ён павітаўся са мною і тады ж пасля нашай нязначнай гутаркі з роспытамі пра жыццё ды здароўе, са смуткам прызнаўся: «Цяпер не п’ю — грошай вобмель».

Але гэтая яго смутная радасць, якою ён дзяліўся з усімі для адводу вока, каб неяк супакоіць сябе і іншых, была, вядома, кароткай, усяго покуль не прадаліся дробныя, пабітыя паршою яблыкі і ў руцэ не замуляў рубель.

Бо варочаючыся дадому, я ўбачыў яго пры грудку збоку не вельмі яшчэ бойкай тады і не заасфальтаванай шашы: ён ляжаў на сваёй двухколцы, упёртай прастакутнікам ручкі ў жвірыстую сцежку пад сухім, сцішным шэптам адзінокай бярэзіны.

На другі год, у пачатку кастрычніка, у пору бабінага лета, калі ў нас яшчэ, бывае, дакошваюць атаву, калі стаяць ціха — прымружаныя і

зацягнутыя сіняватай смугою дні і свецяцца жоўтай яснасцю шурпата-калючыя дзічкі на затравелых узмежках поля, дык на другі год, прыехаўшы дадому, я пачуў нечаканую вестку, што працяла шчымлівым болем маё сэрца: памёр Федзя, во нядаўна, на тым тыдні.

Перад гэтым Федзя ўжо рабіў на базе шклатары, прымаючы бутэлькі, якія тады, асабліва ад «чарніла», здавалі цэлымі мяхамі, падвозячы на веласіпедах. Там, на базе шклатары, ён і параніў сабе нагу. Рана разгнаілася, але ён маўкліва трываў, покуль нага не распухла і покуль яго не паклалі ў бальніцу, збіраючыся ўжо нават рабіць аперацыю — у яго пачыналася гангрэна... Ён, вядома, не даўся і ўцёк дадому.

Прыцікаваўшы ды падпільнаваўшы, што і дзе робіцца ў вёсцы: хто перастрэшвае хату, хто перасыпае хляўчук ці муруе склеп, ён кульгаў туды і самапростам рваўся памагаць, больш замінаючы, пэўна ж, і перашкаджаючы ў рабоце. Ён нейкім сваім нюхам чуў, дзе будзе чарка.

Потым знайшлася справа ўжо нібы і па ім — адспеўваць са старымі бабамі нябожчыкаў. Федзя дастаў недзе пад чужою бэлькаю стары, падточаны моллю каталіцкі малітоўнік, і ўжо нібы замяніў арганіста, былога валютчыка, што быў нават і сядзеў, за тое, што хітравата, нават не сам, а праз іншых, нібыта на спрат, у старых бабак, што ў святыя дні, не могучы, але прыпаўзалі да касцёла, вымагаў залатыя, яшчэ мікалаеўскія пяцёркі ці дзесяткі, а цяпер, вярнуўшыся з турмы і перабраўшыся ў далёкі Слонім, і па хваробе ды па калькасці пахаванняў не паспяваў прыехаць.

Бліжэйшыя вёскі пачалі запрашаць Федзю — ён быў нават выгаднейшы: не трэба столькі плаціць, хіба ўжо рубель, адно, вядома, пасадзіць за жалобны стол, дзе перад першаю памінальнаю чаркаю Федзя яшчэ зацягваў кароткую малітву.

Аде нялечаная нага ўзяла сваё, і Федзя злёг, цярпліва, у муках пераносячы боль — адгнівалі пальцы, і гэтак цярпліва і ўпарта, нібы на злосць, на помсту, на дакор усім, з гнеўным адчаем чакаючы смерці.

— У труне ён ляжаў, яж жывы, — расказвала мне маці. — Тыдзень, як пахавалі. Во малітоўнік у мяне забыўся. — І яна дастала тоўстую кніжку ў лакіраванай вокладцы.

Мне ўспомніўся нечакана далёкі дзень лета, пясчаная дарога, на якой яшчэ не высахлі дажджавыя лужыны, і ён, Федзя, босымі нагамі падганяе, таўчэ ў чэрава сваю бельгійскую кабылу, поруч з якой тупае цыбатымі ножкамі палавое, з кучаравым хвастом, палахлівае жарабятка.

*1987*

## *МАЛАДЗІКОВАЯ НЯДЗЕЛЬКА*

На маім стале ў цёмна-ёдзістай шкляной вазе — букет трохі прывялых палявых кветак: сіняй злінялай валошкі, жоўтых з паніклымі галоўкамі рамонкаў (дзіва, але ў нашай старане я не спатыкаў іх) і ружавата-махрыстых шчотачак перапялічніку.

За акном — росная ліпеньская раніца, чамусьці па-асенняму халаднаватая, з нерухома сінім шкляным небам, на якое, чапляючыся за крыжавіны антэн, што выткнуліся з карычневых дахаў суседніх дамоў, набягаюць зырка-белыя, падсвечаныя знізу ранішнім невысокім сонцам, пухкія хмаркі. Душа зноў стыне ад прадчування бясконцага дажджу. Хоць учора, нібы на змену пагоды, на ружавата-чыстым небе, як толькі закацілася сонца, выясніўся танютка — белы, толькі што народжаны маладзік. У такія пагодныя, пад маладзікову, як маці казала, нядзельку, дні, сеўшы ў душнаваты з трапяткімі фіранкамі, з тугім скразняком, з ванільным пахам баранкаў і цёплым духам свежага хлеба вуркатлівы «Ікарус», я ехаў звычайна дадому...

Здаецца, нядаўна гэта было, а ўжо прабегла пяць ясных вёснаў з нізкім лётам ластавак над пясчанымі вясковымі дарогамі, з раскалыханым сінявата-ружовым жытам, абапал гэтых дарог, з адзінокімі пустымі хутарамі каля здзічэлых сівых яблыняў, з нейкімі смутнымі ці нуднымі ад чакання аўтастанцыямі.

Цяпер мая дарога дадому раптоўна абрываецца перад глыбокім ярам пустэчы, калі падумаеш, што ўжо не стрэне цябе, прыпасваючы на паўмежку карову, басаногая маці і не падасць шурпатую руку, кінуўшы граблі на падсушанае, растрэсенае на надворку і пахучае ад зуброўкі сена, прыжмураны, з дзіцячай ад бяззубага рота ўсмешкай, у вечнай, што скідалася толькі за сталом, кепачцы здзіўлены бацька.

І душа зашчыміць і абальецца гарачынёю жалю, калі ўявіш ужо зарослы лопухам, быльнікам і баркуном надворак, завязаныя нібы назаўсёды пацямнелым дротам весніцы, хату з наглуха зашморгнутымі фіранкамі ў маўклівых сляпых вокнах. Да парога не бяжыць тая даўнейшая, вытупаная нагамі ў мяккай мураве, у стракатай дзяцелінцы чорная крываватая сцежка, а на пляскаты камень пamагільнаму ўжо напаўзае доўгімі растапыранымі пасынкамі-плетунамі нязводны спарышнік. Помніцца і яна, счарнелая рамка ад матчынага абраза, павешаная на ржавы цвік каля вугла, як помніцца і пуга з рагатым ядлаўцовым пугаўём, што стаяла пры шырокім, перарэбленым з даўнейшага гумна, шара-патрэсканым глухім хляве, дзе ўжо не ўздыхае, паражоўваючы жуйку, прытомленая карова, як не пудзяцца, блытаючыся ў гарахавінні, трапяткія авечкі.

Летась я пастаяў пад застрэшкам, перачэкваючы дождджык і чуючы нешта невыразнае, забытае і даўняе ад сточаных шашалем сцен, з жоўтаю парахнёю, нацярушанаю з глыбокіх чорных дзірачак на парваную сівую павучыну.

Ад дзікай з шурпатым камлём грушкі, што расла на ўзмежку, каля якой я фатаграфаваўся, стаўшы між яе белых, як абляпаных смятанай, звіслых галін, застаўся шары невысокі пень.

Грушку зрэзалі, горка казаць ужо — свае...

Іх, мацеры з бацькам, не стала, як цяпер ужо здаецца, нібы разам, хоць паміралі яны праз два гады: спачатку маці, паляжаўшы з

тыдзень у бальніцы і нават даўшы наказ, у што і як яе ўбраць, і перад смерцю, як гэта зрабіла яе маці і бабка, памыўшыся, а праз два гады — бацька, ужо адзінока, седзячы на канапе і не паспеўшы апрануць чыстую бялізну — яна засталася ляжаць горбачкаю на крэсле пры той жа канапе.

Гэта таксама наш беларускі звычай — перад смерцю памыцца і адзець новую сарочку.

Што ў хаце нешта прылучылася, дагадаліся суседзі: цэлы дзень гарыць электрычная лямпачка і ад калодзежа да парога замецена снегам і нярушаная сцежка.

Мне пазванілі вечарам з нашай гарадской пошты, што ёсць тэлеграма, прачыталі нейкім хрыплаватым голасам яе кароткі змест, той змест, што нечакана прыгняце і аглушыць чалавека: «Памёр бацька. Пахаванне паслязаўтра. Прыязджайце ўсе».

Не, гэтых слоў цяпер не было: «Прыязджайце ўсе...» Яны былі ў бацькавай тэлеграме, калі памерла маці, два гады назад, у цёплыя сакавіцкія дні 83-га. На нашай пясчанай зямлі нават сышоў снег, і шашу перабягалі жаўтлява-ржавыя курапаткі, са спалавелага, збэрсанага ржышча мякка ўспырхвалі жаваранкі.

У лютым 85-га, як і сёлетняй зімою, стаялі моцныя маразы.

У сцішэлы, з ружавата-агністым захадам надвячорак, з сінімі ўжо смутнымі доўгімі ценямі на чыстым снезе, я быў дома на заснежаным двары, з нейкім яшчэ патайным недаверам, што папраўдзе бацькі няма, увайшоў у настылую, тры дні не топленую хату, дзе абапала

труны на заслонах сядзелі нашы вясковыя і хутаранскія кабеты.

Бацька, убраны ў цёмна-сіні касцюм, ляжаў у тым велічным спакоі, у якім звыкла ляжаць нябожчыкі. На падушцы побач з яго застылым, бяскроўна-белым тварам, які варажыў, паказваў на нешта благое яшчэ месяц назад перад астатняй нашай сустрэчай, калі я прывёз бацьку цёплую бялізну. Браў ён яе ўжо нехаця, перад гэтым сказаўшы: «Нашто яна мне». Як не брала і маці падораную ёй сінюю ў чырвоныя ружы японскую хустку: «Да мяне ўжо нічога не йдзе. У мяне і простыні вашы ляжаць неўжываныя».

У бацькі з нагруднай кішэнькі выглядала расчоска, якую паклаў яму нехта з суседзяў, рукі былі перавязаны белай хустачкай.

Курносая, з цёмна-русымі, што выбіваліся з-пад суконнай хусткі, валасамі кабета, суседка праз адну хату, знарок, мусіць, для мяне ўжо ўздыхнула:

— У чацвер у нас быў. Прыйшоў прыбраўшыся, у фрэнчы.

Стрыечная сястра з блізкай суседняй вёскі Алена галосна, таксама ўжо для мяне, загаварыла:

— Дзядзька Ладзімяр у сорак дзён пасля мамы памёр. Яшчэ на саракавіны прыходзіў.

І кабеты адна перад другою пачалі пераказваць кожная сваё.

— Акуратны мужчына быў. Сам па сабе. Нікому не дакучаў.

— Мая мама лежма ляжала, пяць тыдняў.

— А ў яго во — лёгкая смерць...

— Не кажы, любка. У святым пісанні пішацца: «Збаў нас, божа, ад наглай і неспадзяванай смерці».

Даўкі камяк сціскае маё горла — я маўчу.

— Спі спакойна, спачывай, — нечы голас дадае мне жалю, і я, каб не заплакаць, выходжу на двор, гляджу на вазок, засланы малінавай стракатай радзюжкай, на каня, што ловіць на снезе цёмна-папяловымі губамі падкінутую канюшыну.

З братам мы яшчэ паедзем шукаць і прасіць назаўтра далакопаў ды наказаць сваякам з далёкіх вёсак, хто не ведае яшчэ пра бацькаву смерць, асабліва яго хрышчонай дачцэ, што замужам ажно за восем вёрст адсюль, у далёкіх Лудзічах.

...Пайшоў ужо трэці год, а тая паездка па навакольных вёсках сярод ветранай марозлівай ночы помніцца выразна. Нешта было ў ёй не толькі горкае, перамешанае з жалобай, але быў і іншы, яшчэ нават не вызначаны да сёння смутак і жаль — я расставаўся не толькі з бацькам, але і з тым родным, навакольным светам, з людзьмі, якіх ведаў змалку, але з якімі, пакінуўшы вёску, страчаўся рэдка, а цяпер, аб'язджаючы гэтых людзей, нібы развітваўся нанова і ўжо назаўсёды.

Першая хата, каля якой мы прыпыніліся, была ў суседняй, недалёкай — усяго за саўгаснымі фермамі — сселенай з хутароў, пабудаванай нанова, на сваіх і не сваіх дварах, невялікай вёсачцы.

Мы прыехалі да стрыечнай сястры Алены. З глухой, з касабока прылепленай дашчанай

верандай, хаткі на нас дыхнула кіславата-саладжавым духам вантробаў, крыві — усім тым, чым пахне хата пасля разабранага парсюка.

Я спатыкаюся ў цёмнай верандзе, ідучы на голас брата і яе, Аленін, што адгуквалася ўжо недзе з кухні. Там было таксама не вельмі ясна ад цьмянай лямпачкі. З непамытым яшчэ сталом, з апольцамі тоўстага дрыготкага сала на ім, з місамі і чыгунамі на падлозе, вузенькая цесная кухня таксама прыгнятала мяне.

— Я зараз, братка, — Алена выцерла аб фартух свае тлустыя рукі. — Пасядзеце — я мігам.

— Сядзець няма калі. Дзе ж Арсей? — пытае брат.

— Спіць вунь у хаце. Парсюка разабралі, прычасціліся са старым Кузюком і спіць.

— А мы прыехалі во, — брат паказаў на мяне, — папрасіць, можа, Арсей прыйшоў бы дол капаць?

— Прыйдзе, — Алена ўздыхнула. — А ваш тата, тут у нас седзячы, усё казаў, каб адразу памерці. Як прасіў, так бог і даў. Сэрца яму балела. Жаліўся мне. Я валяр'янавых капель наліла, так ён, акрыяўшы, і чарку ўжо просіць.

Я глядзеў на статную, па-дзявочы лёгкую, не распаўнелую, як усе замужнія жанчыны, Алену, прыгадваючы ўжо і яе жыццё, мусіць, па-свойму не вельмі і шчаслівае. Да год трыццаці пяці, калі не больш, сядзела ў дзеўках. Па нейкім ужо лёсе, ці, можа, з жалю да сябе і адзінокага суседа па даўнейшым хутары Арсея Самахвалава выйшла за яго замуж.

Гэта было нешта большае, чым жаль, шкадаванне. Арсей Самахвал недзе ў гады тры ці чатыры пасля вайны разам з братам застрэліў свайго бацьку на хутары ў каханкі — аўдавелай кабеты.

Братоў Самахвалаў судзілі. Старэйшы з іх, што страляў у акно з абрэза і якому далі на некалькі год больш, дадому так і не вярнуўся. Вярнуўся малодшы — Арсей.

Чаму яго прывяціла Алена, для мяне як было, так і засталося таямніцай. Кажуць, ён сватаўся да яе некалькі разоў, усё больш настойліва і ўпарта падходжваў да яе, покуль, нарэшце, не ўзяў замуж, дарэчы, усунуўшыся ў іхнюю хату прымаком.

Арсея бачыў я разы са два, не больш: першы раз, калі ён вярнуўся з турмы, другі раз у хаце — іхняй, ужо агульнай пры Аленінай маці, маёй цётцы. Ён маўкліва піў, седзячы разам са мною за сталом, гаварыла Алена, але, вядома, не пра тое, як яны пажаніліся, а пра тое, што яму нездаровіцца, хварэе нешта на жывот.

— Не, сястра, ты нічога не стаў на стол, — замахаў рукамі брат. — Няма калі, а збірайся сама, паедзем да Веры. Без цябе хату не знойдзем. Разбудаваліся Лудзічы.

— Дзіва што. Зліліся з Рудняй.

Па вуліцы ўжо, калі мы вузкай у глыбокім снезе сцежкай падыходзілі да накрытага старым кажухом каня, брат нечакана заступіў сцежку Алене:

— Не, заедзем спярша да Анюты. Папрашу яе Геніка. Малады, здаецца? — перапытаў

брат, скіроўваючы каня назад, на ўкатаную машынамі дарогу, што едка завішчала пад палазамі.

— Дзіва што, — угнулася ад стрэчнага пранізлівага ветру Алена.

— На колькі ж ён маладзейшы за яе?

Алена памаўчала, нарэшце, цяжка, нібы з жалем, уздыхнула:

— Лічы, што сынам прыходзіцца. Во глядзі і праехалі хату, — махнула яна рукою на чорную ліпу, што расла за плотам, нібы асцерагаючы ўвесь двор. За рэдкім штыкетнікам пабеглі сінаватыя ад мігатлівага святла тэлевізара невялікія ў шэсць ці восем балонак вокны, змайстраваныя сталяром яшчэ па старой даўнейшай модзе.

Мы ўвайшлі ў хату, таксама па-даўнейшаму не разгароджаную і прасторную, з адной толькі печчу, сваім прыходам збянтэжыўшы гаспадыню, што, падкурчыўшы ногі, сядзела на высокім жалезным ложку, і гаспадара — лысаватага і трохі сутулага мужчыну, што, упёршыся рукамі ў калені, занадта блізенька прысунуўся з крэслам да экрана тэлевізара, які стаяў у покуці, каля адсунутага стала.

Сінаватае святло то ўспыхвала, то прыгасала — на экране мяняліся кадры, чужы голас нешта гаварыў, але сэнсу я не разбіраў: у галаве раіліся нейкія свае, балюча-атупелыя думкі — мне ўсё бачылася хата, дзе адзінока ляжаў бацька (суседзі вечарам пачалі разыходзіцца), і бацькаў мярцвяна-белы твар, які я убачыў знадворку праз шчыліну незавешанай да астатку фіранкі, калі мы ад’язджалі, не вы-

ключыўшы той адзінай, што звісала са столі, ярка-сляпучай лямпачкі, і маё сэрца як сціснуў, так і не адпускаў камяк жалю, што бацька як быў адзінокі, так і застаўся — і ў жыцці, і ў смерці.

— Ну што, піянерка?.. Маладзееш усё, — не здымаючы пышнай, перафарбаванай у нейкі непрыгожа ржава-рыжы колер трусінай шапкі, брат трасянуў ёю, павярнуўшыся да ложка.

— Знайшоў маладзенькую, — Анюта яшчэ больш падцягнула пад сябе ногі і сцялася на высокім ложку, цікуючы трохі спадлоб'я на мяне.

— Геніка адпусціш? Заўтра будзем дол капаць. Вы ж чулі, пэўна, — бацька памёр.

— Чулі, спачуваем, — адарваў нарэшце ад тэлевізара сваю лысіну Анюцін мужык. — Позна сказаў, але пайду папрашу суседа, каб падмяніў заўтра.

— Пры кароўніку ён, корм падвозіць, — сказала Анюта і ужо да яго: — Генічак, але ж трэба неяк прыйсці.

— Прыйдзе, калі што дак і я падмяню, — Анюта пільна і уважліва прыцікоўвалася да мяне.

— Не бабская гэта работа, — махнуў на ложак рукою і падняўся з рыпучага крэсла сутулавата-вялікі гаспадар у суконным хатняй вязкі світэры з расшпіленым замочкам на каўняры. — Сам разбяруся.

Мы выйшлі з хаты. За вёскаю вярнуліся да скрыжавання, на чорную выезджаную да асфальту шашу і паехалі збоку яе, выбіраючы белы пасак зледзянелага снегу. Шаша была ўжо

без бярэзін, трохі пашыраная з тых даўніх дзён, якія помню выразна, як помню і першага Анюцінага мужыка, чырванашчоката, крывавагата ў нагах Грышку, ці не «ястрабка», што з'явіліся пасля вайны ў недалёкім мястэчку для барацьбы з дэзерцірамі ды рознымі бандамі, якія яшчэ туляліся ў нашых навакольных лясах. Грыша няшчадна піў і на нашых вясковых вяселлях ці вечарынках даставаў пісталет, скрыгатаў зубамі і гразіўся, стоячы дзе-небудзь каля дрывотні у чорным, як прорва, асеннім прыцемку, некага застрэліць... І гэта здарылася, толькі не ў нашай вёсцы, а ў блізкім мястэчку, дзе Грышка пераходзіў пуці вузкай калейкі перад самым дэпо, адкуль якраз высунуўся паравозік.

Машыніст спярша, вядома, даў свісток, а потым ужо і крыкнуў на Грышку, што староннямy чалавеку хадзіць тут не дазволена. Вар'яцеючы ад знявагі, нервовы, мусіць, недзе кантужаны Грышка выхапіў пісталет і кінуўся да машыніста. Бачачы бяду, машыніст рвануўся ў адчыненае дэпо, але ўскочыць у яго не паспеў: куля дагнала яго якраз на парозе.

Грышка пусціўся ўцякаць у блізкі ад мястэчка лясок, але пагоня з сямі байцоў чырвонапагоннікаў насцігла і акружыла яго там. Залёгшы ў ямцы пры маладой прысадзістай хвоечцы, Грышка пачаў адстрэльвацца і параніў байца. Шкадаваць тады яго ніхто не стаў: стралялі ўжо, каб не ўпусціць з рук, і даволі цяжка паранілі. Покуль Грышку прывезлі ў мястэчка, покуль дачакаліся цягніка і покуль адправілі ў далёкія Баранавічы ў бальніцу,

Грышка сцёк кроўю і сканаў ужо на аперацыйным стале.

Забіраць ды хаваць яго тут Анюта не паехала. Пабыўшы колькі месяцаў у гэтым няўдалым ды зганьбеным замустве, Анюта засталася ні то дзеўкаю, ні то ўдавою, бо з Грышкам жыла, не ўзяўшы царкоўны шлюб (ён тады быў у нас яшчэ ў модзе і гаварыў пра чалавечую прыстойнасць) і нават для прыліку не распісаўшыся ў сельсавеце.

Да Анюты ліплі хлопцы, спярша старэйшыя, а потым ужо і нашмат за яе маладзейшыя, асабліва на падпітку. Яна зваблівала і сваім хараством і тымі ўжо абгаворамі ды плёткамі, што з ёю ўсё можна — не дзеўка ж, берагчыся не будзе, чаго там.

Але Анюта так і асталася адзінокаю ў старой хаце пад гэтай ліпкаю — маці памерла, выйшла замуж сястра, паехаў у Казахстан на заработкі і застаўся там брат. І нечакана гадоў сем назад, калі Анюце было пад пяцьдзесят, у прымы да яе з нашых хутароў прыйшоў выгнаны з дому жонкай, шалапутны Генік. Маці яго, кабета цвёрдая, трохі з мужчынскім голасам і ўхваткамі, пабегла да Анюты з грознаю кляцьбою, але ні дадому, ні да жонкі Генік не вярнуўся, застаўся ў гэтай старой, цяпер ужо ім самім перарobленай ды перасыпанай, Анюцінай хаце.

Насустрач, пакалыхваючы над грудкамі і рассыпаючы па заснежаным полі веер святла, паўзе машына. Бліжай да канавы брат скіроўвае каня і я заплюшчваю вочы, каб перачакаць калючы разам з сухім снегам скразняк.

Пасля натужнага гуду матора, што аддаляецца і цішэе, пытаю ў Алены:

— Як жывуць яны?

— Хто?

— Ды Генік з Анютаю.

— Добра! — галосна ў гэтую шара-белую марозлівую ноч гукае Алена.

У мяне мярцвее прыхопленая марозам шчака, я тру яе і затуляюся каўняром. Стыне ў цёплых фінскіх чаравіках і мой большы, разбіты калісьці аб камень палец.

Брат падварушвае каня. Мільгаюць абапал шашы чорна-шурпатыя, не зрэзаныя тут на грудку старыя бярэзіны, і памяць маланкай высякае бацькавыя словы, сказаныя гадоў са тры назад: «Ты не чуў? Забіўся ж Верын заяць. Ехаў на матацыкле. Вунь за Карыцамі на грудку ўрэзаўся ў бярэзіну. З таварышам ехаў. Кажуць, надта ж таварыш крычаў. Разміналіся з машынай».

Верыных дзяцей я ўжо не ведаю. Ды з ёю бачыўся на матчыным пахаванні два гады назад, пасля другога расстання, ледзьве ўгадваючы ў прыгорбленай, са звялым тварам жанчыне тую прыгожую маладую дзяўчыну, што ў дзевятнаццаць год выйшла за беднага хлопца музыканта ў далёкую вёску. У яе застаўся хіба той самы ласкавы голас ды карычневая бародавачка на верхняй губе. Як жыве яна, распытаць аднак не паспеў. Помню, скардзілася, што замужам вось ужо трыццаць год, а як успомніць рэчку каля роднай матчынай хаты, дык ледзь і не заплача, бо так і не прывыкла да гэтых далёкіх, раскіданых між пясчаных

выдмаў Лудзіч. «Здаецца, лепшага ды харашэйшага месца на свеце, як мацерына хата над рэчкаю, няма», — казала яна, ужо горка пасміхваючыся з сябе.

Новы, нядаўна выстраены будынак, як усе цяпер вясковыя будынкі, пад шыферам, аказаўся ў канцы доўгай вёскі, ужо без агню ў вокнах. Баязлівы сабака, счуўшы нашу гаману, нязлосна цяўкнуў і, зазвінеўшы ланцугом, схаваўся пры хлеўчуку у будку.

Алена адчыніла брамку, раз, другі, ужо знадворку, гукнула ў цёмныя вокны, пабразгала ў дзвярах настылаю клямкаю, але ніхто на яе голас не аказаўся.

— Спяць ці што? — яна па глыбокім снезе пабрыла ў гародчык на другі бок хаты і там крыкнула на ўсю моц: — Верка, ці чуеш? Вер-ка!

Голас яе нёсся нібы з глыбокай ямы, і я здзівіўся, што ў марозную зорную ноч так глухне голас. А, можа, заняты трывогай, думкамі пра бацькаву смерць, я проста недачуваў.

Нарэшце, каля нейкіх чорна-голых кустоў Алена выбралася са снегу на ачышчаны і затупаны надворак.

— Гэта ж не спяць, акно на кухні гарыць. Во зараз адчыняць.

І праўда, неўзабаве рыпнулі настылыя дзверы, забразгалі засаўкі, і нас на кухню ўпусціў непрычасаны з калматымі валасамі і няголены дзён колькі гаспадар — Верын муж.

Аказаўся ён не вышэйшым за мяне, брыдкаватым і амаль равеснікам. А калісь, пасля Верынага замуства, калі я, падлетак, спаткаў

іх у мястэчку, ён выдаваў высакаватым і нават прыгожым.

У хаце, якую я бачыў праз пройму кухонных дзвярэй, таксама запалілася, ці мо ўжо гарэла няяркае святло, каля жоўтай на трое дзвярэй шырокай шафы стаяла дзяўчынка гадкоў чатырох у доўгай сукенцы, і маладзіца гадоў дваццаці пяці пакалыхвала дзіцячую каляску.

Распазнаць болей я не паспеў — выйшла Вера і, учуўшы ад брата, што памёр яе хросны, успляснула рукамі, забожкала і, дадбегшы да мяне, абхапіла далонямі за шчокі, аблашчыла, абвяла мяне, нібы ў нейкім старадаўнім рытуале:

— А браток, адмяніўся ты, не пазнаць. Я ўсё чула, што па талевізару выступаеш.

Мы неўзабаве вярталіся назад у вёску, дзе адзінока ў адзінокай хаце зырка іскрылася сіняватымі балючымі промнямі вялікая лямпачка, і расцягнуты прастакутнік святла падаў на снег і шарую сцяну суседняй хаты.

Гэты прастакутнік заўсёды дадаваў радасці, што ў хаце не спяць, нават у апошні раз, калі я прывёз бацьку цёплую бялізну, за месяц да яго смерці, і ён, ужо нехаця беручы яе, здаецца, і без скаргі, сказаў мне: «Яна ўжо мяне не абагрэе. Дзень — век. А ты глядзі, сынку, і сваю, як кажуць, хатку і сваю Агатку. Не сённяя — заўтра... Чалавеку ўжо назначана...»

Прайшло больш як два гады, а я выразна бачу, як над пераплеценым яловым частаколам плыве паднятая на плечы шасцёра прыгнутых мужчын чорная труна, бачу спакойны, велічны

і скамянела-абыякавы бацькаў твар, кепку на яго падушачцы, чубок рэдкіх валасоў, як бачу і гэтыя тры мае маўклівыя сустрэчы, і шарую сцяну роднай хаты з тою ўжо пустою рамкаю ад абраза...

*1987*

## УДАВА

Помніцца грымотнае лета, забіты перуном у начную навальніцу сярод поля на сцежцы наш хутаранец, а праз дзень ці два — новая бяда.

Навіну пра яе прынёс бацька.

Да мяне на поле, пазнаўшы здалёк нашу карову, па вузкім, яшчэ тады не саўгасным папары, мяккім ад нядаўняй раллі і жоўтым ад маладой свірэпы, падышоў ён сам.

Цяпер там, на мястэчковым полі, ці, як тады казалі, мяшчанскім, двума шарымі высокімі каробкамі падняўся камбікормавы завод. А тады чэз падпараны сонцам, замшэлы нізкаваты хваёвы лясок, збягала з грудка белаватая ад сыпкага, перавеянага ветрам пяску дарога, а каля яе цягнуліся вузкія мястэчковыя надзелы.

— Пасеш тут? Глядзі, каб не крычалі мяшчане, — прыжмурыўшы вочы, бацька падняў голаў, а потым адвярнуўся ад мяне і, нібы між іншым, нібы нічога страшнага не здарылася, сказаў: — Петрыка поезд зарэзаў.

— Насмерць?! — здзівіўся я і ўтрупеў, ўмлеў ад нечаканага страху, уявіўшы чорны ў скалках вады паравоз з вялікімі коламі і пад ім чалавека.

— Ды, мусіць, бо наўрад ці выжыве, ногі па самае тулава адрэзала.

— Калі?

— Сёння раніцаю. Дурны лёг пад поезд, спытай праз каго.

І я раптам успомніў, як нядаўна, задыхаючыся, у нейкай спешнай трывозе ў мястэчка прыбеглі дзве навасёлкаўскія кабеты — Сабоцкія, як на іх казалі: адна старэйшая, скуластая, з мужчынскай размашыстай хадою, з чарнаватым гузам на шчацэ, другая маладзейшая, рослая і прыгожая з твару, яе сястра, у якой у прымах быў наш Невяроўскі Петрык. А ўслед за імі, не паспяваючы, падмахваючы знятаю з галавы хусткаю, ішла, як сама не свая, праставалосая Зося — Петрыкава маці.

Я глядзеў на іх і па іхняй спешнай, з подбегам хадзе, па іхняй занепакоенасці здагадваўся — бяда. Але што здарылася менавіта такое, да жудасці страшнае, вядома, не падумаў.

Невяроўскі Петрык колькі год назад не маладым ужо хлопцам, прыстаў у прымы да аўдавелай кабеты, муж якой не вярнуўся з польскага фронту, загінуўшы яшчэ ў верасні трыццаць дзевятага на роўным, са старавечнымі грушамі полі пад Варшавай.

Невядома, што пацягнула ў Навасёлкі Петрыка, але ўсё, мусіць, разам: і дагледжаная га-

спадарка, і ласка аўдавелай маладзіцы. Але ў прымачым жыцці і не кавалася, як кажуць, і не пляскалася.

Аднаму гаспадару сярод дзвюх кабет, што трымаюць цябе ў хамуце, панукаючы і кіруючы табою ды папікаючы яшчэ кавалкам хлеба, жыць было і труднавата, і крыўдна. Злосці, прыкрасці ды нявыказанай помсты, а можа, і раскаяння, набралася залішне шмат — аж роўна з берагамі.

Петрык, робячы грузчыкам на станцыі, дакладней, у пагрузканторы, іншы раз і заначоўваў там, у бытоўцы, ці — як тады казалі — у брахалаўцы. А дзе начуюць адны мужчыны, там і абрыдлыя карты, і гарэлка, і зборы ў адзінокіх местачковых самагоншчыц, іншы раз і бойка... На гэты раз у Петрыка была прапажа: прачнуўшыся з балючаю галавою, можа, яшчэ і не цвярозы, Петрык, абмацваючы кішэні, агледзеўся, што ў яго не стала пяцьсот рублёў — уся ўчарашняя палучка.

Уявіўшы, мусіць, што будзе дома, і не ведаючы, што рабіць, як апраўдацца, з гарачкі, а можа, з той ужо набалелай крыўды, што гняла, дапякала не раз, Петрык пабег далей ад вакзала, дзе яшчэ не вельмі прытарможвалі таварнякі, што ляцелі, не спыняючыся, праз нашу невялікую станцыю, і лёг на дрыготкія, поўныя гулу і звону рэйкі. Машыніст, вядома, заўважыў, але позна...

Мне выразна помніцца, што расказваў, вярнуўшыся з Навасёлак, з жалобнай вячэры, нам, падлеткам, стоячы на вуліцы, расчырванелы, нават здавалася, трохі нібы раўнадушны

Петрыкаў меншы брат: «Хірург нарэзаў цэлую місу мяса, але не ўратаваў».

Аб Петрыку, страціўшы ўжо другога дарослага сына (першы загінуў на вайне), гаравала найбольш маці — старая Зося, як помню цяпер, нямоглая, сівая, з белым мярцвяным тварам і бяскроўна-сінімі губамі кабета.

Удава, панасіўшы з год жалобу, акрыяла і нават яшчэ паспраўнела і, вяртаючыся з мястэчка, асабліва ў нядзельныя ці кірмашовыя дні, што бывалі серадою, заязджала да Петрыкавай сястры, кожны раз са сваёю бутэлькаю, балазе хутар — усяго адна, адбудованая пасля вайны, хата без гумна і хлеўчыка — быў пры самай шашы, недалёка ад мястэчка.

Чуючы чарку, на сценку, зарослую мяккай бела-ружовай дзяцелінкай, што бегла да адзінокай неабгароджанай хаты, з шашы знарок ці не знарок пачалі зварочваць і нашы вясковыя мужчыны, асабліва заседжваўся там прыгожы і ліпкі да жанчын Змітрык Чарнецкі. У Навасёлкі шашою, ужо звычайна блізкім вечарам пад навіссю сцішэлых бярэзін, калі пад імі гудуць рахманыя хрушчы, захмялелую ўдаву праводзілі двое — яе дзевер і Змітрык Чарнецкі.

Сястра нябожчыка Петрыка, жартаўлівая, вострая на язык Зіня, у вёсцы ўжо расказвала кабетам і пра свайго мужыка, і пра Змітрыка:

— Ой, смяялася б і я, каб не свой дурань у хаце. Панапіваюцца і цалуюць адзін у адну цыцку, другі — у другую.

Панурая, маўклівая, з чырвонымі, хворымі, мусіць, на кан’юктывіт вачмі Змітрыкава Ма-

рыля, прачуўшы, што Змітрык зноў падводзіць у Навасёлкі п'янаватую Вольгу, узяўшы з сабою старэйшага, гадоў трынаццаці сына, перастрэлі іх ужо на шашы за нашымі гумнамі, са страшнаю нечалавечаю кляцьбою і каменнямі, якія яна грабла рукою на пясчанай дарозе каля шашы то на свайго ўжо «кавалера», то на «дзеўку», што хавалася то за яго, за Змітрыка, то за карэлыя старыя бярэзіны.

На гэтую сварбу і бойку цікавалі, тулячыся дзе за вуглы, ужо ўсе дасужыя, цікаўныя ды абгаворлівыя бабы.

Бачыў і я, як нечакана з шашы рвануўся Змітрык і, дагнаўшы ўжо на вуліцы, хапіў сваю не вельмі спрытную, таўставатую Марылю за хустку, здзёр з галавы і запусціў дужую пяцярню ў распушчаныя, распатлэшаныя Марыліны валасы. Прыгнуў яе і скоранька, як мага, пацягнуў у свой двор. Яна заенчыла, закрычала, як голаў сцяць, але вырвацца не магла. Перапалоханы, збялелы хлопчык, як малады певень, падскочыў да бацькі, але той, перакрывіўшы ў страшнай міне твар і заплюшчыўшы ад злосці вочы, ажно заблішчала яго залатая каронка ў роце, махнуў кулаком — не падлазь!

Што было ў двары за высокім, як піраміда, гумном з замшэла-рабаватаю ад купінкаў аксамітнага моху страхою, я не бачыў. Я толькі чуў, як выгуквала, нібы топячыся, ажно раздзіраў душу гэты крык, і прасіла на помач людзей бяспамятная, нібы здурэлая, Марыля.

Неўзабаве адтуль, з-за шарай сцяны гумна, злосна адплёўваючыся і мацюкаючыся выйшаў

Змітрык. Нечакана прыпыніўся, азірнуўся круга сябе, каб узяць што падхватнае ў руку, нарэшце ўбачыў жалезны ад аўтамабільнага кола абруч, што стаяў пры гуменным вугле і за якім з выгнутым у жалабок кароткім дротам бегаў яго сын. І, схапіўшы гэты абруч, шпурнуў яшчэ на надворак.

Няроўны, нібы эрэзаны з аднаго боку, абруч пайшоў кругам на чужы двор, са звонам стукнуўся ў калючы ржавы дрот і адбегся паволі назад, пастаяў і цяжка ўпаў. Пастаяў, гледзячы на гэты абруч, і Змітрык, а потым, подбегам і пахістваючыся, пайшоў даганяць Вольгу, што жвірыстаю шапаткою сцежкаю ішла пад навіссю сцішных бярэзін, ішла трохі ганарыста, заклаўшы па-мужчынску за спіну адну руку...

Але не вельмі гаваркая, панурая з чырвонымі вачмі Марыля адпомсціла Змітрыку нават скора і злосна. Гэта прычула і мая маці і, разбудзіўшы мяне сярод ночы, вывела на двор. Бацькі не было дома, ён быў у мястэчку на варце.

— Чуеш, як стогне? — маці падапхнула мяне пад высокі Змітрыкаў частакол, што зліваўся з поцемкам ночы, і, калоцячыся і ад страху, і ад холаду, сказала: — Захвошча яна яго... Б’е п’янага каторая пара. Я ж не сплю, чула і бачыла ўсё.

І праўда, ад блізкай, што стаяла глухою сцяною да нас, Змітрыкавай хаты даносіўся невыразны, нібы з картаплянай ямы, стогн і сіплавата-здушаны Марылін голас:

— Або жыцьмеш, або ўжо памірацьмеш, але так ужо не будзе! Не-е-е!

Мне, падлетку, зрабілася брыдка, паліў гідкі сорам перад імі, сталымі людзьмі, разабрала злосць на маці, і я, як воўк, затуліўшыся за яловы, зліты з поцемкам частакол, цвёрда сказаў: — Я туды не пайду! — і мы вярнуліся ў хату.

Змітрык Чарнецкі пасля гэтай ночы нідзе не паказваўся, мусіць, ціха, як збіты сабака, залізваў, лячыў свае балячкі, а праз тыдзень ціхенька сабраўся і пайшоў жыць да яе, да Сабоцкай.

Памёр ён нечакана ў той жа год, калі я не быў дома — вучыўся якраз у далёкім горадзе.

Пра смерць Змітрыка Чарнецкага расказаў мне ўжо бацька, калі не такім даўнім спякотна-навальнічным і задушлівым летам я прыехаў дадому адведаць яго, адзінокага ўжо ў адзінокай хаце, для нейкага падманната харства ababiтай матчынымі, яшчэ ў дзявоцтве тканымі дзяружкамі з прыгожымі, у «вазоны», узорамі. Невядома дзеля чаго рабіла ўжо гэта малодшая нявестка, тады-сяды наведваючы з мястэчка бацьку.

— Во, бачыш, панавешвала, калі я ў бальніцы быў, — бацька махнуў рукою на сцяну. — Не, каб хату пабяліла... Але ж бяліць — работа, а так дастаў з куфра, прыбіў да сцяны і — харawство.

Мы бяром услончык і ідзём садзіцца пад маладзы лапушысты са зрэзанай верхавінай, знявечаны каштан (гэта ўжо зрабілі электрыкі, таксама тады, у маі, калі бацька ляжаў у бальніцы), і бацька пачынае скардзіцца на здароўе, на задуху, што не дае ўжо прынесці з

лесу палена, а некалі ж вазамі на плячах насіў, а потым расказвае спрытном* усе вясковыя здарэнні і, смеючыся ўжо, пра суседаву дачку, што во месяц, як зняслася.

Бацька закурвае, доўга смокча свой заўсёды тонкі і кароценькі «Север», нарэшце ссоўваецца з услончыка, топчацца ў мыльніку з белаAружовымі кветкамі, якімі зарос наш непрапалаты, запусцелы гародчык, і нібы сабе, нібы мне зноў кажа пра суседаву дачку:

— Род іхні гэтакі. Змалку з хлопцамі займалася і яе цётка Вольга, што выйшла замуж за Сабоцкага. Кажуць, Саўку, першага свайго мужыка, што на вайне згінуў, падушкаю хацела задушыць... А ты ж, пэўна, і не ведаеш? — бацька, прытаптаўшы акурак, садзіцца зноў да мяне на ўслончык. — Яна ж і Змітрыка запарола.

— Як?

— Віламі... Ён жа вагаўшчыком рабіў. Усё ў ад'ездах, усё ў нейкім Янаве-Палескім у камандзіроўках сядзеў.

А яна тут з шоферам сышлася... З Бярозаўкі. Змітрык прыйшоў з работы дадому, а яна на гарышчы ўжо з ім, з тым шоферам. Ён учуў і — туды... А яна віламі і парнула яму ў бок.

— Няўжо? — дзіўлюся я, бо гэтага пра смерць Змітрыка не чуў.

— Во як бывае... А Змітрык нікому не прызнаўся. Ці то Сабоцкую шкадаваў, ці то ўжо брыдка было казаць каму. Але з гэтае раны і памёр...

---

* Радком, па чарзе.

Азіраючыся назад, на далёкі, але чамусьці яснейшы свет падлеткавых гадоў, я не раз бачу тую чэрвеньскую раніцу на мяккім папары пры чэзлым марным ляску, на месцы якога цяпер уладна і непрыступна-велічна падымаюцца дзве шарыя цэментныя каробкі камбікормавага завода, і мне ўспамінаецца, як сцішанаю яшчэ, не люднаю ранішняю шашою подбегам, выбіўшыся з сіл, у мястэчка ідуць сёстры Сабоцкія...

Дарэчы, старэйшую з іх, дужую, з мужчынскімі ўхілкамі, здаецца, і не вельмі пастарэлую, я ўбачыў у прыгарадным аўтобусе, пазнаўшы па тым самым сіняватым гузе на шчацэ.

Я глядзеў на яе, і мне ўспамінаўся Петрык Невяроўскі, а потым і ён, наш сусед і сваяк, Змітрык Чарнецкі. Ён успомніўся мне, як заўсёды вясёлы, з бяскрыўднай, захмялелай усмешкай і залатой каронкай, што паблісквала дзеля фасону ў верхнім радку яго маладых белых зубоў.

*1988*

## ВОЧЫ ПОЎНЫЯ ЖЫЦЦЯ І СТРАХУ

У польскай газеце «Życie Warszawy» на апошняй старонцы пад заштрыхаванай рубрыкай «Ogloszenia», дзе поруч з разнастайнымі аб'явамі змяшчаюцца некралогі, я натрапіў на такі, здаецца, звычайны тэкст, увабраны ў чорную рамку жалобы: «З жалем паведамляем,

што пасля цяжкай і доўгай хваробы памерла Ізабэла Навакоўска, арганізатарка тайнага навучання, сувязная, чалавек вялікай дабраты, справядлівасці і пачцівасці...» Можа, гэта простае супадзенне, але менавіта маёй першай настаўніцай у даўняй, нібы ўжо не рэальнай беларускай школцы падчас акупацыі была Ізабэла Навакоўска.

Мне прыгадваецца далёкі час вайны, наша бойкае пры чыгунцы мястэчка, небрукаваная, зарослая кучаравым спарышнікам вуліца, з драўляным касцёлам за высокім штыкетавым плотам на адзін бок яе, на другі — з прыгожа выштукаванымі і пафарбаванымі дамамі пад цынкавымі дахамі, у адным з якіх, што стаяў уздоўж вуліцы, схаваўшыся за крывымі яблынямі, пачарнелым і не ашалёваным, жыў Чуба, яшчэ польскі настаўнік спеваў, пазней арганіст гэтага касцёла і тайны настаўнік местачковых дзяцей, найбольш палякаў, што не хадзілі ў беларускую акупацыйную школу і мелі магчымасць за дробную плату вучыцца ў яго.

Неяк смешна і расцяжна вымаўляючы беларускія словы (прышва, пашва), нас вучыла, найбольш па савецкіх падручніках, яна, былая польская настаўніца, Ізабэла Навакоўска, ці, як мы яе афіцыйна называлі, грамадзянка настаўніца — высокая, бялявая і трохі зласнаватая кабета, ад якой добра перападала распусным і самым няздольным, гультаяватым хлопцам.

Мы з ёю чыталі Коласава апавяданне «Малады дубок», са зборніка, выдадзенага ў даваеннай Вільні, і вывучалі ўсяго толькі, нават не

рашаючы задачак, табліцу множання. Навакоўска стаяла каля дошкі з таўставатай накрыўкай ад пенала і біла ёю па руцэ кожнаму, хто пісаў крэйдаю не той адказ. Даставалася найбольш Натолю Таўкуну — майму суседу па парце, пазней, ужо ў сталыя гады, шафёру, што вазіў галоўнага ўрача санаторыя.

Вучыліся мы ў апусцелай яўрэйскай хаце, разгароджанай вузкім калідорам на дзве палавіны; прастарнейшы будынак школы немцы забралі пад вайсковы шпіталь.

На свеце шугала пажарамі і хадзіла бядою вайна — у мястэчку кожны дзень нехта гінуў ад выпадковай ці, можа, сваёй, наканаванай лёсам кулі, і кожны дзень хто-небудзь з вучняў не прыходзіў у школу. Першаю, здаецца, не прыйшла высокая, ці не старэйшая за ўсіх нас і хворая на галаў Бася Гутман, што засынала на ўроках, седзячы адна на самай астатняй лаўцы. Яе прывяла ў наш клас, здаецца, сама Навакоўска.

Бацьку яе, паляка, родам недзе з цэнтральнай Польшчы, што разам з асаднікам Адалінскім падаўся ў нямецкую паліцыю, за сувязь з акоўцамі арыштавалі і адправілі ў Наваградскую турму немцы.

Потым не з'явіўся самы маўклівы і сарамяжлівы сярод нас сталяроў сын, бялявы з віхрастым чубком Чэсік Харошка. Праз дзён колькі мы дачуліся, што ўночы нехта ўварваўся ў іхні крайні, дарэчы, недалёкі ад школкі, новы з прыгожымі ліштвамі і аканіцамі дом і застрэліў гэткага самага віхраста-кучаравага, як і сын, Чэсікавага бацьку і маці,

якую я не помню. Яна, маці, кажуць, паспела накрыць хлопчыка коўдрай. Што сярод рабаўнікоў і забойцаў быў бацька нашай аднакласніцы Ліды Якубчык, тоненькай, высокай, як жэрдачка, сінявата-рабацiністай дзяўчыны, ні мы, ні, пэўна, сама Ліда нічога не ведалі.

Праз тыдняў колькі, калі ў школу не з'явілася ўжо Ліда Якубчык, — прыйшла нечаканая чутка, што яе бацька, былы чыгуначнік — высокі, як помню, мужчына ў чорным шынялі з белымі бляшанымі гузікамі, з ганарыстымі, трохі падкручанымі вусамі, і наш хутаранін прымак Додла, заўсёды няголены, расхрыстаны, у адным і тым жа суконным каптане, у палапленых галіфэ, уночы пастукаліся да суседа Харошкі, каб вымагчы ў яго золата. Знакаміты местачковы столяр, жанаты на пападзянцы, меў, пэўна, нешта прыхаванае на чорны дзень. Было, мусіць, і золата, якое, забраўшы, не падзялілі Якубчык з Додлам. Астатні ўжо ад злосці і дурноты, кажуць, збегаў у жандармерыю. Немцы, схапіўшы спачатку Якубчыка, а потым ужо і Додлу, абоіх аддалі ў рукі галаварэзаў — казакаў з арміі паходнага атамана Паўлава, што ўцякала з Дона і ачуцілася ў нас у Наваградчыне, і тыя, патрымаўшы ў местачковым склепе тыдняў са два, закатавалі Якубчыка на хутары разам з іншымі вязнямі і таемна сярод ночы пры рэчцы ў алешніку закапалі. Додла тады выкруціўся, але ненадоўга.

Пасля Ліды Якубчык школу кінулі мурзатыя, у сіняках, у драпінах, несусветна злыя і задзірыстыя блізняты Пясэцкія — Чэх і Лех.

Ад іхняга новага, што стаяў на рагу вуліцы, ашалёванага ў елачку, з прыгожым ганкам-верандай і белымі аканіцамі дамка, што адным вуглом упіраўся ў старую шурпатую хвойку з разложыстай кучаравай кронай, засталася чорная горба смярдзючага пажарышча — там, кажуць, згарэла іхняя маці, худзенькая — на твары адны вялікія вочы — пані Пясэцкая, сувязная, як цяпер я ўжо дазнаўся, польскіх партызанаў. Блізнят Пясэцкіх забрала цётка, з якое яны ўжо пасля вайны выехалі ў Польшчу, дзе для мяне і згубіўся іхні след.

На згоне зімы, здаецца, яшчэ ў сакавіку, калі на нашай пясчанай зямлі лёгка сыходзіць снег, і на бярэзінах свіцяцца прывязаныя да зламаных галінак сінія бутэлечкі, у якіх занач нацякае празрыстага, чыстага, як сляза, бярозавага соку, наш клас нечакана сцішэў і нібы вымер, — у школу не прыйшло палавіну вучняў.

І ў той жа дзень спадцішка запаўзла страшная навасць — карны батальён на світанку акружыў і спаліў блізкую ад мястэчка вёсачку Ганчары, пад якую, за рэчку, за алешнік, разззброіўшы лясную ахову, што сцерагла не лес, а ўжо мястэчка, адыходзілі партызаны.

Падпаліўшы вёску, немцы, балазе, не стралялі дзяцей і жанчын, а лавілі маладых мужчын і хлопцаў, што не ўскоралі ўскочыць у алешнік, схавацца пад карчы ў рэчку, і гналі на чыгуначную станцыю ў нарыхтаваны пусты састаў. З кожным днём у класе рабілася пустэльна і нават вусцішна.

Неўзабаве апусцела месца і каля мяне,

на чорнай з зафарбованымі нарэзамі чужых імён, знакаў і формул вялікай парце, зробленай, мусіць, для старэйшых класаў, — у школу не прыйшоў Натоль. На другі ці на трэці дзень мы ўбачылі яго стрыечнага брата, што, даўно пакінуўшы школу, туляўся па мястэчку: ён, гугнявячы ў свой пляскаты нос і смешна варушачы сподняю губою, што напаўзала на верхнюю, рассечана-заячую, расказаў пра тое, што ўчынілася ў мястэчку: немцы з ортскамендатуры, якія праходзілі страявую падрыхтоўку на пляцы даўнейшага свінога рынку, акружанага белымі цаглянымі крамамі, злавіўшы пяцёра грузчыкаў, якія ўкралі ў іх коцы*, завялі за гэтыя крамы, загадалі ім капаць сабе ямы. Разам з грузчыкамі быў і Натолеў бацька. Іх, пяцёра мужчын, застрэлілі тут, за гэтымі цаглянымі пустымі крамамі.

Самога Натоля я ўбачыў неяк выпадкова, незнарок сустрэўся на пуставатым пляцы даўнейшага свінога рынку, што зазелянеў першай рэдзенькай травою — ён там, трымаючы за вяроўку, пасвіў казу. Ён нібы засаромеўся мяне ці ўчуў нейкую вінаватасць. Заўсёды вясёлы, гаваркі, ён цяпер быў, як адрошаны і сам не свой, стаяў, угнуўшы галаў і хаваючы свой бяскроўны і спакутаваны твар.

— Калі прыйдзеш у школу?

Ён падкусіў губу і падняў на мяне шэрыя, поўныя ўжо сталага смутку вочы:

— У школу я больш не пайду. Ты ж, мусіць, ведаеш, — бацьку застрэлілі, — і тур-

---

* *Коцы* — коўдры.

зануў за вяроўку худую перахлябленую казу.

Губы ў яго скрывіліся, задрыжалі, але ён не заплакаў, падзёўб толькі збітым з саслізганай падашвой дзеравянкам шарую сцежку, што бегла між вострай травы, дзе ўжо раскрываліся ясна-жоўтыя, нізкія яшчэ дзьмухаўцы.

— Тут травы няма, павяду яе на балота, — ён перакінуў сабе на плячо вяроўку і пацягнуў за сабою худую ўпартую казу, што ўпіраючыся і раскачваючы ногі, жалосна бляяла і не хацела ісці.

У тую апошнюю весну акупацыі я яшчэ не ведаў, што мы расстаёмся, каб ніколі больш не сядзець за адной партай.

Праз год ці два, ужо, вядома, пасля вайны, Натоль прыйшоў у наш пяты клас, праседзеў ціхенька на задняй парце, а потым, паклікаўшы ўсіх нас на другі бок школы, дзе была ўкопана вялікая бочка з вадою, укінуў нешта ў яе, і страшны глухі выбух выплюхнуў з бочкі ваду.

І больш пасля гэтага Натоль у школу не паказваўся. У скорым часе я ўбачыў яго ў закурэлым газагенератары, абапал шафёрскай кабіны якога сінім дымам курылі дзве жалезныя печкі. Натоль працаваў тады стажорам шафёра.

Памёр ён гадоў сем назад ад сардэчнага прыступу ўжо ў сваім «Масквічы» непадалёк ад запраўчнай станцыі, паспеўшы яшчэ з'ехаць на абочыну шашы: адна рука трымала руль, другая была, кажуць, у кішэні. Ён намагаўся яшчэ дастаць нітрагліцэрын ці валідол.

Пра гэта мне расказалі не так даўно, калі ў мястэчку на няроўным тратуары я ўбачыў яго маці, старую сівавалосую жанчыну, што паволі ішла, мацаючы тонкім кійком шурпаты тратуар. Казалі, што яна аслепла пасля таго, як памёр ён, Натоль, адзіны яе сын.

З даўнейшых вучняў той акупацыйнай школкі я помню мала каго, ды мала хто і застаўся дома, у глухаватым мястэчку, што з чатырма новымі пяціпавярховымі блочнымі дамамі набывае ўжо выгляд гарадка. Здаецца, толькі адна няскладная вялікая кабета, што прадае ў блакітным кіёску, каля аўтобуснай станцыі, газеты ды часопісы. Не, яна не была ў нашым класе, проста помніцца, што яна вучылася ў той даўняй школе.

Застаўся дома прыгожы, бязрукі, з апаленай левай шчакой Стась Нагорны. Яны, мястачковыя хлопцы, раскручвалі міну, і яму проста пашэнціла, ён якраз адышоўся, калі выбухам разрэзала траіх. Самы меншы сярод іх, дзесяцігадовы Тадэвуш Бярнацкі, падабраўшы ў прыпол гарачыя, акрываўленыя кішкі, бег яшчэ дадому.

З жоўтым скручаным сцяжком на мястэчковым пераездзе не так даўно стаяла ўсмешлівая і вясёлая Ліда Якубчык. Мы з ёй давучыліся да дзевятага класа, покуль яна не выйшла замуж за нейкага выпадковага баяніста, што іграў у мястэчковым клубе на танцах. Яны недзе паехалі, там недзе разышліся, і Ліда вярнулася дадому з дзіцем... На пераездзе я ўбачыў яе год дзесяць назад.

Не ведаю, ці робіць яна там, пасля той перад-

навагодняй аварыі, калі ў яе на вачах — страшна і бачыць такое — разбіліся два таварнякі.

Машыніст даверыў цягнік памочніку, заснуўшы якраз перад самай станцыяй. Адрабляючы наперад трэція суткі, каб пагуляць у таварыша на вяселлі, памочнік не ачуняў як след ад сну і задрамаў таксама. Поезд з разгону, перарэзаўшы стрэлкі, трывожна імчаў на пераезд, на якім ужо гукаў, сцішаючы ход, на шчасце, «зборны», што падбіраў на станцыях пустыя вагоны і цыстэрны.

Ліда, здагадваючыся, што можа прылучыцца страшнае і непрадбачанае, выскачыла на пуці, замахала чырвоным ліхтаром, але цягнік, як нешта грознае і недаступнае, свецячы трыма сляпучымі агнямі, імчаўся на «зборны» таварняк, што выйшаў якраз ужо на мост.

Удар быў моцны і нечаканы — з агнём, з жалезным грукатам і лязгам: вагоны скрыгаталі, біліся адзін аб адзін, зрываліся з цялежак і пуцей, падалі з высокага адхону пад рэчку. Цяжкі жалезны абвал пабудзіў усё мястэчка.

Старэйшы машыніст загінуў, малодшага, ужо бязрукага і бязногага, выразалі праз гадзін дзесяць аўтагенам. Ліду Якубчык знайшлі рабочыя камбікормавага завода — яна сядзела ў кутку бытоўкі, як сама не свая, і, заікаючыся, яшчэ не магла расказаць, што здарылася, і як прыбегла яна сюды на камбікормавы завод за кіламетр ад пераезда. У яе быў нервовы стрэс, і яна, кажуць, захварэла.

Я, здаецца, бачыў яе летась. Але ж ці яе?..

У метро, у пуставатым вагоне электрычкі, што з жалезным цяжкім звонам, рытмічным

перастукам колаў, са скразняком і свістам рванулася ў чарнату тунэля, неспадзявана на карычневым сядзенні я згледзеў немаладую, ужо ў тым веку кабету, калі адцвіло хараство, калі вяне твар, і зморшчынкі падсушваюць, сцягваюць губы, і нібы трохі сумеўся — кабета была вельмі падобная да Ліды Якубчык. Я нават, усміхаючыся і адарваўшы руку ад блішчастай парэнчы, падаўся да пуставатага сядзення, каб прысесці поруч, але жанчына, учуўшы на сабе мой вясёлы, незразумелы ёй зірк, адвярнулася да чорнага акна, за якім мільгаў, зліваючыся ў шары мігатлівы пасак, бясконцы тунэль.

Я дагадаўся, што, як здаралася са мною ўжо не раз, абмыліўся. І каб зняць сваю ніякаватасць і нялоўкасць і не бянтэжыць кабету, на станцыі ўжо, нібы і трэба было, выйшаў з вагона.

Людны натоўп — маладзейшыя спяшаліся, выпярэджвалі, перабягалі дарогу, — нёс мяне да эскалатара. Я, не заўважаючы нікога, паволі ішоў, успамінаючы жаночы твар і ўсё раздумваючы, яна гэта была, Ліда Якубчык, ці проста трохі падобная да яе кабета? Потым мне прыгадаліся дзве народаўкі ў яе на шчацэ, і я ўжо цвёрда сябе пераканаў, што проста напаткаў чужую кабету, падобную да Ліды Якубчык. Ды і ці варта шукаць у маладым людным натоўпе каго-небудзь з таго даўняга трэцяга класа?

Але заплюшчыўшы вочы і праз чорны вір памяці, як на глыбокім, ледзь падсвечаным дне, не раз убачыш белаватую жвірыстую шашу, засыпаную слізкай рудой кастрыцай сцеж-

ку між знявечаных, у жоўта-зеленаватай смале, соснаў, пабелены знадворку дамок з чорным гонтавым дахам, цемнаваты клас і на стале ў Навакоўскай стос тонкіх кніжак колеру охры, дзе было надрукована тое незабытае апавяданне «Малады дубок».

Як вечаровая зара, прымеркла даўняя бяда, забываюцца паволі равеснікі, каб зрэдку, але выразна выплываць з глыбокага і патаемнага віру памяці. Чужое жыццё жыве ў нас, покуль мы жывём, як і наша будзе жыць у памяці іншых.

*1991—1992 гг.*

## СЦЕЖКА НА РАСХОДНІКУ

Яна памятная мне — гэтая выплесканая босымі нагамі ды выезджаная ціхутка шапаткімі веласіпедамі чуткая сцежка, што наўпрасты, як страла, ляцела ў мястэчка, апярэджваючы кружную дарогу праз мост, на млын, што быў у другім канцы мястэчка, і кудою звычайна ездзілі марудныя вясковыя фурманкі.

Караткаватая, не болей як на паўкіламетра, сцежачка, шарым, нявыбеленым палатном яна рассцілалася спачатку з крутога пясчанага груда, на якім з-пад старых прысадаў светла бялелі першыя местачковыя хаты, і праз ружовы ад смолкі і махрысты ад вобаратніку поплаў бегла ад рэчкі пад серабрыстыя купчастыя вербы. Пераскочыўшы тут гібкую кладку

з хісткаю жэрдачнай парэнчаю, тугою ўжо чарнаватаю лентаю каля прымлелых гаркавата-клейкіх алешын, пад якімі пякуча-агністым жарам гарэлі палявыя гваздзікі і красавала, выпусціўшы дробныя каласкі, пахучая зуброўка, падымалася зноў на жвірысты грудок, зарослы круглымі, нібы царкоўныя купалы, ядлаўцовымі кустамі, між якіх раскашаваў ясна-жоўтымі выспамі густа-дрыготкі, як сатканы, расходнік і цёпла-горка пах, разліўшыся цэлымі азярынамі, ліловы чабор.

Я любіў гэтую праменькую, з адзінокімі прахожымі вузкую сцежку, што абягала самотны цётчын хутар з недакончанаю хатаю, ці, праўдзівей, толькі выведзеным пад бэлькі зрубам, з гумном і нізкім хлявом, за якім узнёсла шапацела трапяткая бярэзінка. Зводдаль зруба, насупраць пустога праёма для акна, упарта сядзеў і, здаецца, ніколі не цвіў крывы камель голага бэзу. Сярод ружовага ад дымнай мятліцы абгароджанага сіва-валасістым частаколам двара распускала свой шырокі прыпол прысадзістая хвоечка.

Светла загадкавым падлеткавым пачуццём я любіў гэты сцішны, занядбаны хутар. Гаспадар яго, мой дзядзька Янка, не ўжыўшыся з жонкаю, старэйшаю за сябе на дванаццаць гадоў цёткаю Марыляю, да якое прыйшоў у прымы, пагнаўшыся на кавалак зямлі, кінуў хутар, недакончаную хату і пайшоў добраахвотна ў польскае войска, хоць палякаў, здаецца, і недалюбліваў, і, закончыўшы вайну ў Судзетах, застаўся ў Польшчы на землях «адзысканых», што прыналежалі немцам.

Жыў ён у Лэбе, невялікім кашубскім гарадку на беразе Балтыйскага мора, і клікаў да сябе адзінага сына, што добра разбэсціўся, ходзячы па вечарынках і п'ючы самагонку. І той паехаў, нават, здаецца, без належных на гэта дакументаў — проста сеў у цягнік да польскіх сем'яў, што вярталіся з далёкага Казахстана і Сібіры і да якіх далучаліся беларускія, ужо з нашых навакольных вёсак.

А недакончаны зруб застаўся гнісці на стромым грудзе, пад якім расла бачная заўсёды здалёк старая алешына з чорна-шурпатым, у абхваты два, тоўстым камлём, у карэннях якой вялася чуйна-патайная выдра. Я бачыў яе ўсяго адзін раз і то здалёк, калі яна паказалася неўспадзеў на затравелым беразе, бліснуўшы карычняватай поўсцю, і, змеціўшы мяне, тут жа знікла, як умее знікаць з вачэй кожны дзікі звер. Начамі, асабліва, як помніцца, пад поўню, тут таямніча і вусцішна пагукваў удод. Месца тут, нягледзячы на блізкае мястэчка і шашу, што, перапоўзшы ўзгорак, спускалася да першых хат, у той час яшчэ і крытых саломай, было глухое.

Па сцежцы хадзілі не вельмі часта, найбольш з тых рэдкіх, што выселіліся з нашай вёскі хутароў, раскіданых па адхонах боханістых узгоркаў і мякка атуленых хвойнікам.

Але першаю ў прагале цёмна-зялёнага цвіркатлівага ад маладых шпакоў алешніку я бачыў цётку Марылю — яе шарую, нібы абвешаную лахманамі, постаць. Цётка жыла тут жа за рэчкаю ў першым мястэчковым доме, што прыляпіўся да касагора, у ніжнім блоч-

ным, вільготным і халодным, падвальным пакойчыку з дашчанай верандай. Над ёю кватараваў хітраваты загадчык млына з трохі смешным для мяне шляхецка-палескім прозвішчам Станчук-Ляўчук, які кожнае восені, прысеўшы з дубальтоўкаю на здзічэлым самотным хутары, падпільноўваў і страляў дзікіх гусей, што пры пералёце ў вырай садзіліся тут на начлег.

Цётка Марыля пабыла ўжо на хутары, агледзела, ці не знікла за ноч яшчэ адна дзеравіна з таго штабеля, што ляжыць накрыты яловаю карою, і памалу ўжо, але ўпарта варочалася назад, трохі ківаючыся з боку на бок ад свае хваробы — вадзянкі, ад якой іншы раз і не магла хадзіць, покуль не ўпадзе, паслізнуўшыся, і не разаб'еcца і покуль не выльецца з яе гэтая вада...

Не, цётка ідзе трохі прыспешваючы і, перабраўшыся цераз кладку, заварочвае да мяне на той круты грудок, дзе я пасу карову. Ідзе, не мінаючы топкую крынічку, у самым вузейшым месцы ёю ж самою закіданую галлём, каб не тапіцца па калені ў гразі і багнішчы.

Гаворыць сама з сабою і доўга шалпочацца ў густым алешніку і калючай шыпшыне і нарэшце, спудзіўшы карову, выбіраецца на грудок. Чапляючыся за карычневую мятліцу, за ядлаўцовы дымна-зялёны кусцік, выпаўзае на сцежку, што ўецца беражком груда, і падымаецца да мяне. Адсопшыся, трохі перавёўшы дых, пачынае гаварыць:

— Дзіцятка, я ўжо паўсвету абышла. Сёння ўночы ў мяне ж вунь тры дзеравіны ўкралі. І ўсё яны, каб ім не даў Бог шчасця, — Балаба-

ны. — У цёткі па зморшчаным твары паўзе і адрываецца сляза. — Збегала ў сельсавет, але ж участковага не было. Так Балабан і пабудуецца з майго дрэва.

Тыдзень назад, напаткаўшы мяне ў мястэчку, дзе я здаваў малако і варочаўся дадому з прыёмнага пункта ўжо з пустою банкаю, на якой пабліскваў медны прыпаяны кранік, цётка схапіла мяне за руку і ўкрадкам павяла за сабою, просячы не ўпарціцца і падысці з ёю на блізенькую касцельную вуліцу, каб нештачка ўбачыць. Я ішоў за цёткаю, не ведаючы і не здагадваючыся, дзеля чаго іду, нават і тады, калі мы спыніліся на рагу касцельнай вуліцы перад свежаакораным жардзяным плотам, за якім на пустым участку падымаўся шары, ужо зліналы на сонцы і апаласканы дажджамі зруб. Цётка падлезла пад гэты загарад і, азірнуўшыся, ці хто не бачыць, кіўнула мне пальцам. Я таксама ўгнуўся і падшмыгнуў пад свежаакораныя, што пахлі густа-цягучаю смалою, жэрдачкі загарадзі.

Цётка, падняўшы галаў і выцягнуўшы ўгору руку, паказвала, як дагадаўся, на сярэднюю бэльку:

— Мая, Чэсічак, па суках пазнала. Я надоечы нават у зруб залезла, адтуль з сярэдзіны бачыла.

— А можа, вы не пазналі. — Мне нешта не верылася, што худзенькі высокі Жураўскі, што рабіў на пошце і трымаў замужам Валодзеву, ці, як па мянушцы казалі, Балабанову Веру з нашых хутароў, мог украсці цётчыну бэльку.

— Дзіцятка маё, дай спокуй, я ж добра прыцікавала, але ж нікому не кажу, што гэта мая бэлька. Толькі Богу малюся... Не кажы і ты. Ідзем, покуль ніхто не бачыць.

І яна зноў першаю вылезла з пахучай жардзяной загарадзі.

Адышоўшыся ўжо ад зруба і заварочваючы ў касцёл, сказала:

— Каму дзе пажалішся?.. Буду ісці праз кладку поначы — укінуць у рэчку ці на хутары затаўкуць. Таму і маўчу ды Богу малюся. Аднаму табе і сказала. Каб нехта ж ведаў, каб слёзы мае дарма не прапалі.

Я гляджу на цётку, што зноў бярэ мяне за руку і вядзе ўжо да свайго зруба, што стаіць за гнілаватым нахіленым плотам, які ўжо даўно не бачыў мужчынскай рукі, як і не бачыў яе і ўвесь хутар з пустым, ужо без гаспадарчага спрату і скарбу — збожжа і сена — гумном, над якім толькі вясною, калі разліваецца рэчка, падгуквае ўдод, з пазелянелым ад моху хлевушком, што пахне не гноем, а збуцвелым дрэвам, і які ўжо даўно не чуў ні ржання каня, ні рыкання каровы.

Цётка паказвае мне на складзеныя пад карою неачэсаныя дзеравіны і кажа:

— Во сёння ўночы ажно тры ўзялі. У мястэчку не знайшла. Пайду прыгляджуся на хутарох... І Уладаку напішу. Я пра ўсё яму пішу. — Яна ўздыхнула, паглядзела на мяне, і з яе сініх вачэй высачыліся дзве буйныя слязіны і пабеглі па зжоўклых маршчыністых шчоках. — Усё чакаю яго дадому. Ужо два гадкі асталося. Ты ці ж ведаеш, што ён там за

алямэнты ў цюрме сядзіць. Кінуў жонку з дваіма дзецьмі. Хаваўся, покуль не знайшлі і ў медныя капальні не загналі. Але ж ты і пра гэта нікому не кажы.

Яна адвязвае ад шула доўгую, збітую з жэрдачак фортку, падыходзіць, блытаючыся ў ружаватых катках, да складзеных дзеравін, стаіць і паказвае на раз'еханую кару:

— Бачыш, кару на месца не паклалі. Я ж усё прымячаю і значу.

Яна падцягнула да дзеравіны з'еханую яловую шурпатую кару, абышла яшчэ раз хлевушок з гумном і, закрыўшы ўжо за мною расхлістаную брамку, уздыхае і ўжо гаворыць не то для мяне, не то для сябе:

— Няўжо ўсё было. Прайшло і няма.

І, ужо адышоўшыся, паскардзілася:

— Задыхаюся. А галаву як павярну, то нібы на той свет падаю. Але пайду.

Не ведаю, ці знайшла на хутарах свае дзеравіны цётка Марыля. Дакладней і праўдзівей — не помню. Але што нехта свой ды блізкі цягаў на дровы ці так для якой патрэбы дзеравіну ці дзве з глухога непрыгледжанага хутара — гэта вядома, гэта рэч бясспрэчная.

Горка ўжо думадь і пра другое: дарма старалася, дарма траціла сілы хворая на вадзянку цётка Марыля. Можа, і не вельмі дарэчы ўжо тут наша беларуская прымаўка «Век жыві, век — будуйся». Цётка Марыля будавалася, як ужо магла і колькі ўжо змагла, так і не прыждаўшы сына. Ён прыехаў — ужо як спадчыннік, каб прадаць накрытую, але яшчэ без вокнаў, без падлогі, недакончаную хату, а ра-

зам з ёй і трухлявае гумно і хлевушок — ужо некаму на дровы.

Я шкадаваў толькі кніжак — найбольш з даўнейшых, віленскіх выданняў — іх два мяхі выцягнуў з цётчынай апусцелай кватэры загадчык местачковага млына, той жа самы Станчук-Ляўчук, што жыў над цёткаю на другім паверсе таго, напалову драўлянага, напалову блочнага, умураванага ў круты грудок дома.

Я вучыўся ў Маскве і дадому, у родныя мясціны наведваўся ўсё радзей і радзей. За гэтыя гады, што я не быў дома, усё, нібы ў вечаровую пору, прымеркла, таямніча прыцішэла і перамянілася.

Я схадзіў на былы хутар, каб перажыць адчуванне ціхага смутку, блізкай старасці, адзіноты і... чалавечага знікнення з гэтай вечнай зялёнай зямлі. Ад даўнейшага хутара засталася толькі трапяткая шумлівая бярэзіна, груда цэглы — цётка, мусіць, нават паспела зрабіць печ — ды пляскаты камень, што застаўся ляжаць там, дзе быў парог, і зарос наўкруга сівым мяккім палыном, як і пабітая цэгла — карычневым танюткім, як сітка, асніком і нізкім сунічнікам у белых зорках позніх кветак.

Над завоінай не ўздымалася ўжо тая чорная шурпатая алешына з кучаравай кронай, абвешанай рванай сеткай таўкачыкаў.

І бераг, і грудок над рэчкаю, і ўся мясціна, дзе быў хутар, выдавала ўжо зусім здзічэлаю і адзінокаю, і смутна-глухою.

На грудку, куды з гібкай, хісткай кладкі, тлуста паблісківаючы між ружовага ад смолкі поплава, бегла ліпкая, выплесканая нагамі

сцежка, густою шчоткаю стаяў і, выпусціўшы карычнявата-блішчастыя асцюкі, ціха, да востра-танюткага звону ў вушах шапацеў ячмень. На паўмежку цвілі ясныя, ажно ад іх балелі вочы, рэдкія васількі. Бліжай між круглых ядлаўцовых кустоў рванымі выспамі слаўся нізкі жоўта-ясны расходнік і гаркавата, мятна пах чабор, увесь звінючы ад гіжлівых і ўпартых у сваёй працы пчол.

Якраз там, дзе пухкім і порсткім лапікам натапырыўся, расцвіў светлы жоўта-чысценькі расходнік, некалі шаргацела пад нагамі жвірыстая сцежка. Цяпер яе не было. Як не было ніякага і знаку ад яшчэ аднаго хутара, што павінен быў стаяць за чорным з цёмна-тлустымі, адваленымі скрылямі зааранным ужо даўнейшым лужком, таксама на грудку — там засталася ўсяго адна, трохі пахіленая шырокая кронай старая яблыня, ад другой, выкапанай, пэўна, у леташнюю восень, жаўцела сыпкім дробным пяском шырокая яма.

Абмінуўшы заараны, напэўна, пад цімафееўку лужок, берагам ужо ацярэбленага ад галля і прарэджанага хвойніку, дзе, згледзеўшы мяне, востра і наперабой застракаталі пільныя сарокі, я падышоў да гэтай адзінокай яблыні.

Што тут некалі была хата, сведчыла высокае котлішча, што зарасло валасніком, ружаватыя макаўкі круглых каменняў, што клаліся пад даўнейшую падрубу, ды адзінокая яблыня, з паабіванымі, паломанымі галінамі тоўстымі палкамі, што накрыж ляжалі на гэтых паабіваных галінах.

Далей, калі перайсці густы непрацярэблены хвойнік і замыты вадою і зарослы ядлоўцамі яр, абапал якога была процьма баравікоў, а пад чэзлымі ядлоўцамі вылежаных зайчыных заўсёды цёплых ямак у касмычках пуху, сумавала яшчэ адна хата з нізкім саламяным лобам. Гэта быў хутар Ігнася Варонкі, стрэлачніка з чыгуначнай станцыі, што, помніцца, хадзіў абвешаны вялікімі чорнымі ліхтарамі.

Я ўжо ведаю, што тамака яе няма. На даўнейшае котлішча, на тое месца, дзе яна стаяла, з усяго блізкага поля ссунулі валуны — цэлае лежбішча іх, як марскіх ільвоў ці маржоў, толькі нямых і застылых, у сівых лішаях, як з неадмытай чалавечай ганьбай.

Але спярша пра яе, пра гэтую хату, што ўздымалася тут, таксама над рэчкай, куды стрымгалоў збягала сцежка, каб пераскочыць пакладзеную між алешын вузенькую, над самаю вадою, кладку. Ёю на сяло ў вёску з недалёкага хутара бегалі ўжо Варонкавыя дзяўчаты, — адна старэйшая, другая малодшая, але, мусіць, больш спрытнейшая, да хлопцаў. Бо нават была і зацяжарыла, і п'янаваты Ігнась Варонка ад крыўды і помсты, схапіўшы дачку за валасы, перад усімі ўжо вёў яе тапіць у рэчку. Але гэта не памагло — дзяўчына, кінуўшы хутар, уцякла ў Калінінград, куды пасля вайны збягалася ўся шуга і навалач. Там, кажуць, і нарадзіла. Старэйшая выйшла замуж сюды, у сваю ж вёску. У хаце засталася Варонкава жонка з малым, гадоў усяго шасці, хлопцам.

Прыдбаўшы каханку, Варонка перабраўся ў Баранавічы і дадому з'яўляўся рэдка. Іншы раз

у суботні прыціхлы надвячорак, калі было нават чуваць, як чмыхала за недалёкім чыгуначным мостам нядужая яшчэ даваенная вадакачка, з грудка, з пясчанай жвірыстай сцежкі, што збягала да кладкі, нечакана чуўся мне знаёмы хрыплаваты голас:

*Выпьем, что ли, Ваня,*
*С холода да с горя.*

Яшчэ здалёк я ўгадваў яго сутулаватую постаць, апранутую ў чорную форму чыгуначніка — фрэнч, штаны, фуражку. Ігнась Варонка з Баранавіч, дзе і рабіў стрэлачнікам, ужо варочаўся дадому, яшчэ па дарозе, у станцыйным местачковым буфеце, дабавіўшы ў чубе.

Як здавалася тады мне, Ігнась быў не такі ўжо шкодны і баявіты мужчына ў нашай вёсцы.

Цётка Марыля, калі пералічвала нехрысцяў і зладзеяў з блізкіх хутароў і вёскі, усіх тых, хто мог пакрасці яе бэлькі, чамусьці ніколі не спынялася на Варонку, не давала яму мянушкі, адно толькі махала рукою: «Гэты — несусветны гультай. Яму ўсё думаецца пра гарэлку ды кабеты. Распуснік. Ці яму да бэлек?..»

Страшнае пра Варонку я пачуў ужо ад чужой выпадковай кабеты: немаладой, прысадзістай, у беленькім фартушку на даўгаватай зялёнай спадніцы ў чорныя падшытыя пасачкі, у прыталеным каптаніку і ў сіняватай накрухмаленай хустцы, нечым з твару нават падобнай да цёткі Марылі.

Помню, было гэта ў нядзельку, яшчэ роснаю раніцаю, з цішна-мяккім куваннем зя-

зюлькі ў сіваватых надрэчных вербах — яна любіць, чамусьці, вербы, а не алешыны, — міма Варонкавай хаты ядлаўцовымі кустамі, калючаю, ружаватаю ад жарствы сцежкаю, трохі нават з подбегам і неяк дзіўна азіраючыся на Варонкаў хутар, ішла кабета. На сагнутым локці яна лёгка несла лазовую карзіну з вечкам, другою, вольнаю і сціснутаю ў кулак, падмахвала сабе ў такт гутаркі — нячадных, перамешаных з малітваю праклёнаў: «Каб ты адпакутаваў, як адпакутавала я. Каб цябе і сырая зямелька не ўзяла! Каб цябе чэрві стачылі! Каб цябе перад сконам чэрці рвалі! Каб табе мову адняло! Каб табе рукі павыкручвала! Каб ты ў агні гарэў! Каб з цябе жыўцом скуру дралі!»

Згледзеўшы нечакана мяне, кабета нібы сумелася, змоўкла, гэтак моўчкі пастаяла, а потым, мякка ступаючы па сіва-ліловым, што разлёгся лісцікамі на мосе, яшчэ з нераскрытымі жоўтымі кветачкамі, валасніку, падышла да мяне:

— Ты ж чый будзеш? Ці не з гэтага хутара?

— Не, з вёскі я.

— Ты на мяне з гэткім дзівам не глядзі. Не дурная я. Хоць скажу табе, дзіцятка, як я і ад розуму не адышла, — яна азіраецца на хутар і падмахвае лазовай карзінай. — Гэта ж тут ваш Варона жыве?

— Ага. Толькі ён не Варона, а Варонка.

— Значыцца той! — яна злосна і рэзка махае сцятым кулаком. — Ён у вайну прыгледзеў, прыцікаваў маю нявестку. Прыгожая ж надта з твару была. Раз прыцягнуўся ў хату

п'яны, другі раз, трэці. Ужо й ратунку няма. Пачалі нават хаваць яе. Тады ён да сына: «Такую, растакую...» Сын ужо не стрываў, схапіў яго за грудкі. Ён пайшоў, як мыла з'еўшы. Праз тыдзень ці што, заліўшы гарэлкаю вочы, набраўшыся, як мурза гароху, прывалокся зноў. І трэба ж было нам адсунуць дзверы. І ён ужо не да яе, не да нявесткі, а да сына: «Шукай палатно ў куфры». Сын адчыніў, адкінуў вечка, нагнуўся, а ён во гэтак з ружжа і стрэліў яму ў патыліцу. На месцы забіў. Спытай за што? Нелюдзь. Злыдух. Нячыстая сіла. Нявестка ўцякла ў Наваградак і цяпер там жыве. Замуж надоечы выйшла. Я во адна як стой асталася. Так і жыву ў Нягрымаве. Але калі не йду ў мястэчка, то заўсёды прайду каля гэтага хутара і ўжо, як магу, так кляну, так ужо прашу ў Бога, каб паслаў якую кару...

Не ведаю, ці запомніў я ўсё, што расказвала мне тут, на палявой сцежцы, каля ядлаўцовых кустоў невядомая кабета ў зялёнай доўгай спадніцы з белым фартушком і ў чорным прыталеным сачку, — я быў уражаны і ўтрапеў ад дзіва, што такое нечалавечае і страшнае мог учыніць не злы і ціхаваты Ігнась Варонка.

Але, помніцца, у той жа год, у перадзім'е, калі ўжо ранні неглыбокі сняжок прыцярушыў зямлю, у сыры непраяснены дзень я ўбачыў, як наша вёска — малы і стары — рвануліся за шара-сіні голы алешнік да рэчкі, хто бег з бусаком, хто з вядром: там на грудку, ахопленая залацістым полымем, гарэла Ігнасёва хата — чорны знізу, вышай сіняваты дым, падняўшыся ўгору, даставаў да хмурага нізкага неба.

Я прыбег туды, калі ўжо абвалілася страха, столь і агонь забушаваў у хаце — гарэла шафа з тым невялікім пажыткам, які быў у Варонкаў. Мужчыны пачалі рваць бусакамі і скідаць на падтоптаны снег верхнія, абсмаленыя да чарнаты вянкі зруба. Ні Аксені, якая перад гэтым церла ў сенях лён, ні яе шасцігадовага Мішы, што, седзячы на печы, чыркнуў і падсадзіў запалку ў сухі лён — а сухі лён гарыць як порах, — тут не было. Іх забралі на блізкі хутар, за лясок.

Хлопец, казалі, быў трохі абпалены. Зашыўшыся далей ад агню, ён перапалохана і моўчкі сядзеў у кутку на печы, покуль у хату, поўную дыму, не ўбегла ўжо знямелая Аксеня і не выцягнула яго адтуль. Ёй, хворай на сэрца, зрабілася саўсім блага.

Але, чамусьці, шкадавалі не яе, а Ігнася, што зараз меўся прыйсці з работы і заміж хаты чорнае, што курылася сінім дымам, убачыць пажарышча і расцягнутыя, абгарэлыя дзеравіны зруба.

І раптам з купкі людзей, што асталіся яшчэ стаяць каля чорна-сіняга пажарышча, на якое жанчыны шугалі, прынёсшы вёдрамі з блізенькай рэчкі, разам са скрылікамі тонкага лёду, цяжкую халодную ваду, нехта перапуджана сказаў: «А во, Ігнась ідзе!» Усе, знямеўшы, абярнуліся. Я ўбачыў, як па белым грудку, на крываватай сцежцы па даўніх, ужо зацярушаных за ноч парошаю слядах спакойна і неяк занадта марудна ступаў Ігнась Варонка у чорным доўгім шынялі і летняй фуражцы.

Ён ужо ўсё бачыў здалёк... Ён толькі, вядо-

ма, не знаў, згарэў хто з яго сям'і ці не і, падышоўшы, адразу спытаў пра гэта. Не, дарэчы, не спытаў, а маўкліва і запытальна паглядзеў. «Не, ніхто, не», — выціраючы набеглыя ад жалю слёзы, сказалі адразу некалькі збедаваных, шкадаўлівых кабет.

І мне чамусьці ўспомнілася тая нягрымаўская старая жанчына ў засіненай хустцы, у доўгай зялёнай спадніцы і белым з нявострымі зубкамі фартушку, басаногая, з жоўтымі пазногцямі, успомніліся ўжо яе лямант і яе просьба да Бога: «Каб ты ў агні гарэў!» Мне, падлетку, здавалася, што праклён усё ж упадзе на Ігнася і не толькі той, што ўпаў на хату ў адліжны снежаньскі дзень.

Услед за пажарам да Варонкаў прыйшла новая бяда — нечакана захварэў там, у Баранавічах, — кажуць, яму ў нос убіўся рак, — там і памёр сам гаспадар — Ігнась. А праз год ці болей, калі яго Аксеня, сабраўшы абпаленыя дзеравіны і прыкупіўшы новых, агорала невялікую, яшчэ без сянец, хату, сям'ю спасцігла чарговае гора: назграбаўшы на подсціл карове падсохлага алехавага лісця, пры грудку, недалёка ад хаты, прысела перадыхнуць і ўжо не ўстала сама Аксеня.

Брата-падлетка, таго самага хлопца, што падпаліў на печы лён, да сябе ў Калінінград забрала сястра.

Адзінокая хата, што асталася стаяць на стромым грудку, над мармытлівай і булькатлівай рэчкай, у сцішныя вечары на якой залацілася дарожка ад чырвона-мядзянай поўні, позняй асенняй ноччу, шорсткай ад замаразку,

раптам загарэлася і, як свечка, ціха, роўненька апала.

Я гляджу на зарослае рэдкім ліловым чабаром і марным, што прыпаў да зямлі ліст-камі, сіваватым валасніком даўнейшае пажарышча, на жоўтую яму, на дне якой падымаецца варсістая, мякенькая, як аксаміт, зліняла-зялёная, яшчэ не расцвіўшая дзіванна, на паабіваную, мусіць, ад ранніх яблыкаў, нахіленую ад вятроў у паўднёвы бок старую папяроўку, і крыўда, перамешаная са смуткам, абдымае мяне, і я заварочваю ў хвойны лясок, прапахлы смалою, кастрыцаю, грыбамі, я нават падымаю адзін, трохі прытаптаны, на самай сцежцы, і выходжу да таго яра, дзе вясною з палёў у рэчку шугае цёмна-каламутная вада... І, як заўсёды, з-пад куста выскаквае і, падкідваючы белаваты азадак з кароткім хвосцікам, уцякае, прытуліўшы доўгія вушы, сыты заяц...

Ён адзін, як нешта даўняе, наіўна-радаснае і жывое ўзбуджае душу, і зноў па-маладому хочацца падсвіснуць і прабегчы гэтым зарослым зялёнымі ядлоўцамі ярам, вільготным, з прылізанай ад дажджавой вады травою. Але заяц у міг вока знікае за высокімі кустамі ядлоўцу.

Раўком я выходжу на знаёмую, толькі без глыбокіх калёсных каляін дарогу і спыняюся на ёй, азіраючы ўжо знаёмае поле з новымі падсаджанымі пералескамі, і па залацістым іржышчы заміж даўнейшай з саламяным лобам Варонкавай хаты бачу толькі густы, ужо распушчаны асот і засунутыя, збітыя, як авечкі ў гурт, белаватыя звезеныя з поля валу-

ны, што нібыта любілі шчодра расці на нашых сцежках, дарогах і межах.

Душа шчыміць, сэрца высмоктвае смутак... Ні хутароў, ні хутаранцаў. А як ім цяжка было прывыкаць да глухой адзіноты, высяляцца з вёскі, як, нарэшце, цяжка было вярнуцца назад, жыць на відавоку і прывыкаць да суседавага гармідару і крыку. Але ўсё ўжо беззваротна адышло...

Канчаецца густы, едка-пахучы і высокі ядловец, прысадзістыя з шырокімі абвіслымі лапамі сіваватыя хвойкі абапал раўка з выспамі зморшчаных, састарэлых і не вызбіраных маслякоў — я выходжу зноў да высокай старой бярэзіны, на хутар цёткі Марылі.

У разорах падымаюцца абвешаныя радужнай сінявата-залацістай павуцінай, натапыраныя, як кацяняты, пасаджаныя вясною хвоечкі. Праз год дзесяць яны схаваюць і гэты пусты надрэчны грудок з мройна-трапяткою, што нібы плыла некуды, выцягнуўшы вецце, сухашапатлівай бярэзінай.

Падышоўшы туды, дзе некалі была хата, і на прагале між натапыраных, як нэндзныя кацяняткі, хвоечак бачу густую шчотку зялёналіловых, урослых у зямлю скочкаў у гарошынках маладых, толькі што народжаных. І сярод гэтай густой, натапыранай шчоткі пухлаватых, налітых слізкай вільгаццю скочак падымаецца квола-жаўтлявы, невысокі сцвалок, абвешаны зверху букетам жоўтых кілішачкаў, што нагадвалі мне чмяліныя соты. Я, не вытрываўшы, рву мяккі сцвалок — я першы раз бачыў, як цвіце скочка.

Трымаючы ў руцэ гэтую райскую, першы раз убачаную кветку, я азіраюся кругa сябе: свет той, даўнейшы, стары і незнаёмы, абноўлены, уквечаны новымі дрэвамі, лесам, з новымі ў блізкім мястэчку белацаглянымі дамамі.

Цяжкім абвальным грукатам нада мною шыбуе імклівы самалёт. І ў далечыні над зялёным навалам маладога алешніку, праз чыгуначны мост, аднастайна-рытмічна перастукваючы коламі, ланцугом прабягае грузавы цягнік з цяжкімі пульманамі, з белаватымі рэфрыжэратарамі, з платформамі, наладаванымі лесам, з чорна-рудаватымі цыстэрнамі...

Усё тое і не тое... Свет ужо не майго, ужо чужога маленства. Маю сцежку прыкрыў яснажоўты расходнік — тое нізенькае зелле з жоўтымі зорачкамі растапыраных кветак, што любіць расці на жвірыстай і пясчанай зямлі. Я прыглядаюся да хвоек, што шырокімі копамі разрасліся сярод даўнейшага двара, і бачу голы, аброслы зялёным аксамітным мохам куст бэзу...

Ён, гэты стары ў зялёным аксамітным моху куст бэзу помніць мяне. І не толькі мяне. Ён помніць і ведае болей, як болей помню і ведаю я.

*1993*

## АЛЬЦІСТ З МЕСТАЧКОВАЙ АРКЕСТРЫ

Помніцца, мне, дзесяцігадоваму падлетку, падабаўся не той старэнькі жоўта-залацісты, пацямнелы альт з нізкавата-здушаным і не-

прыемным гукам, а аркестровая труба, здаецца, пасярэбраная, з трыма «помпачкамі» (мы гэтак называлі стаячую галасавую машыну) зграбна-інтэлігентнага выгляду з яркім, можа, нават рэзкім тэмбрам.

Яна, гэтая элегантная, з люстраным водсветам труба, яшчэ польская, прызначалася майму аднакласніку, цыбатаму, з доўгай шыяй і сінявататаму, як старая вантрабянка, Костаку Левандоўскаму, пасля таго як мы сабраліся на другія ці трэція заняткі музычнага гуртка, і сіваваты, у чорным фрэнчы польскага чыгуначніка Юзік Тулейка праслухаў нашы галасы.

— Запомні, — ты альт! — узняўшы палец, сказаў ён, па-школьнаму, Іосіф Казіміравіч, калі я праспяваў нешта ўжо ім самім падказанае.

Што мне дасталася менавіта памутнелая глухаватая труба, я ўпэўніўся тады, калі, купіўшы ў культмагу танны, з рыжаватымі картоннымі вокладкамі і жаўтлява-порыстаю папераю блакнот, як нараіў гэта зрабіць той жа Іосіф Казіміравіч, зайшоў у недагледжаны, аселы ад старасці яўрэйскі дом, у другой палавіне якога стаяла машына, дзе мястэчкоўцы ціснулі льняное семя, і ад дома заўсёды пахла цёплым духам алею.

Першую, ад вуліцы, і меншую палавіну дома займаў ён, Юзік Тулейка, былы польскі чыгуначнік і даўнейшы дырыжор мястэчковай аркестры, што была пры пажарнай стражы, цяпер — загадчык гаспадаркі ў нашай школе і адначасова кіраўнік музычнага гуртка. Духавыя інструменты — залаціста- і цёпла-бліску-

чыя барытоны, валторны, кларнеты, басы, альты, што належалі калісьці пажарнай, праз усю вайну збярог ціхаваты, па-татарску жаўтлявы з твару, як усе брунеты, гэты польскі чыгуначнік.

Пасля вайны, робячы ўжо загадчыкам гаспадаркі і займаючыся болей нарыхтоўкай дроў, ён, мусіць, самапростам, каб не прападалі марна інструменты і яго ўласны дар музыканта, арганізаваў пры школе аркестравы гурток. Хоць ён, гурток, фармальна лічыўся пры школе, але навучаліся мы найбольш у Тулейкі на кватэры.

Сарамяжа і ніякавата памарудзіўшы на гнілым, пачарнелым ганку, засыпаным краплістым і гаркавата-пахучым лісцем ад блізкага сохараня, я нарэшце зайшоў у сені, а адтуль, пастукаўшы, — у прадаўгаваты пакой, у якім з розных куткоў і сценаў, як у касцёле, фігуркі святых, здзіўлена і прыгожа паблісквалі залацістыя трубы рознай канфігурацыі і памеру. А на стале, засланым засіненым абрусам, ружова-пярловымі планкамі адсвечваў трафейны акардэон. На маё дзіва і недаўменне, гаспадаром у пакоі, а можа, і ва ўсёй кватэры, аказаўся Костак Левандоўскі. На стале перад ім двума стосамі ўзвышаліся гэтакія самыя, як і мой, танныя, у рудаватых картонных вокладках, набухлыя блакноты. З аднаго стоса Костак браў таўставаты блакнот, разгортваў яго і, высунуўшы на верхнюю губу ружовы кончык языка, выводзіў на чыстым лістку металічнаю машынкаю з рубцаватымі колцамі, абмокнутымі ў густое залаціста-ліловае чар-

ніла, дзе раўней, а дзе трохі коса, прыгожыя пяцілінейныя стужкі. Нотных сшыткаў у тыя гады ў нас не было.

— Давай свой блакнот! — ён з пыхлівым, непадступна-ганарыстым выглядам, нібы робячы вялікую ласку, кінуў чужы блакнот на другі стос і выцягнуў руку з упэцканымі ў чарніла пальцамі.

Машынка, як дыскавая барана, разоў з чатыры праехала па рыжаватым полі майго блакнота, пакінуўшы раўнюткія кропачныя стужкі-баразны.

— А труба якая ў цябе? — спытаў Костак, неяк брыдліва адсоўваючы блакнот і папярэдзіўшы, каб я не загортваў — няхай высыхае чарніла.

— Мусіць, альт, — з няпэўнасцю адказваю я.

— Во, ён вісіць, — умазаны ў фіялетавае чарніла Костакаў палец тыцнуў на заклееную зялёнымі шпалерамі сцяну, дзе якраз вісела шырокім раструбам уніз памутнелая, працёртая да цемнаватых плямаў старая труба.

— А ў цябе іншая? — з няменшай цікавасцю і інтарэсам спытаў я.

— Гэ-э, — разявіўся шыракаваты, таўстагубы Костакаў рот. — Во-о, глядзі! — і той жа ж ліловы ад чарніла палец паказаў на невялікую і танюткую, як маладое дзяўчо ў доўгай сукенцы, ясна-серабрыстую помпавую трубу, што ўладарна і зваблівa зіхацела на чорнай старой камодзе. І нарэшце ўдакладніў з неабвержным гонарам:

— Гэта труба майго бацькі.

— А хіба твой бацька граў у аркестры?

— Дзіва, нават вядучым, — і Костак не забыўся пахваліцца нават сваёю дасведчанасцю. — Сольныя партыі выконваў.

І ўжо прыглушаным ад балючых, пэўна, спазмаў, цяжкім голасам выдыхнуў:

— Яго ж уласаўцы закатавалі.

Я прыгадаў вялікую з двума крыжамі, каталіцкім і праваслаўным, абгароджаную невысокім штыкетавым плотам доўгую магілу, што свежым пяском жаўцела на развілцы вуліц насупроць касцёла, у якую звозілі і хавалі, адшукваючы ў шасэйных канавах, у раўках, на прыдарожным полі забітых у вайну. Сюды ж перанеслі трупы дваццаці мужчын, якіх закатавалі ў гумне, на недалёкім ад мястэчка хутары, ужо адступаючы, раз'юшаныя і помслівыя за сваю здраду былыя палонныя, якія апынуліся ў радох уласаўцаў і ваявалі на баку спрадвечных рускіх ворагаў — немцаў. Я ж не ведаў, што паблізу касцельнага плота, у свежай магіле ляжаў Костакаў бацька.

— Праз аркестру мой тата і згінуў, — сутаргава ўздыхнуўшы і нарэшце перамогшы свой шчымлівы і неаднойчы перапакутаваны ўжо боль, загаварыў прыцішана-задуманы Костак. — Не пайшоў граць жалобны марш, як хавалі ўласаўца, што падарваўся гранатаю, глушачы ў завоінцы рыбу, — ператрымаў яе ў руцэ...

Вострым локцем Костак адсунуў рыжаватыя блакноты. Устаў з-за стала і, падышоўшы да старой, сточанай шашалем камоды, уладарна узяў праваю рукою серабрыстую трубу.

— Ну, зайграй, — падахвоціў я.

— Без муштука? — ён крадком азірнуўся на мяне і пастукаў тым жа ўмазаным у чарніла пальцам па вузкім кончыку трубы. — Муштук тут павінны быць. Ты што, першы раз бачыш трубу?

— Ну, не першы, але ў руках не трымаў.

— На, паглядзі, — Костак нібы зжаліўся нада мною.

Элегантна-прыгожы інструмент даверліва і чуйна халадзіў мне рукі. Я з узнёслай радасцю прыклаў да губ вострую без муштука рульку і пальцамі правай рукі націснуў на гузікі вентыляў. Але заміж чаканага прыемнага гуку з трубы пачулася непрыемна густое шыпенне.

— Слухай, — разгневаны Костак раптам выхапіў з маіх рук трубу. — А можа, ты разам са мною будзеш вучыцца граць на акардэоне? Нас ужо ёсцека двое — ты будзеш трэці. Я скажу дзядзьку Юзіку. Плата невялікая — маці прынясе колькі яек ці асялок масла.

Праўда, я ўжо бачыў, як іншы раз у суботнія ці нядзельныя вечары старэйшыя мястэчковыя хлопцы, заклаўшы за плечы перакупленыя ў кагосьці трафейныя акардэоны, пад’язджалі на веласіпедах пад прапахлы алеем Тулейкаў дом.

Я ледзьве ўпрасіў маму, каб пусціла мяне ў музычны гурток ці, як яна казала, аркестру, а тут яшчэ вучыцца на акардэаніста ды за плату?

— Не-е, — пакруціў я галавою, горка расчараваўшы ўзнёсла-разгарачанага Костака Левандоўскага. — Мама не пусціць.

— Мама, мама, — перакрывіў і перадражніў мяне Костак і неяк горка скрывіў свае тоўста-сіняватыя пухлыя губы. — Але ж твая маці не пасылала цябе на чыгуначную станцыю па вугаль. А мне во трэба збегаць і з дэпоўскага склада накрасці яго. Дроў жа ўдома нямашака.

Ён, азірнуўшыся наўкруга сябе, знайшоў нарэшце на абслізганым табурэце, што стаяў пры дзвярах, парудзелы, скручаны ў сувой стары мех.

— Хадзем разам, — сцішаным і падабрэлым ужо голасам папрасіў ён. — Мне смялей будзе. Ты пастаіш, папільнуеш, каб часам хто не надышоў. Я пабойваюся гэтых «ястрабкоў» — страляюць як шалёныя. Чуў? Днямі застрэлілі дэзерціра, проста на парозе ў хляве — ішоў паіць каня.

Тыя два ці тры пасляваенныя гады ў нашай старане былі досыць неспакойныя: яшчэ не выйшлі з лесу і не склалі зброю ўсе партызаны і, прывучаныя да гвалту і рабавання, начамі зноў грозна пастуквалі прыкладамі ў вокны баязліва-сцішэлых вясковых хатаў; яшчэ тамсям туляліся акоўцы — нядаўнія польскія партызаны, якіх цяпер выпорвалі з хутароў войскі НКВД. Ім у помач арганізоўвалі «истребительные батальоны», куды з дзіцячаю ахвотаю запісваліся мястэчковыя падшыванцы.

Заміж нямецкіх магістратаў цяпер гарэлі сельсаветы, свецячы сярод глухое ночы пурпуровым страхатлівым агнём. Навучаныя падпільноўваць і караць спадцішка колішніх вясковых старастаў ці старшыняў управы, нач-

ныя госці праз вакно ці з якога-небудзь схрону стралялі савецкіх упаўнаважаных, наезджых актывістаў і ўжо тых, хто першым падаваў заяву ў калгас. Наша, як тады казалі, Заходняя Беларусь як магла і чым магла ратавалася ад саветаў ці, праўдзівей, ад усяго прымусова-савецкага: непасільных пазыкаў, бясконцых падаткаў, незлічоных паставак і абагульнення зямлі, гаспадарчага рыштунку і гумнаў. Якая патаемна-нясцерпная нянавісць жыла, перавварочвалася тады балючым клубком у кожнай душы! Да гэтай нясцерпнай чалавечай крыўды далучаўся і чуйны дзіцячы боль.

Помніцца, як з нашага чацвёртага класа, — калі туды ўвайшоў невысокі даўганосы хлопец у шарым картовым касцюме і тутэйшая, трохі малахольная дзяўчына з пакамечаным, неадпрасаваным гальштукам, што па-мужчынску, брылём назад надзеўшы кепку, ганяла па мястэчковых вуліцах на зялёным трафейным веласіпедзе, мы ўсе цішком пачалі ціснуцца да дзвярэй і адзін за адным выскокваць на калідор, — у піянеры тады запісаўся ці ён, дарэчы, піянерам ужо быў, недарослы, злоснахудзенькі сын прыезджага, тоўстага, мусіць, ад сардэчнай хваробы, дзяжурнага па чыгуначнай станцыі і перарослая, сарамліва-прыгожая дачка даўнейшага, яшчэ перадваеннага савецкага міліцыянта, што вярнуўся з фронту ранены ў плячо і рабіў ваенруком у нашай школе.

Цяпер якраз, калі мы, выйшаўшы з Тулейкавай хаты, наўпрасты праз іржавыя, недагледжаныя пуці чыгуначнай станцыі накіраваліся да вугальнага склада, абгароджанага едка-па-

хучымі ад крэазоту старымі шпаламі, ён і трапіўся нам на вузкай, зарослай бязлістым цыкорыем сцежцы.

— Пад вугальны склад, хлопцы, не ідзіце, — па рудаватым мяху, што куксаю вытыркаўся ў Костака з-пад пахі, ён, пэўна, здагадаўся, куды мы ідзем. — Там чырвонапагоннікі і ястрабкі. Раю вярнуцца назад, каб часам чаго кепскага не выйшла.

Мы, паслухаўшыся, вядома, вярнуліся, але не дадому: брала цікавасць — што ж там папраўдзе робіцца. Прайшоўшы трохі за ваенруком, мы няўзнак завярнулі назад. Тулячыся каля даўнейшых зеленавата-шэрых нямецкіх складаў, ад якіх цяпер густа пахла прыпсаванымі селядцамі і разлітым вінам, і перабегшы адзінаццаць, як не раз падлічылі, пуцей нашай чыгуначнай станцыі, спадцішка падкраліся бліжэй да вугальнага склада, абгароджанага на стаяка чорна-рудаватымі шпаламі. Недалёка ад гэтай рудаватай, едка-пахучай сцяны, пад шурпатым тоўстым камлём самотна ўзнёслага топаля, чорнага ад злеценых нанач гракоў, на белаватых мяхах і клунках гаротна туліліся жанчыны з дзецьмі. З някрытага грузавіка, з дашчанай яго скрыні туды, пад топаль, выгружалася яшчэ адна сям'я: даўгарукі, прыгорблены мужчына насіў, ускінуўшы на спіну, вялікія клункі, увязаныя ў паласатыя малінавыя радзюжкі. Нізкарослы баец у ватняй куртцы і выцвілай пілотцы ссаджваў на зямлю басаногую дзяўчынку.

— Некага вывозяць ці што? — я азірнуўся на пудка прыціхлага Костака.

— Ну, пэўна ж, калі там салдат завіхаецца, — неяк нібы адчэпна і злосна варухнуў плечуком Костак. — Вугалю не набяру. А можа, падкрадземся з другога боку!

— Да склада не падкрадзешся. Бачыш, наўкруга ястрабкі, — і я паказаў на падлетка ў вайсковых галіфэ і ў вялікім, з чужога пляча кіцелі, што ішоў якраз на нас, трымаючы на плячы за брызентавы пасак доўгую вінтоўку.

— Ведаю гэтага зноска, — задыхнуўся ад злосці Костак. — Вераціла, прыдсядацелеў сын. Урэдны, падла, мяне ўжо лавіў. Уцякайма, покуль не позна.

І Костак першы з нейкім ласіным храпам і быстрынёю завярнуў за дашчаны доўгі склад. Я рвануўся ўслед за ім. Шыбануўшы ў патайны і вузкі завулак, што ўшчаміўся між збуцвелых, пахіленых платоў і смярдзючых ад гною хлеўчыкаў, у якіх сыта парохквалі і рахмана чухаліся дужыя падсвінакі і ўспуджана ўскрыквалі насцярожаныя пеўні, мы спакваля ўжо дайшлі да невысокае пабеленае хаткі, што сонна стаілася пад мякка і сцішана шапаткімі хвойкамі. За імі строма і палахліва абарваўся пясчаны бераг гнілога азярца, зарослага сівым высокім, як сцяна, непралазным гляжджаем. На азярцы іншы дзень спраўны ва ўсім Костак зграбаў для рабое свінні зялёную раску.

— Дзе ж цябе халера носіць? — перастаўшы стракатаць швейнаю машынкаю і перакусіўшы нітку, што цягнулася з іголкі, павярнулася да нас Костакава маці. — Крапівы свінцы трэба было б нарваць.

— Я па вугаль хадзіў. Няхай скажа ён, —

гнеўна і недавольна зморшчыўся пакрыўджаны Костак.

— І дзе ж ён, твой вугаль?

— Дзе-дзе? — перадражніў яе Костак і кінуў на заслон у прыходзе пусты згорнуты мех. — Ястрабкі там круцяцца, людзей вывозяць.

— Добрых не павязуць, — як мне здалося, нават з непрыхаванай радаснай злосцю адказала Костакава маці і, згробшы з прыполу нацярушаныя хвосцікі нітак і рознакаляровых лапікаў, паднялася над прыгожай швейнай машынкай, што нагадвала мне тулава чорнага з белаю галавою каня.

Дарэчы, чорнага з белаю я не бачыў, а каштанавы з белаю храпай і белым жыватам быў у местачковага майстра, які, маючы металічныя формы, рабіў тутэйшым заказчыкам калодзежныя трубы і пустацелыя цэментныя блокі, ці, як у нас іх называлі, — пустакі. З гэтакіх шурпатых пустакоў быў складзены за Костакаваю хатаю невысокі хлявок, у якім раздражнёна мігітала чорная з сівою барадою каза і, заплюшчыўшы вочы, салодка чухалася рабая свінка. А поруч, з высокае, на ножках, клеткі, чуйна падымаючы доўгія вушы, чырвонымі вачмі свяцілі белыя ангорскія трусы, для якіх Костак нібы касіў ухватнаю жменяю і таптаў у гэты руды і вечны свой мех разучую, як пілка, плашчугу* і халодна-росную макрыцу.

Наслухаўшыся нуднага і балючага, як стрэмка, упікання, мы, нібы ад навальнага

* Мяшэй.

дажджу, уцякаем у блочны шурпата-шашачны хлеў: я — каб стаць пры адчыненых дзвярах і сцерагчы, каб часам не вышмыгнула на двор аблезлая гарбатая труска, а ён, Костак, каб узяць за вушы і падняць трапяткое трусяня, што бездапаможна боўтае доўгімі заднімі лапамі, шукаючы апоры.

— Маеш рубель ці не? — спадцішка пытае Костак і, прыклаўшы да грудзей цёпла-даверлівае трусяня, гладзіць яго па лабатай галаве і гарбатай спінцы.

— А нашто табе? — насцярожваюся я.

— Ты скажы, маеш ці не? — прыстае Костак зноў, відаць, прыдумаўшы якое-небудзь штукарства ці зманвае на нешта несусветна брыдкае, накшталт таго, каб мы надвячоркам у жаночы дзень зазірнулі ў местачковую лазню, дзе старэйшыя падшыванцы на зафарбаваных шыбах прадрапалі таемныя і спакуслівыя дзіркі.

— Не, не маю, — пакорна ўздыхаю я.

— Ато збегалі б да салдата, што вартуе аптэчныя склады, і выстралілі б з вінтоўкі.

— Так ужо і выстралілі б, — здзекліва ўжо ўсміхаюся я, успамінаючы вахлакаватага салдата з доўгай рускай вінтоўкай.

— За так не выстраліш, а за рубель — можна, — прымружвае адно вока Костак.

Там, дзе зарослая прыгаслым расходнікам і бязлістым цыкорыем іржавая ветка адыходзіць ад шырокай пасмы пуцей і бяжыць за калючы дрот яшчэ не знятага загарада даўнейшага яўрэйскага гета, у перабудаваных драўляных хатах і ўжо новых шчытавых бараках, ад

якіх пахне смуроднай камфарай, знаходзяцца аптэчныя склады вайсковага шпіталя. Іх вартуе заморана-худы, нібы хворы на язву, рослы салдат у дзіравым, патрапаным шынялі і ў выцвілых абмотках.

Кожны раз, калі я мінаў высокі калючы загарад і доўгія за ім хаты са шчытавымі баракамі, мне чамусьці думалася, што вайсковая часць забылася пра свае бінты, лякарствы і гэтага ссутулена-адзінокага салдата, што з нейкім пакорным, нібы сабачым адчаем пaглядаў з-за дроту на ўсіх прахожых.

Аднойчы, у нядзельны сумны надвячорак, заўважыўшы на ружаватым бруку нас з Костакам, ён падаўся да калючага дроту і падмахнуў рукою:

— Несите, ребятушки, по рублику, дам стрельнуть, — і, паказваючы жаўтаватыя ад курыва зубы, кісла ўсміхнуўся, а потым паляпаў пяцярнёю па цёмна-карычневым прыкладзе доўгай мосінскай вінтоўкі. — Ей бож дам.

Костак, як ашалелы, вопрамеццю рвануўся дадому і, выпрасіўшы ў мацеры, прынёс макраваты ад поту, скамечаны рудаваты рубель і, расчыніўшы жменю, паказаў яго здзіўлена-набычанаму павесялеламу салдату.

— Заходи, — салдат прыадчыніў фортку пры вялікай жалезнай браме, прапусціўшы за калючы дрот аднаго толькі Костака.

Ціхенька, па-зладзейску азіраючыся, яны зайшлі ў суткі між зялёных шчытавых баракаў, і неўзабаве адтуль пачуўся тупы, кароткі стрэл.

У мяне, вядома, рудаватага, як тытунёвы ліст, рубля не знайшлося, і я застаўся злосна-

абыякавы да гэтага непатрэбнага стрэлу, што з лопатам падняў над складамі грумадку пудкіх галубоў.

Я нават не спадзяваўся і не цешыў сябе, што выпрашу ў мацеры грошы, — мы з мамаю жылі з мізэрнай гаспадаркі, сплочваючы бясконцыя сталінскія падаткі і здаючы за карову малако, а за дзве шарыя авечачкі — воўну і мяса. Костакава ж маці была краўчыхаю, яна абшывала местачковых спекулянтак, што разам з інвалідамі гандлявалі на рынку дражджамі і самагонам, савецкіх жанчын, што ўслед за афіцэрамі і чыгуначнікамі прыехалі ў мястэчка, яна магла зарабіць такі-сякі грош, таму ў Костака ў кішэні шапацеў папяровы рубель, а то нават адшкадаваны траяк.

— Значыцца, не маеш, — Костак нібы з нейкім здзеклівым нада мною свіргатаннем і рыпам зачыняе ў хлеўчуку дзверы і, якую хвіліну стоячы пры іх, задумліва кажа: — Трэба было б у краснапагоннікаў украсці карбіду — я ведаю, дзе ён ляжыць. Там, за іхняю канюшняю, у паветцы стаяць бочкі з карбідам.

— А нашто ён табе? — пытаю я, пазіраючы, як на сцішэлае мястэчка цярушыцца вечаровы змрок, і як бясконцым шлейфам з мяккім шоргатам крылляў плывуць пацяжэлыя пад восень гракі, — мне пара ўжо дадому.

— Пытае, нашто? — Костак зубамі падкусвае сваю таўставатую верхнюю губу. — Рыбу глушылі б і ластавак з-пад карчоў выгналі б. Ты ці ведаеш, што яны зімуюць у рэчцы? Счэ-

пяцца лапкамі і вісяць вяночкам, зачапіўшыся за корч у бухце.

— А не ляцяць у вырай? — пытаю, спатажаны нечаканым Костакавым адкрыццём.

— Як і жаваранкі, — цвёрда, з усёй грунтоўнасцю вялікага знаўцы заўважае Костак.

— Махлюй болей, — я пачынаю хмыкаць недаверлівым смяшком.

— Каб я з гэтага месца не сышоў. Мой дзед расказваў: пайшоў аднаго разу лавіць рыбу і выцягнуў вянок сонных ластавак. Закінуў сетку пад корч і якраз натрапіў на іх... Але ты, бачу, не даеш веры і па карбід не пойдзеш, — сонна і расчаравана пазяхае Костак.

— Ага, пара дадому, забавіўся я.

Костак яшчэ падводзіць мяне да невысокіх весніцаў і, абапершыся локцем на іх, сурова ўжо, як памочнік у дзядзькі Юзіка, папярэджвае:

— Ты ж не забудзься заўтра прыйсці да Тулейкі: Іосіф Казіміравіч будзе раздаваць інструменты, — атрымаеш свой альт.

— А ты пасярэбраную трубу з «помпачкамі»? — з нецярплівай рэўнасцю адказваю я.

— Ну-у, зраўняўся, — разяўляецца і ганарыста задзірае свой наздраваты нос зняважаны Костак.

Але назаўтра нас чакала горкае і неспадзяванае расчараванне: як я не атрымаў свой стары памутнелы альт, так ён — сваю новую пасярэбраную трубу са стаячымі помпачкамі.

На збуцвелы да чарнаты, гадоў колькі не фарбованы ганак, дзе сабраліся мы ўсе, чакаючы покуль выйдзе і запросіць нас у кватэру

заўсёды ціхаваты і нязлосны Юзік Тулейка, з-за дзвярэй высунула сіняваты, нібы змерзлы нос яго мажная, галарукая Анця і, хаваючы гэтыя голыя рукі пад квяцісты пярэднік, здзівілася:

— Вой, вы ж, пэўна, не ведаеце, што Юзік паехаў хаваць савецкага актывіста. Кажуць, яго ўчорачы ўвечар праз акно застрэлілі. А гэтакая пашана — хаваюць з аркестрам. Загадалі знайсці ўсіх, хто граў у польскай аркестры, і павезлі на самаходзе.

Яна яшчэ абвяла нас вялікімі шара-зеленаватымі вачыма і, кашкануўшы нагою чорнага з белымі лапкамі катка, што ўслед за ёю высунуўся з сенцаў, схавалася за дзвярыма.

Мы, смутныя, як прадчуваючы благое, разышліся па хатах. Заняткі духавога гуртка аднавіліся толькі праз тыдзень. Іосіф Казіміравіч прыйшоў на іх яшчэ больш пацішэлы, сумны, нібы адрошаны. Разам з разлінованым уручную рыжаватым блакнотам я атрымаў залаціста-памутнелую трубу.

Я нёс яе дадому, трохі саромеючыся сустрэчных, асабліва сваіх зайздросна-помслівых равеснікаў.

Дарэчы, я хаваў яе і ад зіркатых вачэй суседак, што амаль кожнае раніцы прыбягалі да мацеры разгадваць свае бясконцыя сны, як і ад свайго меншага брата, што без спросу адчыняў і перапорваў чорны шкапчык, перагароджаны палічкаю, дзе ляжалі мае сшыткі і кніжкі, праўда, усяго адзін падручнік па геаграфіі, бо іншыя раздавалі толькі ў школе — па адным на парту, каб пасля ўрокаў забраць

назад, — таму я свой альт запхнуў на палок за печ.

— Ну во, знайшоў спрат, — не залюбіла і маці, згледзеўшы ў запечку залацістую трубу. — І занясі гэтую забаўку назад.

Ёй быў не даспадобы ні мой музычны гурток, ні тое, што я прыходжу дахаты на шарай гадзіне. Восеньскія дні імкліва карацелі. Прадчуваючы блізкі зазімак, ужо з трывожным голасам невысока над мястэчкам двума клінамі ў вырай праплывалі асветленыя вечаровым сонцам шара-серабрыстыя журавы. З Тулейкавага дома, прапахлага духам алею, я пачаў варочацца нават глухаватаю цемнатою.

Праўда, яна тым часам ратавала ад злаcліўцаў, што, перастрэўшы мяне на вуліцы, наўздагон крычалі:

— Метак, ну затрубі!

А што я мог затрубіць, калі мы пачыналі з нотнай азбукі; ды хіба ж яны ведалі, што труба, на маё таксама горкае расчараванне, была толькі часткаю цэлага вялікага аркестра, што яна магла іграць у спалучэнні і суладдзі з іншым духавым інструментам, а ў асобку ў яе быў натужны, нібы здушаны тэмбр, не тое, што ў элегантна-зграбнай аркестравай трубы, якая чаравала мяне ясным, меладычным гукам і якая ашчаслівіла майго аднакласніка і сябра Костака Левандоўскага.

З чалавечай зычлівасцю і разуменнем мяне і мой стары, пацямнелы альт прывітаў хіба адзін толькі Ігнат Данілавіч Скрыбец, настаўнік беларускае мовы. Па-вясковаму праставаты ў сваім цянюткім, зношаным і нібы да-

матканым касцюмчыку, былы дырэктар нашай беларускай школы яшчэ пры немцах цяпер, здаецца, не пасаваў, не падыходзіў, вылучаючыся сарамяжай шляхетнасцю перад прыезджымі і дэмабілізаванымі з войска савецкімі настаўнікамі ў доўгіх афіцэрскіх шынялях, у цёмна-сініх гімнасцёрках і гэтакіх самых галіфэ.

А яго дачкою, вірлавокай і танканогай, як сарна, дзяўчынай у капялюшыку і тугаватай кароткай спаднічцы, нечым падобнай да польскіх гімназістак, я таемна і несвядома яшчэ захапляўся. Я ўжо наровіў сумысле прайсці міма белай мураванкі з чорнаю прорваю верхняга акна, дзе была рэдакцыя раённай газеты і дзе, казалі, яна рабіла карэктарам — спецыяльнасцю неразгадана-таямнічаю тады для мяне.

— Надта ж граматная Скрыбцова дзяўчына, — помніцца, незнарок пахваліла яе заўсёды зласлівая і абгаворлівая Костакава маці, але тут жа не ўпусціла, каб усё ж не ўпікнуць. — Багатыя, таму і іхняя верхнасць была.

Між драбнаватых і круглатварых, як матрошкі, савецкіх кабет, што з’явіліся ў мястэчку ў тоўстых вязаных хустках, у цяжкіх ботах і валёнках без галёшаў, яна папраўдзе выдавала шляхетнай паннай.

І як я спатажыўся і зніякавеў, калі надвячоркам на вуглу сельмага, асветленага ці не адзінай на вуліцы лямпачкай, трымаючы пад пахаю свой альт, выскачыў ёй насустрач, — яна ішла пад ручку з бацькам у ганарыста на-

бакір пасаджаным капялюшыку з пярынкай.

Згледзеўшы маю замешку і разгубленасць, Скрыбец паблажліва ўсміхнуўся:

— Ну, што, альціст? — і, адарваўшыся ад дачкі, заступіў мне дарогу. — Запісаўся ў духавы гурток?

Я, маўчучы, стаяў і чуў толькі адно, што побач яна.

— Гэта выдатна, будзеш напачатку ведаць хоць элементарную нотную грамату. Я ж яе во, — ён варухнуў вострым плечуком у бок дачкі, што прыстакнула зводдаль і, развёўшы локці, трымала рукі ў цёплай муфце з залацістым замочкам, — вучыў іграць на скрыпцы, нават з помаччу зычлівых людзей у Варшаўскую кансерваторыю паслаў, але ўсё перайначыла вайна...

— Тата! — пад пляскатым, пасаджаным набакір капялюшыкам злосна зморшчыўся яе курносы носік.

— Ну, добра, не буду болей пра цябе, — ён парывіста ўзмахнуў галавою ў шырокай кепцы з зашпіленымі наверсе вушкамі. — Пахвалю сябе, бо таксама іграў у аркестры і спярша, як ты, на альце.

І яго рука пацягнулася да мае трубы.

— Тата, вы як маленькі, — з муфты раптам высунулася танюткая рука і схапіла бацьку за локаць. — Не смяшыце людзей!

— Ну во, не даюць чалавеку ўспомніць маладосць, — Скрыбец шырока раскінуў рукі і сарамяжа ўсміхнуўся, свецячы залатою каронкаю, і пайшоў услед за дочкаю, — худы, драбнаваты, усяго ёй па плячо ростам.

Я пазіраў ім услед, стоячы тут, каля сельмага пад рассеяным святлом лямпачкі і бачачы, як іх ахутвае, паглынае мяккі ліловы змрок. Мне тады, вядома, не думалася, што гэта быў ужо змрок неразгаданай і нераспазнанай вечнасці. Пасля таго ветранага кастрычніцкага вечара мы з Ігнатам Данілавічам больш ніколі не спатыкаліся.

Бо назаўтра раненька, калі па першаму чуйна-хрумсткаму, шапаткому прымаразку я забег да Костака Левандоўскага, каб паклікаць яго ў школу, яго невысокая, кароценька-таўставатая маці з чорнаю, як падведзенаю вугольчыкам, наміткаю пушку на верхняй губе, павярнулася ад пліты, дзе нешта шыпела і булькала ў вялікім алюмініевым сагане, нібы абязвечыла мяне, падняўшы белаватае вока і варухнуўшы губою з лёгкім пушком:

— Не чуў, мусіць? Вашага вучыцеля, гэтага здыхляка Скрыбца сёнячы ноччу заарыштавалі. Вунь жонка ад памяці адыходзіць, і дачка раве, як карова.

Непрыхаваны гнеў, нават помслівая злосць чувäць была ў яе трохі хрыплаватым голасе. Я ж не здагадваўся, што крыўда, перамешаная з болем, сачылася з яе душы пэўна таму, што нехта з мужчын, перабыўшы вайну, жыве, а яе мужык, застрэлены маладым, парыць зямлю недалёка ад свае пабеленае хаты, на развілцы вуліц пад двума ўзнёслымі крыжамі, каталіцкім і праваслаўным, пад якімі хавалі тых, хто быў закатаваны ў вайну.

— Краснапагоннікі заарыштавалі, — удакладняе яна, абхапіўшы аберуч каравымі ану-

чамі вялікі саган. — Таямнічую арганізацыю выявілі, пабяруць яшчэ...

У класе, куды мы ўвайшлі трохі прыпазніўшыся і перапоўненыя таямнічаю мястэчковаю навіною, каб расказаць яе на здушаным паўшэпце, усе неяк падазрона, чуйна і нацята стаіліся, пэўна, ужо ведаючы без нас пра гэты начны арышт, тым больш меўся быць урок беларускай мовы, і клас, асабліва ўстрывожаныя дзяўчаткі, з затоеным страхам і кабечай нецярплівасцю чакалі, хто з настаўнікаў заменіць Ігната Данілавіча.

З размаху рвануўшы дзверы, у клас спярша зазірнуў і неяк збянтэжана падаўся назад расчырванелы, як пазней мы заўважылі — ад нашча перакуленае чаркі, дырэктар школы, а потым, трымаючы наперавес перад сабою вінтоўку, увайшоў рослы, з упалымі шчокамі, ваенрук.

Ён уладна паклаў яе на стол і, азірнуўшы клас, сарамяжа ўсміхнуўся:

— Хлопцы, хто з вас паможа мне прынесці яшчэ некалькі вінтовак?

І, напэўна, паўкласа, зарыпеўшы і загрукаўшы лаўкамі, на шырокі ўзмах ваенруковай далоні падбегла да дзвярэй.

Мяне, адапхнуўшы набок, апярэдзіў Костак Левандоўскі. А тыя, каго ўжо, прапускаючы паперадзе сябе на калідор, адабраў ваенрук, праз хвілін пяць, узбуджаныя і задыханыя, прынеслі ў клас едка-пахучыя ад ружэйнай змазкі, пацямнелыя, з чорным рабаціннем даўняй іржы сапраўдныя вінтоўкі.

На нашу лаўку Костак кінуў ажно дзве.

Уважліва і замілавана-радасна разглядаючы сваю, я з нечаканым дзівам і адначасна з балючым расчараваннем убачыў на ствале, вышэй замка, высвідраваную чорную дзірачку.

— Што гэта? — недаўменна павярнуўся я да Костака.

— Дзірка, хіба не бачыш?

— А ў тваёй?

Костак прыўзняў сваю, нашмат навейшую, без крапінак іржы, з жаўтлявай ложай вінтоўку, і я з тым жа ж здзіўленнем убачыў, што ў ёй таксама чарнела, нібы ў дупляным зубе, глыбокая свідравінка.

— Зрабілі наўмысна, каб не стрэліла вінтоўка. Спытай, калі хочаш, у ваенрука.

— Так-так, — пачуўшы перашэпты і на іншых партах, пацвердзіў ваенрук.

Вядома ж, гнеў наш і расчараванне былі немалымі, але не меншаю, здаецца, была і радасць — паляскаць замком і прыцэліцца, адчуўшы ў руках звабліваю вагкасць сапраўднай зброі.

У кожным чалавеку, тым болей у дзесяці ці дванаццацігадовым падлетку віруе спрадвечнае злосна-спакуслівае імкненне, гэты неадольны магнэз страляць, біць, крышыць, рушыць. Благое ў чалавеку нараджаецца разам з ім, і чалавек заражаны ім на ўсё свядомае жыццё. Кожны з нас у патэнцыі сваёй — забойца, толькі не кожны здзяйсняе тое, што ў ім жыве.

— Скажыце, — не прывабленыя ўсё ж вінтоўкамі, мусіць, хутчэй раўнадушныя і абыякавыя да іх дзяўчаткі нарэшце, не ўтрымаўшы, спыталі ў ваенрука. — А дзе наш Ігнат

Данілавіч? Кажуць, што яго арыштавалі... Няўжо праўда?

Узнёсла-бескллапотны, нават вясёлы, з іскрамі смеху ў блакітных, нібы дзіцячых вачах ваенрук раптоўна схмурнеў, нацяўся ўвесь і, заліўшыся чырванню да самых вушэй, смешна адтапыраных на сіва-лысаватай галаве, зусім марудна, цягнучы слова праз слова, адказаў:

— Не, нічога не ведаю, не чуў нават. Я, як вам сказаць, не быў, лічыце, нават знаёмы з ім. Ну, шапачна, як гаворыцца...

— Як?! — некаторая з дзяўчынак нават успляснула рукамі. — Вы з ім і ў школьнай канцылярыі за руку не віталіся?

— Ну, ведаеце... — нешта невыразнае і няпэўнае мямліў ваенрук.

— Чуеш? — востры Костакаў локаць балюча штырхнуў мне ў рабро. — Во, як баіцца Сталіна.

— А хіба ж Сталін арыштоўвае? — я з недаўменнем азірнуўся на Костака.

— А то хто ж бярэ ўсіх за жабры? Ён!..

Разабраўшы ў вінтоўках замкі, а потым ужо з помаччу ваенрука сабраўшы іх, мы выйшлі на хмураваты асенні двор, засыпаны жоўтабардовым лісцем са старога, сумна нахіленага над школаю клёна, каб ужо навучыцца па камандзе ваенрука браць вінтоўку «на плечо!», а потым — «к ноге!». Непадступна-злосных і загневаных дзяўчатак, даўшы ім нейкае заданне, ваенрук пакінуў у класе.

Астатнія ўрокі цягнуліся для мяне з абрыдлаю і непераадоленаю нудою, мне не хацелася

рашаць блытаныя задачы або адказваць да тупасці завучаныя арфаграфічныя правілы. Я, пэўна, як і ўсе ўражлівыя і нервовыя дзеці, пакутаваў ад дзіслексіі, Дарэчы, нелады з правапісам дадаюць мне нямала клопату і сёння, у сталыя гады.

Але, на шчасце, у нас пачалася геаграфія, якую вяла ружовашчокая, трохі скуластая, з запухлымі вочкамі, нядаўна прысланая маладая настаўніца са смешнаю і незразумелаю для мяне мянушкаю — крэолка. І кручаны, непаседлівы Костак Левандоўскі, мусіць жа, таксама ад невыноснага смутку, нарэшце ўспомніў, што ў яго ў кішэні муляе муштук ад трубы. Спадцішка забаўляючыся ім і падзьмухваючы ў яго, ён несумысна, але моцна свіснуў, ажно ўскрыкнула ад неспадзяванасці і выпусціла з рук указку перапуджаная геаграфічка і ад крыўды, сораму і злосці паказала паднятаю ўказкаю ўжо на дзверы. Костак, дзіка і ашалела ўсміхаючыся, выйшаў у калідор. Але прастаяў ён там не болей як хвіліны дзве ці тры, бо, трымаючы за каўнер і нават прыпадымаючы, як малое шчаня, яго ў клас увапхнуў раз'юшана-злосны, што ледзьве не ўпаў, зачапіўшыся пляскатым чаравікам за парог, дырэктар школы.

— Я пытаю, як яго прозвішча і што гэта за лайдак?! — трымаючы за каўнер, не выпускаючы Костака, што палахліва згорбіўся, злосна, праз зубы цадзіў дырэктар. — Чаму шлындае па калідоры?!

Ссутулена прыўзняўшыся над столікам, спатажаная настаўніца не магла растлумачыць, што зрэшты адбылося.

— Ён свіснуў у муштук ад трубы, — падказала ціхавата-цягучым голасам злосная худзенькая Костакава суседка з блізкае парты, якую ён без дай чаго любіў штурхануць. — Ён вучыцца ў духавым гуртку ў Юзіка Тулейкі і носіць з сабою муштук ад трубы, і б'ецца ім...

Дырэктар пераступіў з нагі на нагу ў гэтых сваіх пляскатых і сашчэпленых дротам, як свінячыя лычы, неваксованых чаравіках і сказаў зноў з прыцішанай злосцю:

— У нашай школе не было духавога гуртка, гэта была правакацыя Тулейкі!

І раптам сашчэпленыя дротам чаравікі крохка, як па намерзлым снезе, зарыпелі і наблізіліся да парты, за якою насцярожана сцішыўся я:

— І запомніце, у школе не было духавога гуртка, і мы не дазвалялі розным фашысцкім прыхвасням калечыць дзіцячыя душы!

Дырэктар яшчэ ўзняў свой жоўты ад курыва палец і тройчы патрос ім:

— Запом-ні-це!

Забыўшыся ўжо, мусіць, пра Костака Левандоўскага, дырэктар бокам, парыпваючы сваімі пляскатымі чаравікамі, вышмыгнуў за дзверы.

— Во як баіцца Сталіна, — зноў паўтарыў сваё, прысеўшы каля мяне на парту, разгневаны Костак Левандоўскі. — У школу прыйшлі энкавэдзісты. Я бачыў: двое іх. Некага заарыштуюць яшчэ...

— Няўжо Тулейку? — задыхнуўся ад здагадкі я.

— Можа, і яго, — павярнуўшы набок го-

лаў, па-петушынаму, адным вокам, зіркнуў на мяне Костак. — Чуў, як у дырэктара ад злосці рыпелі звязаныя дротам чаравікі і як ён называў дзядзьку Юзіка прыхвастам. А сам што — цэлы хвост?

— Левандовский и Борейшик, вы снова... — пачула здушаны Костакаў шэпт геаграфічка.

Мы, вядома, прыціхлі, каб пасля ўрока загаварыць зноў пра духавы аркестр і лёс Юзіка Тулейкі.

— А што, на нямецкія святы і ён граў маршы, — нібы між іншым заўважыў Костак.

Мы збегалі нават на дрывотню — дашчаны склад, дзе поруч з нарыхтаванымі паленамі ляжалі ўзваленыя пірамідамі старыя парты і дзе звычайна можна было заспець дзядзьку Юзіка, а потым абабеглі драўляны, без аднаго крыла, будынак яшчэ польскай недакончанай школы, каб падступіцца на ржавы коўш ад ваганеткі, што стаяў пад акном канцылярыі, поўны закісненай вады, і зазірнуць сцішком у ніжнюю шыбу, — але Іосіфа Казіміравіча папраўдзе нідзе не было.

Нарэшце, перастрэўшы на калідоры, адважыліся спытаць у настаўніка малявання — тоўстага, з адвіслым падбароддзем былога дзяка з нашае мястэчковае цэрквы, што рабіў цяпер у школе і, апярэджваючы званок, з вялікім драўляным цыркулем ішоў у клас.

— Не, не ведаю, не бачыў, — ён уважна і з падазроным дзівам азірнуўся на нас.

— Ого, тут нешта не тое, — нарэшце па-сапраўднаму захваляваўся Костак Леван-

доўскі. — Можа, сходзім і зірнём да дзядзькі Юзіка ў хату?

Нервова-ўзбуджаныя і па-сталаму ўжо занепакоеныя, мы бегма праз чужыя двары пусціліся да недалёкай ад школы Тулейкавай хаты і выскачылі на скрыжаванне вуліц, блізка ад чыгуначнага пераезда, дзе іншы раз спыняліся выпадковыя грузавікі ці паштовая крытая машына, каб за пакамечаную пяцірублёўку ўзяць спадарожнага пасажыра. Каля варухлівых, запаленых агнём восені, светла-залацістых ясеняў у апалым, чуйна-шапаткім лісці стаяў баец у шарым даўгаватым шынялі, абняўшы скачанелымі рукамі вінтоўку, і поруч з ім зябка сутуліўся, усунуўшы рукі ў кішэні чорнага польскага фрэнча, і палахліва зіркаў наўкруга сябе знябожаны дзядзька Юзік.

З-пад пляскатай кепачкі растапыранай стрэшкай на каўнер лезлі яго сівавата-чорныя, даўно не стрыжаныя валасы.

У мяне ў грудзях нешта балюча турзанулася і пахаладзела. Ад нечаканасці спатыкнуўся і Костак Левандоўскі.

Змеціўшы нас, дзядзька Юзік нібы трохі выпрастаўся і падняў галаву, уважна і з нейкім маўклівым запытаннем з-пад свае кепачкі глянуўшы на нас.

— У мяне ёсць пяць рублёў. Можа, аддаць яму? Падыдзем бліжай, — і, падштурхнуўшы мяне, Костак наблізіўся пад разрослы ясень, што ажно свяціўся мярцвяна-жоўтым, смутным святлом.

Убачыўшы нас, баец, агніста-рыжаваты, з рабацінністым тварам, насцярожана павярнуўся

і разняў над вінтоўкаю схаладзелыя бурачковыя рукі, але прамаўчаў ці не паспеў штосьць сказаць, калі да Тулейкі ўміг падбег і, ткнуўшы яму ў руку разгорнутую паперку, уміг адскочыў увішны Костак.

Тулейка, палахліва і з запытаннем азіраючыся на вартавога, скоранька скамячыў яе і запхнуў у кішэню. Задзіраючы пляскатую кепку, панура паглядзеў на нас, нарэшце, уздыхнуўшы, папрасіў:

— Накажэця, хлопчыкі, маёй Анці, каб перадала мне што-небудзь з цяплейшага.

— А з трубамі, з гуртком што? — выцягнуў сваю худую сіняватую шыю Костак.

— Трубы няхай будуць у вас. Я вярнуся, і будзе зноў духавы гурток. Хіба ж я вінаваты ў чым? — і дзядзька Юзік зноў з палахлівай таямнічасцю скасіў рудаватыя вочы на агністарыжага рослага салдата. — Я ж неўзабаве вярнуся...

Невядома аднак было, каго ён суцяшаў — сябе ці нас? Бо вярнуўся ён не скора. Ці не праз дзесяць гадоў, пасля ўжо вядомых хрушчоўскіх указаў аб амністыі. Помніцца, у нашым новым прамтаварным мястэчковым магазіне неяк на згоне зімы я ўбачыў прыгорбленага хударлявага дзядка ў зашмальцаванай, як у рамонтніка з чыгуначнай станцыі, даўгаватай ватовай куртцы, ватовых сцёганых штанах і ў вялікіх, не па назе ўжо, кірзавых ботах. Трымаючы на локці новае цёмна-сіняе, здаецца, бобрыкавае паліто, ён стаяў каля карычневага полага завешанай шырмы, чакаючы, мусіць, сваёй чаргі, — саромеўся ці што зняць перад усімі зліняўлую, зашмальцава-

ную куртку. Каб не даўгатварая, сутулая Анця, што, прыгнуўшыся нешта казала яму на вуха, я і не здагадаўся б, вядома, што перада мною быў Юзік Тулейка — так змяніла і заўчасна састарыла яго жорсткая і нялітасцівая савецкая турма.

Я падышоў да яго і павітаўся, падаўшы руку, але ён мяне, мусіць, не пазнаў і не ўспомніў, хаця згодліва ківаў галавою, учуўшы маё прозвішча. Карычневы полаг за яго спіною нечакана адшморгнуўся, і пагаварыць мы не паспелі — ён, бяззубы, па-дзіцячы ўсміхаючыся, схаваўся ў прымерачную. Ды наўрад ці варта было расказваць яму, хоць мне і карцела, як праз дзён колькі пасля яго арышту нам загадалі вярнуць прыгожыя залацістыя трубы і мы, ураганыя і здзіўленыя, кінулі іх у той самы дрывяны склад ці дрывотню, дзе ўжо ляжалі знятыя з нашага касцельнага аргана медныя доўгія трубкі, нечым падобныя да мінных снарадаў, толькі без апярэння, і дзе валяліся чорныя касцельныя лаўкі, пазакіданыя абы як адна на адну. Масіўныя дубовыя ці ясеневыя лаўкі, трохі перабіўшы і адрамантаваўшы, паставілі потым у вакзальнай пачакальні. Дзе падзеліся арганныя трубкі і трубы з даўнейшай польскай аркестры, я не ведаю. Таемна перашэптваліся, што іх здалі на металалом, але мне сапраўды не верыцца.

Як не верыцца, што дадому не вярнуўся выкладчык беларускай мовы, былы дырэктар сямігадовае школкі ў часе вайны Ігнат Данілавіч Скрыбец. Ішла пагаласка, што ён памёр дзесьці ў Казахстане.

Праз месяц ці два ўслед за ім арыштавалі

танюткую, як сарна, інтэлігентна-прыгожую, у клятчастым паўпаліто і чорным, ганарыста пасаджаным набакір капялюшыку і з муфтаю на залацістым замочку, яго дачку, — аказалася, што ў часе вайны яна працавала ў павятовым гэбітскамісарыяце машыністкай. Дзе падзелася хворая, з апухлымі нагамі Скрыбцова жонка, мне невядома. Зрэшты, можа, і чуў і ведаў у тыя далёкія пасляваенныя гады, але з цягам часу многае сплывае з памяці.

Але калі іграе духавы аркестр ці, як мы даўней казалі, — аркестра, калі я чую суладнамагутнае і ўзнёслае гучанне медных трубаў, а разам з імі — змрочны і грозны грым барабанаў, калі бачу іскрыста-святочнае ззянне сярэбраных ці залачоных інструментаў, тады з далечыні гадоў выплывае драўляная, без аднаго крыла, недабудаваная, яшчэ польская школа, а разам з ёю — чорная яўрэйская хата, што пахла алеем, цесная кватэра і ў ёй на сценах — залаціста-жоўтыя аркестравыя трубы. Ад іх ішла ўрачыстая святнасць, як ад разных і размалёваных фігурак у залацістым касцёле, напоўненым арганнай музыкай.

І мая памяць маланкай выкрасае яшчэ хударлявага з уважнымі карымі ці нават зеленаватымі вачмі і чорна-пасярэбранымі валасамі, заўсёды ў прыталеным, з накладнымі кішэнямі, фрэнчыку яшчэ польскага чыгуначніка ціха-прыветнага дзядзьку Юзіка, дырыжора даваеннай пажарнай аркестры і зберажоны ім праз усю вайну стары, памутнелы альт.

*1994*

# *СОН У КАЛЯДНУЮ НОЧ*

Адзінокая, аўдавелая дваццаць гадоў назад, Стэфаніда — па-вясковаму Стэпка ці Сцяпаня — у зорную калядную ноч прысніла дзіўны, поўны нябеснага святла і прамяністай яснасці прарочы сон: нібы сядзела яна пры акне, але не дома, а ў далёкай бацькавай хаце, адкуль прыйшла сюды замуж, і ёй на калені, узмахнуўшы шархотка-тугімі крыламі і абвеяўшы твар чуйным скразняком, сеў снежна-белы галубок. І да Стэфаніды, як да дзевы Марыі на касцельным абразе, дацягнуўся косы слупок тугіх і звінючых, як струны, зіхатлівых промняў.

Голуб рахмана, нібы прыручаны і свойскі, забуркаваў і, надзімаючыся, закружыўся на Стэфанідзіным прыполе. І на ружовай ножцы яго замільгаў кончык чорнай блішчастай вяровачкі, якраз такой, якою ўвязвалі ячную салому, калі яе цюкаваў на полі калёсны трактар з капніцелем.

«Хто ж яму лапкі перавязаў?» — здзівілася Стэфаніда і схапіла за слізкі кончык, каб расшмаргануць вяровачку.

Але голуб баязліва страпянуўся і, мякка б'ючы шархоткімі крыламі Стэфанідзе па руках, паляцеў за акно, асвечаны снапком залацістых промняў.

Стэфаніда толькі правяла рукою па шарай полцы старога хвартуха, што ляжаў на прыполе, змахнуўшы з яго тыя дзве сіва-белыя пухкія пярынкі, згубленыя снежна-белым галубком.

«Што ж напрарочыў гэты сон?» — прачнуўшыся, Стэфаніда доўга сядзела на ложку, перажываючы тыя прыгожыя малюнкі, поўныя нябескай яснасці і хараства, покуль не схаладзела ад здагадкі: «Гэта ж Коля, мой Коля прылятаў. Але хто ж яму ногі перавязаў? Хто?»

Высокая белаватая поўня праз замерзлыя шыбы акна цадзіла ў хату мройнае сіняватае святло. Яго косы чатырохкутнік даставаў да шарай старой полкі, якую Стэфаніда падсцілала нанач пры сваім высакаватым і не модным цяпер металічным ложку. Пры ложку стаялі і яе вялікія белаватыя валёнкі з чорнымі памутнелымі галёшамі.

Стэфаніда намацала на халодным нікеляваным біле сваю чырвоную вельветавую кофту і суконную камізэльку з падшытаю спадыспаду зайцаваю шкуркаю, каб было цяплей спіне, і апранула іх. Уступіўшыся босымі нагамі ў слізкія і казытлівыя шарсцяныя валёнкі, падышла да акна, адшморгнула фіранку і праз зубчатую шчылінку, выдзьмутую скразняком у таўставатай наледзі з боку рамы, зірнула на двор. У зеленаватых ад мярцвянага месячнага святла глыбокіх снежных курганах тануў штыкетавы плот. За карункамі чорнага пераплеценага галля бэзу, на які панадзіліся прылятаць чырвоныя, нібы аблітыя на воллі кроўю, і поўныя, як бурбалкі, снегіры, а ўчора села чародка ружова-дымных, чубатых, яшчэ прыгажэйшых, але невядомых ёй амялушак, Стэфаніда ўбачыла яшчэ цёмнае, з патайною глыбінёю суседава акно.

Значыць, да дня яшчэ было няблізка. Там, у Чабароў, уставалі раненька, прыспешваючы на паўстанак да першага прыгоднага цягніка — двое суседавых хлопцаў, што як і Стэфанідзін Коля, рабілі ў горадзе.

Яшчэ не злякнуў, не перапалохаў яе нечаканым, моцным лопатам крылаў з-пад печы хрыпаты, безгалосы певень, якога разам з курамі перад калядным марозам Стэфаніда пераганала з халоднага хлеўчыка ў цёплую хату. «І трэба ж было вырасці яму ледзьве не з бусла», — кожны раз адыходзячы ад перапалоху, дзівілася Стэфаніда.

Яна ўміг зашмаргнула фіранку і ўключыла, зажмурыўшыся ад зыркага, калючага святла, тую адную ў хаце лямпачку з чорным патронам, што вісела на белым шнуры пад бэлькаю.

Зялёны будзільнік з сіне-белымі кружкамі на цыферблаце і няроўна нагерзанымі, нібы па-яўрэйску, лічбамі, да якіх яна доўга не магла прызвычаіцца, паказваў усяго толькі трэцюю гадзіну.

«Што ж там з Колем прылучылася, калі ў галубка лапкі перавязаныя? — зноў вострым болем адазвалася Стэфанідзіна сэрца. — Каб дзе часам не правінаваціўся ды ў турму не сеў... Каторая пара не дае знаць пра сябе».

Стэфанідзін адзіны сын рабіў з суседавымі хлопцамі ў чыгуначным дэпо, у сталярні. Але ўлетку, як пачалі скарачаць на чыгунцы рамонтнікаў і стрэлачнікаў, чамусьці скарацілі і яго, столяра, ціхаманага, што і заступіцца за сябе не можа, негаваркога, сарамлівага Колю. Удаўся ён нейкі неразбітны. Суседавыя, ня-

бось, бойкія і хітрушчыя. Ім каб яшчэ рогі, то чорта ў пекла загналі б. Ты ім слова, яны табе два — не пераспрэчыш...

Неяк улетку, калі яна, перастрэўшы іх, спытала, дзе ж Коля, бо ён быў не прыехаў у светлую нядзельку дадому, яны зарагаталі.

— А вы што, не ведаеце? Коля ж прыжаніўся.

— Як? — абамлела яна.

Толькі меншы, ужо бачачы, што змянілася з твару і зараз упадзе Стэфаніда, бо ногі папраўдзе падкасіліся, паспачуваў:

— Наконт жаніцьбы не ведаю, але жыве ў інтэрнаце для маласямейных і робіць у нейкай канторы, што дзверы ставяць багатым. Так што баксы мае.

— Што за яны, гэтыя баксы? — спытала Стэфаніда.

— Так цяперака даляры называюць.

— Выдумалі ж — даляры... Багатыра знайшлі. Смеху варта ваша гутарка.

Але калі дадому прыехаў Коля, яна, частуючы яго, здарожанага і нейкага зблажэлага, — адныя вялікія вочы на твары свецяцца, — спытала:

— Схуднеў ты, і што ж цябе ўзяло так?

— Ой, мама, ты кожны раз адно і тое — схуднеў.

А потым ужо асцярожна, каб не ўнаравіць, ціха перапытала:

— Людзі ж кажуць, што тамака ў горадзе ты прыжаніўся?

— Хто гэта кажа? Ці не Чабарэ часам? — дагадаўся ён.

— Ага, янэ.

— А хіба я табе не казаў, што жыву ў абшчазе?

— Як ты кажаш? Абшчага?

— Ну, абшчажыце, інтэрнат... Далі, калі пайшоў на новую работу.

— Як заработкі там? — Стэфаніда ўспомніла пра тыя баксы, але не сказала гэтага.

— Лімон маю, — ён схапіўся з-за стала да свае зеленаватае сумкі з рознымі пацеркамі, бляшкамі, нашыўкамі і шмаргануў з вострым свіргатаннем машынкай, дастаў адтуль яснамалінавы з пухкай ангорскай воўны світэр і чорную шарсцяную хустку з чырвонымі ружамі. — Во, табе прывёз.

— Вой, ці мне старой насіць гэты маліновы свэтар. — Яна адхіліла яго руку. — Да смерці гатуюся. А калі ёсць у цябе якая дзяўчына, то падары ёй.

А потым перапытала пра гэты самы лімон.

— А пра які гэта лімон ты кажаш?

Ён засмяяўся:

— Ну, маці, ты даеш, ад жызні адстала.

— Дзіва што, седзячы адна ў запечку.

— Лімонам цяпер называюць мільён грошай. Абясцэніліся яны саўсім.

— Ну, ці я не ведаю. Хадзіла вунь па хлеб надоечы. Цэны растуць як на дражджах. Толькі пенсія мая не прыбаўляецца. Не ўдзельніца я вайны. Вёску, хату спалілі, людзей пабілі, тату ўкінулі ў агонь. Яны, няхай іх ліха пабярэ, — рускія казакі, што памагалі немцам. І я ўжо не ўдзельніца. Хто ж тады бачыў і перажыў вайну? Хто там дзельнічаў, як яны кажуць.

— А той, хто пенсію большую мае, — усміхнуўся ён і нібы пахваліўся: — Маці, трэба ўмець жыць...

Колева гутарка са смяшком ды папрокам вельмі ж устрывожыла і да адчаю ўсхвалявала Стэфаніду, але яму насуперак яна ні словам не абмовілася, толькі пра Бога напомніла:

— Бога не абманеш, сынок.

У той астатні прыезд ён, яе зблажэлы і нейкі адрошаны (адчужаны), чуйна задуманы Коля, толькі пераначаваў і раненька, якраз у шэсць паехаў, пакінуўшы нямытую бялізну і гэты малінавы, вязаны з ангорскай воўны світэр, які яна акуратненька згарнула і паклала ў шафу: няхай ляжыць — нявестцы будзе.

І во ад яго ні слыху, ні дыху.

Ужо з месяц будзе, якраз на ўсе Святыя, калі маладзенькі ксёндз высвенчваў тутэйшыя могілкі, і яна была там — стаяла каля паіржавелай агароджы і зарослага капца, пад якім ляжыць яе Ігнась, у вёску прыехаў вусаты рослы мужчына, што, не застаўшы яе дома, пачаў хадзіць па суседзях і распытваць пра Колю.

Мужчына нават не назваўся, хто ён, але ўсе прызналі, што гэта следчы і што на Колю ўжо, напэўна, дадзены розыск.

«І во звязаны, як той галубок, што прысніўся ў сне. Мусіць, знайшлі і звязалі і, можа, у турму пасадзілі. Няхай бароніць і асцерагае Бог. — Стэфаніда ўчула, як у яе балюча закалола і абліло мляваю гарачынёю сэрца. — Трэба ехаць, трэба шукаць, дзе ён», — ужо цвёрда рашыла Стэфаніда і пачала перабіраць у шафе, што, займаючы паўхаты, стаяла ў

прасценку між вокнаў, каб знайсці святочную адзежу — тую чорную хустку ў вялікія ружы, куртку і шарсцяны світэр, што звязала яшчэ тры гады назад. На ногі, акрамя гэтых старых валёнкаў, нічога лепшага і цяплейшага не было.

«Пайду ў іх», — Стэфаніда паўзіралася на свае ногі, абцяжараныя зморшчанымі і аселымі, як старыя грыбы, сівымі валёнкамі, і падышла да пабеленае печы — трэба было распаліць яе і зварыць есці. І не столькі сабе, як свінцы, што парохквала ў хлеўчыку, парсючка, які заважыў на пудкоў тры, яна закалола якраз перад калядамі, каб мець на свята скварку і пачаставаць Колю свежыною. Але ж ён не прыехаў. Прыйдзецца везці з сабою на падаянку.

У хляве яшчэ адзін хвост — кароўка, але яна ўжо на цяленні, запушчаная, не доіцца, а сена ёй, што накасіў, дзякуй яму, яшчэ ўвосень Коля, падкіне старая Чабарыха... А куры пад печчу не задыхнуцца, заўтра выпушчу на хату і падмяту там, а што дух цяжкі, то тут жа нікога не будзе... Так што няма каму прынюхвацца і задыхацца...

Прасохлыя занач алехавыя, даўка пахучыя дровы разгарэліся ўміг, і на сцяне напроці печы і ў сівавата-белым і шорсткім ад марозу акне замільгаў, закалыхаўся залацісты водсвет агню.

А яна тым часам, зняўшы са столі лямпу, што вісела на ўсякі выпадак, калі пагасне электрыка, і ўзяўшы нож, схадзіла ў варыўню да кубельца, адрэзала пахучага ад кмену сала, а потым з шастка над печчу, дзе віселі перавя-

заныя ніткамі скруткі падсохлых ужо, што ажно заблішчалі ад тлушчу, спакусліва-смачных кілбас, падступілася на нізкі табурэцік, адрэзала адно колца... Загарнула іх разам з салам у рыжаватую торбу, якую знайшла ў шафе на паліцы і поруч з акрайцам хлеба ўпакавала ў сваю аблушчаную цыратовую сумку, у якой насіла, пераклаўшы анучкамі, жоўценькія курыныя яйцы — прадавала іх на паўстанку, калі тут спыняўся на колькі хвілін львоўскі цягнік.

Для Колі яец не было — куры яшчэ не несліся.

Яна ўспомніла пра грушы, насушаныя з восені і прыпратаныя ў торбачцы на печы, і знайшла іх.

«Хоць які будзе ласунак», — усцешана падумала Стэфаніда і зноў, скасіўшы вока, зірнула ў шыбу, у тую шчылінку, што прадзьмуў у намаразі вецер, — на той бок вуліцы за чорным, пераплеценым, як карункі, галлём дрэў залацістажоўтай яснасцю ўжо свяцілася акно.

«Вой, ці не спазнілася я, — ускрыкнула нават уголас — балазе ніхто не чуе — перапалоханая Стэфаніда. — Трэба ж бегчы і папрасіць старую Чабарыху, каб напаіла і накарміла карову, бо яна, Стэфаніда, вернецца дадому нанач гледзячы, як прыходзіць прыгарадны, каля адзінаццаці.»

У печы ўжо добра расшугаўся агонь, і закураны алюмініевы чыгунок пырскаў лупатымі бурбалкамі — кіпеў.

«Ай, не ўцячэ, астанецца і мне», — махнула рукой Стэфаніда і пачала акрывацца.

Марозік пад поўню быў дужы, яна ажно задыхнулася ад яго, выйшаўшы ў сені і доўга адсоўваючы настылую занач засаўку. Косы сіняваты цень ад хаты перагароджваў заснежаную вуліцу. Чуйны Чабароў сабака гаўкнуў, высоўваючыся з будкі і забарабаніўшы аб дошкі ланцугом, але тут жа ж вінавата завішчаў, прызнаючы яе.

Нават не спытаўшы, хто за імі, дзверы адамкнуў старэйшы Чабароў сын, трохі, праўда, здзівіўся, пазнаўшы яе:

— Гэта вы, цётка Сцяпаня?

— Я, Міша. Хачу папрасіць тваю мацяру, каб укінула сена карове і накарміла парася. А я сабралася ў горад.

— Ты ж там толькі не забаўся, а то буду мець клопат, — строга папярэдзіла яе трохі незадаволеная, надзьмутая і ззелянелая, як квахтуха, дзюбаносая Чабарыха, што таксама стаяла пры распаленай печы.

— Во скажаш, — махнула рукою Стэфаніда, — чаго я маю расседжвацца. Туд-сюд і назад. Вечарам вярнуся.

— Гэдак і я, — нарэшце падабрэла і ўважна падняла свой дзюбаты нос Чабарыха. — Абы з дому, так мне здоўжыцца, і ўжо леціма лячу назад.

— То прыглядзь ужо за ўсім, Аленачка. Хлеў я не замыкаю, а хату прымкну, каб цыганка не ўлезла, як летась было — столькі хат абакралі.

— Але ж, нябось, злавілі, недзе ажно ў Вільні, — засмяялася Чабарыха, раскрываючы свой шыракаваты рот і паказваючы чорныя прастрэлы ў паджоўклых зубах.

— Вой, — узмахнула рукамі Стэфаніда, успомніўшы пра алюмініевы чыгунок, што перад яе адыходам з печы пачаў закіпаць, і, памагаючы каленам, пачала адчыняць цяжкія намерзлыя дзверы. — Пабягу — чыгун выкіпеў. А ключ, Аленачка, на вугле павешу, ты ж ведаеш...

— Так што, цётка Сцяпаня, паклічам, як будзем ісці на паўстанак? — ужо ўпоган ёй, у сені, з якіх каціўся ліловы, падсвечаны электрычным святлом, густы сівер, гукнуў старэйшы Чабароў сын.

— Столькі таго ўжо клопату, дайду і сама...

Яна паснедала тою дробнаю картопляю, што варыла сабе і свінцы, колькі раздушаных у руцэ картоплін укінула ў курачае карыта пад драбінамі, падліла ў бляшаную баначку вады, на мурку печы знайшла паперку з адрасам, якую пакінуў Коля, і яшчэ пастаяла сярод хаты, трымаючы ў руцэ сваю старую аблушчаную сумку і ўспамінаючы, што яшчэ мелася зрабіць.

Паслухала, як спяшаўся на стале блакітны гадзіннік, адмерваючы і скарачаючы яе жыццё, убачыла, што большая мінутная стрэлка па шнурку круглых пацерак перахілілася за крывую, як п'яную, лічбу дванаццаць. Шостая гадзіна — пара нарэшце ісці. Сенечныя дзверы праз дзірку ў вушаку прымкнула на засаўку даўгім ключом з язычком і павесіла яго пад анучку, на цвік у вугле.

Але ж цыганы, ліха на іх, навучыліся адсоўваць і гэтыя цяжкія жалезныя засаўкі з рубчыкамі — кажуць, магнэзам. Як адсунулі

хату сярод ночы ў суседнім Заполлі і абцугамі замучылі багатую даярку разам са старой мацераю, дамагаючыся, каб аддалі грошы, а грошай у хаце не было — ляжалі на ашчаднай кніжцы на пошце.

«Во, які свет стаў», — уздыхнула Стэфаніда, чуючы ў душы пякучы боль ад гаркаты і крыўды.

Замурзаны лёгкаю хмаркаю і акружаны ліловай каронай плямісты месяц ужо хіліўся на захад. У яго мройным, рэдкім святле серабрыста-сінімі блёсткамі ўспыхваў снег. Абвешаныя мігатлівымі зорамі, чуйна драмалі заінелыя бярэзіны. Крохкім вугалем парыпвала намерзлая глыбокая сцежка — яна абвіла цёплыя, прапахлыя гноем хлявы і выбегла пад узнёслы крыж, пастаўлены цэлаю вёскаю летась і абгароджаны выштукаваным плоцікам.

Стары дубовы крыж, ужо замшэлы і трохі пахілены, ламаў і выварочваў, калі быў у раёне за нейкага сабачку, яе сусед Іван Чабар. Адно ж крыж стаіць, — во новы, — а Чабара скруціла ліхата: спярша рукі і ногі адняліся, а потым — мова, і ляжаў ён, як палена, два гады ў ложку, пад сябе ходзячы...

Стэфаніда нават прыпынілася перад узнёслым крыжам, уявіўшы, як будзе стаяць тут на двух ці трох услончыках яе труна. З незапомнага часу ў іхняй вёсцы кожнага нябожчыка ў адкрытай труне нясуць ажно пад крыж і тут ужо зачыняюць вечка, каб на возе ці, як цяпер, на грузавой машыне везці яе на магілкі.

У спякотнае грымотнае лета тут, пад кры-

жам стаяла труна з яе Ігнасем, якога яна прывезла з горада ўжо нежывым. Ён рабіў у сталярні пры дэпо — рамантаваў, правіў грузавыя вагоны. Яму тады моцна забалела галава, і ён, не стрываўшы, пайшоў у амбулаторыю, дзе і памёр, седзячы на крэсле ў чарзе да доктара. Потым ужо выяснілася, што ў яго ў галаве, над вухам нарваў і лопнуў нарыў. Сорак тры Ігнасю было, ёй — Стэфанідзе, — трыццаць дзевяць, а Колю — тры гадкі. Божа літасцівы, як ён, маленькі, плакаў, падкурчыўшы пад сябе босыя ножкі і седзячы на табурэце перад бацькавай труною. Горка ўспамінаць, як шчымела тады, заходзілася ў яе душа, калі яна чула надрыўны плач трохгадовага сіраціны.

З пяцярых дзяцей, якіх Стэфаніда нарадзіла, выгадаваўся толькі ён, меншанькі Коля: астатнія радзіліся то нежывымі, то хворымі, каб памерці праз месяц ці два, як памерлі праз год блізняты — хлапец і дзяўчынка. Можа, таму, што яны з Ігнасем стрыечныя — брат і сястра. Але так ужо Бог прызначыў — Стэфанідзе палюбіўся Ігнась, ніхто іншы, а ён... Яшчэ з-замаладу, калі ёй шаснаццаты гадок ішоў, ён, Ігнась, са сваім бацькам прыйшлі першы раз у іхнія Панікарты, у тую доўгую, у адзін шар хату, што стаяла блізенька ад панскага двара, якая і згарэла вайной разам з панскім дваром, калі партызаны падпалілі яго.

Тады яны, убачыўшыся першы раз, сядзелі, як сваякі, на беразе азярца, дзе давалі нырца чорныя качкі з белымі лысінкамі на лобе, зусім не баючыся іх...

Заклаўшы за спіну адну руку, а другую, што нясе аблушчаную сумку, цяжка звесіўшы, сагнутая і прыгорбленая Стэфаніда ідзе рыпучаю снежнаю дарогаю, рабаватаю ад пратэктараў і асвечанаю рэдзенькім сінявата-малочным месячным святлом, не чуючы, як у блізкай лагчыне аддаецца калючае рэха яе павольных крокаў.

У чорным плюшавым сачыку, у дзюбком насунутай на галаў суконнай хустцы, у няўклюдных валёнках яна збоку нагадвае куртатую птушку, нейкае бясхвостае вараня, што, звесіўшы падбітае ці зламанае крыло, сунецца цемнаватым паскам дарогі. Наўкруга ўздымаюцца белыя заснежаныя пагоркі з замглёнымі ўпадзінамі дуброў і пералескаў, з чорнымі адзінокімі дубамі, але Стэфаніда іх не заўважае. Яе галава поўная непаваротна-цяжкіх дум, а вочы бачаць даўняе і пераўжытае: яна ўспамінае пра Ігнася, якога каторая пара няма на свеце, хоць час прабег як адзін дзень. І Колю ўжо дваццаць трэці ідзе, а ён усё ніяк не дабярэ сабе работы. Паўгода пабыў электрыкам на саўгаснай ферме, дзе Стэфаніда на ўсё жыццё ўвярэдзіла рукі, завіхаючыся даяркаю, а потым заманулася яму ехаць у горад, рабіць у тым самым дэпо, дзе спрацаваўся бацька. Праўда, нялёгка яму было: устань да світання, паспей на чырвоны дызель, бо паравозы ўжо не ходзяць, стаяць у тупіку на іхнім паўстанку, ржавеюць з закладзенымі фанераю вокнамі, ажно шкода іх, а прыцемкам прыедзь дадому. Яна нават была ўзрадавалася, што Коля памяняў работу, што нарэшце яму далі пакойчык

на дваіх у «абшчазе», як ён кажа, на тое обшчае жыццё.

А ён, мусіць, скруціўся там з ліхімі людзьмі і пайшоў у іншае месца. Толькі дзе ж ён? Каб чаго благога не ўчынілася. Каб галаў куды не падсунуў. Адзінак ён у Стэфаніды з Ігнасем, на далоні, як кажуць, калыханы. Можа, і лішне распешчаны ўдаўся. Бяда.

Уледзянелая, укатаная машынамі, раз'езджаная дарога, на якой адбівалася святло акружанай ліловым кругам поўні і над якою плыло густа-сіняе ў рассыпаным прысаку зорак настылае неба, нарэшце выбегла на чорнаружаватую ленту асфальтнай шашы. Стэфаніда, чуючы, як ад спешнае хады макрэе спіна, зашоргала галёшамі гаматных і цяжкаватых валёнак па ходкім шурпатым асфальце. Наперадзе фіялетавымі агеньчыкамі свяціліся светафоры блізкай станцыі і ўздымаўся шэры прысадзісты будынак вакзала. Непрыгожы, нібы з адсечаным дахам, што збудавалі гады тры назад на месцы невялікага драўлянага, накрытага не моднаю ўжо, мусіць, чарапіцаю.

За ім, за вакзалам, двума радамі сіратліва чарнелі, ажно страх браў, старыя, ужо непатрэбныя паравозы, што некалі так працяжна гукалі перад семафорам, ахутаныя клубамі пары, паспешна чахкалі, набіраючы хуткасць. Усё старое перайначваецца і памірае, як гэтыя чорныя паравозы: «І мне вось ужо за шэсцьдзесят перакінулася, — падумала пра сябе Стэфаніда і перамяніла ў руках цяжкую сумку. — Не паспела азірнуцца, як нахапілася старасць. А жыць не жыла, толькі нагаравалася».

Каля філёнчатых дзвярэй у скупым рэдкім святле ледзь жывое лямпачкі сутаргава ўздрыгваў і трос пакалечанаю праваю нагою шары, як воўк, валачашчы сабака. Зводдаль, як зломаны зуб, старчма ўздымаўся пастамент, на якім калісьці бялеў гіпсавы бюст насатага Сталіна. Пасля яго грамафонавай трубою тырчала ваза, у якой сярод лета цвілі жоўта-фіялетавыя браткі. Аднак разбілі і яе. Нішто не вечна на свеце, нават Сталін, перад якім гнуўся і лекацеў цэлы свет.

Стэфаніда наступіла на хрумсткі лядок перад парогам і адчыніла дзверы, махнуўшы імі на ўнуранага, дрыгатлівага сабаку. «Калоціцца рыхтык стары Закрэўскі», — з даўніх, забытых часоў маладосці яна прыгадала местачковага доктара і ўвайшла ў пачакальню, дзе на шырокай лаўцы драмала маладзіца, прыхіліўшыся галавою да мужчынскага пляча. Каля другой сцяны пад суцэльнымі вокнамі на гэткай жа самай нягеглай шырокай і нізкай лаўцы сядзела, нешта перабіраючы ў плеценай з рагозу карзіне, сівавалосая, сухарлявая кабета, як Стэфанідзе здалося, старэйшая за яе.

Па чырвона-бурачковым твары і храшчаватым носе Стэфаніда прызнала Хвядосю, што абняславілася, абакраўшы з сястрою яшчэ ў перадваеннае лета тутэйшы касцёл. Сястру Бог пакараў: ці не пасля вайны вайсковы грузавік, якім кіраваў п’яны салдат, даў скрыняю ёй у плечы. І яна, кажуць, паваліўшыся, яшчэ з гарачкі ўстала і перахрысцілася. Мусіць, перад смерцю бога ўспомніла. А гэтая, нябось, жыве, — маўчучы, сама для сябе адзначыла Стэ-

фаніда і, апусціўшы цыратовую сумку, прысела тут, на блізкай лаўцы, дзе, прыхіліўшыся да пляча вусатага маладога мужчыны ў насунутай набакір шапцы, драмала маладзіца ў зялёным паліто з белым нутрыевым каўняром. Драмаў, пэўна, і мужчына. Але на грукат і рып дзвярэй з-пад чорных броваў бліснула вока, скоса зіркнуўшы на Стэфаніду.

«І што ж гэта за ён? — Стэфаніда таксама паўзіралася на маладога вусатага мужчыну, але не ўгадала. — Дзе ж цяперака каго пазнаеш. Пазарасталі вусамі ды бародамі, хоць заміж пудзілаў у каноплі стаўляй. Балазе мой Коля не зарос, не ходзіць з доўгімі апушчанымі валасамі». Думкі яе зноў набеглі на сына.

Яна абмацала кішэню ў шорсткай старой кофце, што была апранута пад чорным плюшавым каптаном, — ці ж не забылася Колеў адрас — і, учуўшы, як суха шапаціць пад рукою паперка, на міг супакоілася. Тым часам малочным святлом успыхнула ў касе аконца — там, мусіць, прыдрамаўшы, прачнулася касірка. І цэлаю грумадкаю са смехам і галосным гуканнем у пачакальню зайшлі хлопцы з высокімі танканогімі дзяўчаткамі ў вязаных белых і сівых калготках, смешнымі, без спаднічак.

«Во мода пайшла, — трохі здзекліва пеpакрывілася Стэфаніда, — дзяўчаты пачалі апранацца, як хлопцы — у штаны, у курткі. І шапкі мужчынскія носяць». Няма ўжо ні ўстыда, ні сумлення. Дзе ж будзе дабро і праведнасць? Нядзіва, што ў суседняй вёсцы дачка, нацягнуўшы анучу ці панчоху на твар, ішла забіваць маці, каб забраць грошы. Балазе

надышоў нехта з суседзяў... Во як пачало рабіцца».

Стэфанідзе раптам прымроілася, што і яе Коля, спакушаны далярамі і падмоўлены якою-небудзь бандыцкаю зграяю, надзеўшы на голаў чорную маску ці панчоху, ідзе рабаваць ці забіваць людзей.

Гарачы пот заказытаўся і пабег пацеркамі між лапатак.

«Грэх і думаць пра такое», — яна страханулася, са злосцю плюнула і азірнула пачакальную залу, што гула ўжо злосным, устрывожаным вуллем. У пачакальні было ўжо людна. Каля касы ў калейцы стаялі рослыя Чабаровыя хлопцы. «Мне можна, пэўна, і без білета», — махнула рукою Стэфаніда.

У вагоне на залатаным і зацыраваным сядзенні яна прысуседзілася да немаладых жанчын, што, нібы не ўбачыўшы яе, вязалі, чапляючы слова за слова, пачатую гутарку. Чабаровыя хлопцы, сеўшы праз два сядзенні, гулялі ў карты. Стэфаніда агледзела не вельмі поўны, пуставаты вагон — ехалі найболей маладыя хлопцы і дзяўчаты, усе тыя, хто працаваў ці вучыўся ў горадзе — і міжволі прыслухалася да несціханай гутаркі.

— Мая ты даражэнькая, — расказвала шыракатварая курносая маладзіца з карычневаю ядзеркаю бародаўкі на верхняй губе. — Некалі нашай Сарапіне трынаццаць пучкоў крапівы-жыгучкі ссеклі на спіне. Ажно цела пузырамі пайшло. Але раматус вылечылі.

— Магла і зайсціся ад болю, — чарнявая, даўганосая кабета ў чорнай хустцы з маліна-

вымі, падобнымі да півоняў кветкамі худою рукою змахвала з вострых каленяў нешта нябачнае.

— Дзіва што, — пагадзілася і кіўнула галавою шыракатварая і курносая.

Стэфаніда прыгадала нясцерпны боль, што кожнае ночы мучыць і яе, ломячы ногі і рукі, асабліва на змену пагоды, ужо наважылася расказваць спадарожным жанчынам, як ратуецца яна — намазваючы калені настойкаю, якую робіць, замачыўшы ў гарэлцы смярдзючы слізкі грыб, што расце ў самым гушчары лесу, але тыя нечакана загаварылі пра іншае:

— Ці чула? — падняўшы свой доўгі наздраваты нос, раптам спытала чарнявая. — Гэта ж Лёніка пасадзілі — машыны краў. Цэлую шайку, кажуць, разварушылі.

Гэты напамінак пра турму, пра крадзеныя машыны, пра зладзейскую зграю нечаканым шчымлівым болем працяў Стэфанідзіна сэрца, што яна не ўтрывала і, падняўшы сваю сумку, перасела на другую лаўку, на вольнае месца, да маладых рагатлівых дзяўчатак, каб не чуць болей гутаркі пра турму, зладзеяў, бо ўсё, што ні казалі пра гэта, Стэфанідзе здавалася, казалі пра Колю...

Поезд спыніўся на прыгарадным паўстанку, падсвечаным высокімі чырванаватымі і зыркалючымі ліхтарамі. Праз замурзанае акно, прыткнуўшыся лобам да настылае шыбы, Стэфаніда бачыла шары асфальтны перон з бельмамі замерзлых лужынаў, ашаляваную будку з навесам, шырокія дахі ружовых цагляных складаў, пры якіх шчыльным радком ціснуліся, на-

гадваючы нейкую смешную вёсачку, металічныя гаражы, пафарбаваныя ў зялёны, салатавы і ржавакарычневы колер.

Перад імі на брудным снезе серабрыліся белымі камлямі зрэзаныя і ўпокат зваленыя бярэзіны. Зводдаль ад іх двума горбамі ўздымалася паабсяканае чорнае вецце. Дрэвы ляжалі, нібы зваленыя ўпокат мёртвыя людзі. Раптоўна гарачыня апякла Стэфанідзіна сэрца і ў грудзях усё дробна задрыжала — так зрабілася шкада гэтых зрэзаных дрэў: нехта ж садзіў, радаваўся, што растуць і красуюць, і на табе — у адну хвіліну спляжылі, злажылі, як людзей з кулямёта. Няхай бароніць бог! Стэфаніда бачыла ў вайну, як стралялі немцы жанчын жыдовак, раздзеўшы іх і паставіўшы над ровам... Ажно страх успамінаць. Бо калі застракатаў кулямёт, яны падалі, лёгшы покатам, не раўнуючы як гэтыя белыя бярэзіны.

Поезд паволі, ледзь чутна скрануўся з месца, і за акном вагона пачаў адплываць шары асфальтны перон, ашаляваная будка з навесам, шчыльны рад металічных гаражоў і гэтыя складзеныя ўпокат каля шурпатых чорных пнёў з паружавелымі ўжо зрэзамі, белыя, асвечаныя ліхтарамі бярэзіны.

Стэфаніда адхілілася ад акна — з суседняй лаўкі ўжо зніклі тыя дзве жанчыны, што расказвалі пра нейкага Лёніка, які краў машыны, — яны выйшлі, пэўна, на гэтым прыпынку. Людзі няспешна, трохі марудна рыхталіся да выхаду, здымаючы з верхніх паліцаў сумкі і зашпільваючы на ўсе гузікі паліто і курткі.

— Што, ужо прыехалі? — Стэфаніда спалохана зірнула на дзяўчат, што, прычасаўшыся, прытоптвалі на галовах пуховыя вязаныя берэты.

— Ага, канечная, — сказала чарнавокая, як мышка, закручваючы вакол шыі доўгі шалік.

Стэфаніда таксама паправіла на галаве раз'ехаsucc хустку і ўзялася за ручкі свае вагкаватае старое сумкі.

Вагон пачало хістаць з боку на бок, і колы яго едка рыпелі на намерзлых стрэлках. За акном узнялося вялікае, на ўсё неба святло — мусіць, набліжалася станцыя. Стэфаніда прыхінулася да спацелае шыбы акна і, сцёршы рукою густую луску вільгаці, убачыла асвечаны пражэктарамі і ліхтарамі дашчаны шчыльны плот, ажуровую, прыгожа сплеценую над ім трубку калючага дроту, вышку, дзе стаяў, апусціўшы ў шапцы вушы і трымаючы нагатове вінтоўку ці аўтамат — яна не разабрала — сутулены стражнік.

— Што ж гэта? — яна, здумелая і спатажаная, азірнулася на дзяўчат. — Не вакзал жа ж, мусіць?

— Гэта яшчэ турма, — засмяялася тая самая, з чорнымі мышынымі вочкамі.

Нарэшце Стэфаніда прыгадала, што ў горадзе, як прыходзіць поезд, перад яго астатнім прыпынкам ёсць турма. Даўняя, яшчэ, напэўна, царская, дзе за палітыку сядзеў яе дзядзька Антось. Спачатку пры палякаў, а потым — пры саветах, ад якіх ужо і не вырваўся дадому...

Ужо тут, за гэтым высокім шчытным плотам, над якім прыгожымі кольцамі ўвіты калючы дрот, у гэтым цёмна-чырвоным будынку, што ажно пасівеў ад намаразі, пакутуе яе Коля? Няхай сцеражэ і бароніць Бог!

Мінуўшы доўгі мур, што цягнуўся блізка ад чыгункі, а потым мост, з-пад якога хуткаēногімі прусакамі выбягалі рознакаляровыя машыны і высунуўся доўгі жоўты аўтобус, цягнік нарэшце падышоў да сінявата-фіялетавых ліхтароў станцыі і, натужна зарыпеўшы, стомлена спыніўся між зялёных і блакітных электрычак. Усхваляваная, дрыготка нервовая Стэфаніда адхілілася ад акна.

У праходзе, навісаючы адзін аднаму на плечы, ужо стаялі нецярплівыя пасажыры. Каля светла-карычневае лаўкі, залатанай цямнейшым кавалкам дэрмаціну, Стэфаніду вызіралі і вычэквалі Чабаровыя хлопцы.

Яны, дзякуй Богу, памаглі спусціцца з высокіх сходаў вагона. Стэфаніда задыхнулася і ад густога марозу і ад таго адчування, што зараз застанецца адна, нікому непатрэбная ў амаль незнаёмым, пачужэлым горадзе.

— Мы давядзем вас толькі да аўтобуснага прыпынку, — паспачувалі і паспрыялі яны, ідучы абапал яе і нібы абараняючы ад чалавечага тлуму, што вірыў і плыў паміж цягнікамі. — Нам у іншы бок. А вам там людзі падкажуць, як знайсці інтэрнат.

— Ага, ага, — згаджалася яна, зноў абмацваючы шархоткую паперку з адрасам.

Паклаўшы на калені сумку, яны яшчэ пасадзілі Стэфаніду на выгоднае месца ў доўгім

аўтобусе з чорным, сабраным у гармонік тамбурам. І яна паехала, думаючы пра той невядомы інтэрнат, пра сустрэчу з сынам, уяўляючы яго то хворым у ложку, то п'яным пры стале з гэтакімі самымі маладымі хлопцамі.

Аўтобус турзаўся, пакалыхваў Стэфаніду, і ёй здавалася, што едзе яна на возе, які вязе старая клышаногая кабыла, што наступіла на цвік.

Аўтобус намерзла парыпваў, скрыпеў, дзверы то зачыняліся, то адчыняліся, напускаючы холаду і новых пасажыраў, што пахлі ветранінай і марозам, то крута хіліўся набок, агінаючы паварот і прыцiраючы нешта адным колам. За зашэрханымі сівой намараззю вокнамі з прахуканымі і прадрапанымі дзірачкамі золатам іскрыліся агні яшчэ не патушаных ліхтароў, вокнаў і пад'ездаў у блізкіх будынках.

«Трэба ж ужо, мусіць, спытаць», — Стэфаніда дастала з-за пазухі тую шархоткую паперку, лашчоную, як новыя папяровыя грошы, і, хапіўшы за мяккае рукаво жоўта-светлае дублёнкі высокага хлопца, падала гэтую паперку.

— Скажэцця, ці ж далёка будзе гэтая вуліца?

— А-а, Алібекава? — перапытаў высокі чарнявы хлопец у жоўтай дублёнцы і мяккім ціхаватым голасам адказаў. — Цераз адзін прыпынак вам трэба выйсці.

— А інтэрнат там ёсць? На вуліцы... — вымавіць назву Стэфаніда не магла.

— Там ажно тры...

— Які ж мне трэба? — у самое сябе ўжо спытала Стэфаніда, падымаючыся з сядзення.

Аўтобус, неяк завальваючыся набок, як хворы валачашчы сабака, пасунуўся далей, а яна стаяла пры карычневым навесіку з вузкаю лаўкаю, пазіраючы на тры высокія каробкі новых будынкаў, што на другі бок вуліцы за белым домам, прыхаваным карычневым веццем прысадаў, уздымаліся ў хмурнавата-туманнае, цяжкае, заспанае яшчэ неба.

— Ці не гэта інтэрнаты будуць? — спытала яна ў насупленай, панурай і, здаецца, бязбровай жанчыны, што, абапіраючыся на палку, падышла да прыпынку.

— Ага ж, — падмахнула цяжка ўхутанаю галавою нямоглая з палкай жанчына. — Няхай іх ліха пабярэ. Спакою тут праз іх няма. То музыка раве, хоць вушы затыкай, то сварка стаіць, то бітва... Упыну і ўправы на іх не знойдзеш. Учора ізноў парэзаліся тут...

— Вой, — уздрыгнула Стэфаніда, — што вы кажаце?

— А тое, што чуеш.

Дыхнуўшы перагарным бензінам, падышоў светлы з сінімі паскамі аўтобус, і старая пачала ўскарабквацца ў сярэднія дзверы. А Стэфаніда, устрывожаная чуткаю пра бойку з нажамі, рушыла праз асфальтную ленту з градою непрыбранага лёду і снегу. Нечакана з боку ад яе, віскнуўшы тармазамі, спыніўся шыракаплечы з дзвюма мутнавата-белымі фарамі шары самаходзік, і з яго, апусціўшы бакавое шкло, высунулася чорная лысаватая галава, і пачуўся нейкі незразумелы для Стэфаніды крык:

— Ты што, смерты захатэл?

— Ай, і праўда, пераходжу вуліцу і не зважаю на машыны, — дакараючы самую сябе, Стэфаніда нарэшце перайшла на другі бок чорнае ленты.

Чатыры жанчыны ў аранжавых камізэльках на цёплых ватовых фуфайках з дзяркатымі мётламі зварочвалі з вузкай сцежкі насустрач ёй. Астатняя з ліловым, падвяселеным кіслаю ўхмылкаю тварам нечакана падміргнула Стэфанідзе:

— Не самагонку нясеш?

— Што ты, — адмахнулася ад яе сваёй цяжкаватаю сумкаю Стэфаніда.

— А тут нічога брыдкага няма, — скрывіла кіслыя п’яныя губы маладая жанчына ў жоўтай камізэльцы і цяжкіх, падкасаных і белых ад вапны кірзавых ботах. — Тут каля нашага магазіна прадавалі. У слоіках. Такая самая баба, як і ты. У плюшавым каптане. Мне падумалася, што гэта яна. А можа, усё-такі маеш пару слоікаў?

— Вой, маладзіца, што ты кажаш, якія слоікі? — Стэфаніда адвярнулася, каб не глядзець на кісла-п’яны, хваравіты твар маладое жанчыны.

— Люда, маць тваю! Ідзі скарэй! — у адзін голас раптам загукалі тры прыбіральшчыцы з шырокімі, нейкімі нібы самаробнымі лапатамі.

— Так яны, мусіць, усе п’янаватыя, — жахнулася Стэфаніда, зварочваючы на брудную заледзянелую сцежку, што між белых і прадаўгаватых, як каробкі з-пад абутку, блочных дамоў наўпрасты тачылася да высокіх

жоўтых інтэрнатаў. Яны, нібы вялічныя тупыя калоны, падпіралі сівую з белаватай прошваю хмару. За ёю ўжо дрыжаў ружаваты ўсход.

Стаўшы на падаконнік, з другога паверха жаўтлява-белага дома, з-за намерзлай шыбы на Стэфаніду ўзіралася вірлавокая лысагаловая дзяўчынка ў салатавай сукенцы. Рыхтык гэтакі і яе Коля быў.

У высотных інтэрнатах, абліцаваных, як лускою, жоўтаю пліткаю, спадаючы каленчатымі сходцамі, яшчэ залаціліся квадраты вокнаў. З-пад невысокага пад'езднага брылька ў вочы калола зыркая, абвітая, як натапыранымі апілкамі на магніце, калючымі промнямі, ацалелая лямпачка.

Стэфаніда прымарудзіла, саступіла са сцяжынкі, прапускаючы жанчыну ў зялёным кажушку з белым башлыком, якая вяла на повадзе чорнага з вялікай галавою і хвішчаватым, як у пацука, хвастом, няўклюднага сабаку.

— Божа, які страшны звер, — яшчэ глыбей і далей Стэфаніда адступілася сваімі сівымі валёнкамі ў шорсткі і шапаткі снег.

— Не бойцеся, ён не кусаецца, — заўсміхалася танкатварая жанчына, але повадам турзанула бліжэй да сябе чорнага цыбатага дога.

— Такі ж вялікі... — сарамяжа сказала Стэфаніда і перамяніла ў руках сваю цяжкаватую сумку.

Яшчэ зводдаль пад кантовым брыльком першага пад'езда, адкуль пырскала ў вочы залаціста-ліловымі промнямі моцная лямпачка, Стэфаніда згледзела чорную шыльду і прачыта-

ла на ёй усяго адно серабрыста-белаватае кароткае слова — «інтэрнат».

І яна, косячы вачыма ўгору і адчуваючы раптоўны сполах, што інтэрнат — гэта вялікая, страшная глыба ў жоўтай лусцэ — зараз рухне, абваліцца і прыдушыць яе, у міг вока прабегла да аблушчаных, аблезлых ад фарбы дзвярэй на дзве форткі з асколкамі выбітых шыбаў. Самлелая ад страху, хапілася за ручку і доўга аддыхвалася пад ахронам панэльнага брылька: яшчэ здаўна Стэфаніда чула ў душы боязь як перад узнёслымі дрэвамі, так і перад высокімі будынкамі.

З інтэрната выходзілі вахлакаватыя, з аблезлымі, як нэндзныя каты, зімовымі шапкамі, апухлыя ад перапою мужчыны. Сіні атрутны дым віўся ад іхніх кароткіх дакураных цыгарэт, якія яны трымалі ў руках, адставіўшы тонкія крываватыя мізінцы.

З-за вугла выбег чорны з белым нагруднічкам каток. Убачыўшы Стэфаніду, задзёр трубкаю хвост і па-свойску пацёрся аб жоўты, падпалены на гарачай печы Стэфанідзін валёнак. Ад шчыра прытуленага да валёнка і ласкавага катка Стэфанідзе дадалася нават нечаканая адвага: яна адчыніла дзверы, апынуўшыся ў вузенькім калідорчыку, з якога выходзіла ажно трое дзвярэй — двое бакавых і адны наўпрост. Стэфаніда папхнула тыя, што былі перад ёю, яны не адчыніліся. Каток сядзеў пры левых, бочных, і яна адчыніла іх, аказаўшыся ў нейкім малочным святле, што падала з высакаватай столі. За карычневым пісьмовым столікам, уладна распасцёршы локці, сядзела

жанчына ў зялёнай хустцы з наміткаю чорных вусоў пад задзірыстым носам. Пры ёй стаялі двое высакаватых хлопцаў: адзін рыжы, без шапкі, і ўжо нашча пахмелены, другі старэйшы, у парудзелай чорнай вушанцы і злінялай белаватай, нібы пасыпанай мукою куртцы.

— Вы да каго? — жанчына рукамі развяла перад сабою хлопцаў.

— Я Колю Сіўца шукаю, — Стэфаніда на ружаваты квадрат цэментовай падлогі паставіла цяжкаватую сумку, каб намацаць у кішэні паперку з адрасам.

— Каго-о? — зморшчыў нос і паказаў вялікую шчарбіну ў верхніх зубах п’янаваты рыжы хлопец, — Колю-ю Сіўца?

— Ага, Колю, — узрадавана падмахнула галавою Стэфаніда.

— Ты што, мамуля, — развёў рукі і брыдліва ўхмыльнуўся, зноў паказваючы сваю шчарбіну, рыжы п’янаваты хлопец.

— А ён хіба ваш сын? — жанчына пачала прыкусваць верхнюю губу са шнурком чорных валаскоў.

— Мой, — апала душою Стэфаніда, чакаючы страхатлівай навіны.

— Ён жа ж казаў, — жанчына здзівёна падняла вялікія шаравата-зялёныя вочы, — што ажаніўся і жыве на кватэры ў жонкі. Ён нават і выпісаўся адсюль...

— Ці не ў Маскалёва ён, — скалмачаная заечая шапка мужчыны ў белаватай куртцы павярнулася да чарнявай вахцёршы.

— Вой, што ты кажаш, — пухлыя рукі вахцёршы з кароткімі пальцамі нервова турзанулі

за ражкі зялёнай хусткі. — Маскалёва арыштавалі.

— Разбалталіся вы, — зморшчыўся і пакруціў п'янаю галавою рыжы хлопец. — Мамуля, не слухай іх. Вось табе адрас: Азёрная, сорак тры, кватэра сем. Запомні, мамуля!

— Дзе ж я запомню. Хоць запішэця, — рука, што моцна закалацілася ад гэтага аднога пачутага ў гутарцы слова «арыштавалі», нарэшце намацала ў кішэні плюшавага каптана хрумсткую паперку з адрасам.

Кароткім стрыжнем ад шарыкавай ручкі, знойдзеным у бакавой шуфлядзе стала, вахцёрша марудна нагерзала адрас і яшчэ падказала, як даехаць на Азёрную.

— Мамуля, ён там. Точна ведаю, — пахіснуўся на стол п'янаваты хлопец.

«Мусіць, ужо не знайду Колю». — Стэфаніда падняла цяжкаватую сумку і самлелымі, бязвольнымі нагамі ступіла да дзвярэй.

Пакоўная сумка адбірала плячо, увярэджанае яшчэ з восені, калі Стэфаніда ўскінула на яго ссечаную на дровы маладую алешыну. Махнуўшы свой цяжар за спіну, Стэфаніда падхапіла яго леваю рукою і, прыгнуўшыся, трымаючы абедзвюма рукамі, панесла гэтак ззаду. «А ці трэба ўжо валачы? Дзе ж Коля? І ці знайду яго? — думкі, як і сумка, таксама цяжэлі, горка слязіўся адчай, яна горбілася ўжо ад свае безвыходнасці і крыўды. — Але ж праўду кажуць: кабыла здыхае, а за траву хапае. Так і я, ледзьве іду, а яшчэ валаку гэткі цяжар».

Яна доўга стаяла перад шара-чорнаю лен-

таю шашы з белаю заснежанаю прошваю. Падываючы і смуродзячы бензінам, шашою ляцелі, ажно кружылася ўсё ў вачах, імклівыя то чорна-графітныя, то срэбрана-бліскучыя, то чырвоныя, то блакітныя самаходзікі. Прапоўз і доўгі фургон з ушэрхлымі ад холаду пярэстымі цяляткамі. Адно з іх смутна і галосна рыкала, ажно ад шкадавання ў Стэфаніды зайшлося і балюча зашчымела сэрца: «Божа мілы, няўжо ж іх у бойню павезлі? Але ж дзіва што, гэтакі горад, столькі людніска і кожнага накармі...»

— Давайце, маці, памагу, а то, я бачу, вы не пяройдзеце, — рослы, як і яе Коля, сівавата-маладжавы мужчына ў ёдзістых акулярах падхапіў яе пад локаць і павёў поруч з сабою праз чорную, укатаную да тлуставатага бляску ленту шашы з грабянцом бруднага лёду пасярэдзіне.

— Дзякую табе, даражэнькі чалавек, — сказала яна, спыніўшыся пры бляшаным карычневым навесе з лаўкамі. Мужчына, пругка і шырока ступаючы, пайшоў у высокі карычнева-белы з чорным мармуровым уваходам дом, а яна засталася зноў адна пад гэтым бляшаным навесам, расхрыстаным, як пастаўленая на кант кніжка.

Нумар кватэры і дома, і як ехаць туды, на Азёрную — нібы ў чорнай прорве, усё раптоўна знікла ў нетрывалай Стэфанідзінай памяці. А спытаць не было ў каго. Жанчыны ў аранжавых камізэльках, што самаробнымі шырокімі лапатамі счышчалі з шашы снег, кідаючы яго пад чорныя ліпкі, адышліся ўжо

далекавата. П'янаватае, ў закасаных ботах маладзіцы, што напытвала ў Стэфаніды пра самагонку, сярод іх, здаецца, не было. «Можа, упала дзе», — пашкадавала Стэфаніда, успомніўшы, як захліснулася восенню каля кароўнікаў у раўчаку з жыжкаю іхная даярка, напіўшыся з загадчыкам. Цяпер жа ж п'юць, няхай Бог адносіць.

Ужо гарэла, ломячыся слюдзяною чырванню ў цёмна-сініх квадратах вокнаў, позняе зімовае сонца. На чыстае неба выплывалі блізенькія і падобныя капялюшыкамі адна да аднае, як блізняткі-баранчыкі, дзве бела-ружовыя хмаркі. На чорна-смолкіх комінах далёкае ЦЭЦ ужо згаслі рубінавыя агоньчыкі. Роўная і, здаецца, пружыніста-звінючая лента шашы то трохі аціхала, то зноў цяжка ўгіналася ад рокату і гулу бясконцых машын. І нібы ад шырокага паса ў даўнейшай малатарні, закружылася збалелая Стэфанідзіна галава. Нечакана з-за павароту, апярэджаны кароценькім самаходзікам, страхатліва завальваючыся набок, выпаўз доўгі аўтобус з чорнымі, рабрыстымі, як у гармоні, мяхамі. Стэфаніда падняла сваю нялёгкую сумку: «Туды ці не туды, але паеду, чаго тутака на адзіноце стаяць».

З сярэдніх дзверцаў выскачылі дзве дзяўчынкі ў белых вязаных калготках, чорных куртках і ўрачыста натапыраных пыжыкавых шапках.

Стэфаніда счакала, пакуль вываліцца грузная, мусіць, хворая на ногі жанчына з гэткаю ж, як і ў яе, у Стэфаніды, нялёгкаю сумкаю і паднялася на чорныя, закіданыя карычнява-

тымі фільтрамі ад скураных цыгарэт, рубцаватыя сходы. Аўтобус, пасля таго, як схлынуў ранішні паток пасажыраў, па-дзённаму быў пуставаты.

— Ці ж даеду я да Азёрнай вуліцы? — насцярожана азірнула ўнураных пасажыраў Стэфаніда.

На яе голас чорнымі гармонікавымі мяхамі зарыпеў толькі доўгі «Ікарус», пасажыры абыякава і адчужана маўчалі. Ды на каленях у жанчыны, ахутанай вялікай чарнабуркаю, прыўзняўся і азірнуўся круглатвары хлопчык у фіялетавай вязанай шапцы з брыльком і штучным футры, шарым у чорныя плямы — пад колер барсавай скуры.

— Можа, і даедзеце, я не знаю, — трохі гаркавата загаварыў ён, круглатвары хлопчык гадкоў трох.

— Дзякуй, дзіцятка, адно ты мне і паспагадала, — у Стэфанідзіных вачах зацяпліліся слёзы.

— Гэта ў самы канец, — нарэшце азірнулася і жанчына ў пухкім, сівавата-дымным каўняры, яго маці, паказаўшы свой прыгожы і малады твар з рудаватай барадаўкай на верхняй губе.

Астатнія пасажыры нават не зварухнуліся. Глуха павярнуўшыся да Стэфаніды свае капюшоны, пыжыкавыя і вязаныя шапкі, унурана горбіліся каля вокнаў, зашэрхлых дымнаю, у слюдзяністых блёстках намараззю. Адно высокае, нібы патайное, сядзенне пры шафёрскай кабіне шчасліва пуставала. Трымаючыся за спінкі з выкрышаным, як выгрызеным пацу-

камі, пенапластам скурчанаю, пакрэплаю на марозе рукою — новыя пляскатыя рукавіцы з вострымі на пальцах кончыкамі яна яшчэ не вымала з сумкі — Стэфаніда паволі дайшла да яго і нязграбна села, не могучы ўціснуць ногі з вялікімі валёнкамі. Чуючы востры нязносны боль у плячы, падняла на калені карычневую, абшморганую сумку, напакаваную скруткамі пахучых ад каляндры і кмену кілбас, апольцам ружовага сала і торбачкаю салодкіх сушаных дуляў. Пазіраючы на леташні наклееены каляндар з партрэтам польскай акторкі Брыльскай, на яе твар, што выплываў як з таемнай сіняй вады, танклявы і прыгожы, успомніла зноў пра Колеву дзіўную і загадкавую жаніцьбу. «Каб хоць якую чужую ды чорную не ўзяў, каб гэтакую бялявую, з сінімі вачмі, сваю. А то будзе, як у Чабароў, калі старшы іхні недзе з-за свету прывёз з вузкімі вачамі ды яшчэ п'яніцу. Яна пабыла тыдзень ці два і давай уцякаць на чыгуначную станцыю, у буфет па гарэлку. Чабары, не стрываўшы гэтакай распусты, выгналі з хаты і нявестку, і сына.

Але як там ужо ні было, абы жывы ды здаровы быў, ды ў турму не трапіў. Бо наўкруга гэтакі разбэшчаны свет, столькі ж шаленства...»

Аўтобус, паляпваючы прышчэпленаю над дзвярыма бляшанаю накрывачкаю і чымсьці едка паскрыпваючы пад падлогаю, засланай чорнаю гумаю з выпуклымі кружкамі, нёс Стэфаніду ўсё далей ад сённяшніх дзён, у тыя светлыя гады, калі яе Коля быў маленькі і хадзіў наўкруга хаты, граючы на губным гар-

моніку з адною бліскучай тронкаю, што з горада прывёз Ігнась. Дзівячыся на белагаловага сынка, яны з Ігнасем шчасліва ўсміхаліся і, ласкава пазіраючы адно аднаму ў вочы, казалі: «Мусіць, музыкантам вырасце». Аднак шчасце павярнулася бокам. Ды хіба ўгадаеш, што ў жыцці прылучыцца.

Ігнась раптоўна памёр ад таго нарыва ў галаве, а Коля, падросшы, паехаў у раённы цэнтр, у школу механізацыі. Але там, пэўна, было не да вучобы. Коля сышоўся з брыдотаю і басатою, украў музыку — калонкі і стэрэо, як ён казаў, і яго нават хацелі судзіць, але балазе абышлося — толькі выключылі са школы механізацыі. Той год да войска, няхай бароніць Бог, выдаўся найцяжэйшы: Коля пачаў піць і швэндацца цалюткія ночы навылёт. Як Стэфаніда вытрывала ўсё гэта, як розуму не страціла. Войска яго трохі перамалола — дадому ён вярнуўся ўжо развважны і паспакайнелы, у дадатак — рослы і прыгожы. Люба было глянуць на яго. Але ж у глухой, без моладзі і вечарынак вёсцы, праўда, доўга не ўседзець — і Коля ўслед за Чабаровымі хлопцамі шмарганyў у горад. Пашэнціла — на работу ў сталярню пры чыгуначным дэпо ўзяў даўнейшы Ігнасеў начальнік ці таварыш. Праўда, цяжка было штодня раненька ўставаць і бегчы на прыгарадны поезд, а месца ў інтэрнаце не налучалася. І, вядома ж, прыйшлося мяняць работу. Але на табе — крадком, патаемна, нават не кажучы мацеры, ажаніўся.

«І што ж гэта за ліха, чаму не сказаў?» — паварушыла здранцвелымі, наседжанымі на-

гамі Стэфаніда і ўжо злякнулася ад чужога крыку, ачнуўшыся на міг ад сваіх патаемных і горкіх думак.

У аўтобусе сварыліся. Худая рослая жанчына ў аблезлым каракулевым каўпаку, з-пад якога доўгімі зліплымі хвастамі на падняты каўнер шэрага, паточанага моллю паліто падалі цёмна-русыя валасы, і маладзіца ў белай ажурнай хустцы, нізкая і паўнявая.

— Гасударства разваравалі, спекулянты праклятыя! — крывячы тонкія хваравіта-сiняватыя губы, крычала жанчына ў сівым зношаным каўпаку. — Чэм сумкі набіла, што і не прайсці? Не сваё, нябось!

— Што вы гаворыце, — сарамліва апусціла чорныя вочы з белымі перламутрава-сіняватымі бялкамі паўнявая маладзіца, цягнучы далей ад дзвярэй у вузкі праход аўтобуснага салона і праўда велікаватую блакітна-ліловую паласатую сумку.

«Ой, якая ж яна з'ядлівая. Няхай сцеражэ Бог. Можа, дзе пры турме была? — Стэфаніда, сама ўжо здушаная непрыязню, калючым зіркам акінула сутуленую жанчыну з доўгімі касмыкамі валасоў на паднятым каўняры, уважліва паўзіралася ў зблажэлы шэры твар, акроплены негустым рабацiннем. Востры гарбаты нос, што спускаўся да тонкіх, злосна падцятых губ, дадаваў твару брыдкасць і адчужанасць. Злосна мружыліся сіняватыя злінялыя вочы. — Далібог, мусіць, у катоўні, дзе б'юць і нявечаць людзей, яна была, — Стэфаніда нібы абязвечыла сябе гэтым прыдуманым страхам і адхілілася да акна, каб засланіцца ад гарачых,

помслівых думак і ўпікнула сябе: — Ці не грэх мне? Гэтакая падазронасць на нявінную, усяго, можа, звяглівую кабету».

— Канечная, аўтобус далей не пойдзе! — падаючы зверху, у пустым салоне гразліва праграмеў голас, і шофер, адключыўшы мегафон, высунуў з-за чорнай перагародкі з авальным акном кучаравую цыганскую галаву: — Бабуля, я вам кажу, прыехалі, пара выходзіць!

— А вой, — спалохана ўскрыкнула Стэфаніда. — І праўда, нікога няма, а я сяджу сабе, як курыца на седале.

Шофер, убачыўшы, што яна ніяк не можа выціснуцца з вузкага сядзення каля кабіны, падбег і зняў з яе прыполу пакоўную сумку і ўсміхнуўся, учуўшы вагу:

— Не па вас ношка.

— Ой, не кажэця, сыну ж прывезла, адно не ведаю, як знайсці яго, — прымарудзіла, ступіўшы на ніжнюю вуграватую лапатку сходцаў, збедаваная Стэфаніда. — Можа, у вас ён дзе? Коля Сівец — не чулі?

— Во, мой напарнік, — цыганісты кучаравы шофер пальцам ткнуў у два прозвішчы, напісаныя над дзвярыма кабіны, — Саша Сівы, а Сіўца?.. Не, — ён патрос кудзеркамі чорнасіняватых валасоў, — не ведаю. Няма ў нашай аўтакалоне такога.

— А дзе ж тут будзе вуліца Азёрная? — спытала Стэфаніда, высунуўшыся з аўтобуса і задыхнуўшыся ад калюча-марознага пругкага ветру.

— Прайсці трохі далей трэба. Вунь туды, — шофер ужо з кабіны паказаў паголеным з сіня-

ватаю ямкаю падбародкам на чорную сярод белага нярушанага снегу стужку аўтастрады, і вузкія палавінкі дзвярэй, паволі разгарнуўшыся, закрылі глыбокую прорву аўтобуса.

Стэфаніда, зноў махнуўшы сумкаю назад, злавіла яе левай рукою і гэтак аберуч, трымаючы рукі на спіне, панесла яе.

Быў канец горада — з аднаго боку накатанай да чорна-смалістага бляску шашы вечным, заснежаным хараством бялела поле і за пагоркам у чуйна-насцярожаным карычневым прысаддзі хавалася, вытхнуўшы вострыя шыферныя дахі, блізкая вёска, з другога боку шараю падрэзанаю сцяною, што нагадвала халодны турэмны мур, непрыступна падымаўся панэльны мікраараён. Нібы застоеная асенняя вада, глыбока і патаемна сінелі квадраты вокнаў.

На абочыне шашы густа шыпеў, стоячы на двух колах, як вазок для марожанага, жоўты кампрэсар, і кароткімі чэргамі пастрэльваў адбойны малаток — Стэфанідзе ажно прыгануласся забытая вайна, той сухі і святні дзень — ці не вербніца? — калі РОНАўцы* з кулямётаў абстралялі вёску і каля самых ног у Стэфаніды кулі прошвою прадзяўблі ружовы, вытачаны з зямлі спарышнік. Яна толькі з поўным вядром завярнула на сцежку ад калодзезя і ўслед за прашытым, успененым пяском, што пырснуў на босыя ногі, учула кароткі і тупаваты стук кулямёта.

* *РОНА* — русская освободительная народная армия. Фарміраванні з палонных, што былі на службе ў гітлераўцаў.

І двое рабочых у касках, што ўвіхаліся каля кампрэсара, нагадалі тых даўніх, таксама забытых карнікаў. Стэфанідзе не задабрылася, сэрца абліла млосная гарачыня, і яна, змушаючы сябе падысці да іх, каб перапытаць, дзе ж будзе тая Азёрная, рашуча павярнула ўбок — балазе ўбачыла сама і сцежку, што збягала ў лагчыну, і прадаўгаватае азярцо, што ільсніста і мройна паблісквала і курылася на марозе радужнаю лілова-сіняватаю параю. «Значыць, тут яна, гэтая Азёрная», — узрадавалася з наіўнаю, нібы галубінаю прастатою Стэфаніда і, счакаўшы, покуль аціхне здрадлівы боль пад сэрцам, а шашою пераедзе серабрыста-шэры і доўгі, з усечаным задам, рэфрыжэратар і ўслед за ім праплыве падобны да слізкага вадзянога жука чорнаграфітны «Мерседэс», нарэшце памалу, нібы абмацваючы прымлелымі нагамі дол, перайшла шашу і неглыбокі жолаб канавы.

Нешырокая, перакрыжаваная лыжнымі адпаліраванымі слядамі сцежка бегла пахілым злёгку берагам між маладых ясеняў з натапыранымі, як антэны, і серабрыста-блішчастымі верхавінамі, спадала да цёмна-рудаватага азярца, зараслага спалавелым троснікам і паломаным яшчэ ўлетку гляжджаем, дзе стырчалі карычневыя аксамітныя таўкачыкі, паказваючы на зломах сваю белую і мяккую, як руно, поўсць.

Нібы знябыўшыся па Стэфанідзе, па-свойску да берага шнурком падплывалі, крута выгнуўшы шыі з малымі галоўкамі, парка белых старых і трэйга брудна-карычняватых маладых лебедзяў.

«Вой, у вырай пташкі не адлятаюць. Няўжо зімуюць тут?» — з пакрэплых ад марозу і здранцвелых ад цяжару рук Стэфаніда выпусціла сумку і нагнулася да яе, каб знайсці там новыя, яшчэ неўжываныя шорсткія рукавіцы, што ўвосень звязала сама.

Перапуджаны рыжы пацук, гарбаты і нэндзна-натапыраны, з доўгім, агідна голым ліловым хвастом, адскочыўся ад сцежкі і ў міг вока знік у чорнай прадусе між гарбоў сінявататага лёду.

«О, і гэта брыда вядзецца тут», — Стэфаніда нацягнула на рукі шорстка-калючыя сівыя рукавіцы і ажно ўздрыгнула ад гідлівасці, і не ад рукавіц, а ад гарбатага пацука з бурачковым голым хвастом. Ёй успомнілася, як перад вайною бацька аддаў яе ў мястэчковую школу, наняўшы кватэрку ў сваяка ці знаёмага, нейкага насатага Шчурко. О, не забываецца тая першая ноч, калі яе, васьмігадовую дзяўчынку, адзінюсенькай паклалі спаць на мулкім куфры ў стопцы і накрыцца далі рэдзенькую старую радзюжку. Яна доўга не магла заснуць у шапаткім варухлівым поцемку, а прачнулася ад таго, што са столі ці са сцяны на яе падалі адзін за адным асмялелыя пацукі. Было ўжо не да сну. І раніцай, узяўшы сваю палатняную торбачку з лемантаром і сшыткамі, яна, сплаканая, пабегла не ў школу, а дадому, у свае Накрыжкі...

І дзіва бярэ, бацька не пашкадаваў, а яшчэ зняў пякучую папружку. Злы, чэрствы, не спагадлівы ён быў... Гэта яна, Стэфаніда, не по-

мнячыся любіць свайго Колю. А яе бацька — страшна і казаць.

Стэфаніда падымае старую, аблушчаную ад фарбы, абшморганую дэрмацінавую сумку і ступае жаўтлява-бруднаю сцежкаю сярод нярушанага адлігаю вугравата-пухкага снегу, па якім слізгае яе даўгаваты косы цень.

Памяць вяртае вайну, той халодны і галодны час, калі бацька, аддаўшы яе, пятнаццацігадовага падлетка, за наймічку на багаты хутар, папярэдне, мусіць, дамовіўшыся з гаспадаром, нежанатым, унураным, саракагадовым Гальяшом і ўзяўшы ўзадатак мех жытняй мукі, стаў намаўляць выходзіць за Гальяша замуж.

Ад даўняе перапакутаванае крыўды і вострага сустрэчнага ветру, што дзьмуў з азярца, у Стэфаніды на вочы набеглі слёзы.

Крохка парыпваючы намерзлым снегам і ганарыста ставячы шчытныя новыя боцікі, насустрач ішло разружавелае маладое дзяўчо. Ад гарачага парывістага дыхання каля рота абінеў ліловы, расслаблены на кучаравай галоўцы шалік.

Стэфаніда шорсткаю сівою рукавіцаю выцерла вочы і падняла цяжкую, налітую болем галаву:

— Скажэця, а дзе ж тут будзе вуліца Азёрная?

— А во яна, — дзяўчына адгарнула ад рота заінелы пухкі шалік і махнула рукою на прагал між шарых слупкоў высотных будынкаў, за якімі бялелі панэльныя пяціпавярховыя прадаўгаватыя дамы.

— Як? — здзівілася Стэфаніда. — Я ўжо яе прайшла?

— Не, — скрыва ўсміхнулася дзяўчына. — Які вам корпус трэба? — І пералічыла рукою. — Во 1, во 2, а там — 3...

— А каторы ж сорак трэці будзя?

— Усе.

— Няўжо? — здзівілася Стэфаніда.

— Акрамя нумара дома, — дзяўчына захіліла ружаваты, падхарошаны марозам твар ад парывістага ветру, — трэба нумар корпуса ведаць. Бо тут ажно пяць сорак трэціх дамоў. Во, гляньце на нумарную таблічку, — і карычневая вялікаватая сумка, што вісела на плячы, махнулася ў бок першага блізшага дома, атуленага высокімі бярэзінамі, на вецці якіх пакалыхвалася чародка чырванагрудых снегіроў. — Сорак тры — корпус адзін. А там будзе сорак тры — корпус два.

Пад новымі боцікамі зноў крохка зарыпеў снег. А Стэфаніда нібы абязвечаная, агорнутая нечаканай роспаччу, стаяла на нешырокай дарожцы, надоечы пачышчанай трактарным плугам і падмеценай драцяною шчоткаю і зноў завеянай вострымі і ўгнутымі, як лемяхі, сумётамі, і ўзіралася на маўклівую шарэнгу жаўтлява-белых дамоў з зеленаватымі квадратамі патаемных вокнаў.

«Ой, паверыла, садовая галава, тому рыжаму п’яніцу, — дакорам аблівалася і большала ў грудзях сэрца, не даючы Стэфанідзе дыхаць. — Ён жа ж з самае раніцы набраўся як мурза гароху».

З самлелае рукі на снег лёгка выслізнула цяжкая сумка.

«Але ж нумар кватэры маю — сёмая, — як за саломінку ўхапілася ўзнерваваная і да роспачы разгубленая Стэфаніда. — Ратунак ёсць — пайду па ўсіх кватэрах».

Чуючы боль у плячы, што востра аддаваўся і жагаў па ўсёй руцэ, Стэфаніда паволі нагнулася да ненавіснае, ужо збрыдзелае сумкі.

Расчышчаная сцежка падбягала пад развесісты ясень, што спадаў доўгімі галінамі на глыбокія лоджыі белага пяціпавярховага дома. Чырвоныя, як аблітыя крывёю, снегіры, нават пераварочваючыся шарымі спінкамі ўніз, здзёўбвалі з дрыготкіх барадаў прадаўгаватыя завушніцы насення. З палускваннем церабілі яго кароткімі гарбатымі дзюбкамі.

Закружыўшыся лейкаю, вылушчаныя пласцінкі, падобныя да вёслаў, зляталі на сутуленую Стэфанідзіну спіну.

«Памажы, Божа, — уздыхнула Стэфаніда, спыніўшыся пад брыльком-навесам першага пад'езда і расслабіўшы хустку. Яе раптоўна абліла гарачыня — ад страху і ўжо ад стомленасці. — Дзе ж мой Коля? А можа, як раз тут».

Яна ўвайшла ў цемнаваты пад'езд, незнарок моцна грукнуўшы жоўтымі, на спружыне, дзвярамі. Паволі ступаючы бязвольнымі нагамі на першую прыступку невысокіх сходаў, яшчэ знізу, не ўзышоўшы на шара-цэментную пляцоўку, на абедзвюх дзвярах: адных — чорных, другіх — жоўтых, убачыла blішчастыя, ёй ужо непатрэбныя лічбы — 91 і 92.

«Нешта ж не тое», — асцярожна прытрымліваючы фортку дзвярэй, каб ужо не грук-

нуць ёю, Стэфаніда высунулася з цёмнага пад'езда на сляпучае і нізкае, як вечаровае, сонца. З дыпламатам у руцэ, пераскочыўшы горбу насыпанага жоўтага пяску, перад ёю апынуўся міліцыянт у зеленкаватай, рыхтык, нямецкай форме, толькі фуражка з серабрыстай кукардай і лакіраваным брылём была смешная, нібы сабраная ў зборкі.

— Пачакайце ж, — Стэфаніда ледзьве не схапіла за рукаво яго куртаценькай курткі, — дзе ж тут знайсці сёмую кватэру?

— А вунь, у першым пад'ездзе.

— А Колю Сіўца вы часам не ведаеце? — яе слабы, трохі ахрыплы голас дагнаў міліцыянта ў расчыненых дзвярах.

Яны не зачыніліся — падстаўлены чорны чаравік з вастраватым носікам трымаў іх.

— Сівец? — міліцыянт зморшчыў вуграваты лоб. — А ў нас па справе, між іншым, праходзіў нейкі Сівец.

Прымружыўшы вочы, міліцыянт скрыва і падазрона доўга азіраў знябожаную Стэфаніду, нарэшце трасянуў смешнаю, рагатаю, сабранаю ў зубчыкі фуражкаю:

— А Сіўца вашага часам не судзілі?..

— Няхай бароніць Бог, што вы? — як мага ўжо не сваім, нейкім адрошаным голасам сказала Стэфаніда.

— Мусіць, я памыляюся, гэта быў Сіўцоў, — чаравік нарэшце адступіў ад дзвярэй, і яны схавалі шырокую спіну ў зеленкаватай куртцы з капюшонам.

«А божа мілы, што ж гэта ён сказаў пра нейкага Сіўцова? — Стэфаніда няўклюдна па-

вярнулася і цяжка, марудна пайшла заледзянелаю, пасыпанаю ржавым пяском дарожкаю да крайняга пад'езда.

З непрычыненых дзвярэй, чуйна наставіўшы вушы, на Стэфаніду ўважліва пазірала чорна-паджарая аўчарка.

«Дальбог, не пусціць мяне сюды», — Стэфаніда, не падыходзячы да дзвярэй, спынілася перад зялёнаю лаўкаю, збітаю з кантовых і пафарбаваных рэек.

Але аўчарка, вінавата ўгінаючы галаў і падвільваючы цяжкім калматым хвастом, падбегла да Стэфанідзінае сумкі і тыцнулася ў яе вострыю мызаю — яна абнюхала кілбасы і сала.

«О, хітрая, чаго захацела», — узрадаваная Стэфаніда, пераступіўшы абгрызеную палку, якую кінула паджарая з адвіслым жыватом аўчарка, нарэшце ўвайшла ў пад'езд.

Цягнула атрутным тытунёвым дымам: на пляцоўцы другога паверха, ужо засмечанай жоўтымі фільтрамі ад цыгарэт і запляванай, двое рослых, лёгка, у куртачках, адзетых хлопцаў з партфелямі пад пахамі, курылі, перадаючы адзін аднаму цыгарэту.

«Мусіць, уцяклі са школы», — дагадалася Стэфаніда, але ціханька і бокам прайшла міма хлопцаў. Краем вока змеціла: у куточку цямнела сіняватая бутэлька.

«Няхай сцеражэ Бог, няўжо п'юць?»

Сёмая кватэра была ажно на чацвёртым паверсе. На дзвярах, абабітых цёмна-карычневым, пазгрызаным, пэўна, сабакам дзермацінам паблісквау алюмініевы ромбік з лічбаю «сем».

Дрыготкаю ад хвалявання рукою, што зараз убачыць свайго рослага, сінявокага і кучаравага, як анёлак, Колю, Стэфаніда націснула на белую кнопку ў чорным пластмасавым кружку. Дзверы адчыніліся, дыхнуўшы густым пахам смажанай цыбулі і нібы затхлай рыбы, і ў чорнай пройме замiж чаканага Колі сутуліўся невысокі, срабрыста-сіваваты, даўганосы, дзён колькі няголены мужчына ў карычневай камізэльцы, адзетай на сінюю байкавую кашулю, не зашпіленую на верхні гузік, што агаляла вялікую, зморшчаную шыю.

— А Коля Сівец тут раптам не жыве? — апалым, перасохлым ад задухі голасам спытала Стэфаніда.

— Мы такога не знаем, — падняў худыя плечы мужчына, турзануўшы на сабе сінявата-карычневую камізэльку.

Дзверы прыгрукнулі, забраўшы трохі і густы пах смажанае цыбулі і рыбы.

«Дзе ж ён, Коля? — у Стэфаніды перад вачыма ажно пачалі дваіцца шарыя сходцы. — Няўжо не знайду?»

На пляцоўцы пры акне хлопцаў ужо не было, каля сіняе бутэлькі, чуючы, мусіць, пах кілбасы, Стэфаніду чакала і лісліва ўгінала галаву, віляючы хвастом, паджарая аўчарка.

«Каб знайшла Колю, то б пачаставала і цябе. А раз яго няма, няма і свята», — паківала цяжкаю, укручанаю ў вялікую хустку галавою збедаваная Стэфаніда.

Аўчарка, нібы спачуваючы ёй, пакорна і ціха дайшла ўслед да блізенькага наступнага дома, але ў пад'езд ужо не ўсунулася. На чацверты па-

верх, да недагледжаных, неабітых дзермацінам дзвярэй Стэфаніда падышла адна. Але як ні ціснула на выпуклы белы квадрацік званка, яны, гэтыя жаўтлявыя дзверы, пашарпаныя і пакрэмзаныя нечым вострым, таямніча і глуха маўчалі — ніхто іх не адчыняў.

«Значыць, нікога няма», — гаротна ўгнуўшы галаву, Стэфаніда яшчэ пастаяла на плеценым з саломы кружку і паволі, нібы мацаючы нагамі сходцы, пачала спускацца ўніз. Спіною яшчэ прыслухвалася, ці не адчыніліся тыя жоўтыя, пашарпаныя дзверы, але чула толькі шоргат сваіх ног і злосны гыркат лютага нябачнага сабакі ў бочнай кватэры. Ён, мусіць, чуў у пад'ездзе чужога чалавека.

У трэцім доме чырвоныя, прыветныя, як здалося Стэфанідзе, чыстым і злёгку прычыненыя дзверы на вільготнай, толькі што вымытай пляцоўцы, адкрыла летка апранутая прывабная маладзіца з белым вядзерцам у руцэ, на Стэфанідзіна запытанне яна ласкава з мілаю нават усмешкаю на круглявым твары адказала:

— Не, я не чула пра Колю Сіўца. А ён быў прапісаны тут, у гэтых дамах на Азёрнай?..

— Каб я ж ведала, — сарамяжна прызналася Стэфаніда.

— Чакайце, — маладзіца здагадліва павярнулася да вішнёвага тэлефона, што стаяў на жоўтай тумбачцы. — Я зараз спытаюся ў нашай паспартыстკі.

Але на яе тэлефонны званок, ніхто, мусіць, не адказаў.

— Можа, пачакаем, можа, зараз яна прый-

дзе, — у голасе мілавіднай чарнявай гаспадыні задрыжэла ўжо таксама несуцешная безнадзейнасць.

— Не, ужо не буду вам дакучаць, застаўся адзін дом, зайду ўжо туды. Можа, яшчэ пашэнціць, — Стэфаніда падзякавала і павярнулася да спадзістай лесвіцы.

На чацверты паверх астатняга, ужо чацвертага дома Стэфаніда падымалася, нібы на стромкую, неадольную гору. У душы, быдта маленькая рыбка ў жмені, нецярпліва трапяталася жывое спадзяванне, што яе Коля паправудзе акажацца там.

Стэфаніда нават уявіла, як ён спярша жахнецца і выпне сваю ружавата мяккую губу з белаватаю парасцю, што засталася з тое пары, калі ён, трохгадовы, з разгону ўпаў на чыгуны, а потым засмяецца, як смяецца ён ціха і сарамяжна, і падхопіць у яе з рук ацяжэлую, што адабрала плячо, ненавісную сумку...

Паставіўшы на гумовы квадрат з вострымі рубцамі сваю сумку, гэтаю дрыготкаю самлелаю рукою пацягнулася да высакаватага званка. Дзверы адчыніліся, але не тыя, перад якімі яна стаяла, а тыя, што былі ў яе за спіною. Стэфаніда азірнулася на адначасны глухаваты грукат дзвярэй, жалезны лязгат і шчоўканне замка: перад ёю стаяла паўнявая жанчына ў махеравым сіва-галубенькім каўпачку і нацягнутай на нядбала зашпілены байкавы халат спартыўнай цёмна-сіняй куртцы з белаю машынкаю і белымі паскамі на манжэтах і каўняры.

— Вы да нас? — яшчэ больш пастарэў звя-

лы, пасечаны дробнымі зморшчынамі бяскроўны твар прысадзістае жанчыны ў крывавататых зношаных тапках.

— Як вам сказаць, — цяжка ўздыхнула Стэфаніда, — сына свайго, Колю Сіўца, шукаю.

— Трэба ў міліцыі шукаць, што вы па кватэрах ходзіце.

— Што ж вы гэтак на мяне? — цяжка і бязвольна апусцілася балячая Стэфанідзіна рука.

— Учора тута хадзілі нейкія падазроныя, Сашу шукалі. А цяпер вы...

— Ой, жанчынка, каб вам так было, як мне сёння, — Стэфаніда доўга, ужо зусім не могучы, падымала сваю цяжкую, нібы поўную камення, аблушчаную сумку.

— Я ж і кажу, трэба ў міліцыю звяртацца! — голас наўздагон нібы штырхануў у плечы гаротна прыгорбленую Стэфаніду, і яна ажно спатыкнулася на лесвіцы, але балазе не ўпала.

Чуючы, як у грудзях расце і не дае ісці сэрца, колькі хвілін аддыхвалася, спыніўшыся каля пад'езда на жалезных драбінцах, аб якія выціраюць ногі, пакуль не ляпнулі дзверы і з пад'езда не выскачыла рослая дзяўчына ў каракулевай чорнай кубанцы пад колер скураной курткі і ў зорыстых, упрыгожаных пасачкамі і ромбікамі калготах на стрункіх круглых ножках.

— Куды ж ісці? — міжволі спытала ў сябе і пайшла па шарым заледзянелым асфальце ўздоўж шарэнгі белых дамоў з зеленаватымі

квадратамі замерзлых вокнаў, атуленых купкамі маладых ружавата-чорных ліпаў і стракатых, высокіх бярэзінаў з дробным танюткім веццем, якое свіцілася на фоне блакітна-светлага, нібы разведзенага малаком, настылага неба.

Пазіраючы на чужыя, гаротна абвіслыя, прыцішэлыя бярэзіны, Стэфаніда ўспамінала сваю, маладзенькую, што расла пры калодзезі, пасаджаную Колем.

У канцы астатняга дома, пакручваючыся і выцягваючы шыю з зубатым каўшом, чырвоны экскаватар падымаў з ямы тлусты, рудавата-глііністы грунт, яшчэ не ўмерзлы, і кідаў у новы, не забруджаны самазвал з жоўтай кабінай. Каля самазвала сярод двух ніжэйшых хлопцаў, трымаючы рукі ў кішэнях цёмнай курткі з капюшонам, у стракатай кепачцы стаяў яе Коля.

Стэфаніда, як беспамятная, што маючы моцы і сілы, зашоргала валёнкамі і нават ускрыкнула: «Коля!» Але за грукатам экскаватара голас яе не было чуваць. І яна ўжо з астатніх сіл пабегла...

Убачыўшы, мусіць, што занадта блізка ад экскаватара падыходзіць пажылая кабета з сумкаю, шофер — малады рослы хлопец — рушыў насустрач ёй, як падумаў, адурэлай старой, каб не падпусціць да самазвала.

І толькі за крокаў чатыры-пяць нервова-ўзрушаная Стэфаніда ўбачыла і распазнала, яшчэ не верачы сама сабе, што гэта зусім чужы, незнаёмы хлопец. Аднак жа мінаю і ростам быў рыхтык яе Коля.

— Бабуля, нельга! Ты куды?! — голас паправўдзе быў чужы, не Колеў. І Стэфаніда абмінула чырвоны вуркатлівы экскаватар і глыбокую яму, жоўтую ад тлустай ільсністай гліны, і новы, яшчэ не запэцканы самазвал, куды з зубатага чарпака падалі цяжкія глыбы, і пайшла сцежкаю, што тачылася праз сухі, сыпкі снег.

Рукі зноў стылі на марозе, і яна паставіла сумку, каб знайсці шорсткія новыя рукавіцы. Яе абмінулі, пругка ступаючы і пахрумстваючы сняжком, рослыя маладзіцы: адна ў цёмназеленаватай тужурцы і белых вязаных калготах, што высока, да самага кажушка абцягвалі яе паўнявыя сцёгны, другая — у пыжыкавай калюча-іскрыстай шапцы і карычневай дублёнцы з пяшчотна-белым каўнерыкам.

«Няма Колі, няма і не знайду», — Стэфаніда заслізгалася на хрумскім лёдзе, прыспешваючы крок, каб ускорыць за маладзіцамі і спытаць, як жа знайсці паўстанак, дзе спыняецца доўгі жоўты аўтобус, бо дарогу да яго яна ўжо забылася, заблудзіла і чуе, што ідзе не туды.

Ногі ўжо не слухаліся, млелі.

«Сынок, дзе ж ты падзеўся, сынок? Ці жывы хоць ты?» — гарачыня аблівала сэрца, Стэфаніда задыхалася, а жанчыны ўсё аддаляліся.

Яна ўбачыла, што за шарым цэментным слупом сярод зялёнай агароджы, зробленай з нятоўстых трубаў, што асцерагала тратуар ад бойкай чорнай вуліцы, жанчыны знайшлі пралом і прашчаміліся праз яго.

«Во, і не даганю», — вагкая сумка зачапіла-

ся за ржавую, крута загнутую рурку зялёнай трубы. Стэфаніда, на якое паўхвіліны замарудзіўшы, адчапіла яе і спіною высунулася на шашу і нават пакаўзнулася на сіне-цёмным мутнаватым лёдзе... Цяжкі лабаты самазвал з трыма жоўтымі агоньчыкамі на блакітнай кабіне з моцным гулам і пранізліва-вострым візгам тармазоў рэзка звярнуў убок, ломячы трубчатую агароджу і дзве маладзеньнія чорна-карычневыя ліпы. Але пасівелы ад падцёкаў цэментнай рошчыны жалезны борт паспеў ударыць у Стэфанідзін плюшавы сачык і, мусіць, у галаў, адкінуўшы Стэфаніду і яе аблушчаную карычневую сумку на сярэдзіну вуліцы.

Стэфаніда яшчэ паволі прыўзнялася і пачала спешна, ужо не трапляючы, здымаць з рук шорсткія гарачыя рукавіцы. Яна яшчэ бачыла, як да яе бег Коля... Яго абедзве чуйна працягнутыя рукі падхапілі самлелую, аблітую пякучай гарачынёю Стэфаніду і пачалі падымаць на вялікую стромкую гару. І раптам яны абое сарваліся з гэтай абрывістай гары і паляцелі ўніз, у чорную бясконцую прорву.

*1995*

# ДЗЁННІКІ

## *БЕРЛІНСКІ ДЗЁННІК*

*Улетку 1991 года, з ласкі доктара Ульрыха Янэцкага, я быў запрошаны ў Берлін на Літаратурны калёквіум. Вынікам гэтага гасцявання з'явіўся «Берлінскі дзённік».*

Аўторак. 4 чэрвеня 1991 года. Берлін, Ам Сандвэрдар, 5. Літаратурны калёквіум Берліна.

09.30. — мінскага часу (гадзіннік так і не пераводзіў — апярэджваючы час, жыць цікавей). Другі дзень, як я тут, у чырвонай трохпавярховай віле, зацянёнай магутнымі бурачковымі букамі і ясна-зялёнымі, таксама старавечнымі дубамі, на паддашку, у светла-жоўтым пакойчыку са скошанай сцяною. Уся мебліроўка простая, калі не сказаць аскетычная: два металічныя з цыбатымі ножкамі столікі пад колер сценаў, халадзільнік, рабочае крэслакруцёлка на сталёвай пяцікутнай назе, шырокая тахта-ложак з мяккаю і лёгкаю пярынаю, залацісты таршэр з жалабком-абажурам, чорная настольная лямпа з гэткім жа жалабком ці

шуфлікам, жоўтая шафа, белая тумбачка з кнопачным тэлефонам, мяккае паласатае крэсла, вузкі, умацаваны ў нішу сцяны, стэлажык на восем паліц, абапал якога лаўка-палічка і газетны столік. Як бачу, нямецкія дызайнеры паварушылі галавою, каб разумна спалучыць даўніну і сучаснасць.

Учора спатыкаліся з прэзасам Літаратурнага калёквіума, доктарам Ульрыхам Янэцкім, маладым, гадоў сарака, дынамічным, паважным, але і ў меру далікатным немцам. Пасадзіўшы нас за бакавы агульны столік, ён сказаў:

— Мы падтрымліваем малыя народы і іхнія літаратуры, садзейнічаем перакладу твораў з гэтых літаратур на нямецкую мову.

Я падзякаваў, пры гэтым дадаўшы:

— Может не к лицу просвещённой Европе, что она не знает белорусской литературы, но беда, если не трагедия белорусского народа, что иные государства не подозревают о существовании его национальной культуры. Наша общая цель узнать друг друга. Взаимопонимание — это единственный путь к художественному слову и его переводу на другие языки.

Норберт Рандаў сумеўся і марудна, і, здаецца, недакладна, са сваім каментарам, тлумачыў мае гэтыя дзве ці тры фразы.

Пасля полудню аглядалі Берлін, зрабіўшы падарожжа спярша на двухпавярховым аўтобусе, а потым — на электрычцы (балазе, на 65 марак набылі праязныя білеты на ўсе віды транспарту) ажно ў цэнтр горада, што па вясёлай публіцы, патоку машын, рэкламах, выстаўле-

ных на тратуар кветках, жаночых уборах і аранжавых апельсінах нагадваў мне Парыж, нават Елісейскія Палі ў серабрыстых гладкаствольных платанах. Не хапала толькі французскіх рослых паліцыянтаў у прадаўгавата-круглых, з нізкімі туллямі і доўгімі брылямі, дэголеўскіх фуражках.

Я купіў просценькую (ці не школьную?) ручку фірмы «Герліту», здзівіўшыся, што пазалочаныя пеліканаўскія і паркераўскія цацкі каштуюць да некалькі сот марак. За дзесятак пер'евых ручак, глядзі, можна нават прыдбаць патрыманы «Фольксваген», а гарбаценькі дабіты «Трабант» — нават за адну.

Дарэчы, фасонам, канфігурацыяй нямецкая ручка нагадвала мне самапіску, купленую за 40 франкаў дзесяць гадоў назад у асеннім ужо, здаецца, стомленым ад жыцця Парыжы. Розная пара году, розны час — розныя, пэўна, і ўражанні. У Парыжы, можа, болей пекнаты, нават узнёслай вясёласці, затое меней прастору, зеляніны, зацішку для душы. Разбіты, скалечаны вайною Берлін, а пазней разрэзаны пажывому акрываўленай сцяною, па-рознаму і адбудоўваўся і ўставаў з руін абапал гэтай, палітай крывёю сцяны. Адбудаваны дагледжаны Берлін, калі не браць пад увагу шаблонных хрушчоўскіх мікрараёнаў ва ўсходнім прадмесці, своеасаблівы еўрапейскі горад са сваім рытмам жыцця, бойкасцю, кіпеннем натоўпу, чысцінёю, самавітасцю ў цэнтры, усходняй недагледжанасцю на турэцкіх вуліцах і зацішнымі, нейкімі нават утульна-хутаранскімі дварамі і віламі на акраінах. А ў гэтых дварах, як на

нашых скошаных лужках, — чародкі гвіжліва-цвірклівых шпакоў.

За гэтыя зялёныя ў дзяцелінцы, у кветках, у шпалерах парэчкаў, з дагледжанымі і зусім па-вясковаму ацяжэлымі ад пладоў яблынямі і грушамі, атуленыя цішынёю двары і дзядзінцы, за раскошныя паркі са старасвечнымі, так ашчадна і дбайна захаванымі і выпеставанымі дрэвамі, з зялёнымі, роўненька падстрыжанымі лугавінкамі, з трапяткім бляскам ручаін, як дзе-небудзь у нашым гаркавата-разамрэлым алешніку, немцаў, працавітых і рупных, пэўна ж, варта цаніць і паважаць і тое-сёе па-гаспадарску ды па-чалавечы ў іх пераймаць. Вядома ж, лёгка сказаць, уберагчы, напрыклад, у цэнтры Мінска чатырохсотгадовы дуб, калі на нашых дачах гэтакі велікан і прыгажун два ці тры гады назад быў звалены, пэўна ж, за подкуп і са ўсімі даведкамі на тое, што ён дуплявы і небяспечны, работнікамі лясгаса.

З далечыні, з суседскага боку інакш глядзіш на ўсё сваё, але адносна вышэй і шчырэй цэніш яго, гэта сваё — радзіннае ды бацькоўскае.

І ўсё ж да слёз на вачах зайздрошчу Норберту Рандаву, які жыве ў цэнтры Берліна і каля велічных дубоў, роўныя каторым у нас спаткаеш хіба толькі на Высокім Беразе, на святой радзіме Якуба Коласа.

Віла наша стаіць на пагорку, блізка прыгожага возера Ванзэе, і нават са сталоўкі, аблічаванай сіне-белай кафляй, відаць іртутнацяжкае калыханне вады і белыя ветразі,

а наўкруг — бясконцае мора паркаў, дзе пад ружаватымі, прыгорбленымі ад старасці соснамі, разложыстымі дубамі і бурачковымі, ці, праўдзівей, лілова-серабрыстымі букамі ўзнялася готыка вілаў з бастыёнамі і бастыёнчыкамі, з ласкавым колерам чырвонай чарапіцы.

У цэнтр, да станцыі Заалагічны сад, ад нашай Ванзэе шэсць прыпынкаў — паўгадзіны язды. Паязды тут ходзяць даволі марудна і найбольш адкрытым торам: акрамя метро, у Берліне па горадзе ў розных напрамках працягнуліся лініі электрачыгункі. Як памечана на схемах, наклееных нават на дахах вагонаў, лініі S (чыгунка) і лініі U (метро).

Выплаціўшы неблагую стыпендыю і запланаваўшы нашы з Алесем Разанавым інтэрв'ю для радыё і творчы вечар, нам далі два дні на адаптацыю. Прадстаўляць нас будуць вядомы перакладчык і прапагандыст беларускай літаратуры, калі не сказаць, беларускі паўнамоцны прадстаўнік у Нямеччыне Норберт Рандаў і Элке Эрб, паэтэса і вядомая перакладчыца рускай паэзіі. Прыйдзецца нешта сказаць, але ці варта занадта ганарыста надзімацца, каб даказаць, што кляйнерэр еўрапейшэр літаратур і на самай справе — літаратура вялікая.

У Вавенарга я натрапіў на тры цікавыя і жорстка-праўдзівыя афарызмы:

«Ні мудрасць, ні свабода не сумяшчаюцца са слабасцю.

Вайна — і тая прыносіць менш шкоды, чым рабства.

Рабства прыніжае чалавека да таго, што ён пачынае паважаць свае аковы».

Горкая і страшная да адчаю праўда, калі падумаеш пра нас саміх. І мы самі сябе і збоку ўсе чамусьці хваляць нас за пакору, прыгнечанасць, страту нацыянальнага гонару, называючы гэтую рыску дабрынёю, нават інтэлігентнасцю нашай, ласкавасцю і лагоднасцю характару. І мы, па-блазненску ўсцешаныя і спакушаныя гэтай пахвалой, адракаемся ад матчынага слова, спакутаванага пад прымусам, ад роднай зняважанай і знявечанай гісторыі, ад сваёй душы, ад саміх сябе. Не, не ўсе! Вядома, не ўсе. У многіх стогнуць грудзі і баліць сэрца. Як у яго, як у нашага вешчуна Кастуся Каліноўскага.

А за адчыненым акном так шчыра і даверліва шапоча і хвалюецца, пераліваючыся то ружаватым, то сіне-ліловым колерам магутны, пэўна, чатырохсотгадовы бук, а за ім — гэткі ж велічны светла-зялёны дуб з даверліва прытуленаю да яго прыгожаю ліпаю. Сонца, а ў ім серабрыстымі косымі пырскамі мігціць дожджык.

Сіняя хмара сплывае за бурачковыя кроны букаў, колер якіх прымаеш за колер восені, і душа апякаецца першым смуткам.

20.20. Вярнуліся з італьянскага рэстарана, нічога цікавага і смачнага там не паспытаўшы. Знакамітая піца, што каштавала каля дзесяці марак, добра засушаная аладка з маслінамі, памазаная памідорамі, падсмыроджаная грыбамі і падпраўленая галандскім сырам, куды горшая, чым з вуліцы ў Нью-Ёрку.

Бутэлечка мінеральнай вады — каля трох марак, суп з цыбуляй — ажно шэсць.

Адным словам, спалілі 54 маркі, бо сядзелі наўкруг запаленай свечкі. Рытуал просты: перад кліентамі яе запальваюць, з адыходам яго — тушаць. Сядзіш нібы пад грамнічнаю свечкаю, як нябожчык.

Цікавасць ці інтарэс быў хіба ў тым, што прайшлі вуліцаю Маабіт і бачылі чырвона-цагляную, у пяць ці шэсць паверхаў, знакамітую маабіцкую турму, збудаваную крыжам, пасярод якога ўзвышаецца зялёны купал, нібы над святым і велічным саборам. Перад турмою — галоўны трыбунал. Таксама свая зручнасць і выгода.

Турма акружана высокай агароджай з трохгранных рэек, да якіх ад вуліцы прывараны завостраныя паўметровыя гэтакія ж самыя рэйкі.

Турма спатрэбілася і аб'яднанай Нямеччыне — там сядзяць былыя міністры ГДР. Як кажуць, цягаў воўк, пацягнулі й воўка. Але ці звялі логава, каб пасвіліся «мірныя народы», як пісаў знявераны Пушкін, і каб іхняй спадчынай не былі ярмо ды біч?

У вялікім, на два паверхі, кніжным магазіне поруч з бібліямі розных выданняў, коштам ад 16 да 58 марак, кніжкі пра Сталіна — ажно тры, Чэрчыля, Гітлера, Гебельса, Гарбачова і яго Раісу. Хацеў купіць руска-нямецкі размоўнік, але яго не было. Хоць падручныя, кішэнькавага фармату, слоўнікі на ўсіх еўрапейскіх мовах займалі ажно чатыры паліцы. Сярод іх, праўда, не трапіў на вочы з блізкай і чутай мною з дзяцінства — польскай.

Каля магазіна магнітафонаў напаткалі маладога інжынера-электроніка з Кіева: прыехаў у Нямеччыну паўгода назад і работы да сённяшняга дня не знайшоў. І туляецца тут, пры магазіне, і служыць, пэўна, за нейкага зазывалу. Крыўдна і горка за яго.

На вакзалах, пры станцыях, асабліва ўвечары, бачу, збіраюцца ў купы і гурты бойкія цыганы і гаманкая да развязнасці турэцкая моладзь — не прайсці, не абмінуць. Іншы раз проста на сходах з гайнёю сабак ляжаць забрынданыя і апушчаныя ні то алкаголікі, ні то наркаманы, ні то тулягі. Як бачу, распусты ў горадзе нямала. Ровар без нагляду не пакінеш — калі не ўкрадуць, то зломяць. І мы бачылі веласіпеды з пагібанымі ці знявечанымі заднімі коламі.

Серада. 5 чэрвеня. Віла Літаратурнага калёквіума. Ванзэе.

00.05. — яшчэ ўсё мінскага часу.

Светла-малочныя, як поўня, і круглыя, як поўня, ліхтары пад магутным цёмна-зялёным дубам, а над ім, над яго разложыстаю кронаю, — палавіна гэткага самага ліхтара-месяца. На фоне пасвятлелага ўжо неба.

Высвіствае, прачнуўшыся, тутэйшы чорны дрозд.

Праз цёмныя раскалыханыя платаны, па якіх прабег першы ранішні вецер, прасочваецца светла-ліловае неба — там збіраецца ўзысці сонца.

І там, за вялікаю, як цунамі, хваляю прысад, зазвінеўшы, прагрукатала першая, нібы стомленая пасля ночы, электрычка.

Успомніліся нашы зялёныя пералескі, ружаватае ці ліловае роснае жыта, сенажаць у светла-ружовым вобаратніку, не густы, з дробным яшчэ лісцем, алешнік над рэчкаю, хваёвы лясок з ляшчанаю дарогаю, з шорскім калматым верасам.

Гарбаты светлавухі заяц нехаця пераскоквае загоны з нізенькаю, што толькі ўгледзелася, бульбаю.

Пішу і чую, што душа прагне вярнуцца да забытых даўніх і светлых дзён ці ранкаў пад гэтаю ясна-малочнаю палавінкаю месяца, што паспеў схавацца за рамаю акна.

Успомніўся ўчарашні вагон са спісанымі фламасцерамі белымі перагародкамі кабін, карычневых мяккіх лавак, смуглыя няголеныя і даўганоса-кучаравыя бадзягі з бляшанкамі піва, і далікатныя школьніцы ў джынсавых касцюмчыках — бялявая, з тонкім прыгожым тварам немачка і чарнявая, з лікам дзевы Марыі, яўрэйка.

У немкі светла-русявыя, густыя, як у нашай Ядзі, валасы, тонкі і ледзь задзірысты носік, у яўрэйкі валасы цёмна-кучаравыя, носік прамы і надзьмутыя, з апушчанымі куточкамі, вусны. Поруч з імі — маўклівая з непрыгожым тварыкам і быстрымі вачамі драбнаватая, як здалося, славянка. Яна маўклівa і нават злосна заціналася, нібы чула ўсёю істотаю, што яна непрыгожая...

Узарваўся, мільгануў чорным ценем уніз недзе з-пад застрэшка нашай вілы імклівы стрыж і ў каламутную са светла-зялёнымі кутасікамі елку злятаюцца, падаюць, такса-

ма з паддашку вілы, цвіркатлівыя вераб'і.

Залаціста-ружовы ўсход за цёмна-бурачковымі, прасвечанымі букамі, а з захаду — цішком пацягнуліся невысокія лілова-дымныя хмаркі — ізноў, як учора, перагонамі пральецца лівень.

Куст рададэндрану ў пышным ружовым суквецці цяжка наваліўся на дах цаглянай прыбудоўкі з зіхатліва-белымі да першароднасці вокнамі.

Чытаю зноў Вавенарга, адзіную кніжачку, якую толькі ўзяў з сабою.

«У самых першых на зямлі пісьменнікаў яшчэ не было ніякіх прыкладаў... Тыя, хто прыйшоў ім на змену, дасягнулі поспеху, скарыстаўшы адкрыцці ці вынаходствы папярэднікаў...»

Што было ў нас, прыгнечаных спакон веку, хіба асветнік Скарына? Ён вярнуўся на Бацькаўшчыну, каб несці прамень святла, праўды і навукі. Астатнія, як, для прыкладу, Сымон Полацкі, уцякалі з Бацькаўшчыны, каб сваю навуку і веды аддаць іншым.

Тое ж самае зрабіў Адам Міцкевіч: на ніве польскай культуры ўславіў, усхваліў сваё ўласнае імя, нібы забыўшыся пра той народ, з якога ён выйшаў і сярод якога ўзрос. Ён служыў не народу, а дзяржаве ці, дакладней, палітыцы, да якой імкнулася дзяржава, напрыклад, старая Польшча, і на якую рукою генія ўзваліў магільны камень.

Яго ж, напэўна, прываблівала дарога, працярэбленая папярэднікамі, а нашыя ж Багушэвіч з Купалам усё чэрпалі з саміх сябе, і та-

му іхнія творы, праўда, няроўныя, часам слабыя, але разам з тым, як слушна заўважае Вавенарг пра тых самых першых, поўныя боскай геніяльнасці.

Чацвер. 6 чэрвеня. Учора разам з Норбертам прагуляліся па нашай Сандвордэрштрасэ, і я не столькі любаваўся размаітымі па сваім стылі, дамавітасці, дагледжанасці і акуратнасці тутэйшымі віламі, колькі ўсюды да бяспамяцтва захапляўся мілымі мне з дзяцінства хвойкамі. А яны тут крываватыя, прыгнутыя азёрнымі халаднаватымі вятрамі, выглядалі велічна, як на даўнейшых нашых гасцінцах ці на палявых межах. І якраз яшчэ цвілі.

Каля выштукаваных жалезных ці драўляных брамаў з ліхтарамі ў стылі рэтра шыкоўныя цёмна ці сіне-перламутравыя «мерседэсы» ці «фольксвагены» аддана і цярпліва чакалі сваіх гаспадароў.

Над брамамі люстры, як экран манітора, каб з дому ўбачыць тратуар і таго, хто падыдзе ці пад’едзе да брамы.

Каля адной, поруч з невысокай развесістай грушай, дагледжаны і выпеставаны ядлаўцовы куст, высокі і густы, як кіпарыс. І мне зажадалася мець і бачыць гэткі самы перад нашым дамком на Валоўшчынскай дачы.

Між старых, пазелянелых у камлях ад цяньку і вільгаці высокіх буках, ліпах і зрэдзь бярэзінах, падсаджаныя гонкія дзесяцігадовыя клёнікі, абапал якіх убітыя трохметровыя калкі і падсыпана ружовая кара.

Прыватны шпіталь займае будынкаў шэсць ці сем, што стаяць з абодвух бакоў вуліцы, а ў

канцы яе, за круглым пляцам, — дом для састарэлых.

Усюды агароджы, нават драўляныя — ромбікамі, цэментныя ходнікі і зялёныя газоны, усюды чысціня, калі не лічыць вуліцы, загаджанай сабакамі.

21.00. Сёння пехатою абхадзіў паў-Берліна, ажно гудуць, як тэлеграфныя слупы, натруджаныя ногі. Спярша выставачная зала «Пульман», потым універмаг каля заалагічнага саду, падарожжа на другім паверсе аўтобуса і хадзьба недзе ажно ў прадмесці, заселеным туркамі, потым Альт-тэмнельгоф, потым Лейнэштрасэ, нарэшце Аляксандрпляц, на якім зноў пяціпавярховы універмаг, дзе я збіраўся купіць пер'евую ручку «Пелікан», але цана 114 марак спыніла мяне...

Дарэчы, каля выставачнай залы, што збудавана ў найноўшым мадэрным стылі (гіганцкі будынак нагадвае сваімі контурамі электравоз ці дызель-поезд), напаткаў літоўца, які прывёз на выстаўку-продаж тварэнне айчынных рук — мэблю і дываны, аднак кантрактаў падпісана мала: тавары, як кажуць сучасныя бізнесмены, не канкурэнтаздольныя. А што на сусветным рынку прапануем мы, беларусы? Калійную соль, аўтакары, трактары, станкі, лён?.. Ці вытрымаем канкурэнцыю з замежнымі фірмамі?

Пятніца. 7 чэрвеня. Прачнуўся ў пяць — разам з усходам сонца. У такі час і не пазней усё жыццё ўставала маці. У маладыя гады замуства яшчэ і прала (зімою, вядома) да гадзіны ночы, паклаўшы нас, малых, спаць, а ра-

ненька ўстаўшы, зноў садзілася за прасніцу.

Учора, абыходзячы бясконцыя шэра-светлыя карпусы невядомай фабрыкі, натрапілі на пляцоўку, агароджаную сеткай, з шыкоўнымі, па-шчупачынаму лычаватымі і па-святочнаму бліскучымі «мерседэсамі», выстаўленымі на продаж (кошт на лістках, прыклееных да шыбаў — ад 40 да 80 тысяч марак), потым ужо прызіраліся да патрыманых, паезджаных, але яшчэ з прыстойным, як гаворыцца, знешнім выглядам «фольксвагенаў», што стаялі проста пры тратуарах у цеснаце легкавых самаходаў, ужо нашмат таннейшых (5—10 тысяч марак), і мне падумалася, як паднялася і далёка сягнула Нямеччына, а яна ж, між іншым, таксама перажыла вайну, голад, развал, карткі на тлушч і хлеб і змагла выйсці з эканамічнага крызісу і дасягнуць такога дабрабыту, які бачыш ва універсальных гандлёвых гмахах — ад іголкі з ніткамі да электронікі, ад шкарпэтак да дзесяткаў фасонаў куртак, плашчоў, касцюмаў. Ажно разбірае злосць ад мноства ўсяго, ад чужога незвычайнага багацця.

Не, вядома, не ўсе жывуць на шырокую нагу, не ўсім шанцуе, не для ўсіх аднолькавы лёс: каля кафетэрыяў, перакусачных, каля ўваходаў у магазіны, на тратуарах, у людных месцах нямала забрынданых і няголеных бадзяг, нямала і рознай басаты нам ужо знаёмых напарстачнікаў, што гуляюць у тры каменьчыкі, накрываючы іх каробкамі ад запалак, нямала зняверыных, адзінокіх, забытых людзьмі і Богам, як нямала беспрацоўных, або людзей з малымі грашамі, як адзін наш знаёмы,

што па інвадіднасці, па хваробе палучае ўсяго толькі пяцьсот марак. Тут наш пенсіянер мог бы горка пасмяяцца, як смяяўся і, пэўна ж, праз слёзы Кузьма Чорны з заходне-беларускага рэвалюцыянера Пестрака, які расказваў пра польскую турму. Чорны пра савецкую, у якой каля года сядзеў, на людзях маўчаў, каб запісаць толькі ў дзённіку, што ў мінскай «амерыканцы» яго білі калом па галаве. Турма і бядота — не лепшае, мусіць, што прыходзіць на чалавечую долю.

Аднак жа ў краіне з такім дастаткам і дабрабытам усё дарагаватае: агульны сшытак — ад 5 да 13 марак, хлеб — чатыры ці шэсць, кашуля, калі модная — 29, уцэненая — 10 марак.

І тут жа на тратуар выстаўленыя з магазіна жывыя, росныя кветкі. А featнакалёрныя латкі гародніны і садавіны: капуста, морква, бульба, трускаўкі, бананы, ананасы, ківі, папайя, апельсіны, лімоны, чарэшня.

Усё чыстае, памытае, расфасаванае...

Нямецкая акуратнасць, ашчаднасць у рабоце, з нязгоршай рысай педантызму. Напісаў «нямецкая», хоць гародніну, звычайна, прадаюць туркі.

Нават мая гасцявая ванна з туалетам акуратна, без ніводнай шурпацінкі, абкладзеная белай пліткай, з чырвона-цаглянымі кранамі, што нагадваюць рычагі якога-небудзь кіравання і з якіх б’е шыпуча-тугі, пяністы струмень вады, гаворыць, што дома ў нас адсталасць. Але пры падобным развале нашай эканомікі, дай Божа, каб яна яшчэ асталася.

Пад сінявата-белым падваконнем пафарба-

ваныя, вядома, з ручкамі-рэгулятарамі калафеферы, што яшчэ сёння падтрымліваюць у маёй келлі жывы дух.

Словам, навізны, прагрэсу тут для мяне нямала.

Гэта пацвярджае і Вавенарг, які разгорнуты якраз на старонцы з дакладным, праўдзівым афарызмам.

«Навізна — адзіная бясспрэчная прыкмета генія».

Ёсць, зрэшты, гэта геніяльнасць у нямецкім народзе.

Пазаўчора і ўчора па-маладому — да позняга вечара весяліўся наш Літаратурны калёквіум, бо ў буфеце, што поруч з зальчыкам на пяць столікаў, дзе мы снедаем, у буфетнай карычневай падкове-прылаўку цэлая батарэя ад высокіх бутэлек мінеральнай вады, аранжу, вінаў, кальвадосу да «русской водки» і яшчэ нейкіх напояў. Пазаўчора тут сустракаліся літаратары Берліна з кітайскімі пісьменнікамі, учора, здаецца, быў музычны вечар.

Сняданак наш у зацішным прахалодным зальчыку, з высокіх вокнаў якога праз шырокі калідор старых дубоў і букаў відаць хмурае, найчасцей пад колер дажджлівага неба Ванзэе, таксама не благі: кава, масла, заўсёды пухка-свежая булачка і хлеб — ці не з вотрубямі? — таксама свежы, невялікі, як кажуць, на адзін галодны глык, талерка з тонка нарэзанымі сырамі розных гатункаў і талерка з гэткімі ж тонкімі, як аплатка, скрылікамі вяндліны, каўбас, зельцаў, паляндвіцы... Вяршок у белым дзюбатым збаночку-малочніку,

цукар, канфіцюры з трускавак ці вішняў і... літар аранжу — абрыкосавага ці апельсінавага напітку.

І каларыйна, і далікатна, і ўмеру ўсяго, і без абжорства.

Нам, беларусам, трэба вучыцца ў асветленай, адукаванай Еўропы, трэба намагацца быць разам з дасведчанымі, працавітымі людзьмі. Як глыток паветра, калі вынырнем з застоенай ціны, нам неабходна эканамічнае супрацоўніцтва з краінамі Еўрапейскай Садружнасці.

Супольная Еўропа, а не толькі супольная імперыя пад першынствам цэнтра — вось дарога ад нацыянальнага ўціску, нэндзы і бядоты, дарога ад махлярства, ашуканства да справядлівасці і дабрабыту, — вось куды павінен паварочваць наш Млечны Шлях, асветлены нацыянальнымі ідэямі.

Але на Захадзе сцвярджаюць: без энергічнай перабудовы эканомікі, без каласальных тэхнічных пераўтварэнняў, без канвертуемасці няма супрацоўніцтва і гандлю. Праўда, ніхто з іх не называе найпершай і найважнейшай перадумовы — рэальнай незалежнасці, эканамічнай і палітычнай.

Няроўнасць маёмасці, сцвярджае Вавенарг, усяго толькі вынік няроўнасці ў адоранасці або мужнасці.

Тым больш, як мне думаецца, у дзяржаўнай незалежнасці.

Няўжо ж будзе праўдаю, што нам, беларусам, Бог не даў мужнасці, храбрасці, а доля не судзіла быць мудрымі і здольнымі, каб саўла-

даць з ворагамі і заваяваць доўгачаканую, высненую ў снах свабоду і незалежнасць?

Няўжо ж мы па сваёй чалавечай годнасці, розуму і адоранасці ніжэй за тых, хто над намі панаваў і пануе, хто няволіў, нішчыў і караў нас?

Няўжо ж не прабіў у векавечныя званы наш час і мы не ўчулі матчына цяпло роднай зямлі, што прыдала б нам сілу і моц, як учулі гэта жывое цяпло за дваццаць гадоў вольнага гаспадарства нашыя даўнія суседзі і падсуседы — латышы і літоўцы? Яны ўжо ведаюць, як нялёгка, але можна адваяваць або вырваць з ласкі чужых рук акрываўленую і спакутаваную свабоду і волю.

Вядома, хто не дамогся і не зведаў светлага шчасця незалежнасці, той найменш цэніць яе, а хто ведаў і спазнаў, той ніколі не адрачэцца ад яе. Гэта папраўдзе так, гэта — нязрушная, як скала, ісціна.

Але зноў бачу, як на роздум схіляе геніяльны француз, мудры спадар Люк дэ Клап’е дэ Вавенарг: «Трэба ўмець скарыстаць і добразычлівую спагаду сяброў, і суровасць ворагаў».

Напэўна ж трэба!

<u>12.00. — берлінскага, 13.00. — мінскага часу.</u>

Здаецца, як дома, у роднай даўняй Варакомшчыне, паспешным і імклівым ланцужком, мільгаючы ў прагалах алешніку, прагрукаў пасажырскі цягнік, і гэтаксама, як дома, над нізкаю белавата-шыфернаю вёскаю са звонам і падвываннем пралапатаў невысокі верталёт. У старых навакольных прысадах залівіста

цвірчыць берасцянка, таксама нібы дома, у суседскіх млява-звіслых бярэзінах ці на густой з шэраю калодаю для пчол ліпе.

З памаладзелай за вясну, убранай у светлыя кутасікі елкі пад маё расчыненае акно вераб'і носяць у дзюбках цэлыя пампушкі мух і камароў, нібы таксама дома — у гняздо пад латамі ў вільчыку страхі.

Малады чарнавусы немец разам з трохгадовым сынком у блакітнай куртачцы папырскаў ужо, цягаючы вужаваты шланг, усе кветнікі каля вілы, і цяпер, прывінціўшы да яго доўгі, нечым падобны на цёмна-зялёную даўнейшую гранату, распыліцель, кінуў яго на зялёны газон пад дрэвамі, і з гэтай «гранаты», паволі пахістваючыся, струменіць радужны і шырокі веер вады. Яе напор пакручвае распыляльнік.

А колькі гэтакіх пісталетаў-распыляльнікаў бачыў я ў гандлёвых магазінах! Брыдка прызнавацца, але ж і іх хацелася купіць.

20.35. — берлінскага часу, прывыкаю ўжо і да яго.

Сцішны надвячорак. За пацямнелым букам, набіраючы хуткасць, пагруквае жалезам, натужна гудзе і імкліва знікае гарадская электрычка. Я толькі што вярнуўся з яе.

У душным вагоне поруч са мною сядзела ажно трое п'яных. Адзін, тлусты і лысы, у акулярах, праўда, спаў у дальшым купэ, у суседнім жа двое п'янтосаў, ад якіх несла, як ад прыбіральні, пілі з бляшанак піва і нешта балбаталі. У бландзіна, што сядзеў да мяне тварам, зарослага рэдкімі доўгімі валасамі, пад правым вокам на шчацэ сінела вытатуіраванае

сэрца, а на левай ноздры, як у мочцы дзявочага вуха, серабрылася дробнае вочка завушніцы і на вуху, як у сапраўднага алеута ці якога астравіцяніна, пацялепвалася металічнае колца.

На паўстанку Грунвальд зайшла маладая пара: дзяўчына з раскалмачанымі і перафарбаванымі ў фіялетавы колер валасамі, у чорным даўгаватым каптаніку і чорных, нібы абцярушаных серабрыстаю лускою, штанах і ён, стрыжаны пад вожыка, з касою ці касмыком за левым вухам і таксама перафарбаваны ў нейкі аранжавы ненатуральны колер. Чаго толькі з людзьмі не вытварыць мода!

Шукаючы выстаўку беларускіх мастакоў, ці не на вуліцы Гётэ натрапіў на антыкварны магазін і купіў дзве старыя зеленаватыя лыжачкі — прага і магнэз збіраць старызну пераходзіць у хваробу.

А выстаўка, якую нарэшце знайшлі ў касцельным доме, расчаравала мяне: пошуку, самабытнасці было мала, як мала было запрэзентавана маладых мастакоў. Аказваецца, не толькі ў выдавецтвах можна перайсці з шасцітомнікам дарогу малодшаму таленту і калегу, а нават каля святога алтара.

Потым гэтаксама доўга шукалі магазін аўтараў: пісьменнікі Берліна стварылі асацыяцыю, каб уключыцца ў гандлёвы працэс кніжкамі, каб вытрымаць канкурэнцыю з сексам і пошласцю і аўтарамі, што пішуць на патрэбу дня накшталт некаторых нашых фальшыва-народных. Дзякуй Богу, пісьменніцкіх званняў у іх няма.

З рускай савецкай прозы на паліцах

пісьменніцкай кнігарні заўважыў усяго толькі раман Рыбакова. Пэўна ж і ў немцаў без выдаткаў не бывае. Аднак за выдавецкую справу паважаць і хваліць іх трэба: так паліграфічна, так прыгожа, эстэтычна і, калі можна так сказаць, інтэлігентна, асабліва паэзію, могуць выдаваць толькі немцы. Ды яшчэ на дзвюх мовах — арыгінала і перакладу, як выдалі, для прыкладу, «Боскую камедыю» Дантэ. І ўважылі гэтым выданнем не толькі яго, а ці не ўсю сусветную класіку.

Субота. 8 чэрвеня. Тры гадзіны ночы. За градою высокіх і блізкіх ад майго акна дрэў святлее неба. Займаецца ранні летні дзень. Расцяжна і смутна, нібы карова ў глыбокую непрытульную восень, зарыкаў паравоз. Але разбудзіў мяне не ён, а падвяселеная кампанія, што падспеўвала, рагатала і енчыла, ідучы нашай вуліцаю на ванзэйскі чыгуначны вакзал.

Цяпер на блізкай, што мяжуе з чыгуначным вакзалам, аўтастанцыі натужна, з падвываннем гудзе аўтобус. У маё акно цягне перагарам бензіну — там даволі бойкая і неспакойная аўтастрада. Асабліва днём і асабліва ў нядзелю, калі з Берліна ў Патсдам бясконцым патокам плывуць звышмодныя аўдзі і мазды і шнурком, як гусі, з гэтакім самым гусіным гагатаннем імчаць на веласіпедах маладыя берлінцы — студэнты і школьнікі. Праўда, іншы раз як з далёкага веку, выпаўзе і пакоціцца брыдка-гаротны Трабант.

У цёмных яшчэ (днём яны серабрыста-бурачковыя) развесістых і ўладарных тут старых буках пачынае высвістваць першы дрозд — той

самы чорны ці, праўдзівей, рудаваты, з жоўтым шылаватым дзюбком.

Дуб, распасцёршы тоўстыя, кручана-мускулістыя, як у культурыста, галіны адпіхае ад сябе гэтыя нахабныя букі.

Між іншым, дрэвы тут усе на зайздрасць вялікія, з шырокімі кронамі і тоўста-неабдымныя ў шурпатых, патрэсканых камлях. І па-нямецку ўшанаваныя нумаркамі — пералічаныя.

Надоечы пазіраў на іх, дзівячыся з іхняй магутнай велічы і хараства, і чамусьці пачало здавацца, што гэтыя дубы і букі ў свой час бачыў і любаваўся імі Гётэ. І ён сам здаваўся гэтакім магутным і велічным, як гэтыя пародзістыя дрэвы. І я злучаў для сябе моц чалавека, моц паэзіі і прыроды, духоўнае і цялеснае, веліч Гётэ і веліч дрэў.

Цяпер я ўжо іначай, з тутэйшага, як кажуць, берага, бачу свайго суайчынніка Адама Міцкевіча і ўяўляю яго візіт у Веймар, каб ушанаваць гонар і талент нямецкага паэта. Мне думаецца, што іх яднала блізкасць прыроды, веліч старавечных берлінскіх і наваградскіх дубоў і ружовых адзінокіх соснаў, хараство і падабенства зямлі, шматкалёрнасць яе фарбаў. Падабенства душаў двух геніяў мусілі з'яднацца.

Мне, грэшнаму, яшчэ падумалася: каб быў паэт роўны Гётэ, я таксама схадзіў бы і пакланіўся б яму. Але я кланяюся зямлі Гётэ, а значыць — таму паэту, якога яшчэ не знайшоў.

<u>16.50. — берлінскага часу.</u> Вярнуўся на вілу Літаратурнага калёквіума поўны дваякіх,

калі не сказаць дыяметральна супрацьлеглых уражанняў: першае — турэцкі кірмаш на пляцы перад Брандэнбургскай брамай — шэрачорнай, закурэлай, нібы сажаю, на гэтакіх жа шэра-чорных калонах, дзе сабралася сённяшняя берлінская бядота — чарнамазыя, няголеныя туркі, што гандлююць кавалачкамі разбітай берлінскай сцяны, савецкімі афіцэрскімі фуражкамі, шынялямі, пагонамі і ордэнамі; другое — блізкі адсюль, усяго цераз скверык, Рэйхстаг — святыня, даўнейшы бляск і гонар немцаў, і іхняя сённяшняя пакорнасць; і трэцяе ўжо — на пастаменце дзве цёмна-зялёныя трыццацьчацвёркі, дзве 122-мм гаўбіцы, помнік воіну ў касцы, з адамкнутым штыком на вінтоўцы, і сцяна з залацістым гербам, каля якой стаіць, шыракавата і па-гаспадарску расставіўшы ногі, дзябёлы паліцыянт у чорнай куртцы, другі, з рацыяй, ходзіць уздоўж жалезнай агароджы каля танкаў.

Можна ўявіць, што было б з гарматамі, танкамі і «воином-победителем», каб не два ўзброеныя паліцыянты.

І, нарэшце, чацвёртае: рынак антыкварыяту пры чыгуначнай станцыі Цiргартэн, на вуліцы 17 чэрвеня, названай у гонар ці, праўдзівей кажучы, у памяць летніх дзён 1953 года, калі гэтымі ж танкамі, што стаяць на п’едэстале, было нялітасціва-жорстка задушана, да крыві растаптана паўстанне берлінцаў.

Дык тут, на вірлівым і гаманкім рынку, пад навесамі, палаткамі, змайстраванымі самімі ж прадаўцамі, — старая, трыццаці- ці нават пяцідзесяцігадовай даўніны мэбля, пачынаючы

ад сталоў, крэслаў, куфраў, або цэлыя тузіны сталовага срэбра — лыжак і відэльцаў — ці стосы фаліянтаў, пераплеценых у саф'ян, гадавікі часопісаў з далёкай вайны, а поруч з усім гэтым — зброя: вінтоўкі, афіцэрскія кінжалы, салдацкія кінжалы-штыкі, клінкі, шаблі і нават жандарскія чорныя каскі.

Дзівячыся на атрыбуты незваротнай даўніны, я ўспамінаў сваё ваеннае дзяцінства, нават па зялёна-злінялым колеры пілотак і мундзіраў прыгадваў вайсковае адзенне нашых варакомскіх хлопцаў, што служылі ў «беларускім войску» ў блізкім ад нас мястэчку Дварэц і былі закатаваны сваімі, тутэйшымі ўжо, з суседніх вёсак.

Апроч бібліяў і касцельных малітоўнікаў, якія збірала і завязвала ў чыстую белую хустку нябожчыца маці, было яшчэ адно маё захапленне — сталярска-слясарскі рыштунак: сякеркі, пілкі, малаткі, торнікі, і тут жа, як на дзіва, вялікі, як падняць, развадны французскі ключ...

Трапілі сюды, вядома, і аклады з царкоўных абразоў і папоўскія крыжы, што ляжалі на сталах перад падазронымі гандляркамі, якія між сабою гаварылі па-руску і, пэўна ж, разам з інкруставанымі скарбонкамі — сувоі льняных ручнікоў, абрусоў, сурвэтак...

У туркаў — найбольш гадзіннікі з накрывачкамі і пяцікутнымі зоркамі на цыферблаце — савецкія, і ўжо свае, першы раз мною ўбачаныя, крывыя турэцкія нажы, выштукаваныя палкі, узорыстыя дываны, і зноў жа —

у немцаў і ў туркаў — савецкія вайсковыя фуражкі з цёмна-сінімі, чорнымі, чырвонымі аколышамі, медалі — нават бліскуча новенькія — «За отвагу», «За взятие Кёнигсберга», «За взятие Берлина». Палявыя пагоны генерала, святочныя залацістыя з двума цёмна-сінімі прасветамі і трыма зорачкамі — палкоўніка КДБ, і процьма суконных, малінавых з літарамі ВВ. І тут жа, быццам па рускім звычаі, бутэлька пшанічнай за тры маркі. Усяго за тры, як, напрыклад, каштуе бутэлька мінеральнай вады.

Я патрымаў у руцэ стары будзільнік і дзве медныя ці латунныя гіры, падумаўшы пры гэтым, што яны прыдаліся б да майго антыкварнага шафкавага гадзінніка (падобнага, між іншым, на цїргартэнскім торгу я не ўбачыў), і, цяжка ўздыхнуўшы, паклаў іх на стол, — не везці ж такі груз за блізкі свет.

А калі вярнуцца зноў да тых двух незабыўных малюннаў — рэйхстага, акружанага турыстамі і іхнімі высокімі, як ласі, і гонкімі, як ласі, аўтобусамі, і гарачага, як мурашнік, турэцкага базару, усяго цераз скверык ад яго, на пляцы перад Брандэнбургскаю брамай, — то яны не толькі здзіўлялі і ўражвалі мяне, і кідалі ў бяздонны вір пачуццяў, і, як на крэсіве, высякалі думкі і лязом ледзянілі кроў.

Але я спярша быў уражаны і збіты з панталыку няголенымі нізкаабслымі туркамі ў нашых заечых шапках з залацістымі кукардамі або ў вайсковых фуражках ці чорных шлемах танкістаў, якія яны прадавалі, снуючы ў кіпучым натоўпе, а пасля з не меншай цікавасцю азіраў рэйхстаг, які адначасна ўражваў, здзіўляў

і расчароўваў сваёй шаракаменнай непрыступнай веліччу, холадам і вусцішнасцю, якую чуеш заўсёды, калі бачыш муры якога-небудзь разбуранага замка.

Прыгожы на даваенных здымках, ён цяпер выдаваў нібы абсечаны, можна нават сказаць, інвалідскі — без купала, без коннікаў, без скульптурных груп на фасадзе, — калі я пазіраў на яго з-пад сетачнай агароджы, якою быў абнесены зялёна-мурожны прастакутнік надрэчнага пляцу. Удалечыні, за гэтым прастакутнікам, за прыцішаным прыбоем парку сваімі па-галубінаму разгорнутымі крылламі залаціста-зырка блішчала з вянком у працягнутай руцэ багіня перамогі Вікторыя.

Ужо з акна электрычкі, з далечыні азіраючы рэйхстаг, чамусьці падумаў: ці ведалі яны, абое тыранаў і людажэрцаў, дзелячы свет, падпісваючы крывавы акт 1939 года, першы — Гітлер, — што будзе спалены і разбіты рэйхстаг, што будзе зруйнаваны яго непрыступны бункер, што чорным абгарэлым карчом будзе ляжаць ён сам, а каля рэйхстага гандляваць-муць жалезнымі крыжамі, якія ён вешаў на грудзі маладым салдатам, якія, калі хто-кольвечы выжыве, то ўбачаць знявечаную, ганебна растаптаную, падзеленымі калючымі дратамі і недаступнымі сценамі родную Нямеччыну, другі — гэтакі ж самы маньяк, Сталін — ці мог прадбачыць і ўявіць, што ў адзін кароткі міг рухне нязрушная сцяна і блытаным павуціннем разарвецца «жалезная заслона», якім аплёў ён найперш самога сябе, каб адгарадзіцца ад усіх, а потым агарадзіць і адга-

радзіць цэлыя народы і кантыненты. Не спадзяваўся, уласна кажучы, не прадбачыў вялікі карыфей, празорац і мудрэц, велялюбна апеты ў кантатах і вячыста ўслаўлены ў раманах і аповесцях, ім жа ўдэкаранаваных сталінскімі прэміямі.

Упалі, разбіліся яго ўласныя помнікі, усюды і скрозь пастаўленыя пры жыцці, раскрышылася непадступная сцяна, з'іржавела «жалезная заслона», што трымала ў няволі, пакоры цэлыя народы і дзяржавы.

Які нечаканы і трагічны фінал для абодвух, якая бясслаўная, ганебная і павучальная гісторыя для іншых! Напісаў «павучальная» і задумаўся. А хто калі вучыўся, хто зважаў на бясслаўны канец сваіх папярэднікаў?

Кожны лічыў і лічыць, што ён пачынае гісторыю і пачынае справядліва, дзеля справядлівасці, карысці і дабра людзей, сваіх і людзей усяго свету.

Думкі мае вірылі, уздымаліся шалёнай гарачынёю, але іх астуджаў выбух бессаромна нахабнага рогату ў суседнім купэ, дзе шалела і дзеразавалася моладзь — хлопцы з выцвілымі грывамі на высока паголеных галовах і дзяўчаты, таксама паголеныя, але ўжо з аднаго боку або з патыліцы. У старэйшага з іх, мо з паўгода зусім не стрыжанага здаравяка, валасы былі завітыя ці ссуканыя ў дробныя коскі, накшталт косак у негрыцянак, і пафарбаваныя ў жоўтазялёны — анілінавы ці што — колер, на ноздры паблісквала крышталікам кнопка-завушніца, а на мочцы вуха пацялепвалася серабрыстая, нібы выцягнутая з блакнота, спружынка.

Мяне ўжо нервавала і непакоіла іншае: пра што думае, чым жыве сённяшняя гарадская басатва — іхняя і савецкая, наезджая сюды, як кажуць яшчэ, навалач, што хрысціць перакрыжаванымі мацюкамі тутэйшую Фрыдрыхштрасэ.

Але што мог думаць ультра-моднік і фарсун з завушніцай на ноздры? І што я мог ад яго патрабаваць? Я толькі ў думках сваіх пажадаў яму: «Старэйце ў цемрашальстве і радуйцеся з грахоў сваіх!» Як казаў нехта са старажытных грэкаў. Казаў таму, што змяніць і перайначыць чалавечы свет не мог.

Нядзеля. 9 чэрвеня.

07.15. — берлінскага часу. Усё пазней і пазней пачынаю садзіцца за металічны жаўтлявы — пад колер сценаў — рабочы столік. На яго ўжо, падняўшыся над букамі, свеціць косае сонца. Напэўна адаптаваўся ў сваёй вузкай келлі, засланай штучным бурачковым дыванам. Азіраюся на гэты вузкі пакой, зрэзаны наўскос чарапічным дахам і абклееньі светла-жоўтымі вуграватымі пенапленавымі шпалерамі.

Дарэчы, рэйхстаг таксама пафарбаваны ці абклеены з сярэдзіны гэтакімі самымі ясна-жоўтымі вуграватымі шпалерамі. У немцаў павага да жоўтага колеру — старажытнага колеру слановай косці. І колеру цёплага лета, спелага збожжа і вячыстага сонца.

Значыць, у «Годзе нулявым» я інтуітыўна, па законах прыроды, маляваў усё ў жоўты колер. «Чужая бацькаўшчына» — шэры. «І скажа той, хто народзіцца» — бела-зімні. «Голас

крыві брата твайго» — зялёны: жыцця і смерці.

На станцыі Ванзэе прагрукаў цяжкім жалезам спешны поезд, і ў маёй душы страпянулася, ажыла і апала нечаканая радасць — убачылася даўнейшая шэра-саламяная Варакомшчына, балотца ў ружовай смолцы і ліловым, злінялым вобаратніку, старыя сухаверхія надрэчныя алешыны (на гэтакія, між іншым, любаваўся тут, у берлінскім парку), а за імі, за надрэчнымі алешынамі — некалі міла-вясёлы, а цяпер — балюча-нясцерпны жалезны грукат цягніка. Цяпер за гэтым звінючым і рытмічным перастукам, як у нас кажуць, за калеяю ляжаць у вечным спачыванні мае бацькі і ўсё старэйшае пакаленне варакомцаў...

Як мала засталося ў роднай старане роднага мне! Адышлі людзі, дрэвы, хаты, даўнейшыя палявыя сценкі і дарогі. Прыйшло, паўстала ўсё новае. Мусіць, праўдзіва пісаў калісьці Пушкін:

*Два чувства дивно близки нам —*
*...Любовь к родному пепелищу,*
*Любовь к отеческим гробам.*

І я шукаю ў ім, у новым, рэаліі даўняга, як шукаю і выглядваю на антыкварным берлінскім рынку рэчы з вайны, з няблізкага, замутнёнага далеччу гадоў дзяцінства і падлеткавай пары.

<u>15.30. — берлінскага часу.</u> Вярнуўся з таго з самага рынку пад палаткамі на вуліцы 17 чэрвеня — прагнаў дождж, — дый нават не ад-

туль, а з Кайзерштрасэ, якою прыблукаў ажно да станцыі метро «Нямецкая опера».

Якая раскошная вуліца, нават са стаянкамі машын пасярод яе, а збоку — чырванаватыя, цаглянага колеру дарожкі для веласіпедыстаў. Як нямала машын, так і нямала ў Берліне веласіпедаў.

Сёння між двума базарамі — адным антыкварным, другім, за аркаю, — дойлідства і мастацтва, дзе напаткаеш не толькі скульптараў, мастакоў, разьбяроў, ганчароў, а нават друкароў са сваім маленькім станком, — лацінаамерыканскі рок-гурт — чатырох смуглявых падобных з твару да індзейцаў, доўгавалосых хлопцаў: адзін з гітараю, другі са струнным інструментам накшталт іспанскай вітуэлы — папярэдніцы гітары, двое астатніх з жоўтымі троснікавымі чатырох ці болей ствольнымі флейтамі. Яны так суладна і весела ігралі і выспеўвалі нейкі мне знаёмы матыўчык, што я міжволі прыпыніўся і заслухаўся. І не толькі я, а нават абыякавыя да ўсяго веласіпедысты. Бесклапотныя хлопцы з дзяўчатамі дык проста садзіліся на тратуар і кідалі на футарал ад гітары, што нібы незнарок лёг у іх ля ног, жаўтавата-бліскучыя пфенінгі і серабрыстыя маркі.

Смуглявых доўгавалосых спевакоў і музыкаў слухаў з любасцю і зайздроснай крыўдаю і гаркотаю — усё думалася, а чаму ж, напрыклад, нашым рок-гуртам не прынесці беларускую песню на вуліцы Берліна?

А рынак антыкварыяту здзіўляў і ўражваў мяне зноў: чаркі, статуэткі, келіхі, званкі, зва-

ночкі, крыжы з распяццямі, табакеркі, люлькі...

20.20. — мінскага часу.

Ціхі, нават нейкі рамантычна-хутаранскі Берлін... Калі, вядома, не ўспамінаць цыганку з дзіцем у прыполе, што сядзела на тратуары, зводдаль вулічных музыкантаў, калі не бачыць там жа, каля пачарнелай аркі, слінкатага, апушчанага п'яніцу з бутэлькаю, а поруч — другога, таксама няголенага, з калматым сівым сабакам на повадзе, калі не ўспамінаць пра брыдкага, гарбаносага, як баран, хлопца з голенаю галавою, на якой дрыжала шчотка бялявых, знарок пакінутых для моды валасоў. Нешта пад даўнейшага запарожца. Аказваецца — не, пад нямецкіх лётчыкаў з першай сусветнай вайны, якіх бачыў у часопісах на антыкварным рынку.

У дзяўчат, па-маладому спрытных і даўганогіх, — найчасцей кароценькія да немагчымага і тугія да немагчымага спаднічкі — чорныя — і чорныя калготкі. У маладзіц, што возяць перад сабою каляскі з дзецьмі, калготы пры джынсавай караткаватай спадніцы ліловаальбо зялёнкававквяцістыя, як даўнейшыя шпалеры. Хлопцы — у парваных на каленях і абрынданых джынсах.

Акуратныя хіба толькі сталыя мужчыны ў светлых, адпрасаваных портках, светлых куртках, а то нават у карычневых ці ясна-шэрых, ці клятчатых касцюмах. І, вядомая рэч, — паголеныя.

Аднак кайзераўскіх вусоў, да якіх нас прызвычаіла літаратура, тут бачу мала, хіба ў

старых гандляроў-яўрэяў ці на тым жа кірмашы ў туркаў.

Чамусьці запомніліся двое старых, зарослых сівымі барадамі яўрэяў і тыя, паточаныя моллю старасвецкія капелюшы, якія яны прадавалі. Смеху варты іхні гандаль — хто ж мог спакусіцца на гэтакую старызну? Які вар’ят?

Успомніўся і той разьбяр па дрэве, маладзенькі немчык, што прадаваў трашчоткі, драўляныя конікі, вазкі і пільшчыкаў, якія нястомна — тут жа прыстасаваныя да століка — цягалі «пілу». Ажно сэрца замірала, калі я з незабытым дзіцячым дзівам пазіраў на гэты неацэнны для мяне скарб — якая кінастужка з даўняй пары пракруцілася ў мяне перад вачыма.

Панядзелак. 10 чэрвеня. Сёння ўночы ўспомнілася Варакомшчына, тыя людзі, што адышлі ўслед за мацераю, старыя і паўвечныя, мае равеснікі і малодшыя за мяне. Я налічыў іх больш за дваццаць. Яны адышлі са сваёю дабратою, як мой бацька, розумам, як маці, злосцю і шкадлівасцю, як сусед-прымак, са штодзённым лямантам і сварбою, як суседка Ганна. І за гэтыя гады паднялося новае пакаленне, вядома ж, з тымі самымі характарам, норавам, павадкамі, выхілкамі, жэстамі, галасам, смехам, усім тым, што перадалося ім ад іхніх бацькоў: працавітасць і гультайства, разбэшчанасць і цнатлівасць, дабрата і помслівая злосць.

Перагортваю даведачны матэрыял Вавенаргавага зборніка, трапляю на прозвішчы Лафантэна і Карнэля і неспадзявана задумваюся: П’ер Карнэль, пачынальнік класічнай фран-

цузскай драмы, жыў з 1606 па 1684 год. На дзвесце гадоў раней прыйшоў на свет, чым бацька беларускай драмы Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. А яго суайчыннік Жан Лафантэн, французскі байкар на дзвесце гадоў апярэдзіў нашага знакамітага адваката і народнага заступніка Францішка Багушэвіча.

Не дзіва, што нам так нялёгка даганяць еўрапейскую літаратуру, узнімацца да сусветнага ўзроўню. Пры нашых здольнасцях і таленце мы, аднак, не ўзышлі на належную вышыню, мы нават, калі сказаць па шчырасці, не дасягалі таго, што было вызначана і наканавана Богам. Усход — з аднаго боку, захад — з другога крыжавалі нас і дзялілі нас, у нас саміх не спытаўшы, як у пакутным адчаі і горкай роспачы пісаў Колас. Разгон «Грамады», ліквідацыя беларускіх школ і гімназіяў у міжваеннай Польшчы, арышты, высылка, а потым павальнае і гвалтоўнае знішчэнне інтэлігенцыі, жорсткая забарона ўсяго беларускага, прымусовая русіфікацыя ў былой Савецкай Беларусі — абярнуліся нечуванай трагедыяй для беларускага пакутнага народа, які ступіў толькі першы крок з цемры да святла. Не дабітая, не дамучаная на Лукішках, не вынішчаная на Салаўках і ў катоўнях НКВД, беларуская інтэлігенцыя гінула падчас другой сусветнай вайны, — яе вынішчалі ўсе — СД, гестапа, спецгрупы НКВД, армія краёва, СМЕРШ, «истребительные батальоны»... і свая ўжо, поўная садызму і сляпое злосці, свалата і брыдота.

<u>20.30. — мінскага часу.</u> З паўгадзіны ці мо

трохі болей, як вярнуўся з горада, але не той блакітнай дарогай, што памечана на схеме метрапалітэна, і што ідзе праз Шарлотэнбург, Вэсткройц і Груневальд, а ружовай — праз Стэглі ці Цэлендорф, перад гэтым доўга паблукаўшы па паўднёвым Берліне і выйшаўшы на Германпляцы, дзе я хаваўся ад шчыра-густога і цяжка-шапаткога, як вадаспад, берлінскага ліўня.

Сёння, як было дамоўлена, Норберт Рандаў звадзіў нас у Штатбібліятэк (дзяржаўную бібліятэку) і пазнаёміў з доктарам Францам Гёрнерам, загадчыкам аддзела Усходняй Еўропы, пад чым, як пасля мы даведаліся, маецца на ўвазе ўся кніжная прадукцыя Савецкага Саюза, усяго паўмільёна адзінак, тысяч дзвесце з якіх займае руская кніжка.

Я спадзяваўся, што тут знойдзецца нямала падшывак беларускіх газет і часопісаў, якія выдаваліся ў Нямеччыне ў час вайны і пасля вайны. Мяне найбольш цікавіў часопіс «Новы шлях», колькі нумароў якога я купіў у Навальні на таўкучцы, знайшоўшы там жа, пры плоце, ажно тры прыгнаныя ветрам чырвонцы. Гэта было, здаецца, восенню сорак трэцяга, бо я набыў яшчэ каляндар на 1944 год.

«Новага шляху», які так спадзяваўся ўбачыць, па бібліяграфічных звестках, нідзе ў Нямеччыне няма. Ёсць «Новы шлях», але ўкраінскі і, здаецца, не адзін. «Мінскер Цайтунг» («Менская газэта»), «Беларуская газэта», «Беларускі работнік» ёсць у Кёльне, у інстытуце сусветнай эканомікі.

Бібліятэка, зрэшты, салідная — 2,5 мільён

тамоў. Дарэчы, часопісы фіксуюцца толькі па назве, як адзін экземпляр за ўсе гады.

Пасля багатых паліц з энцыклапедыямі і даведнікамі па розных галінах ведаў і навукі ў бібліяграфічна-даведачным аддзеле з чытальнай залай на 600 месцаў здзівіў даволі сціплы бібліяграфічны запас Усходняй Еўропы. Мы ж, беларусы, як належыць, па нашай прастаце, абыякавасці ці што, займалі ўсяго дзве ніжнія палічкі з рознай абэцэдаршчынай, сталіншчынай і лжэнавукай.

Як заўважыў Франц Гёрнер, чарнявы, шчуплы, з сарамяжаю усмешкаю мужчына, наш візіт — першы візіт людзей, якія цікавіліся беларускай прэсай — газетамі і часопісамі. Мушу заўважыць, што цікавіўся толькі я, бо майго спадарожніка займала перш за ўсё серба-харвацкая літаратура і Рэрых.

<u>Аўторак. 11 чэрвеня.</u> Учора праязджаючы аўтобусам праз Пляц рэспублікі яшчэ раз убачыў рэйхстаг — шэра-чорны, закурэлы пасля пажару будынак, агромністы і адзінокі. Ён узвышаўся, як руіна.

І яшчэ адна цікавая дэталь з учарашняга дня — дзве шарэнгі веласіпедаў каля акуратна абрэзаных кустоў-шпалераў перад уваходам у берлінскую бібліятэку. Аспіранты і студэнты прыязджаюць сюды на веласіпедах, спалучаючы дзве выгоды — і прагулка цікавая, і, напэўна ж, дармовая. Веласіпеды ў жалезных стойках, як перад сельскім універмагам у нашых заходне-беларускіх мястэчках.

Учарашняя сустрэча з Францам Гёрнерам пацвярджае маю здагадку, што цікавасць нем-

цаў да гісторыі, культуры і мовы малых народаў, куды яны залічылі беларусаў, а, можа, нават украінцаў, абымае куды больш шырэйшыя інтарэсы — несці гэтым самым і распаўсюджваць сваю культуру, мець свой уплыў.

Улічыўшы памкненне і жаданне немцаў, мы, беларусы, маглі б пашырыць сферу сваёй цікавасці. Аднак дзеля гэтай неабходнай справы людзей, адданых і сумленных, у нас мала, дзейнічае нейкае таямнічае жуллё, якое прылашчваецца і прысмоктваецца да беларускага нацыянальнага руху, да нашых ідэй, каб зарабіць долары. Усяго толькі.

Нашы караблі, яшчэ не адправіўшыся з гавані, адразу абрастаюць і абліпаюць слізкімі ракавінамі, як, напрыклад, абраслі ўсе беларускія фонды, таварыствы і асацыяцыі.

Серада. 12 чэрвеня. Учора па запрашэнні спадара Янэцкага з'ездзілі ў рэстаран — зноў жа італьянскі. Праўда, на гэты раз з італьянскай кухняй, рослымі, смуглява-кучаравымі і крывагубымі, як Маякоўскі, італьянцамі-афіцыянтамі.

Стол быў рыбны — сёмга, крабы, стронга, белае віно і гарэлка ці, праўдзівей, лікёр самбуко з зярняткамі кавы і сінім трапяткім агеньчыкам — падпаліў афіцыянт, як калісьці падпальвалі ў нас бенедыктын. Я піў усяго толькі безалкагольнае піва, як і спадар Янэцкі.

Дамовіліся, калі нічога не перашкодзіць (днямі нямецкае радыё перадало аб падрыхтоўцы вайсковага перавароту ў СССР), правесці ў Беларусі дні нямецкай літаратуры, запрасіўшы ў Мінск Ульрыха Янэцкага, Норбер-

та Рандава і Элке Эрб. Кантакты берлінскіх і літоўскіх літаратараў ужо ўсталяваліся, гэтаксама як і нямецка-албанскія.

У горадзе каля вялікіх універсальных магазінаў на тратуарах сядзяць, па-індуску склаўшы ногі і трымаючы на прыполе малых дзяцей, маладзенькія, нібы падлеткі, танкатварыя цыганкі. Большыя рэспусты куляюцца цераз голаў на зялёных, ужо скошаных газонах. Перад цыганкамі, як перад якімі-небудзь прадстаўніцамі дабрачыннага фонду, ляжаць карткі, у якіх абвешчана, дзеля чаго просяць грошы і падзяка за іх — своеасаблівая жабрачая далікатнасць.

У метро каля гарбаносых, густа зарослых чорна-сіняватаю шчацінаю туркаў у чорных неадпрасаваных і памятых касцюмах — бялявыя немкі, пэўна ж, жонкі, з залатымі ланцужкамі і бомамі на грудзях.

Учора такі самы няголены рослы турак па падказцы худзенькай вастраносай немкі дужаю валасатаю рукою схапіў магнітафон, які я разглядаў і наважыўся быў купіць.

<u>20.55. — мінскага часу.</u> Толькі што прыехаў жоўта-чырвонай электрычкай з цэнтра, з Турмштрасэ ў сваю зялёную Ванзэе. Турмштрасэ — вуліца вежы, у якой некалі, відаць, трымалі вязняў. Адсюль і паходзіць наша беларускае слова «турма».

І вось некалькі штрышкоў з той самай «турэмнай» і іншых берлінскіх вуліц.

Трапіўшы сёння ў недагледжаны, занядбаны, з аблушчанымі і закурэлымі сценамі, з ямамі і выбоінамі на тратуарах Усходні Берлін

(раён Панкаў), нібы трапляеш дадому, у занядбаны Мінск, на сваю Карл-Марксштрасэ, у родны двор, запруджаны гэтакімі самымі нікчэмнымі, як тутэйшыя інвалідныя «Трабанты», бруднымі, непамытымі і саржавелымі аўтамабіямі.

Усход і Захад пішу знарок з вялікай літары. Норберт Рандаў кажа, што праз пяць гадоў зраўняецца, усё ўвойдзе ў сваю каляіну.

У немцаў напэўна ж так.

І вось што няўзнак прыкмеціў: усе гандляры трохі разумеюць ці гавораць па-польску, і не толькі ў Берліне, а і ў Парыжы, у Нью-Ёрку. Гандаль — ці не новая нацыянальная рыска палякаў? І даволі брыдкая. Запомнілася бачанае і чутае на вуліцы каля штабеляў кардонных каробак пры танным магазіне, каля гульцоў у карты: «Курва, Тадэк! Пенёндзы пшэграл! Кур-ва-а!»

Брыдка, агідна, сорамна. І за наш славянскі свет, і за саміх сябе. Адкуль і чаму бярэцца лаянка і п’янства, і мора па калені, і «вшыстко едно»?..

<u>Чацвер. 13 чэрвеня.</u> У немцаў нямала непакою і турбот — усюды ідзе рамонт і будоўля: усюды бачыш ажурныя жоўтыя краны — і на чыгуначных станцыях, і каля шэрых маналітаў, і каля старых, абвешаных сінімі ці зялёнымі сеткамі, дамоў.

Падфарбоўваюць, падмазваюць, падлізваюць, перакрываюць светла-чырвонаю чарапіцаю старыя дахі, акуратненька — камень да каменя — і нават з узорам брукуюць тратуары. У кожны доме ззяюць свежаю фарбаю бе-

лыя вокны. Па-святочнаму прыгожа і ўрачыста. Якога колеру ні быў бы дом — шэры, чырвона-цагляны, — у кожным першароднa белыя, зіхатлівыя ад чыстаты вокны.

Смецце ў зялёных цэлафанавых мяхах выносяць на тратуар, каб яго магла забраць машына-сметніца.

Учора наша клапатлівая і працавітая прыбіральшчыца, між іншым, адна на ўсю трохпавярховую вілу, паставіла ў маім пакоі новы чорны таршэр, каб усё было пад адзін стыль — лямпа, стол, таршэр і мой новы «Кроўн», які ўключаны на кароткую радыёхвалю, дзе ўперамешку з нудна-дзелавымі навінамі гучыць сучасная эстрадная музыка.

Гэта куды цікавей, чым нашы рэпартажы з сесіі, адкуль звычайна чуецца непісьменна-руская з дамешкам беларускіх слоў правінцыйная гутарка, ці звесткі пра штодзённыя надоі і ўмалот. А ўмалоту ж мала, хоць нашае, беларускае, сялянства не сядзіць, набожна склаўшы рукі.

Пазаўчора і ўчора заходзіў, праўдзівей будзе сказаць, спускаўся на эскалатары ў шыкоўныя халаднаватыя гастраномы, што знаходзяцца амаль спрэс у ніжэйшых, падвальных памяшканнях пяці — альбо чатырохпавярховых — абавязкова з эскалатарам — гандлёвых гмахах. І чаго толькі няма ў сыравата-халодных нямецкіх гастраномах, якіх толькі не пабачыш гатункаў вяндліны, каўбас, хлеба, сыроў, канфіцюраў, кавы, цукерак, вінаў, лікёраў...

А ў што ж ператвораны нашы падвалы?

У бруд, у кашачыя лежбішчы, у смуродныя прыбіральні. Такой азіятчыны, дзікунства, недагледжанасці, як у нашых дамах, мусіць, нідзе няма. Скрозь нейкае жабрацтва, нэндза, непрыхаваная бядота і беспрытульнасць. І самае што ні ёсць горшае — абыякавасць. Абыякавасць ва ўсіх і да ўсяго...

Сёння наведалі карцінную галерэю. З усіх імпрэсіяністаў найбліжэйшым мне як быў, так і застаўся Клод Манэ. Пікасо здзівіў хіба сваім доўгім векам (пражыў дзевяноста два гады).

Пры галерэі — кніжны магазін, а там — столькі кніжак па мастацтве, што душа замірала ад зайздрасці: Гоя — 120 марак, «Дрэздэнская галерэя» ў двух тамах яшчэ танней, унікальнае выданне — гісторыя мастацтва ў дзевяці тамах — 200 марак.

Пятніца. 14 чэрвеня.

Сёння, ды не толькі сёння, нам на сняданак падалі сыры, сыркі, укручаныя ў фальгу, і сырочкі, і малако ў баначках-сотах — усяго на адзін раз забяліць каву. Разумная эканомія.

Гледзячы на ўсё гэта, хочацца сказаць: каб жыць у дастатку, трэба скупіцца і ашчаджацца. Багацця без ашчаднасці не бывае.

Ад учарашняга дня ў памяці застаўся рыжавата-няголены акардэаніст, што, паклаўшы кепку перад сабою, сядзеў каля шкляных дзвярэй універмага на сваім, мусіць, прынесеным з дому табурэціку і іграў даўнейшыя факстроты. І флейтыст, малады рослы хлопец, чамусьці таксама няголены, у чорным святочным касцюме з чорнаю флейтаю ў пераходзе метро перад эскалатарам і сходамі. Гэты па-сапраўдна-

му стараўся, пакалыхваючыся і плаваючы локцямі — і ў футарал ад флейты, што ляжаў на цэментнай падлозе, сыпаліся пфенінгі. У акардэаніста кепачка пуставала.

Каля метро, каля людных месцаў — падземныя, а то часовыя вагончыкі-туалеты, і, дарэчы, бясплатныя. Платныя хіба ў метро і ў вялікіх універмагах. Здаецца, амерыканцы заўважылі: які туалет, такая і краіна.

На нямецкай хвалі (іншай не знайшоў) праз кожнае слова ў хрыпатага дыктара Ельцын—Гарбачоў, Гарбачоў—Ельцын.

Пакуль мы з Норбертам Рандавым 118-ым маршрутам дабіраліся з Ванзэе ў Даглен Дорф, азіраючы з другога паверха высокага аўтобуса, які з прысадзістых дубкоў збіваў жалуды, святочна-лагодны і зялёны Берлін, я дзівіўся, і ўжо не першы раз, з той дбайнай пашаны і павагі, якая ёсць у немцаў да травы, кветак і дрэў.

А ўжо ў Даглен Дорфе мяне зачаравала эпоха Адраджэння, нямецкі жывапіс, геніяльны Альбрэхт Дзюрэр і не толькі ён. Мы прайшлі ўсяго толькі два паверхі унікальнага музея. І я зноў захапляўся веліччу, разумнасцю, працавітасцю немцаў. Што рабілі мы, беларусы, ці па-старадаўняму літвіны, на пачатку 16-га стагоддзя? Будавалі замкі, пісалі, вядома, палотны, не пакінуўшы свайго Дзюрэра. А, можа, усё ж ён быў? Была ж у нас Літоўская метрыка — кнігі дакументаў Вялікага княства на беларускай мове, быў сусветна вядомы юрыдычны помнік — Літоўскі статут, быў ужо святы касцёл, а ў ім — алтары.

Няўжо мы не распісвалі алтароў, крыжовую дарогу Хрыста? Вядома ж, распісвалі. Святы Божа, дык дзе ж беларускі Дзюрэр?

На вуліцы напаткаў чародку дзяўчат-падлеткаў у шэрых лёгкіх плашчыках, як ходзяць усе тут, і ў белых шаўкавістых хустках — турчанкі. Большая сярод іх, прыгожая, хавала пад насунутай на лоб хусткай свае чарнява-агністыя вочы.

У многіх берлінцаў, як прыкмячаю, чорныя вочы. Сінія дык зусім рэдкасць. Найбольш шэрыя, як на палотнах у Дзюрэра, бо яго папярэднікі — незнарок заўважыў у музеі — малявалі карыя вочы. Можа, гэта звязана з міфалагічнымі персанажамі? Але ж твары ў іх, і нават у Хрыста, яшчэ не кананізаваныя, звыклыя твары звыклых людзей, якія бачыш і сустракаеш у метро альбо на аўтобусным прыпынку.

А сёння доўга разгадваў, успамінаў і прыпамінаў прозвішча нашага местачковага чалавека, да якога так быў падобны дужы, кірпаты і ружовашчокі немец, што, зайшоўшы ў вагон, цяжка сеў насупраць мяне. Тое ж самае надоечы адбылося з туркам, чарнява-сівым і кучаравым, які ўвесь час, пакуль мы ехалі разам, нагадваў мне нашых местачковых Мурзічаў, як падказвае прозвішча, далёкіх беларускіх татар, хоць пішуцца яны, вядома, беларусамі.

А днямі дзве смуглявыя, валавокія маладзіцы, акуратненька, зграбна і чыста апранутыя ў плісіраваныя спадніцы і белыя блузкі, што зайшлі ў вагон, так ужо выразна нагадалі мне нашых вясковых матрун і вольгаў, што

міжволі з ніякаватасцю падумалася: колькі ж у нас, у беларусаў, сапраўды чужое крыві?

Субота. 15 чэрвеня. Ментолавы ці мятны пах зубное пасты вярнуў мне першыя дні ліпеня сорак першага года, калі мы, дзеці спаленай вёскі, пабеглі на поплаў да надрэчнага алешніку, адкуль раненька выбраўся, пастаяўшы сутак трое, конны абоз, і там падымалі пляскатыя цынкавыя цюбікі — яны, здавалася, пахлі, як цукеркі, — і не ўсе мы ведалі, што гэта была звычайная зубная паста. Помню нечы крык: «Не еш — атрута!» і голас у адказ — ужо знаўцы: «Гэта — мазь, зубы чысціць». Гаварыў нашмат старэйшы за нас Коля Рак, які ўжо абышоў ажно двойчы алешнік, спадзеючыся знайсці ў кустах, як і яго сусед, забыты салдацкі веласіпед.

Успамінаецца, паўстае вайна, а ўслед за ёю і пытанне: дзе ж цяпер тыя немцы-абознікі, што стаялі каля пажарышчаў імі ж спаленай нявіннай беларускай вёскі? Нехта з іх, прайшоўшы вайну, усё яе страшнае пекла, цудам і дзівам застаўся жыць і цяпер, нямогла падымаючы руку, даючы знак шафёру, каб хвілінку счакаў, ледзьве сунецца хворымі старэчымі нагамі да нашага двухпавярховага аўтобуса.

Між іншым, так і падумалася, калі на прыпынку ў нялюдным, па-правінцыйнаму зацішным Стэгліцу, што перакладаецца на просценькае — Шчыглы, да аўтобуса спяшаўся нямоглы, ссутулена-сівы мужчына.

Сёння нечакана для самога сябе на пероне нашай станцыі Берлін-Ванзэе заўважыў мноства немаладых, сухарлявых, з пышнымі ад

завіўкі валасамі — папраўдзе, як пух дзьмухаўцоў, — яшчэ шпаркіх і ружовашчокіх не па гадах немак і міжволі падумаў: глядзі, колькі адзінокіх кабет, бо ніводнага дзядка з імі. І ўжо з гаркатою ўдакладніў: яны, іхнія мужыкі, іхнія любыя і нялюбыя, засталіся недзе там, далёка за маёю спаленаю Варакомшчынаю...

Серада. 19 чэрвеня. Сёння едзем у Метраполіс, дзе экспануецца сучасны мадэрнізм — чорная панчоха ў чырвонай скрыні. Але мяне цікавіць найбольш фотавыстаўка, прысвечаная 50-годдзю другой сусветнай вайны. Што ж самі пра сябе пакажуць немцы? Няўжо будзе хітранька прыхавана і затушована праўда, як гэта звычайна робіцца ў нашай дакументалістыцы? Але ж ці толькі ў нас? Бо нават Нюрнбергскі судовы працэс — тая ж аднабокая палітыка, тая ж паўпраўда аб вайне.

Чацвер. 20 чэрвеня. Не ведаю, што сказалі б мацяркі тым сынам, якія апранулі чужую вайсковую форму — варожую — удакладнім. Прыгадваюцца толькі словы «роднага бацькі»: «Палонных у нас няма!» А яны былі, ды яшчэ колькі іх, ды яшчэ ў чужых мундзірах. Я іх бачыў сам і ўчора глядзеў зноў, толькі ўжо на фотаздымках, наклееных на стэндах усё ж такі унікальнай фотавыстаўкі. Поруч з Андрэем Уласавым, высока-сутулым, губатым і падслепаватым, бо ў акулярах, — Браніслаў Камінскі, падобны да местачковага хлюсціка ці фраера, і поруч з апошнім — салдат-ад’ютант, як і ўсе яны, у нямецкай форме са знаёмым мне шаўронам на рукаве — «РОНА».

П’яных да бяспамяцтва ад атручанага сінім каменем ці карбідам местачковага самагону, у абношаных нямецкіх шынялях ронаўцаў, я бачыў у нашым мястэчку з разбітымі, разрабаванымі ўжо яўрэйскімі хатамі. Як праўдзіва прыкмеціў Талстой, апісваючы разбураны набегам каўказскі аул, нянавісці да гэтай салдатні не было, апроч «отвращения, гадливости и недоумения». І быў яшчэ страх перад іхняй нечалавечай жорсткасцю.

22.10. — на гадзінку пазнейшага мінскага часу.

Між двума высокімі букамі, між іхнімі раскідзістымі кронамі — невысокі жоўта-чырванаваты месяц, што бярэцца пад поўню.

Такі самы, як пяцьдзесят гадоў назад, калі ён пагодным чэрвеньскім надвячоркам затоенаціха зазіраў да нас у яму з сыпкімі пясчанымі сценамі, дзе мы збіраліся начаваць пасля таго страшнага дня 30 чэрвеня, калі была расстраляна запальнымі снарадамі і згарэла датла наша Варакомшчына.

Яму, рыхтуючыся ўжо да бяды, выкапаў і настоліў бацька. Але яго ў той вечар з намі не было. Зранку ён пайшоў у мястэчка, адкуль ужо не вярнуўся, як не вярнуліся дадому многія варакомскія мужчыны — іх арыштавалі немцы і разам з местачковымі яўрэямі далучылі да палонных савецкіх саддат.

Раз за разам усхліпваючы, маці адзінока гаравала, а нам, дзецям, было нават весела і нова ляжаць на старых уцалелых каптанах у чуйнахаладнаватай яме і бачыць у прагале дрэў залацістую раўнадушную поўню.

Поруч пад старымі яблынямі ў гэтакіх самых выкапаных і настоленых ямах вялікаю, можа, на душ дзесяць, сям'ёю клаліся спаць Амяльянавыя, далей, з няменшай колькасцю дзяцей, Міхалавыя. Чуўся нават дурнаватараспусны хлапечы рогат і дзявочы нястрыманы смяшок, а потым злосны вокрык бацькоў.

На грудку, праз вуліцу, за абпаленым бэзам і пачарнелымі абгарэлымі бярэзінамі курыліся і смуродзілі сінім нізкім дымам яшчэ гарачыя пажарышчы з белымі горна-адзінокімі печамі...

Чырвоны прыгожы двухпавярховы дамок з байніцамі, з вострым гатычным дахам, з белымі вокнамі, а за ім — зялёныя прысады, залацісты месяц, а пад гэтым месяцам — глухавата-далёкі перастук берлінскай электрычкі...

Таксама нібы дома, але ўжо ў цяперашнім часе.

Ці думаў той васьмігадовы хлопчык, што клаўся спаць у яме пад светлаю поўняю, што ўбачыць яе роўна праз пяцьдзесят гадоў з невядомага яму Берліна, а хіба спадзяваўся, мог уявіць сабе і нямецкі салдат, што нехта з пагарэльцаў апыніцца ў яго зялёнай прыгожай Ванзэе з чырвонымі дагледжанымі віламі — кожная на свой манер, кожная пад стыль і густ гаспадара, — і ўспомніць спаленую вёску і сябе малога, што спаў у даўнейшай картапляной яме, асвечаны поўняй.

Аўторак. 25 чэрвеня. Учора творчы вечар у зале з белаю мармуроваю каланадаю, з цёмна-карычневаю, пад колер каштана, столлю з

келіхамі-плафонамі і ружова-сінім прыгожым небам за высокімі тыльнымі вокнамі. І, дарэчы, з сухім вінам...

Было чалавек дваццаць. Уважлівыя твары дзяўчатак і хлопцаў. Усё, здаецца, як дома. Толькі высокія прычоскі хлопцаў пад даўнейшую польку, пад афіцэраў часу вайны напамінаюць, што перад табою немцы. І ў тагосяго не нашая манера сядзець, як сядзіць моладзь у электрычцы.

Рандаў чытаў у сваім перакладзе «Салодкія яблыкі». Зашмат, ажно 16 старонак. Але слухалі ўважліва...

<u>Пятніца. 28 чэрвеня.</u> Зноў жа тым самым 118 маршрутным аўтобусам праехаў зялёны, прыхаваны лістотаю дубоў, ліпаў і клёнаў нейкі рахманы і зусім ужо, здаецца, асвойтаны Берлін і зноў вярнуўся на вілу з адчуваннем прыніжанасці і сораму.

З Норбертам Рандавым наведалі Інстытут даследаванняў Усходу — Славішэс Семінар, дзе ў даволі грунтоўнай бібліятэцы з добрым запасам энцыклапедыяў, слоўнікаў, лексіконаў, даведнікаў я натрапіў зноў жа на самую бедную колькасць кніжак — беларускі аддзел. На паліцах не было ні «Полымя», ні «Маладосці»...

Салідна і важна прадстаўлена польская літаратура. Некалькі паліц займае прыгожа пераплеценая «Культура» — польскі эміграцыйны часопіс.

У літоўскім аддзеле знайшліся выдадзеныя ў Празе — мы ўсе ёй павінны пакланіцца! — і Кёнігсберзе (чамусьці готыкай) «Новы запа-

вет» (1865, 1866) і Данелайціс (1869). І што ж ужо скажаш пра нас, пра ўсе выдавецтвы і ўсіх перакладчыкаў, калі мы да сённяшняга дня яшчэ не перавыдалі «Новы запавет». Балазе, можна купіць таронцкае выданне.

Пішу не толькі з адчаем, а нават з асцярогаю — па-нямецку яшчэ не выходзіў Янка Купала. А цяпер, каб выдаць беларускую кніжку, патрэбны і аўтарытэтны паэт-перакладчык і выдавец, які ўзяў бы на сябе ўвесь кошт безганарарнага выдання. А ці знойдзецца такі самаахвярны паэт і выдавец? Кожнаму трэба жыць.

Субота. 29 чэрвеня. Усю ноч — буралом, усю ноч — густы, вадаспадны шум раскалыханых дрэў. І ўсенькая ноч з трывожнымі снамі, з частым прачынаннем.

Тут, у няблізкім ад дому Берліне, з блізкай і чыстай радасцю вычытваю і выпісваю родныя беларускія словы. Учора з Норбертам Рандавым знялі з паліцы ў бібліятэцы Славішэс Семінар салідны томік запісак Інстытута Беларускай культуры. Каларытныя, не збітыя яшчэ, не сцёртыя да медных танных грошыкаў родныя словы пад настрой мае душы, што знебылася ўжо па доме. Парывісты вецер і быстры, ледзьве згледзіш, лёт стрыжоў, што пакідаюць на падваконні смутны цень, — усё таксама, як дома, у мінскім двары.

Не ведаў, што менавіта абгарэлы (толькі дзе абгарэў?) экземпляр «Вянка» натхніў Максіма Багдановіча на балючыя, апавітыя горкай надзеяй, ужо астатнія радкі, на вядомы «чатырохверш»:

*У краіне светлай, дзе я ўміраю,*
*У белым доме ля сіняй бухты,*
*Я не самотны, я кнігу маю*
*З друкарні пана Марціна Кухты.*

Тут жа паведамляецца пра архіў Вацлава Ластоўскага ў Заходняй Беларусі, дзе маюцца быць рукапісы Багдановіча.

Што і каму вядома сёння пра гэты унікальны архіў? Быў разрабаваны, згінуў у вайну ці проста змарнаваўся?

20.30. — берлінскага часу. Сёння зноў быў у рэйхстагу недзе паміж 14 і 15 гадзінамі, азіраў фотавыстаўку, прыглядаючыся да знаёмых экспанатаў і нават для пацвярджэння свае памяці запісваючы, якая форма была ў чыгуначнікаў і якога колеру былі мундзіры і каўняры. І зноў сімвалічна — у гэтую пору і якраз 30 чэрвеня, роўна пяцьдзесят гадоў назад, гарэла, расстраляная запальнымі снарадамі наша Варакомшчына.

Пад нялёгкім уражаннем крывава-балючага ўспаміну я двойчы і наўкруг абышоў карычнева-светлы ці мо праўдзівей охрысты ў цёмных разводах яшчэ не сцёртай сажы вайны двойчы спалены рэйхстаг. Абышоў не з помстаю, не са злосцю, а з чулай чалавечай памяццю, якая павінна і мусіць даравацць дзеля супольнага дабра і шчасця. Як я ні імкнуся, ні намагаюся вярнуць даўняе, але ж чалавечы час не павінен спыняцца. У трыадзінстве Слова, Свабоды і Духу мусіць быць яшчэ Розум.

Панядзелак. 1 ліпеня. Учора развітаўся з Берлінам. Пад мілагучныя званы, што спадалі

ўзнёслым водгуллем на мяне, на пахучыя цёплыя ліпы, увайшоў у Марыен Кірхэ — велічны старадаўні касцёл з пазелянелым каля яго помнікам Марціну Лютэру.

Пад белымі перакрыжаванымі скляпеннямі ўрачыста гучаў арган, за ім — мужчынскія і жаночыя галасы, а потым — суладны хор. Выконвалася кантата Баха. Людзі заходзілі, бралі са століка малітоўнікі з праграмкай і садзіліся на лаўкі ў светла-гулкай кірсе, на сценах якой вісела ўсяго некалькі абразоў, перад алтаром, без балясак, недалёка ад амбона, які сцераглі два вялікія крылатыя анёлы, свяцілася залацістымі лямпачкамі ўсяго адна жырандоля.

Прысеўшы зводдаль ад усіх на карычневую лаўку, я прыслухаўся да бурнага, дэманічнага вадаспаду гукаў. Душа замірала і ўзвышалася. Душа ляцела ў нашыя занядбаныя, забытыя людзьмі і Богам касцёлы, дзе яшчэ па-сапраўднаму не можа ўзнесці хвалу небу ні наша мова, ні наша музыка, ні наша песня.

Дарогаю ўжо падумалася, каб ажыў наш касцёл, яго белыя сцены і вітыя калоны, яго мілагучны арган, каб ажыла, узвілася агністым полымем таямніча-велічная старадаўняя музыка — патрэбны сённяшнія людзі — дырыжор, арганіст, салісты, аркестр, хор, зрэшты, патрэбна чым найхутчэйшае адраджэнне ўсёй нацыянальнай культуры. Беларусам патрэбна самаахвярнасць.

Гісторыя ажывае ў сучаснасці, а сучаснасць — у гісторыі.

Шкадаваў, вядома, што я быў адзін і не было з кім падзяліць сваю нядзельную радасць.

Успаміналася нябожчыца маці. Чамусьці хацелася бачыць за карычневымі лаўкамі, што былі пастаўлены трохі наўскос, каб можна было павярнуцца да хораў, менавіта яе, да канца дзён сваіх шчыра набожную маці.

З учарашняга дня запомнілася і такое.

Стоячы над берагам нешырокай, куды вузейшай за наш наравісты і быстры ў Гародні Нёман, увабранай у каменныя берагі Шпрэе, дзе марудна сунуўся белы кацярок, я разам з усімі ўзіраўся на другі бок яе, на белую, вышынёю ў метры чатыры, да канца не зламаную берлінскую сцяну, што служыла цяпер агароджай японскай фірме «Таёта». А павярнуўшыся назад, тварам да шэра-жоўтага рэйхстага, на сетцы блізкай ад сябе агароджы нечакана ўбачыў белыя крыжы з чорнымі надпісамі імёнаў і датаў жыцця, найбольш кароткага, абарванага куляй. Гэта былі імёны тых, хто памкнуўся пералезці ненавісную сцяну, што дзяліла свет на дзве варожыя палавіны. У памяць урэзаўся нечы кароткі, уціснуты ў запамінальныя лічбы — 1921—1961 — чалавечы век. Таму, хто адважыўся перабрацца цераз сцяну, сёння споўнілася б семдзесят, а пражыў ён усяго сорак. Як горка ўсведамляць, што свабода заўсёды аплачваецца крывёю.

<u>Аўторак. 2 ліпеня.</u> Кінуў на шчасце ў каламутна-брудную ваду колькі ржава-залацістых пфенігаў і з новым, ужо нажытым смуткам пастаяў каля двухпавярховых, даўгаватых параходзікаў, кругом якіх плавалі крыжанкі і лыскі, з узлётам падбіраючы кінуты раскрышаны хлеб ці булку.

Цяпер, прадчуваючы блізкія гадзіны растані з зялёна-свойскім, зусім ужо не чужым Берлінам, успамінаю словы паляка Бярэзкі, родам з-пад Катавіцаў, нямецкага паэта і перакладчыка, з якім пазнаёміўся на вечарыне ў Норберта Рандава і які неяк даверліва сказаў мне: «Як добра было б з'яднаць палякаў і немцаў, раскідаўшы граніцы, альбо палякаў і беларусаў».

Бацькі яго — шахцёры, усе малыя ростам, бо велічна дужы мужчына ў забой не залезе, служылі ў аўстрыйскім войску. Ён сам, скончыўшы лётнае вучылішча — у нямецкім, брат яго — у пасляваенным польскім.

«Гэта — лёс усіх, — удакладніў ён, — хто жыў ці радзіўся на пагранiччы. Мы кепска гаварылі па-польску, яшчэ горш па-нямецку».

У нас, беларусаў, мусіць, трохі інакш: мы кепска гаварылі па-польску, не лепш па-руску і найлепш, вядома, па-тутэйшаму, па-беларуску.

Яшчэ зранку на ўчарашні білет, што купіў за дзевяць марак, з'ездзіў у блізкі ад нашай Ванзэе Карштадт — супер-магазін і прыдбаў нарэшце ручку з «вечным пёркам».

Нялітасцівая спёка, якое тут, у Берліне, даўно не было: +29. Берлінцы, асабліва маладыя, усе ў шорціках, як на пляжы, і, вядома, з калматымі, страшэннымі, як лютыя звяры, сабакамі, якія бягуць паперадзе гаспадароў, высалапіўшы языкі...

Я неяк спадцішка і падсвядома прывык да берлінснай моды, да спакойна-дабрадушных берлінцаў, да электрычкі са спісанымі лаўкамі, да веласіпедыстаў, да гаманкіх дзяцей з

кніжкамі коміксаў, рукзакамі і сумкамі. Як прывык да дачных уздоўж гарадской чыгункі дамкоў, да невысокіх са зрэзанымі верхавінкамі яблыняў і груш, да кветнікаў з касачамі, рамонкамі, браткамі, півонямі...

Ужо спакаваны чамадан і сумка — лішне набраў з дому, лішне накупляў, а ўсё, калі падумаць, ці так ужо неабходна чалавеку? Як добра было б, каб ён меў толькі тое, што трэба на сённяшні дзень.

Auf Wiedersehen, Berlin!

*1991*

## *НА КРЫЛЛЯХ СМУТКУ І АДЗІНОТЫ*
### *Старонкі з дзённікаў*

### Год 1962-гі

*Студзень.*

27. Субота. Яшчэ не было зімы: адліга, каўзата, туман, прастуда. Цярушыць сняжок — сухі, дробны. Нібы нябесная манна. На шапках і каўнярах жывым срэбрам блiскаюць кропелькі расталага снегу. Пахне мокрым сукном. У тралейбусе як у цёплым авечым хляве...

Прыгадалася вёска, жоўтыя сляды ад хлява ў хату, белае і цёплае поле, вечным, халодным снегам засыпаныя хутары. У волкай нерухомай цішы густым, прастудным голасам гаўкае сабака.

28. Нядзеля. Рэдкі сняжок, нядужы марозік. Белая, нібы накрухмаленая, чысціня. Глухаватая ціш зранку, звонкая, тугая — увечары. Снегу пад нагамі не чуваць — адзін пух. Хочацца хукнуць і ўзвеяць яго, уявіўшы сябе казачным буйным ветрам.

*Люты.*

1. Чацвер. Не густы, высокі туман, ліловы іней. З раніцы сонца і абапал яго тэнча (вясёлка). Якая яна непрывычная, нязвыклая зімою. Ажно палохаешся — як на мор ці на вайну? Ці, можа, на шчаслівыя дні?

3—8. Ноччу марозіць, днём адпускае. Пад вераб'іны цвіркат капае са стрэх. Вечары сінебэзавыя. Ад смутку сціскаецца сэрца. А можа, у кожнага яно баліць перад вусцішнаю цемнатою?

11. Нядзеля. Мяце знізу і сыпле зверху. Свету белага не відаць. У адзін міг жанчыны пасівелі — ад нагнанага пад хусткі снегу. І ад гэтай заўчаснай сівізны нечакана памаладзелі.

16. Пятніца. Асеў і пачарнеў свежы, надоечы навеяны кудасай, малады сняжок. І душа знебылася па вясне.

*Сакавік.*

11. Нядзеля. У каляінах поўна вады. На вербалозе серабрацца каткі. Вечарам, калі прышарэе, на захадзе выясняецца сярпок маладзіка. Нібы з вечнасці зазірнуў. Дзе сышоў снег — лапікі прыбітай зялёнай травы. Яна таксама нагадвае пра вечнае жыццё.

17. Субота. Кудаса. Па пояс замяла, зараў-

няла глыбокія карытцы сцежак і дарог, насыпала курганы каля вуглоў. Перад захадам сонца — ружовы снег, дым слупкамі. Блакітна-мярцвяным святлом заліты горад. На ўсходзе высокая белая поўня. Нават сіняватая. Раптоўны брэх сабакі і дзявочы смех. Успомніліся нашыя засыпаныя снегам, недаступныя хутары. І жоўты адзінокі агонь — свіціцца акно.

20. Аўторак. Зранку хрумсткі марозік, удзень — першае вясновае цяпло і светла-галубенькае, як на касцельных абразах, урачыстае, святняе неба. Над нізкім горадам першым званочкам празвінеў трапяткі жаваранак. Вярнуў штось светлае і забытае: дарогу ў раскалыханым жыце. У вадасцёкавых трубах грыміць лёд.

29. Чацвер. Імгла, вільгаць. Разамрэла каркаюць гракі і ўжо топчуцца на старых леташніх гнёздах. І я асветлены чыстай вясновою радасцю.

31. Субота. У канавах пры чыгунцы поўна рыжаватага снегу. Чыгуначнікі ракопваюць у ім канаўкі, каб сцякала талая вада. Гракі злятаюцца на праталіны. Даўгахвосты дрозд пералятае белае поле. І мне ўслед за ім заманулася ляцець насустрач кіславата-парнай вясне.

*Красавік.*

2. Панядзелак. Каля вуглоў да сіняватай белізны раскопаны счарнелы снег. Каламутная вада точыць у лёдзе глыбокія латачыны. Яны звіваюцца як рэчачкі, убачаныя з вышыні, з самалёта. Да спіны ліпне гарачыня.

Прывыкшы да зімовай адзежы, прэюць людзі. Уміг топіцца, растае снег, што на ім ажно выступае пеністае шумавінне. Як на добрым маладым піве. І хмялеюць ад свайго посвісту шпакі.

4. Серада. Як грудзі ў цяжарнай, на бэзе набухлі пупышкі. Чуткі да сонца зялёна-жаўтлявы мох у белай імжы цвету. Помніцца, які ён пяшчотна мяккі пад босымі нагамі, калі першы раз разуешся пасля зімы. І як шуміць вецер у вушах ад першага веснавога бегу. О, як бегалі навыперадкі!

11. Серада. Лётае бесклапотны матылёк. Белы — знак, што будзе малочна. Залацісты — на мёд.

13. Пятніца. На полі зеляніць леташняя канюшына. Успомніўся яе саладжавы пах. Ветрык падсушвае зямлю. Ты ступаеш на яе асцярожна, каб не зрабіць балюча. Зямлю я заўсёды ўспрымаю як нешта жывое, нават з душою.

17. Аўторак. Светла і сонечна. Неба высокае, урачыстае, як бывае яно ранняю вясною і ранняю восенню. Вільготна-свежаю перакопанаю зямлёю пахнуць гародчыкі. Каля платоў прабілася трава і касачы. Сарамліва, прытоена цвіце драбнюткі жоўты падбел. У Ельніку, у гразі, у ржавай вадзе — чорна-серабрыстыя аладкі жабінай ікры. Шэпт сухога чуткага трысніку. Нібы нябожчык адазваўся.

19. Чацвер. Над пахучым жоўта-зялёным вербалозам пушыстым роем гудуць яшчэ нядужыя пасля зімы пчолы. І сярод іх чорна-паласатыя чмялі. Пры сцежцы — натапыранымі

пэндзлікамі трава і сіваваты кучаравы палын. Чуць-чуць, ледзьве згледзіш, зеляніць агрэст. Верабейчык, як злодзей, пырхнуў з перынкай у дзюбку. А наўкруг ужо карагоды беланогіх садоў. Гонкія ўшчэпкі чакаюць бела-ружовых кветак, як дзяўчаты вяселля.

21. Субота. А сыраваты, нават халодны вецер. Успамінаецца яго мякка-лагодны шум у ядлаўцовых кустах, дрыготкая раскалыханая бела-ліловая слепата (ветраніца). Цэлыя азёры яе ў лагчынах, каля сіняга мора пралесак у хмурым яловым лесе. На полі цёмна-зялёнае, смарагдавае жыта, карычнева-ружовыя палеткі аўса, што праклюнуўся нізкімі восцямі. На лужках, на балотцах, у лужынах, акружаных жаўтлява-зеленаватаю акрыялаю травою, журботны звон туркачоў, вечарам — натужлівы крэкт надзьмутых жаб. Жоўтыя выспы слепаты (лотаці). Уяўляю сціплыя букеты ў слоіках, чую гаркавата-вязкі яе пах у нашых варакомскіх хатах. Як мала трэба для хараства. Як мне даволі было чырвонай поўні ў шары надвячорак.

22. Нядзеля. Над рудым поплавам плачуць кнігаўкі. За гракамі нічога не чуваць. Вечарам дождж з першым радасным зігзагам маланкі і першым пагрukваннем грому. Раскрылася зямля. І душа чалавечая.

24. Аўторак.

Галубы ходзяць парамі. Надзьмуўшыся, голуб бяжыць за галубкай і адбівае яе ад грумадкі. Сям’я пачынаецца, пэўна ж, ад самотнасці і адасобленасці, а дзяржава наадварот — ад згуртавання і разбурэння гнязда.

*Травень.*

1. Аўторак. Цеплыня абярнулася нечаканым холадам. Над Мінскам завіўся лёгкі сняжок. Колькі да яго нянавісцi, як зімою радасці.

3. Чацвер. Трава злягла ад шорсткага марозу. Але на гняздзе, задзіраючы дзюбу, па-свойску і небаязліва клякоча цыбаты бусел.

У людзей вясновы клопат — усе дружна садзяць бульбу.

Горка і даўка-цягуча пахне клейка-разамрэлая таполя.

6. Нядзеля. Распускаюцца ліпы — на іх шаўкавіста-пяшчотныя ясна-зеленаватыя банцікі. Скрозь па зялёнай траве раскрылі жоўтыя калматыя вочы нізкія дзьмухаўцы.

Светла-жаўтлявы, святочна ўвабраны бярэзнік. Жоўты, як проса, цвет на дол цярушыць клён. Сівая, нібы аплеценая, абэрсаная павучыннем, маладая высокая грабінка.

10. Чацвер. Груша ў ружаватай квецені. Мяккая пяшчотная цеплыня — ідзеш і купаешся ў ёй. Вечарам нізкі і востры маладзічок.

Учора зноў адгукнуўся гром — рахмана і без маланкі.

Раскрылі свае калматыя вейкі дзьмухаўцы, іх процьма, як ніколі. Успомніліся жоўтыя пажарышчы ад гэтых кветак у нашай спаленай і неадбудованай вёсцы. Яны нібыта ізноў гарэлі, асабліва полуднем, калі я прыганяў з пашы карову.

12. Субота. Дождж змарыў дзьмухаўцы, і яны ўсе паснулі.

13. Нядзеля. Цвіце чаромха — з лазняку

пахне мёдам. Паказваючы чортавы рогі, на балотцы адцвітае, асыпаецца і хаваецца ў высокай траве слепата.

Нібы ў бясконцай журботнай вечнасці мяккае і далёкае куванне зязюлькі. Над азярцом, датыкаючыся грудкамі да вады, бесперапынку кружаць ластавачкі. Успамінаецца Фет, а потым польскі вершык: «Яскулэчка ў аканэчка ціха пука — тук-тук!», а нарэшце і нашае варакомскае: «Пастух жарэ, пастух жарэ. У поле бярэ. А прыгнаўшы: “Маці, есці дай!” “Пералушчылі — параелі”». Гэта ўжо гукаперайманне, імітацыя.

Вечарам, калі запаляць агонь, у шыбы з сухім лускам б’юцца вуркатлівыя хрушчы. Белы месяц над цёмнымі дрэвамі. Якое дзіўнае і якое вечнае хараство. І як ён апеты ў рамансах і ў нашай песні «Добры вечар, дзеванька, куды йдзеш?».

16. Серада. Холад на чаромху. Вішні ў белым, нават буйным цвеце. Аер па калена.

19. Субота. Дзівяцца ўсе — на рынку з’явіліся казлякі. Прадаюць букецікі пахучых цёплых ландышаў. Мне ўспамінаецца школа, дзяўчаткі з крэмавымі букецікамі.

21. Панядзелак. Ружовыя кветкі на старых пасівелых яблынях. У ліловых бутонах бэз. Светла-зялёныя, па-моладу прыгожыя і абноўленыя ліпы. Зноў, як у народнай песні: «На той бок азёра стаіць ліпа зялёна».

23. Серада. Поле пры дарозе ў дробных прытоена-сарамлівых сініх вочках (незабудках). І дзікая гонкая яблынька між калючага глогу, як у няволі, але зацвіла.

25. Пятніца. Пад вішаннікам, трохі пацямнелым, іржавымі пялёсткамі засыпаны дол. Дзяўчаты ходзяць з букетамі наломанага бэзу. Жаўтадзюбыя верабейчыкі купаюцца ў пяску. Помніцца, як местачковыя дзеці страсалі з высокіх соснаў неаперaных грачанят.

27. Нядзеля. З клеткаў ужо вызіраюць і пацвіркваюць маладыя шпачкі. Прыгадваецца смешна-неверагодны выпадак, калі я, падлеткам, узлез на бярэзіну і ўсадзіў у дупло руку. Во было плачу і страху, покуль выцягнуў назад.

*Чэрвень.*

6. Серада. Снег! Як зімою — густы, мокры. Наліп на дрэвы, прысыпаў траву. І на белым снезе зялёныя лісткі бульбы. І хараство і бяда.

8. Пятніца. У гародчыках цвітуць касачы — на памяць усплывае ўжо далёкая мая адзінота з кніжкамі каля жоўтых касачоў. Пад нагамі высокая трава, густы, папяловага колеру, палын. Бачу зялёнае мора травы — далёкае і даўняе наша Азярышча, ружовыя слёзкі, конская цыбуля ў белых кутасіках пуху — там прайшло журботна-сумнае дзяцінства, не нашмат шчаслівейшыя падлеткавыя гады.

9. Субота. Каласуе сіва-ружовае жыта. Замежкі белыя ад дзікага кмену. Ластавачкі ляпяць гнёзды. Зацвітае шыпшына. Самае цяпло. Лугі жоўтыя ад люцікаў і ружова-бляклыя ад таўкачыкаў вобаратніку. Ідзеш босы, а таўкачыкі набіваюцца між пальцаў. Як жытнія каласы. І лускаюць. Як даўно не хадзіў і не вярнуць усяго.

11. Панядзелак. Наўкруг высокія густа-зялёныя шумлівыя дрэвы. Пачынаю думаць, што мінуў год.

Без даты. Чалавек шкадуе перажытага, як шкадуе слоўца, што выбегла з памяці. А каб вярнуў перажытае, яно было б нязначным, як часта бывае нязначным згубленае, а потым знойдзенае слоўца.

Абклаўся слоўнікамі, алфавітнымі і прадметнымі ўказальнікамі да Актаў, выданых Віленскай археалагічнай камісіяй, кніжкамі Чубінскага, Сразнеўскага і Спрогіса і з наіўна-трапяткою, нават трымціва-дзіцячай радасцю і хваляваннем выпісваю выразы і словы, якія яшчэ жывуць у варакомскім дыялекце, у цягучых жалосных песнях старых кабет, падвяселеных скупою чаркай, у матчынай ласкава-роднай гутарцы.

Аксаміт — бархат чорны, чырвоны рыты і дзікі.

Адлас — атласная матэрыя. Пра яе чуў у смутна-горкай мацерынай песні: «Складзі, сынку, атласову сукню, схавай, сынку, у садочку вішнёвым». Гэта яе, нявестку, якую «мужычок», як былінку, зрубіў па самы камлёк.

Барыла — бочка для віна ці гарэлкі. Пра яе ўжо спявалася нашымі жнеямі, што спраўлялі дажынкі: «А ты, гаспадару, выстаў, выстаў ды барылку гарэлкі». Няўжо ж і пілі і тады, як цяпер — бязлітасна шмат?

Шнур — на адзінаццаць маргоў даўняе меры. Яшчэ і сёння можна пачуць ад варакомцаў старэйшага пакалення: «Гэта ж было яшчэ да хутароў, калі поле было ў шнурох».

Не ведаў, што месца, дзе вядуцца бабры, называецца жэрамя і што каня гнядое масці называюць цісавым.

Мігдалы (міндаль). Чуў гэтае слова ў матчыным жарце, калі мы, дзеці, надаедліва пыталіся ў яе, што будзе на вячэру, і яна смехам адказвала: «мігдалы», або «яглы» (прасяная каша), або «варголы» (значыць, голы вар). Мы ж, вядома, не адчувалі патаемнага сэнсу гэтых слоў.

Можа, і расчараваўся б, а ўсё ж цягне зірнуць на кабечы ўбор накшталт вянца ці дзіядэмы, апісаны ў нашых старажытных актах, — «брамку пэрловую на чорным аксаміце з каменьмі двума рубінамі, а трэцім шмарагам» (смарагдам?).

Ёсць, мусіць, у кожнага з нас гэты зваблівы, спакуслівы інтарэс: адкінуўшы полаг мінулага, даведацца, як жылі нашы дзяды і прадзеды. Шкода, вядома, што акрамя вясковых паданняў ды легендаў да нас дайшло так мала папер. А дзённікаў, як вядома, нашы дзяды не пісалі. Іхнія прозвішчы можна спаткаць хіба толькі ў інвентарах фальваркаў, у рапартах станавых прыставаў ды ў скаргах папоў.

Праўда, з няменшай цікавасцю, пераглядаючы неўпарадкаваны архіў Радзівілаў, я зазіраў і ў іхнія дзённікі і дакументы.

Без даты. Як паведамляе Літоўская метрыка (1510 год), «маршалкоўскі суд, з расказання ваяводы Віленскага, прысудзіў мешчаніну места Львоўскага Андрыясу Ермяніну 50 коп грошай за шкоды яго, каторыя яму сталі ў товаре его протіў Шайбаковага двара на речце Ятрі (Ятфі)». «Як поведаў дзяржаўца Слонімскі, тая

шкода стала (учынена) трыма парабкамі пісара пана старасты Жамойтскага Еленскага, з двора его Шайбаковского».

З таемным спадзяваннем думаю, што двор на рэчцы Ятры (Ятфі) і ёсць сённяшні шайбакоўскі надзел, міма якога ішоў гандлёвы гасцінец з Навагрaдка ў Слонім. Дарэчы, гэтым гасцінцам ездзілі яшчэ на пачатку нашага стагоддзя.

Мяркую, што выпадак з разбоем здарыўся ў нашай вёсцы, нават каля нашага садку, хоць гандлёвая дарога перасякала рэчку Ятранку за паўвярсты ад сённяшняга Шайбаковага двара.

Як сведчыць той жа дакумент, «па смерці Станіслава Еленскага, баярына Віленскага павета, «Шейбак женился на его вдове». Праўда, тая ж удава «скоро по смерті его за третьего мужа пошла».

Вось і разбярыся з усёй дакладнасцю наконт шайбакоўскага двара, калі яны, удовы, па тры разы замуж ідуць.

Вядома ж, спакушае гэтае негістарычнае адкрыццё, што Шайбакоў двор на рацэ Ятры — гэта менавіта наш двор, а гандлёвы шлях — той самы гасцінец, што ішоў з Слоніма ў Навагрaдак.

Успомніўшы даўнейшыя паданні і легенды з свае вёскі, магу пацвердзіць: нашы забіякі-варакомцы маглі ўчыніць і не такое.

### Год 1963-ці

17 студзеня. Быў дома. На чыгуначнай станцыі Наваельня, недалёка ад белага вакзала з чырвоным, яшчэ чарапічным, дахам, дзе ссы-

паюць чорна-ліловы наздраваты шлак, бачыў грака. Клышанога перавальваючыся на бруднай сцежцы, ён хадзіў не адзін. Значыць, праўда, што яны не адлятаюць у вырай. Ці мяняецца клімат, ці гракі, як і людзі, прымяркоўваюцца жыць ва ўмовах нашай суровай зімы. Бачыў, між іншым, сотні ластавачак, вядома, улетку, якія ляпілі свае гнёзды пад навесікамі пры вакзале аэрапорта, там, дзе звычайна стаяць пасажыры, чакаючы аўтобуса ці проста авіялайнера. Няўжо пташкі перасталі баяцца грымотна страшнага, абвальнага груку самалётаў? Вібрацыі?.. А можа, адаптуюцца разам з чалавекам, праходзяць той этап, што праходзіць усё чалавецтва. Значыць, усё жывое на зямлі, ад травінкі да чалавека, неад'емна звязана між сабою. Адамрэ травінка — адамрэ чалавек.

Субота. 11 мая. Свет змяніўся на вачах: тыдзень назад была карычнева-сіняя вясна, а сёння яна — радасна зялёная, з першым ласкава-пяшчотным пошумам лісця. Бярэзіны ажно смарагдавыя. Агрэст жоўта-зялёны ад кілішкаў цвету. За сухімі платамі рэдзенька вапнавы накіп вішняў. Па густой траве ўтрапёна, па-дзіцячы вызіраюць страхатліва вялікія вочы дзьмухаўцоў. Вечарамі натужна, ажно раздуваючыся, крэкчуць жабы — зноў на цяпло, на пагоду. А на маладым дубку яшчэ спадцішка і сцішана шуршыць сухое, паскручванае ў трубку леташняе лісце. Ажно шэрхне спіна.

Чацвер. 16 мая. Грады, пясчаная тупкая сцежка пры плоце засыпана ржава-белымі пя-

лёсткамі. Дзеці ўпарта трасуць з кучаравай загранічнай елачкі, з таполяў сонных хрушчоў. Вечарам, калі запаліш лямпу ў хаце, з надворку ў шыбу адчайна тупа б'ецца і мякка шоргае аксамітнымі крыльцамі цьма — начныя матылі. На падваконні ў слоіку букецік жоўтай ёдзіста-пахкай слепаты. Пры акне гонкі кусцік агаткі (іргі?) у дробным, ледзьве прыкметным ружаватым цвеце. Шпак імкліва, як шпуля, ляціць цераз сівы, ачунялы сад.

14 кастрычніка. Масква. ВЛК. Вярнуўся з садавінна-гароднінай базы («Плодоовощ») увесь брудны па вушы, затое з бульбаю ў кішэнях. Дагадлівыя і хітрэйшыя панасыпалі цэлыя сеткі. Я ж там быў першы раз і, дзякуй Богу, астатні. Кажуць, больш туды не пойдзем — пачынаюцца заняткі.

Дадому вярталіся на таксі — балазе запрасіў кіраўнік, ці, дакладней, прарэктар. Вышэйшых літаратурных курсаў. Поруч са мною на заднім сядзенні з авоськаю бульбы разваліўся невядомы мне «слушатель» з Іванава. І адразу ж пахваліўся: «У нас, в Иванове, впервые издавался Дудин». Гэта адпавядала таму, каб я сказаў: «А ў нас, у Babakomшчыне, нарадзіўся Гётэ альбо Гамер».

У таксі, як мне здаецца, ахвотна абгаворваюцца ўсе навіны. Пачынаюць звычайна шафёры. Але наш таксіст маўчаў. Гаварыў прарэктар:

— Знаю вашего Короткевича.

— А як жа ж яму тут жылося?

— Он здесь вихлял... По-моему, ваша Лось пишет лучше его.

Я змоўк, адчуваючы, што гутаркі ў нас не выйдзе. Слухаў, што расказвае «слушатель» з Іванава.

І вось у мяне клопат: адмыцца ад бруду і, дарэчы, ад непрыемнай гутаркі. Праўда, я, даверлівы і неразважны правінцыял, паехаў сартыраваць бульбу не пераапрануўшыся — у святочным касцюмчыку.

Між іншым, па вопратцы і акцэнту пазнаюць і вызначаюць, што ты не масквіч. Учора на Беларускім вакзале нават шафёр з маршрутнага таксі папытаў у мяне:

— Не из Таллина случайно?

— Не, з Мінска.

— Какой грязный город, — ён зморшчыўся і пацягнуўся рукою да касы, дзе ў шчылінку — ці не знарок завужаную — не прайшлі мае 40 капеек. — А троллейбус у вас есть?

Я маўчу, уважліва разглядаючы яго худы брыдкаваты твар з вострым носам. Нешта ў гэтым хударлявым твары было прымітыўна-жулікаватае, асабліва, як мне падалося, у шарых вачах. Але вось яны заблішчалі п’янавата-спакуслівай радасцю, — ён па-змоўніцку азірнуўся на мяне:

— Ну и станок!.. — Гэта ён пра кабету, якая пераходзіла вуліцу. — Люблю таких.

— Вы не жанаты? — мусіць, па-дзіцячы і наіўна спытаў я.

— И причём дважды, — ён зрабіў нечаканы і рэзкі паварот, ажно мяне пахіснула на сядзенні. — Первая попалась прости Господи. Выгнал. Четыре года глаз не показывает, даже к сыну.

Ён ужо гаворыць з недаравальнай злосцю і крыўдай. Як мне здаецца, ён яе яшчэ любіць.

— А эта хорошая — сына любит, родная так не любила.

У міг вока, праз хвілін дванаццаць, мы былі ўжо на Дабралюбава. У дзвярах жоўтага сяміпавярховага інтэрната, як знарок, сустракае Адамовіч. Занадта вясёлы і давольны, як студэнт. Дарэчы, і апрануты пад студэнта: светлая куртка і шапачка-аладка. Хіба пазалочаныя акуляры надаюць яму больш самавіты і ганаровы выгляд. Кліча мяне ў свой 143-ці пакой. На стале ў яго «Дружба народов» з яго надрукаваным раманам. Перакідваемся такімі-сякімі навінамі. Ён паказвае газету з паэмай Вазнясенскага:

— Ёсць неблагія кускі. Але відаць, што стаялі над каркам.

— Вядома, стаялі, — згаджаюся я. — Над маладымі ўсюды цяпер стаяць. У нас з планаў выкінулі ўсіх, не разбіраючы.

— А потым будуць устаўляць, таксама не разбіраючыся. Агулам.

Нарэшце я іду вырашаць справу з пакоем. Лёгка сказаць — вырашаць. Чакаю каменданта ажно тры гадзіны.

— А чаму не пасяліла дзяжурная? — здзіўляецца яна.

Нарэшце яшчэ з гадзіну чакаю дзяжурную.

І вось азіраю свой 215-ты пакой. Дакладней, не азіраю, а прынюхваюся — за сцяною кухня.

— А іншага вольнага няма? — асцярожна пытаюся.

— У нас гэты пакой самы лепшы. Фёдараў жыў і не жаліўся. Між іншым, я скажу хлопцам, з ахвотаю разменяцца.

З ахвотаю, напэўна ж, хачу мяняцца адзін я. Зрэшты, пакой як пакой. Нават велікаваты. Некалі нас, студэнтаў, жыло ажно па чатыры — і ў меншых.

Дзяжурная пайшла, сказаўшы, што прышле прыбіральшчыцу. Зноў нуднае і доўгае чаканне. Ад гэтага і злосці больш. І прыдзірлівае вока бачыць ужо сівы і пушысты, як персідскі дыван, дрыготкі пыл: і на стале, і на крэслах, і на ложку. А пад сталом і пасярод пакоя расцёртыя акуркі, скрылікі раздушанага сала, тлустыя цёмныя плямы па ўсім паркеце.

Асцярожна, нібы пабойваючыся, у пакой заходзіць драбнаватая, сухенькая, але ж і занадта марудная жанчына з вялікай шчоткай.

— Здеся и убирать нечево. Вот пол надобно протереть, видите сальные пятна. Этаж я убираю раз в месяц. Платят всего-то 14 рублей за этаж, — кажа яна, стоячы пасярод пакоя і абапіраючыся на доўгую ручку шчоткі. — Здеся жил какой-то чин. Порядок любил. В ридакцию ушёл. А вот через коридор немец какой-то живёт. Грязнуля страшный — всё пьёт.

— Можа, ненец? — кажу.

— Уж больно я в них разбираюсь, — яна дзеля прыліку пачынае вадзіць шчоткай.

Цярпліва дачакаўшы, покуль яна перастане вэдзгацца і пойдзе з пакоя, за работу бяруся сам, праўда, адзычыўшы ў яе вялікую анучу.

І нарэшце з свайго сёмага паверха збягаю на шосты, да Адамовіча — па чамадан.

— Дзень добры, Масква! — як казаў наш Янка Купала.

А вось што сказаў Мікалай Гогаль: «Москва купчиха... И если уж пошло на моду, то чтобы во всей форме была мода: ...отвороты фрака... — как сарайные двери». Што праўда то праўда.

Серада. 16 кастрычніка. Масква. Сёння на плошчы Пушкіна (брыдка прызнацца, але да помніка не падыходзіў — усё не было калі) насупраць малочнага кафэ напаткаў нізкага — мне па плячо, — сталага веку мужчыну ў шарым паліто, у берэце з пупсікам. Ён ішоў ссутуліўшыся і неяк бокам, каб каго не зачапіць, і надта аддыхваўся, соп, відаць, ад задышкі. Я міжволі прыгледзеўся да яго і адчуў ці ўгадаў нешта знаёмае, напэўна, па партрэтах. Паўстоўскі — здзівіўся я. Але тут жа ж успомніў, што гэтакі тонкі, наздраваты і гарбаты нос у Федзіна, і я стаяў, здумелы і ўражаны, не ведаючы, хто ж гэта быў на самой справе. А можа, зусім іншы чалавек? Але дай, Божа, яму здароўя.

Чацвер. 24 кастрычніка. Масква. Ціхі і шараваты сумны дзень. Няма дзе дзецца. Сяджу дома і пішу для «Полымя». Тут мяне, як і ўсіх, мусіць, заядае адзінота.

Учора быў у Вышэйшай партыйнай школе. Там нават была гарэлка і землякі, ці, як яны сябе называлі, «представители Гродненской и Минской областей». Мне было і брыдка і крыўдна, што гэтыя «представители» не ўмелі вымавіць па-беларуску ніводнага слова. Пасля другое чаркі я, вядома, не вытрымаў. Называлі

мяне нацыяналістам. Але ж будуць помніць «представители».

Дарэчы, пазаўчора быў на Чырвонай плошчы. Першы раз. Бачыў той дом, дзе пад стражаю сядзеў Радзішчаў, калі яго везлі ў Сібір. Дзіўны свет і дзіўны чалавек у ім. Няўжо гэтаю вуліцаю ў аковах ішоў аўтар «Сатирического воззвания к возмущению»? Няўжо ён бачыў чырвоную крамлёўскую сцяну, як і я?

Дзіўна, што з-за гэтай чырвонай сцяны ажно ў маю родную і далёкую адсюль вёску даходзіў векавечны страх.

Пачынаю ўпотай і ціхенька шкадаваць, што прыехаў сюды марнаваць час. Дома няма грошай, а дзе ж я тут іх зараблю? Дома ўсім кепска без мяне, але ж і мне не лепш без іх.

Дзіўлюся, як жа Валодзя Караткевіч высядзеў у гэткім дзікім суме і чорнай адзіноце ажно чатыры гады? Можа, ён сядзеў, калі пісаў, а ў астатні час весяліўся? А для мяне і два гады глухое адзіноты ці не зашмат?

Не пішацца з той ахвотай і жаданнем, як спадзяваўся. Нават не дабяру месца, дзе сесці.

Праўда, залішне шмат часу забіраюць лекцыі, хоць карысці ад некаторых выкладчыкаў мала (Ісбах, Машынскі) — занадта ўсё школьнае і агульнавядомае. Да прымітывізму і нудоты.

Найлепш свой прадмет ведае, ва ўсялякім разе можа здзівіць фактам або дасціпнай фразай, хіба адна Молева. Тая самая, якой свае балады і вершы прысвяціў Караткевіч.

Першы раз, калі яна зайшла ў аўдыторыю, я, грэшны, падумаў, што гэта падручнае дзяў-

чо старога прафесара. Начытаўшыся Валодзевых балад і мадрыгалаў, я, вядома, не чакаў, што яна нізкая, дробная і ў дадатак бяззубая, худзенькая, як плотка, і бязгрудая.

Але гумар, дасціпнасць, эрудыцыя і непаказная смеласць гэтай не вельмі прывабнай жанчыны змусілі мяне нарэшце захапляцца ёю і паважаць яе. І балады і мадрыгалы — гэта ўсё ад Валодзевага ўзнёслага, калі не сказаць наіўнага, рамантызму. Кахаў ён, як мне намякнулі, зусім іншую кабету. Усё ж тую, якую я ўяўляў (бо не толькі намякнулі, але і паказалі).

## Год 1964-ты

6 ліпеня. Варакомшчына. Нарэшце дома. Увайшоў у хату, нібы пасля малацьбы, увесь сівы ад пылу. З баранавіцкай шашы аж да самых Карэліч дарога — як праз Сахару, уся ў клубах пяршывага пылу. Толькі перад Наваградскай дубровай, ці не за вёсачкаю Горная Рута, пачынаецца брук. А да яго кіламетраў пяцьдзесят глытаеш горкі пыл і чуеш на зубах траскучую жарству.

З высокіх пагоркаў Навагрúдчыны ў даліну Маўчадкі да зялёнае Наваельні ляціш ужо з лёгкім ветрыкам, што пахне цягучаю смалою, — пад коламі аўтобуса клейка шапоча свежы асфальт. Нарэшце Шайбакова, і душа балюча замірае — блізенька, праз кіламетры тры-чатыры будзе свая вёска. Абапал шашы з падлеткавых гадоў знаёмая шумліва-трапяткая варта зялёных бярэзін. А за імі ўжо голыя, аб-

паленыя сонцам пагоркі. Там-сям нават з жоўтымі выжарынамі.

З астатняга грудка, дзе ў чэзлым хвойніку ўзняўся маяк, за шырокай лагчынай з круглымі, як царкоўныя купалы, ядлаўцовымі кустамі відаць роднае поле. Прыкмета яго — белаваты валун, што крывым выкрышаным зубам выткнуўся каля даўнейшай быльнікавай мяжы.

Мяжы, вядома, няма, як няма і роднага поля — усё абагулена. Сэрца зანывае і шчыміць ад крыўды — не відно і высокай сцяны лесу: ні Пытлевага, ні нашага — паўгектара гонкіх меднаствольх соснаў. Там палягло збэрсанае і скачанае ветрам жоўта-спалавелае жыта. Лес высек калгас, праўдзівей, — яго старшыня: частку спрадаў, частку забраў сабе, будуючы ажно дзве хаты — адну тут, другую ў глыбокім тыле — у Койданаве. Нехта Каско ці Касько. Ён, вядома, быў не першы. Правёўшы вузкакалейку, наш старавечны бор яшчэ ў 1916 годзе вынішчылі немцы. Таксама не шкадуючы, як Касько, — да пеньчыка.

Спадзеючыся на лепшыя часы, мае бацькі берaглі, ашчаджалі і спялілі кожнае дрэва, тым больш — лясок быў малады. Вось чаму і сядзяць яны ў трухлявай хаце, скіданай з прыкупленых старых хлевушкоў і свірнаў яшчэ ў вайну, калі была расстраляна запальнымі снарадамі наша вёска.

Цяпер яна яшчэ не шыферная, а па-традыцыйнаму і даўнейшаму саламяная, з замшэлымі стрэхамі гумнаў і хлявоў. Пасля доўгай разлукі са мной выдае асабліва знябожанай і гаротна-сірочай. Парудзелі, выгаралі ад жа-

рышчы і спякоты вузенькія надворкі, абгароджаныя шарымі замшэлымі валунамі ды калючым дротам, і на іх ганарыста красуе сіваваты пустырнік і белаватым дымком сцелецца пахучы кучаравы палын.

Выгарала ўсё кругом. Нават балотца, дзе сённячы сянуюць. І Ладак Адамчык, як на яго яшчэ кажуць, Злахчынаў (ад хаты, што стаіць у лагчыне), нечакана для мяне пастарэлы, з сівымі скронямі, стоячы на возе і ўтоптваючы сена, навотліў махае рукою:

— А я ж помню, як тут утапілася Сцяпанава кабыла. А цяперака і знаку німа, што багнішча было. Усё высахла, усё пагарэла... Як жа ж жыць? Во касіў дзялку... Дзесятую долю атаваю палучу. Усюды людзі сенам бяруць, а ў нас як другое гасударства. Як жа ж жыць? Усё пагарэла. Але, кажуць, у «Заготзярно» прыйшло новае жыта. Недзе ўраджай.

І знянацку для мяне пытанне:

— А як там, у Расіі?..

І, не чакаючы майго адказу, паганяе каня:

— Но-о, каб на цябе воўк! З гэтакім... Тыр-р-р, куды ты?

Напэўна, і мне хацеў расказаць пра Расію. Яны, нашы варакомцы, аб'ехаўшы паўсвету, хто прыжыўся ў чужой старане, а хто не, ведаюць пра жыццё больш, чым я.

<u>Без даты.</u> Наваельня. Аўтастанцыя. Радком і цесненька на адзінай лаўцы сядзяць пажылыя кабеты. Пры нагах кошыкі, а ў іх — баханкі свежага хлеба. Прадалі, мусіць, ягады. Чакаючы кожная свайго аўтобуса, стомлена ўжо вядуць гутаркі:

— У нядзелю будзе Пятра. Па Пятры ў два тыдні пойдуць жаць. Ілля — дзевятнаццатага. Пачынаюцца асеннія святы.

Памаўчалі, успамінаючы таксама кожная сваё.

— У нас вяселля было. Надта ж хораша дзеўка грала. Усе бегалі глядзець... Чатэры музыканты.

Старэйшая з іх сінявата-ліловымі пальцамі, падфарбованымі ад чарніц, падграбае пад хустку валасы:

— Нябось, у цэркву не пайшлі. А так моглы і нямоглы.

— Дзіва што, — кажа другая, ломячы ад баханкі акрайчык скарынкі. — У нас кіно пускалі, якраз на Вялікдзень, то ўсе беглі.

Дзяўчаткі, відаць, дзесяцікласніцы, адварочваючыся, каб не вельмі бачылі бабкі, ціхенька смяюцца з іхняй гутаркі. І мне ўспамінаецца народная мудрасць: «Дурной дзеўцы ўсё смех». Але гэта сказана, мусіць, з іншага выпадку.

<u>Без даты.</u> Для сябе — можа, прыдасца? Бацька з сынам хаваліся пятнаццаць гадоў. Сын у часе вайны быў членам СБМ (Саюз беларускай моладзі). Бацька не пайшоў на фронт. Днём яны не паказваліся нікуды. Замкнуўшыся, сядзелі ў хаце і шылі боты. На продаж. З гэтага жылі. Сын нават ажаніўся. Узяў дзяўчыну з далёкае вёскі. Нейкі час туляўся там, а потым вярнуўся дадому, у горад (Навагрудак). Нявестка і свацця даглядалі мужчын, прадаючы пашытыя боты і чаравікі.

Са свайго схрону яны выйшлі самі.

Расказвае партызан. Паліцыянта засталі ў дзяўчыны. Ён схаваўся ў пограб і пачаў адстрэльвацца. Яго забілі. Выцягнулі са склепа ўжо нежывога, з размазджонаю галавою. На труп кінулі дзяўчыну і пачалі біць, умазваючы яе ў яго кроў і мазгі. Помсцілі ёй, што яна аддала перавагу паліцыянту.

Помніцца даўняе апавяданне маці. Марыля Сцяпанава з нашай вёскі выйшла замуж у Ведравічы. Мужа не любіла, падгульвала з мужчынамі. Мужык затаіў помсту. Аднойчы, на Сёмуху, сказаў Марылі, што яе брат Амяльян наказаў, каб яны прыйшлі ў госці. Марыля прыбралася. За ляском, у лубіне, ён забіў яе. Вярнуўшыся з дарогі, ужо пастухам прызнаўся, што зрабіў злачынства.

Яго судзілі — далі ўсяго шэсць гадоў. Варочаючыся з турмы, ён не пасаромеўся зайсці да Амяльяна, Марылінага брата, і папрасіць есці. Амяльян не пазнаў швагра і нават накарміў.

16 кастрычніка. Пятніца. Масква.

У бібліятэцы літінстытута ледзь выпрасіў, бо студэнты знарок ці не знарок губляюць каштоўныя кніжкі, томік пісьмаў Вінцэнта Ван Гога, яшчэ даваеннае выданне (1935 год), і ўцяжку чытаю і выпісваю цытату за цытатай: «Вясна — гэта пяшчотная, зялёная маладая рунь і яблыневы колер; восень — гэта кантраст жоўтых лісцяў на фіялетавых адценнях. Зіма — гэта снег з далікатна-пяшчотлівымі сілуэтамі. Лета — гэта ж размаітыя сінія адценні, супрацьлегласць элементам аранжавага, схаванага ў залацістых і бронзавых танах... Я

ўсё шукаю сіні колер. Сялянскія фігуры тут, як належыць, сінія».

Чацвер, 22 кастрычніка. Масква. Вышэйшыя літаратурныя курсы. Сёння нашы лектары, паслухаўшы інфармацыю Ягорычава, усе спрытном лінчуюць Хрушчова — і за касманаўтыку, і за сельскую гаспадарку, і за раздзел абкомаў, і за карыбскі крызіс, і за раздораныя зарубежным лідэрам ордэны герояў, і за будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Гане, і ліха яго ведае яшчэ за што... «Речи его читать не будем и запрещать не будем».

Цікава, што яны скажуць пра чарговага прынцэпса*, калі той будзе адлучаны ад улады і з яго здымуць трабею — пурпуровы плашч.

Без даты. Чытаю Кузьму Чорнага, і сказ з яго аповесці «Зямля» — «Моцна грукалі коні ў хлявах, жуючы і тручыся аб сцены і жолабы» — вяртае мяне ў вёску да абветраных дрэў, чулай цішыні і да ўсяго, што неўзабаве забудзецца і мною.

Без даты. Масква. Вышэйшыя літаратурныя курсы. Вычытаўшы ў ферсманаўскіх нарысах па гісторыі каменя, што сіні колер успрымаецца чалавекам значна пазней, быў даволі здзіўлены і ўражаны гэтым адкрыццём. Як піша Ферсман, лінгвісты назіраюць, што ў кітайскай і старажытнаяўрэйскай мовах адсутнічае слова, якое вызначае паняцце «сіні», і што яго няма ў паэмах Гамера, і што туркмены не адрозніваюць сіняга ад зялёнага колеру.

---

* *Прынцэпс* — у Старажытным Рыме правіцель, дзяржаўца.

Я, паверыўшы, спытаў пра гэта ў свайго аднакурсніка, далікатна-ціхага і зычлівага туркмена Раджэпа Аланазарава, чым яго да злосці разгневаў. Недаверліва бліснуўшы чырвонымі ангорскімі вачамі, ён мігам збегаў у свой пакой і вынес руска-туркменскі слоўнік.

А што сказаў бы пра палітру фарбаў бессмяротны Ван Гог, які так нястомна і ўпарта шукаў сіні колер і заўсёды сцвярджаў, што ёсць толькі тры асноўныя колеры: чырвоны, жоўты, сіні.

У мяне ж у асаблівай пашане мядова-жоўты. Гэта колер пахкай смалы, бурштынавага мёду і нашай спелай збажыны. Мне заўсёды помніцца: на жоўтым расходніку горка, да сухасці ў роце, пахучыя азёрцы ліловага чабору.

А наогул — бор смалісты, мёд пчаліны — якая неразлучная радасць у гэтых сімвалах.

Без даты. Чытаю тэстамант Віленскай падкаморыны Барбары Шэмят (Шэмятовай) з роду Агінскіх, удавы Мальхера Шэмята, сакратара камісіі, што на чале з падканцлерам Львом Сапегам складала і рыхтавала да выдання Статут Вялікага княства Літоўскага (1588), і дзіўлюся, якія старадаўнія нашы вёскі, як, напрыклад, сяло Цяцейкі (у дакуменце Цяшэйкі), што яна «вечным правам набыла за шэсцьсот коп грошай лічбы літоўскай з баярамі, падданымі і ўсімі прыналежнасцямі, як і фальварак Старынкі «за шэсць тысяч злотых на вечнасць купіла» і якія «зараз да маёнтку Наваельня далучыла».

Ці не адзін з апошніх юрыдычных дакументаў на беларускай мове, бо ўжо быў 1651 год. Набліжаўся той страшны крэс, калі яна была

закрыта ва ўсіх дзяржаўных установах, і таму з асаблівай усхваляванасцю думаеш, як велічна-ўрачыста гучала беларускае слова на тваёй зямлі. І як хочацца вярнуць яго хараство, прастату, дакладнасць і натуральную строгасць, як, для прыкладу, вось з гэтага тэстаманту: «его мілость пан Ян Клімневіч покладал і к актіванью подал тэстамант годнай памяті её мілості пані Барбары Окгінской Мальхеровой Шеметовой Подкоморіной Віленской, на речь в нём ніже поменёную, просячі абы да кніг кгродскіх Віленскіх был актынован і впісан... слово до слово».

І маю нават гонар, што гэты дакумент лучыць мяне з даўнінаю маіх родных мясцінаў, з беларускасцю і вяртае маю веру ў беларускую гісторыю і беларускую мову, якую ўсё ж варта было б называць літоўскай, як называў яе наш вяшчун Максім Багдановіч.

Без даты. Расказвае бацька. Наш сусед Сцяпан Ракіцкі скупы быў. Выпіць любіў, а рубель шкадаваў. Мая баба Тадора падмовіць Сцяпанаву жонку, тая ўкрадзе ў мужыка грошы, паедуць на кірмаш, напояць Сцяпана і скажуць, што гэта Тадора палатно прадала. Сцяпан і рады.

Скупасць яго даходзіла да нейкага абсурду ці вар'яцтва. Свіней, напрыклад, Сцяпан трымаў многа, а карміў — абы не паздыхалі. Яны, худыя — спіна, як пілка, — бегаюць па вёсцы і наровяць ускочыць у чужыя сені.

Прылаўчыліся нават лычом адчыняць дзверы: націсне на язычок або падыме клямку і выесць курачае цеста.

Хлеба з новага жыта Сцяпан ніколі не пёк.

Усё з леташняга ці пазалеташняга, якое з вясны прасушваў, каб не сапрэла ў засеках.

Суседзі Гарасімцы, пракруціўшы свярдзёлкам у Сцяпанавай сцяне дзіркі, кралі збожжа. А ён жыў упрогаладзь. Нават рыбу сырую еў, што вынесе на бераг паводка.

Ашчаджаў Сцяпан грошы, збіраў іх і назбіраў поўны акованы куфэрак.

Падлеткі, падмануўшы малодшую і неразважную Сцяпанаву дачку Мар'яну, вытрасалі з гэтага куфэрка залатнікі. Усадзяць шыла ў шчыліну і трасуць куфэрак: калі залатнік вываліцца — наплююць ды ў кішэнь, калі мядзяк — пад печ. І па гарэлку да яўрэя ў мястэчка.

Дачуўся Сцяпан, што крадуць у яго грошы, дапільнаваў.

Прывязаў Мар'яну да ўслона, намачыў вяроўку і біў, покуль не змогся. Але ж і мочанай вяроўкай залатнікоў не выб'еш.

І усё ж пашкадаваў неразважную ды неразумную дачку, аддаў ёй у пасаг астатняе золата.

Мар'яну помню і я — вядома, ужо старою. Хадзіла яна чамусьці ў чырвонай хустцы, завязанай ражкамі на патыліцы.

Жанчына з палатна рускага мастака Пятрова-Водкіна мне заўсёды нагадвала Сцяпанаву Мар'яну. І я міжволі думаў, няўжо бальшавічкі — усе Мар'яны?

## Год 1965-ты

<u>Без даты.</u> Учора глядзеў фільм Джона Форда «Гронкі гневу» («Тытунёвая дарога») і адразу ж пасля яго «Жыл старик со стару-

хой» — узнёслую камедыйную дрындушку. Сапраўднага кіно ў Маскве яшчэ няма, тым болей у Мінску. У Мінску няма, здаецца, і рэжысёраў.

Субота, 20 лютага. Мяне трывожыць і займае жыццяпіс Уласа Корсака: аўдавелы чалавек жыў з канём і разам з канём памёр.

Панядзелак, 15 сакавіка. Чую радасна-ашалелы крык гракоў (па радыё). У метро на эскалатары ў твар вее вясною. І непрыемна глядзець на цёплы пухкі каўнер з чарнабуркі. У вагоне дзяўчына з букетам буйнага ліловага бэзу (краснадарскага?), і ўсе пазіраюць на яе і на бэз. З вадасцёкавых трубаў вадаспадам б'е вада. Праз тратуар вужакамі паўзуць, вывіваюцца раўчукі. Пабліскваючы ружова-зялёным воллем, шызыя галубы п'юць у іх ваду. Бабулі і нянькі водзяць за ручку цёпла захутаных дзяцей. Ад лужынаў, разбіўшыся на асколкі, бліскае і слепіць вочы трапяткое сонца. Машыны ўздымаюць радужныя веверы талай вады. Стаўшы між падвойных рамаў вітрын, кабеты ў сініх халатах труць анучамі шкло. Голуб неяк бокам адпіхае ад чарады галубку. І мой аднакурснік Раджэп, вясёла ўсміхаючыся, крычыць мне: «Смотри, он пошёль!» (Гэта пра салідную прывабную маладзіцу.)

Серада, 17 сакавіка. Фрыдрыха Ніцшэ, яго «Аўтабіяграфію», «Па той бок дабра і зла», «Так гаворыць Заратустра» я не дастаў. Затое ўзяў кніжку Даніэля Галеві «Жыццё Фрыдрыха Ніцшэ» (1911) і адсюль навывуджваў бясконцае мноства афарызмаў: «Жыццё — люстэрка. Убачыць сябе ў ім галоўная мэта».

«У казарме пазнаеш свой уласны характар».

І вось правілы Ніцшэ, якія ён устанавіў для сябе і якія варта было б скарыстаць: будзь незалежны, нікога не зневажай, і няхай гонар твой будзе мяккі і не няволіць іншых. А далей — не заводзь знаёмства са знакамітасцямі, не спажывай віно, не зближайся з жанчынамі, не чытай часопісаў і не ганіся за пахвальбою і ўзнагародамі.

Не шкодзіла б і мне даць такі-сякі зарок.

Без даты. Каторы ўжо дзень з алоўкам у руцэ чытаю дзённікі Льва Талстога. Услед за афарызмамі Фрыдрыха Ніцшэ ў маю запісную кніжку кладуцца радкамі правілы маладога графа: «Лепш папраўіць і папсаваць», «Напісаць у жыцці адну добрую кніжку ўжо занадта дастаткова», «Не пачынай новага твора, не скончыўшы старога».

А ў мяне толькі пачаткі, і тых няшмат, каб выбіраць.

Як зайздрошчу яму: «Не пишу от изобилия». А я — ад няпэўнасці, апантанасці, баязлівасці, альбо «робости», як сказаў бы ён.

Сёння расказваў аднакурснік мангол.

У іх не шыюць абутку сорак трэцяга памеру, сорак другі — рэдка, сорак першы ёсць, і шмат.

Ён не сустракаў кучаравых манголаў, як і, дарэчы, лысых. Зрок у іх лепшы. Гэта ад таго, што навокал стэп, прастор, і вочы адпачываюць.

Прызнаўся, што быў вельмі здзіўлены, убачыўшы першы раз у еўрапейцаў валасатыя ногі і грудзі.

А я ж нас, беларусаў, не знайшоў бы за што пахваліць і чым выдзеліць. Можа, гэта таксама рыска нашага характару?

Без даты. Аддаўшы ўсяго два рублі, у букіністаў купіў кішаньковага фармату томік Станіслава Пшыбышэўскага. Спадзяваўся на мадэрн, а натрапіў, здаецца, на ўзнёслалірычную і рамантычную прозу, якой у нас, грэшных беларусаў, нямала. Праўда, у Пшыбышэўскага яна еўрапейскага паходжання і з дамешкам містыцызму. Кажуць, Пшыбышэўскі ідзе ад Шапенгаўэра, каб паказаць голую сексуальную душу. Але ж мяне збівае з панталыку каскад узнёслых, прыгожых і бязважкіх слоў, ад якіх нават зморшчыліся б рамантычныя персанажы Караткевіча. Прыгожымі, ружовымі, як яблыневы цвет, словамі я даўно перахварэў, чытаючы са слязьмі на вачах таленавітую паэзію Паўлюка Труса. І з тым жа самым захапленнем — лірычную прозу Янкі Брыля. Мы ж мусім ад некага пачынацца. Каб бачыць далей, мы павінны стаць на плечы вышэйшых. Між іншым, хто гэта сказаў? Ньютан?

Зноў з намаганнем чытаю сусветныя перлы паэзіі, як кажа крытыка, і застаюся раўнадушным. Можа, таму, што сказ у Пшыбышэўскага ўмоўны: «Развеялася радасць, адцвіло шчасце, пакуты даўно прайшлі, як у сне...» Але і да гэтага яшчэ, пэўна, вернецца проза.

Хоць чытаць Пшыбышэўскага трэба было б на мове арыгінала. Пераклад — гэта перавернуты дыван, як разумна і дакладна прыкмеціў Леў Талстой.

Субота, 15 мая. Сёння глядзеў «Гнеўнае вока» — фільм, які здымаўся без сцэнарыя і іншы раз скрытай камерай. Здрада мужа вачамі жонкі. А потым — «Смак мёду», які здаваўся вышэйшым і праўдзівым. Незабыўная стужка пра дзяўчыну, якая ідзе па дарозе маці — робіцца насуперак матчынай волі прастытуткаю. Бядота прывяла да спакусы, а спакуса — да жадання. Жаданне — да новай бяды.

Без даты. Чытаю Марселя Пруста «У пошуках страчанага часу». Зноў жа ж якая балючастрашная праўда: «І будынкі, і дарогі, і алеі такія ж мімалётныя, як і нашы гады». «Гэта ж часта вясняны дзень, змыліўшыся, заблукае ў чародку зімовых дзён».

Як я цягнуся яшчэ да ўзнёсла-ружовага слова, якая ў мяне яшчэ жаноцкая душа!

Аднак лірыкі ў жыцці жорсткія і раўнадушна-зласлівыя людзі. Хто гэта сказаў?

Аўторак, 29 чэрвеня. Варакомшчына. У вёсцы абкошваюць надворкі — каля хатаў на сцежках сохне і пахне гаркаватай прывяласцю скошаная трава.

Белагаловыя дзеці зрываюць і ядуць сінеліловыя кветкі смактухі — па-латыні, мусіць, анхусты, нечым падобнай да жывакосту з чырвона-фіялетавымі, пазней з фіялетава-блакітнымі кветачкамі расліны нашых пясчаных дворышчаў.

Вярнуўся з сумна і сонна-белай Зецялы, святочна і вясёла ўзбуджанай ад Пятровага фэсту. У душным аўтобусе на адным сядзенні са мною дзяўчына з часопісам «Маладосць». Ака-

залася, студэнтка Гродненскага педінстытута. Успамінала пра сустрэчу з мінскімі літаратарамі, што была ў іх у Гродні дзесьці напрадвесні.

— Ой, як мы зніякавелі, калі пачаў выступаць Макаёнак. Няўжо праўда, ён не ведае беларускай мовы? Але, каб не чула, не дала б веры. — І ўздыхнула: — Дзіва бярэ.

Мяне ж здзівіла іншае: яна, гэтая інтэлігентна-далікатная дзяўчына, была родам з таркачоўскіх хутароў, і яе дзяцінства прайшло поруч з маімі падлеткавымі гадамі, за сінім лубінам, дзе я пасвіў кароў і дзе сярод ружавата-серабрыстай збажыны бачыў блізкія шарасаламяныя, змарнелыя ад смутку адзінокія хутары і на калматых быльнікавых межах гультаяватага сабаку і дзяўчатак пры ім у доўгіх сукеначках і злінялых, завязаных дзюбком хустках.

Як я не ведаў і не мог прадбачыць тады, адзінокі падлетак, абуджаны найперш кніжкамі да ўсяго пакрыўджанага і растаптанага беларускага, што поруч са мною вырасце дзяўчо, якое гэтак жа балюча і зняверана будзе пакутаваць за роднае слова.

З гэтага аўтобуса запомніўся рудаваты даўганосы мужчына, што кінуў усяго адну фразу:

— Касавіца ці, як грыцца, сенакашэнне.

І гутарка, таксама нязначная, жанчын паміж сабою:

— З Наваградка едзеш?

— Ну, але.

Зецяла. Поруч з узнёсла прыгожым бароч-

ным касцёлам, абкружаным па-святочнаму белымі мураванкамі, на ружаватым бруку каля аўтастанцыі даволі людна — з касцёла высыпалі якраз тыя, хто не забыўся пра Бога, — найбольш старэнькія кабеты ў доўгіх спадніцах, у старамодных, завужаных у таліі сачыках, у тапках ды сандалях. Іхняя гутарка таксама даўнейшая, з незабытымі паланізмамі, што прыйшлі з касцельнага амбона:

— Альбіна, ты дадому?

— Не, я пузней.

— Ды ўжо ж не па дарозі, — крыўдуе пажылая сухенькая кабета на дзябёлую сакавітую маладзіцу ў салатавай сукенцы, з медальёнам на белаватых незагарэлых грудзях.

Рослы мужчына ў чорнай круглай шапцы з вітай вяровачкай над брылём і ў суконным, даўнейшага крою каптане, або, як у нас кажуць, марынатцы, гаворыць да старэйшага і слабейшага за сябе мужчыну ў танным цёмнасінім касцюме з вялікімі кляпамі:

— На Сібір мо не пашлюць?

Пра Сібір у нас помняць здаўна, яшчэ ці не з 1831 года, калі пачалася першая ссылка. Нават вецер, што дзьме з усходу, у нас называюць сіберным.

Таму пажылы бяззуба, але трохі баязліва смяецца, а маладзейшы у круглай чорнай шапцы перакідвае гутарку на іншае:

— Жыта два тыдні расуе, два тыдні налівае, два тыдні спее... А калі жаць? А ўжо ж Пятра.

<u>Без даты.</u> Бацька расказвае пра трагічны выпадак, што здарыўся ў той жа Зецялі. Уча-

стковы — жанаты, дзеці ў яго — кахаўся з адзінокаю маладзіцаю. Сустракаліся яны на могілках. Там іх падцікавалі падлеткі і нават сфатаграфавалі. Маладзіца сабрала пяцьсот рублёў, каб магчы ўцякаць з мястэчка. Грошы аддала каханцу на схову, на спрат. Сям'ю кідаць ён пашкадаваў, а грошы растраціў. А былі ўжо дамовіліся ехаць. Стрэўшыся зноў на могілках, параспрачаліся, перасварыліся, і яна ў парыве гневу забіла яго. На падставе картачкі следчыя і ўлічылі ў забойстве маладзіцу.

## Год 1966-ты

Без даты. Апавяданне бацькі. Мы, Адамчыкі, паходзім з суседняй вёскі Аханяны. Яшчэ за прыгонам варакомскі Язэп, ці Восіп, Аблажэй, пабіўшыся п'яным са старэйшым сынам, паскардзіўся пану. Як вялося тады, прыйшлі гайдукі і пакаралі сына — далі дваццаць пяць розгаў. Назаўтра яшчэ дваццаць пяць. Не стрываўшы абразы і крыўды, сын павесіўся. Меншы, Юрка, помсцячы бацьку, уцёк з дому на другі ўчастак. Стары Аблажэй, застаўшыся без маладых дужых рук, пасадзіў у сані дачку і павёз яе сватаць у Аханяны, да Захара Адамчыка, у якога было чатыры сыны. Старэйшы з іх, Янка, і прыйшоў у прымы да Аблажэіхі. Праз некаторы час ён паклікаў у помач на багатую гаспадарку другога брата — Алеся. У Аханянах засталіся Міхалка і Віктук (Віктар).

— Алеся я помню, — удакладняе бацьк-

ка. — Высокі быў. Памёр у 19-м ад гішпанкі. Болей як восемдзесят было.

Асіраціўшы трое дзяцей, прымачыха памерла ззамаладу. Янка Адамчык жаніўся ў другі раз: браў удаву, якая выдала замуж дачку і пакінула на гаспадарцы сына. Ад яе ўжо і нарадзіўся наш дзед Тодар (1865 год).

Асірацеў ён у тры гады. Гадавала яго прыродная, ужо замужняя сястра.

Падлеткам, у гадоў пятнаццаць, Тодар вярнуўся ў Варакомшчыну да старэйшага брата Лявона. І аказаўся тут лішні, бо надзел прыходзілася дзяліць на трох — Лявона, Алеся і Тодара. Падпільнаваўшы ў стопцы, слабенькага падлетка Лявон з Аўдоцяю (жонка) хацелі задушыць. Але, на шчасце — яно ж таксама бывае, — надышла суседка.

Дарэчы, калатня і спрэчка за зямлю цягнулася ажно да гадоў пяцідзесятых. І яе разрашыла ўжо гвалтоўная і пагалоўная калектывізацыя. Пошукі кавалка зямлі ледзь не выправілі нашу сям'ю ў Польшчу. Але Бог сцярог пакінуць Бацькаўшчыну. Словам, «Новая зямля» паўтаралася на новы, варакомскі лад.

Без даты. Над комінам дыму няма, толькі дрыготкае сінявата мроіва. У хаце, мусіць, выпалілі печ, але комін не зачынілі.

Я адчыніў сені і пачуў дух свежага хлеба. І праўда, у хаце на лавах і на стале стылі вялікія боханы, накрытыя ручнікамі.

У драўляным ложачку з драбінкамі спала дзіця, і на лаве ціхенька шапталіся жанчыны.

Якая вечная і сапраўдная радасць — дзіця і хлеб.

Без даты. Маці, на хвіліну прысеўшы пры стале, — гэта заўсёды так, каб перадыхнуць, — на мае роспыты пра 39-ты год, расказвае, як нашыя варакомскія мужчыны (Змітрук Лазовік, Міхась Салавей, Васіль і Віця Аблажэі) бегалі на Маргі, у недалёкі ад вёскі марны хваёвы лясок, лавіць і раззбройваць польскіх пагранічнікаў. Назад, у вёску, вярталіся ўжо з шаблямі пры боку і з чырвонымі бантамі на грудзях. І мне нават уяўляецца, як ішлі яны, недаступна ганарыстыя, нечым нагадваючы рымскіх легіянераў, але, як і рымскія легіянеры, з крыкам «Aciipe ratum!» («Атрымай сваё!»), маглі пакараць кожнага па звычаі продкаў — адсекчы на калодцы галаў.

Таўкуны (суседняя вёска). Пры рэчцы на мосце забілі паліцыянта, а ў гмінным мястэчку Дварэц мясцовыя актывісты ўтапілі ў возеры ксяндза.

А потым неўпрыкмет і ўжо каторы раз прыгадвае сваё дзявоцтва, калі яна ад Зельнае (Маці Божай Зялёнай) ажно да самых марозаў наймалася ў сушню, што была пры наваельненскім тартаку, чысціць і рэзаць на машынцы яблыкі. Высушаныя і ўпакаваныя ў скрынкі, яны ішлі на экспарт — у Францыю. Маці за адну восень зарабіла ажно 200 злотых (для сялянскай дзяўчыны нечувана вялікія грошы) і купіла сабе фетравае паліто і туфлі-лакеркі.

Думаецца, што няшмат трэба для чалавечага шчасця, каб яно помнілася ўсё жыццё.

Панядзелак, 4 ліпеня. Раніцаю ўжо асыраваты халадок і раса, а ўдзень — спёка. За сіва-

ватым, трохі ацяжэлым ад налітых каласоў жытам белы пыл, што ўздымаюць грузавікі. Глядзіш на яго і, здаецца, чуеш, як на зубах скрыпіць пясок.

Жанчыны ў балеях нясуць на рэчку паласкаць бялізну.

У рэчцы касякі малькоў, што ідуць супраць вады, і каля карчоў сіняватыя маладыя рачкі.

Сланечнік, звесіўшы галаў на рассохлы плот, шукае сонца. Шарай гадзінай у гародах стаяць, нагнуўшыся, маладзіцы — выполваюць зелле. І бяруцца дадому з поўнымі дзяружкамі.

Вечарам за плечы крадзецца здаровая вільгаць ночы. У густой, абкіданай цветам бульбе, як у вадзе па калені, стаіць сцішаны сад. Патрэсквае і сціхае матацыкл за рогам хаты. Яхкае і звініць ланцугом сабака. І ўсё глыбей асядае цішыня. Яснеюць галасы. Парыпвае і пагрукваае калодзежная корба, звіняць вёдры. Нізка і роўна сцелецца шум далёкага цягніка. І разам з ім аддаляецца і знікае нешта тваё — забытае і не ўспомненае.

5 ліпеня. Аўторак. На полі зялёная, прыпалая да свежай зямлі бульба. Ужо акучаная. Сівы дрыготкі авёс. За сінім лубінам радкаватае, марнае і ажно белае ад рамонку жыта. Нават чуеш здалёк яго горкі даўкі пах.

Неўзабаве жніво. Нават ёсць прыкмета блізкай непрытульнай і непрыветнай восені — за ветраную ноч на вільготныя сцежкі ў садзе насыпаецца шмат драбнаватых яблыкаў.

Чацвер, 21 ліпеня. Пасля шырокага, як

разлітая паводка, шуму цягніка апала, як у туман, чуйная цішыня. І раптам блізкі, трохі глухаваты ў мяккую зямлю пад картопляю стук сарванага яблыка з пачарнелай прыгорбленай папяроўкі. Не ведаю чаму, але ад гэтага стуку спадцішка ў душы астаецца кропелька зіхатлівай радасці. Потым яшчэ стук, нават з шалясценнем па зялёнай лапушыстай картоплі. І зноў наплывае млява застылая, даўкая цішыня, якую падразае толькі востры аднастайны строкат конікаў. І зноў бяздумнасць, зноў нясцерпнае чаканне мяккага стуку яблыка і шапаткога ўздрыгвання лісця.

Якая ж неразгаданая, якая ж адзінокая чалавечая душа, што чакае чуйнага стуку аб зямлю ўпалага яблыка.

Нядзеля, 24 ліпеня. Іду дадому і з-за вугла хаты мяне выцікоўвае тонкі і высокі, як падлетак, сланечнік, і фікус стаіць пры парозе, як вартавы, — яго вынеслі на дождж.

Запісваю пачутае дома — а можа, прыдасца? У местачковай вячэрняй школе вучыліся ўсе тутэйшыя знакамітасці, што пачалі службу з нізшых чыноў: то загадчык канторы «Заготжывёла», то загадчык дрывянога склада, то загадчык аптовай базы, то загадчык млына. Настаўнікі праз іх мелі гной, транспарт, дровы і ўсё тое, чаго нельга было купіць у магазінах. І нават ведалі начальніцкую таямніцу, калі будзе спускацца возера, каб налавіць у плыценькай, абмялелай вадзе рыбы. Адпаведна местачковае начальства за год канчала адразу па два класы. Аднак загадчык млына застаўся на другі год у падрыхтоўчым класе — гэты не

ўмеў нават правільна напісаць уласнае прозвішча.

Дзівакі настаўнікі, яны не ведаюць, што ў партыйным ЦК ёсць сакратары, якія ў слове з трох літараў робяць ажно чатыры памылкі.

Панядзелак, 25 ліпеня. Жніво. Рвуць жоўта-зялёны, з мядовым водбліскам, палеглы лён. Клякоча на скошаным, трохі пазелянелым поплаве бусел.

Не ведаю чаму, але я заўсёды з асаблівай павагай, калі не сказаць, што нават з таемным замілаваннем, гляджу на гэтую птушку, поўную асаблівага гонару і дамавітага спакою. Недарма ж у нашых паданнях бусел быў чалавекам, покуль Бог не ператварыў яго ў пташку, загадаўшы перад гэтым збіраць усё гадства. У нашага бусла, як у рымскага арла, нават не страляе пярун, а нелюдзі стралялі...

Пазіраю на яго, а памяць вяртае далёкую вайну, калі ў мяне на вачах, падстрэлены на ляту і недалёка ад роднага гнязда гэты белы птах падаў на зялёны ад ласкавай муравы надворак, асіраціўшы малых буслянят. Забівалі іх казакі, што вартавалі ў нашай вёсцы імі ж зробленую турму. Падстрэленыя двойчы, яны, буслы, знаходзілі сабе пару. Як мае прадзеды і дзяды ўдаўцы.

Не ведаю, у каго Бог ператварыў бы забойцу? Хіба ў прыдарожны замшэлы камень. Але ж і там ён шкодзіў бы людзям, калечачы ім ногі ды ломячы іхнія вазы і сані.

Сёння — Св. Ганны. І таму — дожджык. Па народным жаданні: «Ты, Барысе, бараніся, а ты, Ганна, усцыся!» Калі ж, дарэчы, было

Барыса? Учора? Неўзабаве Спас — усяму час. Пачынаецца асенняе ворыва і сяўба. Бяры сяваньку, сей памаленьку.

Чацвер, 28 ліпеня. На ганку два поўныя кошыкі яблыкаў-ападкаў. Гарбуз-пустацвет, завіўшыся на плот, прыгожа і светла цвіце на ім. Але пчолаў, здаецца, не прыманьвае. Ужо сопкія, як бульба, папяроўкі. Груша аж ссыпана — уся ў цёмна-чырвоных бурачках. (Ці не гарасімкі ў нас называюцца?) На акне ў бутлі ружаваты, падфарбаваны вішнёвым сокам, цукар. Люблю, як і старажытныя рымляне, вішнёвы колер. Як і колер падагрэтых сонцам іскрыстых брусніц. Яны аж свіцяцца.

Гаспадар, седзячы пры парозе, у злінялай майцы, з ціхім смяшком успамінае, як у іх на хутары яўрэй з чаляднікам шылі кажухі. І ён, тады ўжо добры вісус, адчыняў дзверы і ўпускаў у хату галодных свіней, падпільнаваўшы, вядома, калі яўрэй-кажушнік накручваў на локаць багамойла. І маці тады, схапіўшы што ў руку, попустам ганяла яго з хаты.

Наш местачковы кравец, што шыў бацьку з сівага сукна фрэнчы і курткі з рыжым цялячым каўняром, здаецца, не маліўся, хоць калі маці налівала яму пшанічную зацірку, адзяваў на голаў сваю кепку. Гэта ўжо ўсё далёкае, як маё дзяцінства.

Пятніца, 29 ліпеня. У хаце пры акне, накрытая чыстай белай полкай, нажная машына «Зінгер». Над ёю падушачка для іголак. На цвіку вялікія кравецкія нажніцы і стары аблушчаны метр.

Для апавядання: яна, яшчэ дзяўчынкаю,

шыла ў гародчыку і нечага забегла ў хату. Вярнулася, а на шытве ляжыць вялікая сухая жаба і доўгая ржавая іголка на ёй. Яна глянула і ледзь ад памяці не адышла. Сухую жабу з доўгаю ржаваю іголкаю занесла і кінула на дарогу. Варочаючыся ў гародчык, за плотам убачыла: стаяў іхні сусед, стары Язапат. Вечарам яна захварэла. На трэці дзень у яе з горла пайшла кроў.

Без даты. На поплаве між пярэстых дагледжаных цялушак гвіжаць стракатыя шпакі. Пастухі ў цяжкіх балахонах, спусціўшы з абрывістага берага ногі, сядзяць пры завоіне, каля мяне. Клёву няма. Ды якое рыбацтва пры кампаніі ды гутарцы.

— Как там Жукаў? — Вось з такога і не меншага рангу задае мне пытанне наш даўні сусед па зямельным надзеле — з аднаго боку сценкі, як у нас называлі глухую дарогу, наша поле, з другога — яго, Мацея Таўкуна, і ў чэзлым хвойніку хутар — шарая замшэлая хата і прыселае ад старасці гумно.

З гэтага хутара Мацей, тады яшчэ нежанаты хлопец, пайшоў на фронт. Вярнуўся ён дадому жывы, як гаворыцца, ды здаровы і прынёс з сабою трафейны гармонік, і, не дайшоўшы да роднага хутара, сеў між шапаткога жыта, і расцягнуў яго. А іграць ён, вядома, не ўмеў. А нехта ж падцікаваў ды падслухаў, і з Мацея пасля гэтага пачалі падсмейвацца — гарманісты.

Я, пачуўшы Мацеева запытанне, пэўна ж, успомніў і пра трафейны гармонік, і пра тое, што сам Мацей ваяваў на Першым беларускім

фронце, але што яму адказаць, прызнаюся, не ведаў. Выручыў ён сам:

— Кагда мы з ім бралі Берлін, о-о, які гэта быў разумны палкаводзец!

І Мацей шматзначна змаўкае. Мы таксама моўчкі перажываем хвіліну яго ганаровага і ўрачыстага прызнання. Нарэшце я, намякнуўшы на яго пастухоўства, пытаюся:

— Як жа ж з заработкам?

— За май палучыў 97 рублёў і 7 пудоў жытам.

— Нічога сабе.

— А дзе ж лепш?

Нашу гутарку нечакана перапыняе прысадзістая кучаравенькая маладзіца. Яна топчацца каля Мацея і, сароменючыся, падае яму скамечаны рубель. Ён ідзе і, мякенька б'ючы рукою па спіне, падганяе пярэстага бычка-пярэзімка да вішнёвай каровы, якую за повад трымае хлопец-падлетак.

— Кінь папяросу, каб на табе шэрсць курэла! — крычыць на падлетка залаціста-кучаравенькая маладзіца. — Трымай за рогі карову.

А потым ужо, павярнуўшыся да нас і ад безнадзейнасці махнуўшы рукою:

— Ай, нейкі няспрытны — пора ды ўсё ў хвост.

— Праўда, слабенькі, мажа, і не дагодзіць, — ціха згаджаецца Мацей.

Я скручваю вудачкі і бяруся дадому. На падворку чую, як за суседскімі хатамі ўзрываецца п'яны гоман і смех.

— Спраўляюць Пятра, ці што? — пытаюся ў мацеры.

— Кончылі палоць лён. Хоць як там напалолі, толькі паабсікалі. І во п'юць. І Насця старая з імі. Няўжо не брыдка?..

Услед за мацераю я магу паўтарыць ужо тое, што яна кажа не раз: «Як на маім вяку адмянілася (змянілася) жыццё». І праўда — быт, норавы, мараль, адносіны да Бога (многія ўжо перахрысціцца не ўмеюць) — усё стала іншае. Самае горшае — апатычнае і абыякавае. Чужое нават.

Без даты. Запісаў ад маці нашыя, варакомскія, назвы гатункаў садавіны: яблыкаў, груш і сліў.

А вось назвы пташак, якія ведае хіба адзін вясковы арнітолаг, мой дзядзька Юзап, яшчэ не ўзяў, як кажуць, на пяро. Ніяк не дабяру часу сустрэцца ды запісаць. А калі, бывае, сустрэнемся, то гутарка болей пераходзіць на вайну. Хоць прадбачу, што, калі не зафіксую ў блакнот дыялектныя назвы тутэйшага птаства, буду ж бясконца шкадаваць, бо, на жаль, ні ў якіх даведніках іх не знайду.

Да бяспамяцтва заядлы рыбак мой дзед Янка як ніхто ведаў назвы і павадкі рыбы, але што яго паваліў, вырваўшыся з сеткі, шматпудовы сом, як магу з ягоных жа расказаў вызначыць ужо я, ён з перапуду ды страху не распазнаў.

— Мо сом быў? — помніцца, нехта з мужчын нават намякаў яму пра гэта.

— Хіба ж я не знаю сома ці ментуза? — дзед заплюшчваў ад злосці вочы. — Чорт гэта быў! Бо, як даў мне ў ногі, так і пакаціў. Вунь на Міронавай завоні, у аеры. Чорт, кажу!

— А ты ўжо і рогі ўбачыў, — нехта няўзнак пад'юджвае яго.

— Чорны і доўгі, не раўнуючы, як мой япрук. Я паўдня яго лавіў.

Мой дзед-нябожчык быў гэтакі баязлівы і ўражлівы, як я, і наўрад пасля першай сустрэчы з «нячыстай сілай» ён зноў палез у завоіну.

Нядзеля, 24 кастрычніка. Койданава. У мястэчку торг — прадаюць свіней і кароў. Каля магазінаў — шнурамі падводы. Коні шэрхнуць ад холаду. На возе варушацца парасяты, падымаючы лычамі мех.

— Волька, ты куды? — крычыць нехта ўстрывожанай кабеце, што подбегам мінае воз.

— Кабан на заднюю ногу не ўстае. Мусіць, зламаў. Прывезлі ж на торг.

У гастраноме каля аддзела з гарэлкай, як заўсёды, чарга. Але гарэлку прадаюць разам з латарэйнымі білетамі. Таму хлопцы жартам крычаць прадаўшчыцы:

— Прадай латарэйны білет!

П'янаватыя мужчыны ў фуфайках, у кірзавых ботах, па-вясковаму жылістыя і худаватыя, цяняюцца каля веласіпедаў, што стаяць радком пры плоце. У зацішку дрэмлюць нераспрэжаныя коні — у грывах і чубах шышкі ад лопуху.

Сярод вуліцы п'яны чалавек грозіцца маладым хлопцам:

— Каму даць у морду?

Баявейшы з іх смяецца:

— Усім, дзядзька. Пачынай па парадку.

Чалавек падае ім на плечы і стараецца ўсіх абняць. І не ведаеш, дзе дзецца ад гэтай п'яна-

дурнаватай весялосці. Душа ўсё шукае нейкай недаступнай адзіноты, але знайсці яе не можа.

Без даты. Услед за Танкам дабраўся да віленскага даваеннага «Слова» (газета) і таксама, як ён, раблю выпіскі, праўда, больш са скандальнай хронікі, хоць не мінаю і палітыку, асабліва цяжкія і трагічныя для Польшчы дні вайны. Усе мае кішаньковыя блакноты запоўнены вераснёвымі падзеямі. Гэта ўжо, напэўна, лішняе, але выпісваю нават метэаралагічныя звесткі, расклад руху цягнікоў, не кажучы ўжо пра «Камунікаты штабу Гл. Начэльнего Вудза» аб падзеях на фронце.

Як нялёгка чытаць гэты зварот да салдат, ведаючы наперад, што з імі будзе: «Жолнежэ! Немец, адвечны наш вруг, нападл дня 1 вжэсьня 1939 року на Жэчыпосполіта... Жолнежэ! Вальчыце о ісьнене і пшышлосць Польскі». Страшна, калі ведаеш наперад, якою будзе вайна.

## Год 1967-мы

Нядзеля, 28 мая. Ужо вялікае, у калена, жыта на полі. Падраслі і пачынаюць зелянець ліловыя аўсы. Кругом усё зялёнае, усё зацвіло і пацямнела. Толькі дуб яшчэ ў карычневажаўтлявых зморшчынах-лісціках, як па-руску кажуць, у смушках.

Дзеці ўжо абшморгваюць дробныя няспелыя ягадкі на парэчках. Прыпамінаецца, як і сам малы бегаў шукаць пры рэчцы кусты парэчак са светлымі пацеркамі няспелых ягадаў, ціхенька іх сашморгваў і ціхенька і нават са

смакам еў. І ці толькі іх? Вайною мы, варакомскія пастухі, пракрадваліся, бо ўсё боязна было, у разбураны, спалены партызанамі фальварак Зосіна латашыць зялёныя сліўкі. Страх бярэ, якою ж смачнаю здавалася тая гарката зялёна-сіваватых здзічэлых пладоў.

Прыгадваецца ўжо варакомскі Васіль Адамчык, што, адбыўшы пяць гадоў нямецкага палону (трапіў туды яшчэ польскім жаўнерам у верасні 1939 года) і вярнуўшыся дадому хворы на сухоты, расказваў, як да іх у лагер прыгналі ўжо савецкіх салдатаў і тыя, знясіленыя голадам, пачалі выграбаць рукамі з пажарных бочак зялёную бросню. А я пазіраю на іх, казаў ён, і думаю: памру з голаду, а гэтай брыды есці не буду. І застаўся жыць, а тыя, хто глытаў атрутную бросню, каналі тут жа, каля пажарных бочак.

Вайна, голад, смерць, нечуваныя і нязносныя пакуты абуджаюць у чалавеку папраўдзе нешта ўжо звярынае — есці атруту, паліць, забіваць. Чалавек маральна і духоўна дэградуе, нават зменшваецца чамусьці лексікон яго, замяняючыся паскудным брыдкаслоўем, асабліва ў рускіх. Але гэта ўсё, між іншым, называецца ў савецкай крытыцы «великим подвигом народа».

Без даты. У старых дакументах натрапіў на фразу: «Магомет Керей Солтон пошёл под замок Менский в посерёдок Литвы» (1506). Быў прыемна ўражаны, што Солтаны, якія валодалі каля нашай Зецялы старажытнымі літоўскімі вёскамі, былі па паходжанні татары. Не дзіва, што кольвек хто, напрыклад,

не ведае, што Мінск стаіць пасярод Літвы, а сённяшняя Літва — гэта Жмудзь. Як гісторыя пераблытала назвы суседніх народаў. Нібы знарок, каб раздзяліць іх.

Без даты. Выпісваю словы з даўнейшай мовы гістарычных дакументаў: аер — паветра, адамашак — шоўк зялёнага колеру, атлас — матэрыя, баламут — махляр, балван — ідал, бязмен — вага роўная 2,5 фунта, блазьня — жарт, глупства; блона — шыба, брудна-сівы — цёмна-шэры, брыдзіцца — гадзіцца, барвовы — бардова-цёмны, вільчасты — воўчай масці, буры — цёмна-жоўты, водлуг — паводле, вячысты — вечны... А гэтыя ж словы жывуць і да сёння ў нашай варакомскай гутарцы, і як мне не трэба іх губляць. А чаму, дарэчы, толькі мне? Мова ж старажытных беларускіх актаў агульная для ўсіх.

Субота, 10 чэрвеня. Спадарожны газік з Клецка, з «Сельгастэхнікі». Еду ў Койданава насустрач кароткаму вяснянаму дожджыку. Шчоткі, як рукі, сціраюць на лабавым шкле дажджавую ваду. А на светлыя кругі воспаю ліпнуць новыя кроплі. Шырокія — велічынёю з капейку. Наперадзе бензавоз, спадыспаду ў якога целяпаецца ланцужок, нібы пупавіна ў маладога ягняці. У шафёрцы гарачыня — пярэдняя шыба пацее. Шафёр выцірае яе краем ружовай далоні. Чорны і тлуставаты, як патэльня, асфальт курыцца рэдзенькай парай. Распырскваючы лужыны, насустрач нам ляцяць і ядавітымі шэршнямі гудуць раз’юшаныя грузавікі. Роўна, не натужваючыся, пагудвае наш матор. Шафёр закурвае, не знімаючы рук з кіраўніцы.

Маладыя шпакі неасцярожна пералятаюць шашу. У мяне замірае сэрца — барані Божа на каторага наскочыць наш «газік». З усяе моцы націскаючы на педалі і натужна прыгінаючыся, на грудок выязджае веласіпедыст з прывязанаю да рамы касою. У канавах, абапал шашы, — фіялетавы лубін. На боханах узгоркаў — чуйнае зялёна-ліловае жыта.

Як міла маўчаць, і ехаць пад шчодры дожджык, і бачыць, і адчуваць зялёную і бясконцую ў сваім хараstве зямлю. Не верыцца, што гэта ўсё можа паўтарацца і для цябе і для іншых.

Субота, 17 чэрвеня. Маладое лета, надвячорак. Нізкае і залатое праз цёмны сад млявае сонца. Па зялёнай бульбе рваныя светлыя плямы. Гэта спачатку. Потым — чырванаватае золата на шырокіх, як копы, яблынях, цяпер — на чубку страхі. Нізкі і нібы вільготны шум цягніка. За садам, дзе пачынаецца поле, нясцерпная, пералівістая песня жаваранка. Над пясчанаю дарогай, па якой скрыпіць, пагруквае і шалясціць пяском фурманка, адзінока шмыгае клапатлівая ластавачка. З гародчыка свежа і халаднавата пахнуць крэмавыя кветкі язміну. Каля плота на лаўцы збіраюцца жанчыны-суседкі. Святы надвячорак — заўтра Сёмуха. Сёння падладжвалі пчол. Заўтра на маёвы мёд будуць склікаць гасцей.

Дзіўна, што і я помню гэтыя п’яныя бяседы, расцяжныя, сумныя і шчымлівыя песні нашых варакомскіх жанчын. Даўно было і няўжо звялося? Няўжо судзіла доля, каб згінула беларуская песня?

Няўжо?

Аўторак, 20 чэрвеня. Вечар. Неба светла-сіняе, як разведзенае вадою малако. Дрэвы цямнеюць і зліваюцца ўдалечыні з панурым прытоеным змрокам. Нечы кашаль і шоргат ног па пяску дарогі. Шум аўтамашыны, як шум вады, а потым — вуркатанне матора. Ты нібы зайздросціш таму, хто паехаў, нібы злуешся, што ён чапіў і ўскалыхнуў тваю цішыню. Якая, аднак, скупая чалавечая душа, а можа, насцярожаная да ўсяго, што не яе.

Серада, 21 чэрвеня. Лясок у ласкава-сцішэлым вечаровым сонцы. На маладых сіваватых хвоечках пабліскваюць жоўта-зеленаватыя стрэлачкі. І ўсюды іх пяць, як пальцаў на руцэ. Ціш, толькі звон камара над вухам. У жоўтых ці мо, праўдзівей, у аранжавых ветках гарнік (горная арніка) горка-цёплы, таемны яго пах. Доўга калышацца лапка, якую ты незнарок чапіў плячом. Азірнешся на яе, і падумаецца нечакана: якое ўсё чуткае і жывое круга цябе. А табе ўсё здавалася, што быў адзінокі.

Жнівень—верасень. Дзятлава (Зецяла). Каля барочнага лёгка і імкліва ўзнёслага касцёла разбіраюць белы мур, які акружаў і сцярог яго ўжо некалькі вякоў. Усе маўкліва і, здаецца, абыякава праходзяць міма гэтага барбазінства. Перажываю, мусіць, адзін я. Хоць таксама маўчучы.

У культмагу, дзе на верхняй паліцы каля гадзіннікаў, якраз над баянамі і трохрадкамі, стаіць партрэт сівабародага Маркса ў багетавай рамцы, поўна вясковых кабет і дзяцей. Сутула-

ватая маладзіца з пустым кошыкам у руцэ пытае ў сумнай, аж да пазяхання абыякавай прадаўшчыцы:

— А калі ж будуць лісапеты?

— Былі... На тым тыдні. (Вядома ж, у нас усё было на тым тыдні.)

У магазіне гаспадарчых тавараў рослы, даўгавіды мужчына, абапёршыся на прылавак, курыць і, жмурачы ад дыму адно вока, цікаўна і ўпарта пазірае на хамуты.

У абутковым жанчыны, трымаючы ў руках бярозавыя, выламаныя з дзеркачоў шыпулі, мераюць імі дзіцячыя чаравікі. І мужчына тоўстым сіняватым пазногцем калупае падэшву.

Цераз брукаваны ружовы пляц да аўтобуса трушком прыспешваюць жанчыны, несучы на плячах у рудаватых мяхах піскліваых парасят, купленых на рынку.

Кантралёрка — адутлаватая маладзіца ў бурачковым паліто са штучнай скуры, крычыць, заступіўшы пярэднія дзверы:

— Жывой тавар — не паложана!

— Німа такога закону, — на драўлянай назе тупае сюды інвалід.

Кабеты ў плюшавых сачыках разам хлынулі ў заднія дзверы — нехта іх адчыніў і трымае абедзвюма рукамі.

— Там во напісана, што жывы тавар у пасажырскім транспарце не возяць! — гукае ўжо разгубленая кантралёрка.

— А дзе там пішацца, мы і не бачылі, — наіўна апраўдваецца пажылая жанчына, але ўсё ж уціскаецца ў аўтобус.

Ужо дома, у роднай хаце, маці расказвае, а я зноў запісваю: — брыгадзір Васілёк хату пабудаваў у Рабкох, а жытлую купіў у Барташох. Ішоў хлопец у войска, склікаў сто душ. Во як жывуць... А што ж, палучае больш як сто рублёў, а астатняе ўсё дармовае — як бурак, як капуста, як корм... Не тое што мы, робім, рук не чуючы.

Хаты выбудавалі і прадаюць за Навакрадак, і людзі нават з каменнямі, з падмуроўкаю купляюць, бо там, кажуць, каменняў няма. Во як жывуць. А ты кажаш?..

Паслухаўшы маці, разумею, што так жыць нельга, аднак, як жыць інакш, яшчэ дакладна не ведаю, праўдзівей, не магу даць ясны адказ. Але хіба ж шчасце ў тым, каб браць ад іншага? Аднак шмат хто жыве менавіта так. Во ў чым чалавечая бяда і супярэчнасць: ці жыць трохі лепш, ці быць трохі лепш. Хто гэта заўважыў — Чэхаў ці Горкі?

Без даты. Колькі ўжо дзён сяджу ў бібліятэцы і са зборнікаў П. Чубінскага выпісваю забабоны, загадкі, прымхі, загаворы і чары, а поруч кладу кніжку Сержпутоўскага і не магу стрымацца, каб не перапісаць у блакнот «Арабінавую ноч». Які смарагд, які цуд, якая непаўторнасць слоў, вобразаў, параўнанняў! Якое пекнае мастацкае палатно, вытканае словам.

А дзе вычытаў гэтае праўдзівае папярэджанне Жан Жака Русо нашым Радзівілам — не помню, але ж помняцца яго разумныя словы: «Калі вы не зможаце перашкодзіць Расіі праглынуць вас (Польшчу), зрабіце так, каб

ёй ніколі не ўдалося вас пераварыць». А нас, беларусаў, даўно з’елі, даўно пераварылі і даўно вы...

Без даты. Ці не Герцэн у мемуарах «Былое і думы» заўважыў, што каты заўсёды бываюць вельмі ціхія і сарамяжныя людзі, жадаючы выратаваць сваю асобу ад ганебнага звання. Але гэта сказаў не Герцэн, а, мусіць, Гегель.

Мне думаецца, не толькі каты, але гвалтаўнікі, здрайцы, прадажнікі, падкалодныя даносчыкі таксама. Помніцца, у нашай вёсцы быў ціхі, па-жаночы сарамяжны Саўка, і... ён жа, стаўшы ўпаўнаважаным ад нашай вёскі, ціхенька і таемна аддаваў і прадаваў усіх.

Без даты. На небасхіле ў ружовым вянку яшчэ светлая палавінка месяца. Пеўні як не раздзяруцца адзін перад адным. Злосны, уедлівы, нібы на вожыка, брэх сабакі. На дахах вільгаць, як пасля дажджу. Сонца выплывае ясным вялікім кругам. Серабром адліваюць верхавінкі сцішаных тапаляў, а пад імі — цёмная зеленкаватасць вішанніку. І нехта адчыніў у росны садок акно. Для кароценькага шчасця досыць гэтага.

Без даты. У віцебскім краёвым слоўніку Каспяровіча знайшоў нямала слоў, якія не раз чуў і ў нашай гутарцы: адлега, аплік, аправа, апытаў, астатні, багатыр (багаты), балазе, барджэй, брында, бурбалка, валошка, водлуг, вогер, выперадкі, гестка, гізаваць, дапэўніцца, дападны, дашчэнту, завідна (давідна).

Без даты. Нарэшце дабраўся да савецкіх яшчэ даваенных газет: «Вольная праца» (Беласток), «Зара» (Брэсць), «Чырвоная звязда» (Ба-

ранавічы), «Вольная праца» (Вілейка). Усюды паведамленні пра паспяховае наступленне Чырвонай Арміі на Карэльскім перашыйку. Песня пра Сталіна «От края до края», фільм «Паднятая цаліна».

Выступае кандыдат у дэпутаты Марыя Чэрнік з вёскі Белы Бераг Юрацішскага раёна: «Нас палякі прымушалі бяліць хаты». Дзіва бярэ, няўжо ж ты, маладзіца, без прымусу не магла перад святам апратаць і пабяліць хату?

І вось нечаканае: пасля прапагандысцкіх, як кажуць, зацемак пра мітынгі, танцы на выбарчых участках, дзяльбу асадніцкай зямлі і маёмасці, закон пра абавязковыя пастаўкі збожжа, бульбы, воўны, мяса (красавік 1940 года), праз месяц, ужо ў маі, — гародніны і сена. Усе падзелены на калгаснікаў і аднаасобнікаў. Напрыклад, за адну авечку калгаснік здае 300 грамаў воўны, аднаасобнік — 500 грамаў. Бульбы з аднаго га аднаасобнік — 20 цэнтнераў, калгаснік — 12.

У гэты ж час пачалася «ссылка в отдельные районы». Арышты прайшлі раней, яшчэ нават у кастрычніку, калі бралі мужчын. Запісваю, што расказвала маці. Сем'і вывозілі напрадвесні. Помніцца, мы неўзабаве пачалі адкрываць картапляныя ямы: Соня Янкава аддавала нашаму бацьку картоплі, за тое, што малаціў. Тады ж вязлі з Вільні гімназістак. Яны, маладзенькія дзяўчаткі, горда спявалі ў таварных вагонах, акружаных вартаю НКВД: «Не жуцім земі, сконд наш руд, не дамы погжэсць мовы! Мы польскі народ! Польскі люд...» А салдат пароў у акно штыхом. Янку Нагорнага, нашага

сваяка, прывезлі ў Наваельню на чыгуначную станцыю ўжо з Навагрдскай турмы. У цесных, запруджаных арыштантамі, вагончыках вузкай калейкі. Адсядзеў ён шэсць месяцаў. Да вагонаў нікога не падпусцілі. Янка паказваў на мігі. Дочцы Соні назаўтра дазволілі падысці. Янка сказаў, што ўдалі яго нашы ж варакомцы — Соўка, Мацюшка і Салавей. Напісалі, што меў двое коней, чатыры каровы і трымаў парабкаў.

З вузкай калейкі на шырокую арыштантаў пераганялі, не даючы падняцца, — гуськом.

Янка на высылцы ў Архангельску быў, а сям'я — у Акмолінску. Ад голаду выратаваліся тым, што дзеці лавілі суслікаў, а маці іх смажыла.

Колькі ж дакументаў, роспытаў вымагае раман — усе мае запісныя кніжкі набрынялі ад выпісак з архіваў, слоўнікаў, газет, кніжак, успамінаў сведак тамтэйшых падзей.

Не ведаю дзеля чаго, але запісваю і гэты факт, узяўшы яго з віленскай газеты «Беларускі дзень»: «Ігнат Буйніцкі радзіўся ў маёнтку Празароках. Вучыўся ў рыжскай землямерскай школе. Памёр на фронце 19 верасня 1917 года. Пахаваны на могілках каля паўстанка Палівачы (Маладэчна—Загаце). Дзве высокія сасны над магілай».

Выпісваю, бо дзе ж прачытаеш пра дзве высокія сасны над магілаю Ігната Буйніцкага? У нас так мала сапраўдных літаратурных слоўнікаў, энцыклапедычных даведнікаў, нібы мы прыйшлі ў дзевятнаццатае стагоддзе з каменнага веку. Як мала мы ведаем пра сябе, тым болей пра правы свае чалавечыя. Ізноў

выпісваю з таго ж «Беларускага дня»: «Калі сорамна якому народу ня ведаць сваіх правоў, баронячых яго вольнасць, ды асабліва было б сорамна тое нам, маючы правы, пісаныя не абы-якой чужой, а ў сваёй роднай мове».

Гэта з прадмовы Льва Сапегі да Літоўскага статута.

Без даты. Маці расказвае, а я па парадку, ці, як у нас кажуць, спрытном, запісваю кабечую работу.

Пакуль кучаць картоплі, беляць палатно. Потым полюць агарод. А там — жніво. Жаць ідуць на Яна або пасля яго. Бывае перад Пятром або пасля Пятра. Як які год. Услед за жытам паспявае ячмень. А за імі рвуць лён. Жнуць авёс і лён сцелюць. Потым — грэчка, далей — картоплі. Выкапаўшы картоплі, высякаюць капусту. У глухую восень труць ужо лён. Потым трэплюць і чэшуць. З Каляд у мясаед прадуць. Ткуць па запустах.

Але ж іншы год у мае мацеры былі позні кросны, нават, помніцца, у маладое лета. І я прыгадваю свой нялёгкі да апрыкрасці абавязак, калі ў хаце пры акне стаяў варштат з навітаю ўжо пражаю, — сукаць адна за адною кароценькія цэўкі. Слініш руку і без перастанку круціш корбу сукала, з адчаем і крыўдай думаючы, што твае равеснікі тым часам вольна ды бесклапотна бегаюць каля рэчкі ды па багнішчы, высочваючы качыныя гнёзды. Як усё ж доўга помніцца дзіцячая крыўда. І якія ж незагойныя раны чалавечай душы.

А што да радзюжак, то як неспадзявана і нечакана адышло ды звялося ўсё, каб астацца

горкім успамінам пра недаспаныя жаночыя ночы з бясконцым і доўгім, як сама нітка, прадзівам пры малых і заўсёды хворых дзецях. І колькі ж, між іншым, трэба было мецъ цярплівасці, а пры ёй і жалосных песняў, каб панатыкаць столькі непаўторнага хараства — тых самых радзюжак з прыгожым і размаітым узорам.

Дзе ж яны сёння, нашы беларускія куфры з роднымі радзюжкамі ды залатымі паясамі?

Без даты. У Актах, выданых Віленскаю археаграфічнаю камісіяю, натрапіў выпадкам на інвентар маёнтку Здзецела, яго міласці княжаці Канстанціна Астрожскага. Напісаны ён падкаморым Наваградскім «у року цяпер ідучом тысяча пяцьсот восемдзесятом месяца Апрэля, дваццаць чацвёртага дня, у нядзелю». І чытаецца для мяне як пачатак займальнага рамана з часоў Аляксандра Дзюма: «Найперш, уехаўшы ў двор, па правай руцэ дамок малый, у катором светлічка, в ней печ простый, абалоны паперныя, у бок тое святлічкі каморка, а праціў — другая, між імі сенцы, дзверы двоі на завесах, зашчапкі і прабоі.

Подле таго дамку піўніца новая... Дом вялікі пры зямлі, у катором святліц дзве аб адных сенях нарозні, печы добрыя пілаваныя, абалоны ў сталовай святліцы шкляныя... Па другой старане дом новый... па трэцяй — старый... Па чацвёртай старане свіран...»

І якія тут «месцячанскія» прозвішчы — адразу пазнаеш, хто ёсць хто, як у гогалеўскім «Рэвізоры»: Іванкава ўдава, Хведар Каробка, Ян Муляр, Міхалко Каваль, Гаўрыло Швайка,

Грышка Чабатар, Ясюк Брычка, Міхно Мельнік, Федчык Каваль, Якім Півавар, Ян Нямко, Лаўрын Дайліда, Стасюк Свістун, Сямён Ключнік, Ганна Салодкая...

Ці не адсюль, ад прозвішчаў, ад фаху, ад прафесійных здольнасцяў, ад працавітасці альбо гультайства бярэ свой выток беларуская казка, якую так удала і дакладна запісаў Аляксандр Сержпутоўскі. Зноў не магу стрымацца, каб не выпісаць: «Баба гожая, румяная, нібы кроў з малаком. І вочы чорныя, празрыстыя. Як гляне, дык аж у сэрца заколе і ў вачах цёмна стане». «Праўду людзі кажуць, што ў стральцы дым густы ды абед пусты, а рыбак як памочыцца, то есці не хочацца».

Без даты. Вярнуўся з бібліятэкі (беларускі аддзел). І зноў мая запісная кніжка набрыняла ад індэксаў, спісу ўказальнікаў, тлумачальных выразаў і слоўцаў, неардынарных і нязвыклых прозвішчаў і імёнаў: пташнік (пцічнік), асаднік (пасяленец), абора (хлеў), лаўнік (дазорца, наглядчык у вёсцы), паперня (папяровая фабрыка), талька (маток), дзядзінец (унутраны двор), прынада (прыманка), сківіца (скула), таліс (белае суконнае палатно для малітвы), тфілін (багамойла), наймітка (у нас — наймічка), валачобнае (дань яйцамі), вянок (вязка грыбоў), валоўня (стойла), гвалты (работа звыш паншчыны), грыдня (святліца), карбона (грашовая конаўка), шарварка (праца на агульную карысць, рамонт мастоў і дарог), еча (стрававод), ручайка (жменя ачэсанага лёну).

Усё збіраю, як дзяўчына перад замуствам,

рыхтую пасажнае, толькі ж калі тое свята будзе — калі ж пісацьму раман? Зняверыўся і не ведаю, як да яго падступіцца.

Без даты. Цікава, ці дазваляе слоўнік, выданы пад рэдакцыяй Кандрата Крапівы, пісаць так, як ён сам пісаў у рамане «Мядзведзічы: «Юзік сядзіць край стала», «Насілу ўкацілася ў хату», «Канцы мядзведзкіх палос». А між іншым, я таксама напісаў бы «край стала», «насілу ўкацілася», бо гэтак гавораць і ў нас.

Без даты. У грунтоўным, без лішняй прэтэнзіі на навуковасць, даследаванні П. Баброўскага «Гродненская губерния» (частка II, 1861) натрапіў на цікавы неардынарны факт: «В некоторых деревнях окрест Здентела (Дзятлава) живут потомки прусов барты, говорящие на литовском языке. Некоторые их считают ятвягами».

Мова старажытных бартаў існавала ў нас ажно да трыццатых гадоў гэтага стагоддзя, але гаварылі на ёй толькі ўжо барышнікі на кірмашах, перапрадаючы коней. Асабліва з вёскі Засецце, з радзімы Ігната Дварчаніна. Пра гэта ўспамінае мой бацька.

Дарэчы, і тапаніміка на Дзятлаўшчыне спрэс балтыцка-крыўская: Гезгалы, Погіры, Малдуці, Ятвезь, Гірнікі, Варакомшчына, Бакшты, Курпяшы... Як нямала і прозвішчаў ятвяжскага паходжання. Адно ёсць нават у нашай Варакомшчыне — Кекшук.

З двух салідных і аўтарытэтных тамоў таго ж П. Баброўскага, які, між іншым, як і ўсе даследчыкі, што збіралі матэрыялы «для географии и статистики России», з'яўляўся афіцэ-

рам генеральнага штаба, я выпісаў бадай увесь сельскагаспадарчы каляндар, назіранні над прылётам і адлётам пташак, хваробы на быдла, зёлкі, народныя прыкметы і нават назвы садавіны — нашых груш і яблыкаў. І, вядома ж, колькі пудоў сена (80) з'ядае карова і колькі вазоў гною яна настоіць.

Не ведаю толькі, ці прыдасца, ці спатрэбіцца гэта ўсё для майго рамана? Аднак спадзяюся хоць на мінімальную карысць.

Без даты. Для апавядання. Кожнае лета ён прыязджае дадому і кожны раз не адважыцца сказаць старой Барбары, што бачыў яе Казіка, ужо нежывога, у Белавежскай пушчы. Было гэта напрадвесні 44-га, была вялікая аблава на партызанаў, і Казіка тады забілі.

Пазіраючы ў спакутаваныя, заплаканыя вочы старое кабеты, якія ўмольна прасілі толькі аднога: Казік жывы? І ён пацвярджаў: жывы. Далей гаварыла яна ўжо сама: «Я вываражыла на карты — сынок жывы, у Нямеччыне».

Ён ужо другі дзень як дома. Сядзіць каля адчыненага акна і глядзіць на Барбарыну хату. Нарэшце рашаецца сказаць Барбары праўду і пытае ў маці: «Нешта ж Барбары не чуваць, не ганяе, як заўсёды, з бэзу курэй?» А маці, з жахам спахапіўшыся: «А ці ж табе не сказала, ужо ж з месяц, як памерла». І ён чуў, як на яго раптоўна, нібы пасля пякучай маланкі, упала і абняла сваёю глыбінёю цемень адчаю, крыўды, вінаватасці. Нешта невымоўна цяжкае гняло яго, і ён сядзеў, як абязвечаны, пазіраючы на бэз за акном, на праваленую страху Барбарынай хаты. Нарэшце павярнуўся

да маці і выдыхнуў тое, што так доўга таіў: «А ты ж ведаеш, мама, Казіка ў блакаду забілі». «А ці ж я не здагадвалася», — з нейкім нават спакоем адказала маці. Ён здзівіўся, нечакана падумаўшы: «А можа, гэта сказала б і Барбара?»

Без даты. Маці пераказала, а я, ледзве паспяваючы, нарэшце занатаваў назвы варакомскіх урочышчаў: Крыніца, Ахонава, Пералог, Ялавіна, Гораўшчына, Лука, Смуга, Ратамшчына, Падліпа, Крыштопаўшчына, Загарушчына, Руськае поле, Юрашча, Куляшэўшчына, Доўкушчына, Глінішча, Марге, Свой кут, Жукова гара, Азярышча, Полужні, Зосіна, Камяніца...

Без даты. З Гродзенскага гістарычнага архіва прывёз некалькі вучнёўскіх сшыткаў з выпіскамі з інвентара «Помещичьего имения Новоельна», складзенага 5 снежня 1845 года. Дзіўлюся, што да нашага маёнтка з васьмю фальваркамі прыналежала ажно 23 вёскі і адно мястэчка — Раготна.

Але цікавасць і наіўна-дзіцячая радасць мая ў іншым: у трэцім фальварку Ахонаў (Ахонава), у вёсачцы на восем двароў Аханяны я натрапіў на прозвішча Адамчык. Праўда, тут два Адамчыкі — Тодар і Сымон. Хто ж з іх мой прапрадзед? Дарэчы, бацька ўспамінае, што быў нейкі Захарка. Ці не Захаркаў сын Янка Адамчык прыйшоў у прымы ў суседнюю вёску Варакомшчыну? Ад яго ўжо паходзіць мой дзед Тодар.

Янка Адамчык прыстаў у прымы да Блажэевай дачкі і нават паклікаў у помач на добрую гаспадарку малодшага брата Алеся. Дарэ-

чы, як відаць з інвентара, гаспадарка ў прыгоннага Язэпа Аблажэя была даволі заможная: 1 конь, 4 валы, 3 каровы, 17 авечак, 3 свінні, 11 вулляў пчол.

Такіх ужо ў часы сталінізму запісвалі кулакамі і, сканфіскаваўшы маёмасць, ссылалі на Сібір.

Казімір Шайбак (у яго быў брат Фэлікс), адкуль паходзіць матчын род, нашмат бяднейшы: 1 конь, 2 валы, 2 каровы, 4 авечкі, 2 свінні.

Аднак, учытаўшыся ўважліва ў інвентар, бачыш, як нялёгка жылося прыгоннаму варакомцу (але калі ж яму лёгка было?).

З двара, надзеленага 21 дзесяцінай, прыгону ў тыдзень павінна адбываць: з вупражжу — 3, пешых таксама 3 дні, згонаў, ці як яшчэ казалі, — гвалтаў у год з двара вупражных — 2 і з душы 10 пешых дзён. Звыш гэтага мужчыны хадзілі нанач на варту (няслі каравул), а чатырнаццацігадовыя падлеткі збіралі хмель. Апрача ўсяго, была яшчэ грашовая павіннасць і рэчавы збор ці даніна: з двара варакомцы аддавалі 3 курыцы, 10 яец, 3 талькі, 3 фунты сушаных грыбоў і фунт невадавай пражы.

Ізноў мне прыгадваюцца сталінскія законы пра абавязковыя пастаўкі і бацькава торба, поўная квіткоў ад здадзенага жыта, бульбы, сена, воўны, лёну, масла, мяса, страхоўкі, грашовых падаткаў і іншых прымусовых збораў, што чамусьці называліся дабравольнымі.

Папраўдзе ж пруцянелі людзі ад страху і чакання, як пішацца ў Евангеліі.

Як паўтараецца жыццё, ідучы па замкнутым крузе.

А калі ж прыйдзе збавенне? Няўжо толькі са смерцю чалавечай?

Без даты. Для апавядання. Усё прыйшло так нечакана, усё змяшалася з радасцю, з балючым адчаем, брыдкасцю і нервовым перажываннем, што ён нават палічыў быў сябе злодзеем. Тым злодзеем-падлеткам, які ноччу разам з равеснікамі крадзецца ў чужы сад, — і страшна, і холадна на сэрцы, і разам з тым соладка, і не столькі хочацца тых яблыкаў, як магнэзам цягне нарваць іх...

Яму нават смешна з самога сябе, што ён робіць такое — дзеля забаўкі лезе ў чужы сад...

Цяпер, варочаючыся на верхняй паліцы ў купэ скорага цягніка і чуючы, як грукоча, турзае і калыша яго вагон і ляціць праз ветраную ноч цягнік, ён адчувае такі смутак, такую жальбу, якую не адчуваў даўно ды нават ужо забыўся, што можна пакутаваць і праз каханне.

У яго перад вачыма стаяў людна-суматошны вакзал, прадзьмуты скразнякамі перон і... яна ў белай шапачцы, з бязвольна і квола ўзнятай рукою... і яе пальчыкі, якімі яна ледзьве варушыла і якія перад гэтым ён так пяшчотна цалаваў.

Яму ўспаміналася патаемнае, украдкамі ад усіх беганне на тэлеграф і гэты заўсёды прыспешлівы голас тэлефаністкі: «Ну, гаварыце!» І ўжо нарэшце адзывалася яна, аж у яго замірала сэрца: «Это ты, Андрюша?» Разам з голасам праз бяссонную далечыню да яго вяртаўся і яе мілы наіўны тварок. Цяпер жа ён расплываўся, тануў, як у глыбокай вадзе, і ад

гэтага яму рабілася больш пакутна, тужліва і адчайна.

Без даты. Можа, прыдасца?.. Ён меў шмат кабет, а прыгадвалася найбольш адна, з якою не было ніякай блізкасці, з якою ўсяго толькі разы са два пагаварыў. Яму здавалася, што іншых ён трохі любіў і жыць нібыта без іх не мог, аднак усё мінала, праходзіла, і яму зноў успаміналася яна, зусім простая і не вельмі, каб сказаць, прывабная маладзіца.

Без даты. Можа, і пра гэта напішацца? Мішка Бабок прадаваў матчыну хату, купляў яе аднарукі Самусь Дзедзіч, з суседніх хутароў.

Са стратай бацькоў меркне святло роднай хаты. Са стратай роднага парога меркне і глухне святло Бацькаўшчыны.

Без даты. Мокры пасля дажджу, тлуставата-блішчасты асфальт. У лужынах трапяткое святло ад ліхтароў. Чорны вечар, чорная гразь. Нехта ідзе тратуарам, сагнуўшыся і трымаючы рукі ў кішэнях. А за ім на драўлянайназе-калодцы прыспешвае інвалід.

Услед малады тата вядзе трохгадовую дачушку.

Яна ўбачыла інваліда з дзеравяшкаю і, здзіўленая, спытала: «А чаму ў дзядзі такая нага?» «Ён быў на фронце, і яму снарадам адарвала нагу. А каб мог хадзіць, дзядзю прырабілі дзеравянную», — адказаў тата. «А як жа ён спіць з гэтаю нагою?» — «Нанач здымае». — «А як жа хадзіць тады?» — «Скача на адной назе». — «Як заяц?» — сказала дзяўчынка і засмяялася. І чорны дажджлівы вечар раптоўна наўкруг перайначыўся і пасвятлеў.

Без даты. Перагортваю зноў «Памятныя кніжкі» то Віленскага генерал-губернатарства, то Гродзенскай, то Мінскай губерняў. Не ведаў, напрыклад, што нашы местачковыя прозвішчы Кардаш і Мурзіч татарскага паходжання. Дый пані, якой прыналежаў тутэйшы маёнтак Карыцы, таксама магаметанскага веравызнання, пра што адзначана ў спіску землеўладальнікаў Мінскай губерні. Як і нейкі Мурзіч — уладальнік фальварка Агароднікі. Дваром Азяраны, адкуль, помню, бацька прыносіў надзіва вялікія антонаўкі — гэта пасля вайны, калі ўсе панскія сады абагуліла і забрала база «Плодоовощ», — валодаў Казімір Дамейка, брат знакамітага даследчыка Чылі, чыім імем у знак павагі і ўдзячнасці названа адна з вяршыняў Кардыльераў. Сюды ж, у Азяраны, за колькі гадоў перад смерцю, развітацца з Бацькаўшчынаю ды ўжо на астатку ўбачыцца з блізкімі ды сваякамі, прыязджаў абцяжараны гадамі і славаю Ігнат Дамейка.

Як усё радасна ўсведамляць і чуць святло на душы, што хоць крамяная антонаўка лучыць цябе з даўняй беларускай культурай.

Тут жа ў спісе землеўладальнікаў і мне знаёмая Лапушня — двор з млыном, міма якога падлеткам я бегаў у Кажыхуцкі лес па ягады. З тых гадоў помніцца зламаная, расчэпленая перуном асіна, зараслы крапівою і сніткай падмурак панскага палаца. Лапушня належала Ёдкам, праўдзівей, — удаве Марыі Ксавэраўне, пра якую ўжо ўспамінала маці, расказваючы пра шасцярык (шасцёра коней), на якім дарогаю каля нашай вёскі ездзіла старая пані. Сын

яе — гэта ўжо, вядома, плётка, — хацеў вярнуць паншчыну, за што быў застрэлены нават самім Пілсудскім.

Плёткі распускаліся, напэўна ж, знарок, каб выклікаць злосць і натравіць на помсту. І помсцілі чым і як толькі маглі, на што былі здольныя. Малады мужчына з нашае вёскі, нібы зусім адышоўшы ад розуму, у звар'яцелай, дзікай злосці, скруціў галоўку ў прыгожай скульптуры, якая стаяла перад дваром як памяць аб заўчасна памерлай Ёдкавай дачцэ, а потым, збегаўшы ў мястэчка, павыбіваў шыбы ў тых дамах, якія пакідалі, адступаючы, немцы.

Аднак жа праўда: страшны чалавек, калі даць яму ўладу помсты.

У часе гэтай апошняй вайны, таксама вар'яцеючы ад самаўпраўства і неабмежаванай улады, партызаны спрытном (падрад) палілі ўсе тутэйшыя маёнткі і асады, іншы раз нават з іхнімі старымі гаспадарамі. У пасляваенныя гады я бачыў толькі зарослыя падмуркі, загаджаныя ды знявечаныя капліцы, дзе былі звычайна сямейныя захаванні, ды нялітасціва пасечаныя паркі і ліпавыя алеі.

Так руйнавалася наша архітэктура, наша гісторыя, наша гістарычная памяць, каб потым сказаць: «А беларусы нічога не маюць».

Знішчалася дарэшты ўсё — ад беларускай пасівелай яблыні да беларускага святога слова, якім тыя ж партызаны ніколі не карысталіся.

Ратуй нас, Божа!

<u>Без даты.</u> Зноў абклаўся томікамі М. Федароўскага, І. Насовіча, В. Дыбоўскага, М. Дзміт-

рыева і выпісваю прымаўкі, каламбуры, анекдоты, якія блізкія мне і якія яшчэ па сённяшні дзень, дзякуй Богу, не зваліся ў нашай Варакомшчыне.

— Дай мне.

— Твой нос у г...е. Абатры — дам тры.

— Лепш Моўчадзь, чым Гарадзішча. (Нашы гандлёвыя мястэчкі Моўчадзь і Гарадзішча. Сэнс такі: лепш маўчаць, чым абышто гарадзіць.)

— Гэта тая, што хвастом матае.

— Што?

— Паляцела варон сто.

— Хто?

— Хтоцкі.

А поруч з выпісанымі і фалькпорнымі помніцца і дыялог з прыгараднага аўтобуса Мір—Наваградак:

— Ну, як здароўе?

— Не тут пытаеш, трэба ў сталоўцы.

— Садзіся, чаго стаяць — ногі ж не казённыя.

— На тым тыдні сядзеў, на гэтым пастаю.

А гэта ўжо матчына:

Поп людзей карае, а сам бабу валяе.

Які палец ні адсячы, кожны баліць.

Не збірай дзецям пасагу, збірай ім розум.

Каб ёй (суседцы) рогі, тут чорт не быў бы.

Катку жарты — мышцы смерць.

Нямала дасціпнага, падсоленага, вядома, грубаватасцю, запомнілася і з даўнейшых варакомскіх вячорак:

— Добры вечар!

— Добра білі — добра енчыў.

Усякае дыханне любіць папіханне.

Які там мужчына — аршын з шапкаю.

Яго нос на двух рос.

А гэта ўжо са зборніка Яна Чачота: «Сем сёл, адзін вол і дзесяць ураднікаў». Дарэчы, як і цяпер — наўкруга адно начальства з ураднікамі. Маці жаліцца: «Развялося поўна брыды, рабіць няма каму — усе лянуюцца. Скора і нябожчыка не будзе ў што акрыць».

Без даты. У трэцім томе дакументаў і матэрыялаў, выданым інстытутам гісторыі АН БССР, натрапіў на рапарт павятовага спраўніка пра нечувана дзікае здарэнне, ці, праўдзівей, забойства, што адбылося 23 мая 1907 года ў блізкіх ад нас Данілавічах, вялікай — на сто двароў — вёсцы.

Данілаўцы, не астудзіўшы свой сервітут*, пачалі ўжо дзейнічаць каламі, віламі і нават дубальтоўкамі, ганяючы з сваёй зямлі рабочых, нанятых маёнткам. Тады эканомія двара выклікала спраўніка з прыставам і два дзесяткі конных стражнікаў. Спраўнік, убачыўшы, што сяляне з усёю рашучасцю, падбіраючы ўсё тую ж зброю пралетарыята — каменні, не падпускаюць на сенажаць ні гаспадароў, ні стражнікаў, даў загад страляць у натоўп. З першага залпу, як паведамляецца ў рапарце, упалі забітыя Мацей Сёмуха і Юлька Кулеш. Тады з лесу пачалі адстрэльвацца данілаўцы. «Ответным огнем (стражнікаў), — пра што паведамляе той жа рапарт, — были убиты Магдалена Сёмуха и ране-

---

* *Сервітут* (ад лац. servio) — права карыстацца чужой нерухомасцю.

ны Иван Добрук, Ядя Жих и Барбара Жих».

Гэты інцыдэнт стаў нават пачаткам нашага годаадлічэння — рахуба часу ці эры, асабліва для старэйшых жанчын: «Мне ж было тады пятнаццаць гадоў». Не без гонару хваліліся яны. Страта нашага варакомскага сервітуту, што быў за ўрочышчам Свой кут, скончылася больш ціха. Як расказвае маці, яго патаемна і хітра спрадаў тутэйшаму пану Матусэвічу, ужо пры Польшчы, варакомскі солтыс Юзік Лазовік. А калі, бывае, пастухі пускалі быдла на сервітутную пашу, ён зрываў у іх шапкі і нёс у мястэчка на паліцэйскі пастарунак.

У часе вайны сервітутную зямлю ў Сваім куце і прыгожую атынкованую белую хатку з вялікім гумном арандаваў тутэйшы панок Левановіч. Я помню яго, здароўча-чырвоненькага дзядка, што прыходзіў з доўгай арэшынай адганяць ад свае сенажаці нашыя каровы і лаяўся заўсёды па-руску: «Ух ты, подлая собака!»

І нам, хто не ведаў рускай мовы, было даволі смешна, што сабака ў яго «яна». У гарачае лета 1943 года адзінокага старога арандатара забілі, толькі не нашы варакомцы, помсцячы за сервітут, а партызаны, якія шукалі па хутарах золата. Ды не проста забілі, а ўкінулі ў калодзеж. А золата, між іншым, у збяднелага арандатара не было, былі адно салідныя падшыўкі часопісаў ды польскія выданні Сянкевіча, Пруса, Ажашковай у чорных скураных вокладках, якія мы, пастухі, прымалі за біблію, носячы іх з разрабаванай белай хаткі дадому. Я, бяспамятна радасны і ўзбуджаны, прынёс падшыўку «Нивы» за 1909—1912 гады.

Тады ж і адбылося маё першае, яшчэ не вельмі і свядомае знаёмства з рускай паэзіяй.

Чамусьці, успамінаючы вайну, я, міжволі, успамінаю і гэтую белую хату з раскіданымі і бязлітасна растаптанымі на падлозе кнігамі. І боль мой не меншы, а можа, і роўны ад бязвінна забітага чалавека і растаптаных кніжак.

Серада, 28 чэрвеня. Цвітуць і не могуць атрэсціся ад увішных пчол жоўта-зялёныя, густа і цёпла пахучыя ліпы.

З-пад зялёных і шорсткіх лістоў гурочніку вызірае прывабны жоўты цвет, і тут гвіжуюць умурзаныя ў пылок, як сяляне на малацьбе, і абцяжараныя ад сваіх ношак увішна працавітыя пчолы.

Гладканогія, смугла-загарэлыя маладзіцы з карзінамі і бітонамі сіне-дымных чарніц таксама ўвіхаюцца, як пчолкі... Спадніцы і ногі ў ліловых плямах, нібы іх хто качаў па спакуслівых ягадах.

Субота, 15 ліпеня. Вызірнуўшы з-за плота, ужо зацвітаюць вяргіні — знак блізкай жоўтай восені, ажно халадок крадзецца за плечы. Успамінаецца матчын гародчык, поўны, як яна кажа, юргіняў, і нечая магілка з цянюткімі, як снітка, жоўтымі кветкамі.

Нядзеля, 23 ліпеня. Падлеткі з прывязанымі да пояса бітонамі чапляюцца на вішні — час абіраць падзёўбаныя, папрабаваныя ўжо на смак дападнымі шпакамі чырванавата-карычневыя ягады:, і каля кустоў калючага агрэсту цэлыя раі дзяўчат, дзяцей, маладзіц і мужчына ў рукавіцах.

Вечарам нібы спадцішка, без грому, рахмана-шапаткі, шчодры дождждык. Пасля яго ў росным садзе, дзе між аселых яблыняў густа ўзнялася бульба, нечаканы і моцны, ажно да звону ў вушах, строкат конікаў. Пэўна ўжо тых, зялёных і вялікіх, што выводзяцца ў гаросе. У памяці вяртаецца дзяцінства — холад струкоў за пазухаю і іхні мяккі, хромавы скрып.

Субота, 29 ліпеня. Скрозь па замежках серабрыць пахуча-горкі, ёдзісты палын і цвіце па нашых варакомскіх занядбаных кветніках аранжавы кракос. Прыгадваецца сама сабою прачытаная ў пятым томе Міхала Федароўскага ці не вясельная прыпеўка, дарэчы, усяго адзін радок з яе: «А ў гародзе кракос рос». Ды ўся беларуская песня ўпляла ў свой вянок кветкі і зёлкі: зялёна рута — жоўты цвет, хадзіла дзеванька па полю ды віла вянок з куколю, а ў лузе каліна з расою, зялёны барвіначку па гародзі слаўся... А ў японцаў сімвал чысціні і хараства — вішня. У рымлян — лісце дуба. Цяпер жа усе чалавечыя сімвалы з сінтэтыкі і металу.

Субота, 12 жніўня. На дарозе вільготны, падзёўбаны даждждом пясок. Пры ганку чыгуны з маладою ружоваю бульбаю. Сенцы пахнуць яблыкамі — яны, назбіраныя пасля ночы, у каранёвых кошыках. З адчыненага акна чуваць строкат швейнай машынкі і вызірае дзявочы твар.

Вечар з нізкаю цемнатою, яблыні — як купы стагоў. З акна цёпла і ласкава на блізкую грушу падае яснасць, высвеціўшы буйныя

дулі. У гэтым ціхім святле і вільготная галіна слівы. Конікі свідруюць мігатлівы бэзава-сіні змрок, і каля вушака паскрэбвае шашаль. Ён для мяне сімвал нашай беларускай горнасці, адзіноты, жальбы і беднасці, маіх далёкіх падлеткавых ночаў, салодкіх думак пра іншы, мудрэйшы і дабрэйшы свет, якога, напэўна, ва ўладзе боскай нідзе няма.

Панядзелак, 14 жніўня. Учора раніцай зноў шапаткі рахманы дожджык. Ластаўкі мокрыя, нібы з вады, згорбіўшыся, лёталі па гародзе між яблыняў. Над грушаю віліся жоўтыя восы, залятаючы, як у гнёзды, у спелыя, імі ж праточаныя плады. З суседніх двароў мякка пасвечвалі букеты ліловых і белых флёксаў. Над платамі цэлыя вянкі ацяжэлых слівак — чырвона-ліловых і лілова-сініх, як ахутаныя дымком ад папяросы. Няўжо гэтае хараство было да цябе, пры табе і пасля цябе будзе? Ці, можа, яно ў табе адным ці для цябе аднаго?

Серада, 16 жніўня. Дзень спякотна-гарачы, сухі — і як сто, і як дзвесце гадоў назад дажынаюць аўсы. Помню, як маці ішла на поле, несучы пад пахаю намочаныя жытнія перавяслы, помню яе вялікі, большы, як у іншых жнеяў, серп, а потым і яе таўсцейшыя, чым суседчыны снапы. Ды і ягад яна збірала болей за варакомскіх маладзіц. Гэта таксама помню.

Невядома па якой асацыяцыі і чаму, але і апавяданне Кузьмы Чорнага з яго светла-жоўтага томіка выбраных твораў (выданне 1947 года) вяртае ў даўнія гады — шырокая, ветраная і пыльная дарога, якраз нібы дома, нібы ў нашай Варакомшчыне, нібы на ёй

заміж таго хлопчыка сяджу я і кажу таксама: «Будзем зараз аўсы сеяць».

Каб зразумець і адчуць, і ўявіць гэта, мусіць, трэба нарадзіцца вясковым хлопцам, бачыць шырокую пясчаную дарогу, абпаленую сонцам, тых земляных восаў і сябе на гэтай абветранай сумна-пустэльнай дарозе.

Які вялікі і бясконцы смутак у гэтай абветранай дарозе. Як ён высмоктвае душу. Аднак, праўда, усё гэта трэба перажыць сам-насам, на палявой пясчанай дарозе, нялітасціва абпаленай сонцам і забытай падарожнымі.

<u>Без даты.</u> Для аповесці «Асот»; хлопец сніў, што меў дзеўку, і яму пачало здавацца, што гэта сапраўды было.

<u>Без даты.</u> Для апавядання пра грузчыкаў. Загадчык базы ходзіць накульгваючы, як па кладцы, ставячы ногі ўпоперак адна адной — накрыж.

На грузчыку картовыя порткі, да якіх наліплі і засохлі хлебныя крошкі, і злінялая фуфайка, якая не здымаецца нават у спёку. Дужая рука яго раз за разам шоргае ў кішэню і дастае адтуль паўжменькі зеленаватых жытніх зярняткаў, ён дзяўбе ў іх шчопцямі і кідае ў разяўлены рот.

Глыбока, аж да самых вушэй насаджаная вайсковая фуражка прапацела і зашмальцавалася, на макаўцы тлустая пляма, нібы на фуражку кладуць подмазку ад скаварады.

— Знаеш, што я табе скажу?

— Ат, ідзі ты са сваім казаннем!

— Ты не быў там, дзе косці мелюць... і па дарожках тых не хадзіў...

— Я, браце мой, хадзіў і шырокімі, і вузкімі, а людзям на комін срачы (туалеты) не ставіў.

— Аднак трэба ж мець спрыт.

— Чатэры разу жаніцца.

— А нашто ж жаніцца, калі можна чужым жывіцца.

Ён бярэ па драўлянай скрынцы пад абедзве пахі і па скрынцы ў рукі і йдзе, у такт хадзе ківаючы галавою. Ім сумна. Яны ловяць казу і прывязваюць ёй да хваста пустую бляшанку. Каза з перапуду ляціць пад таварны цягнік.

Без даты. Не прыгадаю, у каго прачытаў — у П. Баброўскага ці І. Зяленскага? Зрэшты, у адным са зборнікаў матэрыялаў для статыстыкі і геаграфіі Расіі пра нашу спрадвечную беларускую хваробу — каўтун. У жанчын яна пачынаецца галаўным болем, шумам у вушах, ціскам пад ложачкаю і асаблівым адчуваннем, якое нагадвае поўзанне па спіне мурашак. Пры каўтуне п'юць дэкокт (адвар) з травы барвінок і абліваюць ім голаў.

Я толькі ўсяго раз бачыў гэтую быліну — паказвала маці, напытаўшы яе ў нейкіх мястэчковых зёлачніц. Дзіўна, аднак, было — яна нагадвала мне знаёмую каліва бруснічніку, толькі з большым лісцем. Дзіва брала і ад іншага: маці прынясла гэтую расліну не для лекаў, а проста для цікавасці — яна кожнае лета збірае зёлкі, наровячы, як гэта раіць народная мудрасць, рваць іх далёка ад вёскі, каб не чуць пеўневага голасу. «Каўтуна я не лячу, — прызналася мне, — гэта ён мяне лечыць». Яна, павярнуўшыся патыліцай, адкіну-

ла парадзелыя, але яшчэ цёмна-сінія валасы і паказала каротка завітую коску: «Гэта ж каўтун адпусціла — ён мне памагае — выцягвае ўсю хваробу з рук і ног. Не баляць члункі (суставы). Нябось добра памагае. Знохар нараіў. Гэтак і лячуся. Дахтарэ мне толькі шкодзяць».

На памяць набеглі купалаўскія радкі: «Я хвор ды бедзен — сам бяруся лячыць сябе: я чараўнік! Бо я без доктара лячуся...» І, уражаны, я нічога не сказаў мацеры. Так лячыліся яе абедзве бабулі, яе родныя цёткі ды ўвесь яе жаночы род. І выжылі, каб нарадзіць мяне.

Бо як часам мы раім іншым рабіць тое, чаго самі дакладна не ведаем.

Без даты. Якая ўсё ж прыгожая, урачыстая і велічная беларуская хрысціянская традыцыя. Людзі, зняўшы шапку і перахрысціўшыся, жадалі самі сабе:

— Радзі, Божа! (Пры сяўбе.)

— Спор, Божа! (Пры малацьбе.)

— Малочна! (Калі дояць карову.)

— Памажы, Божа! (Калі жнуць.)

І ўжо на даўнейшых вяселлях:

— Дай жа, Божа, каб было гожа!

Весела жылося.

Шчасліва вялося:

У полі — урадзіста,<br>
У гумне — накладзіста,<br>
У клеці — насыпіста,<br>
У млыне — намеліста,<br>
У дзяжы — падходзіста,<br>
На стале — уедзіста.

Як нехрысці-бальшавікі звялі і вынішчылі

ўсё: і наша поле, і нашы млыны, і нашы малітвы з пажаданнямі. Нават нашыя літаратары, калі я пытаюся ў іх, чаму не пішуць пра сённяшнія святыя абрады і звычаі, з нейкім нават лёгкім смяшком і здзіўленнем адказваюць: «А гэта ўжо нецікава».

У мяне ад гэтага на сэрцы крывавіць рана.

Без даты. Маці, разгаварыўшыся пра нашы беларускія святы, кажа: «Дзяды святкуюць у тры тыдні пасля Пакроў». Ад яе запісваю і нашы варакомскія слоўцы і выразы: аднакавы (аднолькавы), праўдзівы (сапраўдны), стуль (адтуль), згэтуль (адгэтуль), сюдэма-тудэма, запальная пуля (зажигательная), малодшы (маладзейшы), старшы (старэйшы), акурат (якраз, дакладна), квіт (квітанцыя), скарбовы (казённы), латва (добра), помач (дапамога), зьмеркла (сцямнела), увярэдзіў (натрудзіў), нямашука (няма), ісціме (будзе ісці), нясём, бяром, вышай, ніжай (як у вершах Янкі Купалы), на шнурох, на палёх, на дубох (як у вершах Якуба Коласа), наастатку (напаследак), нэндза (гаротнасць, хваравітае дзіця), груца (ячная каша).

Без даты. Успамінае бацька: «Немцы спалілі Варакомшчыну 30 чэрвеня, у панядзелак, 1941 году, а грэчку я сеяў, вярнуўшыся з палону, 7 ліпеня — на Яна (на Івана Купалу)». І для мяне той пажар, і смерць суседзяў, і белая печ на пажарышчы, і галава спаленай каровы — гарачая кропля вайны, якая сцякае з маіх вёслаў, калі я плыву па акіяне ўспамінаў.

Нядзеля, 17 верасня. У Варакомшчыну,

праўдзівей, да Наваградка, ляцеў лёгкім двухкрылым самалёцікам, любуючыся ўжо зазелянелай рунню, пясчанымі дарогамі з маленькімі, як цацачнымі, грузавікамі, што цягнулі за сабою пасмы пылу, пажоўклымі выспамі бярэзніку ў густа-зялёных яшчэ лясах.

У Наваградку каля драўляных дамоў з вялікімі венскімі вокнамі і з пацямнелымі ўжо, у разводах іржы, бляшанымі дахамі — цэлыя табуны цёмна-ружовых і светла-жоўтых вяргіняў. Буйна-махрыстыя кветкі велічынёю з сланечнікавыя шапкі. З сівавата-запыленага лісця высоўваюць крутыя лабаціны чырвона-кармазінавыя яблыкі. Я люблю гэты колер з дзяцінства, мо таму, што ў маім, ужо няблізкім дзяцінстве не было наогул садавіны (марозлівая зіма саракавога, пажар 41-га знішчылі дашчэнту і сады і будынкі ды, праўду кажучы, і само дзяцінства, хоць з далечыні гадоў яго ўспамінаю кожны раз з абноўленай радасцю).

Дома ў перадвячэрняй цішыні суха і таямніча-даверліва шапочуць яшчэ зялёным лісцем высокія бярэзінкі, пасаджаныя гадоў дваццаць сем назад, ужо мною.

Хрыпатым і нядужым яшчэ галаском пяе маладзенькі певень. Сумна і адзінока на пашы рыкае карова, дадаючы мне асаблівага вясковага смутку. Пагруквае і парыпвае фурманка, марудна плывучы да невысокага чырванаватага сонца. На ім яшчэ грэецца, улёгшыся між сухіх частаколін яловага плота, паласаты гарбуз. На гэты ж плецены яловы плот завіўся і цвіце ясна-зялёнымі шышкамі пахучы надрэчны хмель, занесены сюды, мусіць, разам з але-

хавымі дрывамі. Тут жа сохне вывернуты сівай воўнай бацькаў стары кажух.

І божае дрэўка, якое пасадзіла маці на лякарства ад болю вачэй, ужо таксама роўнае з яловым плотам. Яно падобнае да палыну і мае гэткі самы густа-палыновы пах. Як блізка, як міла ўсё і якое ўсё пачужэла-далёкае.

Панядзелак, 18 верасня. Варакомшчына. Халаднаваты, сыраваты ветрык па асенняму ўжо студзіць плечы. Але ў зацішку за густым касматым, яшчэ не працярэбленым маладым хвойнікам скупое, ласкавае цяпло — ад мройнага, што хіліцца на вечар, залаціста-чырванаватага сонца. Грудок, падмыты рэчкаю, а пад ім — перагонамі сцішны і чуйны шэлест зялёнага алешніку і цыркатліва-звінючы булькат вады каля вялікага чорна-азызлага карча, што ляжыць пасярод плыценькай рэчкі. За ім люта кіпіць, віруе, закручваючыся лейкамі, вада, на ёй успыхваюць і пэнкаюць празрыстыя бурбалкі, кружыць парудзелая шапка пены. Ад рэчкі бліскае і слепіць мне ў вочы разбітае на асколкі сонца.

На пяску, каля плёса густа сцелецца пабіты рудою падбел. Рабаватыя палоскі ад хваляў бягуць па барханістым пясчаным дне. Касячок плотак-верхаводкаў нехаця ўецца каля карча, баючыся, аднак, адплывацца далей ад яго. Дыхнуўшы нечаканым скразняком, ветрык падварушвае каля берага карычневыя парасоны ссохлай, выпетранай лодзьмы і шабельнае пер’е аеру з жоўтымі ўжо кончыкамі.

За мною, як магільны грудок, ці капец, — зарослае перацвіўшым чаборам, ружовымі кат-

камі, якія надта ж любяць нашу пясчаную зямлю, котлішча ад даўнейшай хаты, пазарастаныя крапівою неглыбокія ямы, а далей, пад балотца, пад увіты хмелем алешнік, — знявечаныя, з пазакіданымі калкамі, якімі, пэўна, абівалася няспелая садавіна, дзве яблынькі. Усё, што нагадвае пра даўнейшы хутар, які перажыў ажно два пажары: першы — калі хату, праўдзівей — лён на печы падпаліў пяцігадовы хлопец (маці ў сенях грукала церніцай), другі — калі адбудаваную, але ўжо апусцелую хату нехта падпаліў, відаць, знарок (гаспадары яе — дарослы сын і дочкі — параз'язджаліся хто ў Данбас, хто ў Калінінград). Холад падкрадваецца і ад таго горка-смутнага ўспаміну, што звязаны з хутарам, які стаяў тут, на прыгожым тады яшчэ бязлесым касагоры... Гаспадар яго — Міхась Л..., перад вайною старшыня сельсавета, які разам з іншымі савецкімі актывістамі складаў спісы на вываз, у часы вайны — партызан, намеснік камандзіра гаспадарчага ўзвода, які займаўся болей нарыхтоўкай свіней, авечак і кароў, чым баявымі справамі, — застрэліў мужчыну, мужа прывабнай маладзіцы, да якой усё масціўся са сваім п'яным каханнем.

Пра гэта ўжо пасля вайны расказвала старая кабета, маці таго застрэленага мужчыны, якая, ідучы шашою ў мястэчка, кожны раз праклінала нашу вёску. Кляцьба была ўголас, каб чулі ўсе, з плачом, з заломваннем рук...

Не ведаю, ці ўчуў Бог голас спакутаванай кабеты, але толькі адбудаваная ў другі раз хата загарэлася якраз, як помніцца мне, перад са-

маю зімою, — толькі зямлю прыцерушыў першы сіваваты сняжок і заінелі верхавінкі ружовага алешніку. Як гарэла ўжо трэці раз, я, вядома, не бачыў.

Я азіраюся на пусты грудок з зараслым котлішчам і, здзіўлены, здумелы, пытаю ў самога сябе: «А няўжо было жыццё, хата, дзеці, лён, пажар?..»

Уздыхаю і, чуючы, як сочыцца і холадам сцякае на сэрца журба, іду да другога, не менш прыгожага і абвеянага зноў жа смутным успамінам надрэчнага касагора, дзе на строме, абкружаны старымі алешынамі з выдрынымі норамі ў падмытых карэннях, стаяў родны мне хутар — хата і гумно, а паміж імі на высокіх шастах антэна дэтэктарнага прыёмніка са слухаўкамі. Гэта была ўжо сядзіба майго роднага дзядзькі Яна Шайбака, матчынага старэйшага брата, якога за гэты прыёмнік, этажэркі і шкапчыкі з таямніча-загадкавымі кніжкамі я замілавана і сарамліва-скрытна паважаў. Гэта была асаблівая павага і пашана падлетка да сталага мужчыны.

Як памятка пра даўняе, на фоне сіне-густога, ужо, здаецца, стомленага за дзень неба цямнеюць высокія, нахіленыя ветрам бярэзіны з белымі, выпешчанымі на сонцы стваламі. Ажно не верыцца і ажно страшна — я помню іх малымі, ніжэйшымі за страху старога замшэлага хлява...

Пэўная рэч, ні хлява, ні хаты, ні гумна не стала даўно. Ад маладое ліпы застаўся толькі пень з цэлым ахапкам маладых сакаўных пасынкаў. На котлішчы — яшчэ не зусім зарос-

лая травою цэгла. На ёй вялікім букетам красуе куст крапівы і цвіце лілова-сінімі кветкамі шорстка-сівая варсістая смактуха, якую любяць надта дзеці. Спачывае ў траве і камень, на які колісь ступалі чалавечыя ногі і нават, босыя, мае, — ён ляжаў тады каля парога. Сярод ружовых пэндзлікаў сіўцу і каліваў дзябёлай дзіванны, ледзьве жывы, танюткі, як на зацененых могілках, кусцік бэзу. І дзве ўжо, можна сказаць, старавечныя бярэзіны самотна кіпяць сухаватым лісцем і хіляцца ў адзін бок, таксама нібы ад старавечнай жальбы і смутку.

Дзядзькава хата згарэла ў 41-м, тады ж, як гарэла наша вёска, — яе расстралялі запальнымі снарадамі. Адбудоўваўся хутар пасля вайны, але ўжо адзінокаю цёткаю Марыляю — дзядзька Ян, на дванаццаць год маладзейшы за яе, прымак на хутары, закончыўшы вайну ў польскім войску, застаўся на землях, як тады казалі, «адзысканых» — у мястэчку Лэба на беразе Балтыйскага мора...

Я стаю на абветраным грудку, жмурачыся ад нізенькага пачырванелага сонца, што неўзабаве зробіцца малінавым, хаваючыся за седлаватыя груды. За маўклівым хваёвым ляском ракоча і глухне, надрываючыся, нядужы трактар. З раптоўным гвалтам і шархоткімі ўзмахамі крылляў нада мною ляцяць, расцягнуўшыся рваным шнурком, сытыя, ацяжэлыя пад восень гракі. Іх паспешна насцігае імклівая шпачыная чародка. Яна за сабою нясе і мае ўспаміны. Я азіраюся і бачу над рабізною лёгкіх воблакаў празрыстую, што яшчэ не на-

была свайго колеру, поўню і прыгадваю, як пад гэтай поўняй, толькі не ўвосень, а на згоне зімы, у вялікую бурлівую паводку, тут, на гэтым ужо глухім, недабудованым хутары, адзінока і трывожна дудзеў удод, якога ў нас чамусьці называюць яўрэйскай зязюлькай. Так і помніцца — шырокі шум напорыстай паводкі на балоце і гэтае самотна-вусцішнае ўдодава перакліканне — гуд-гуд, гуд-гуд. Па два разы засаб. І жоўта-лімонная, таксама адзінокая поўня.

Цяпер, дзе я ні пачуў бы ўдода, успамінаю самотны хутар або, наадварот, убачыўшы занядбаны сярод жытнята поля хутар, успамінаю вусцішны начны голас удода.

Хутар, а дакладней — гумно і недаканчаную, недабудованую хату тры гады назад, прыехаўшы з Польшчы, па цётчынай ужо смерці, спрадаў мой стрыечны брат Болесь, дзядзькаў адзіны сын.

Так адышоў, сплыў у вечнасць яшчэ адзін кантынент нашага варакомскага жыцця, застаўшыся хіба скупым радком жалоснага ўспаміну ў маёй запісной кніжцы.

Аўторак, 19 верасня. Удзень наўкруг мяне высокі, трапяткі шэпт бярозавага лісця, увечар — сіняватае дрыготкае святло нашай варакомскай поўні, што ўздымаецца над боханамі Ахонаўскіх грудоў. І яе акружае роднае ўзаранае поле белых лёгкіх хмарак. Лапушысты сланечнік стаіць пад ёю з вострай шыяй, без ацяжэлай шапкі, — скруцілі ўжо дзеці. Далёкі хутаранскі брэх сабакі, паспешнае чахканне паравоза, рытмічны перастук колаў нясуць

мяне ў падлеткавыя зыркія гады, так чароўна і патаемна акружаныя кніжкамі і спакуслівымі думкамі пра іншы — велічны і шчаслівы свет.

Серада, 20 верасня. У нізкім вечаровым поцемку на пясчанай вуліцы шархаценне і скрып нагружаных мяхамі бульбы цяжкіх вазоў. Чырвоны вялікі і адзінока-смутны месяц між паніклых сцішэлых бярэзін.

Бацька, вярнуўшыся з варты, са смехам расказвае, як Ладак леташняй восенню, — ужо ў халады, ужо бабы абівалі лён, — пільнаваў сваю Юзэпу, — ці не йдзе з брыгадзірам? Стаяў за вуглом босы і змёрз, вядома. Ляглі спаць, яна і пытае, чаму ў яго такія халодныя ногі. Ён і прызнаўся, што пільнаваў, ці не праводзіць яе брыгадзір.

А калі аднойчы, завітаўшы на хутар, п’янаваты каваль Валодзя жартам ушчыпнуў Юзэпу, нецярплівы Ладак, які перад гэтым затоена маўчаў, нарэшце, калі выйшаў каваль з хаты, ужо за вячэраю, за сталом навотліў мазнуў Юзэпе па твары: «Чаго маўчыш? Чаго стаіш, як карова?».

Ладак нашмат старэйшы за Юзэпу, таму гэтак дзіка, па-хутаранску раўнуе яе, а іншы раз і б’ецца за нішто.

Пытлевай Аўдолі ці не пад восемдзесят, кажа бацька, а ходзіць яна яшчэ жвава. Малако ў мястэчка нясе, картопляў саўгасных украдкам накапае, прадасць, за выручку нап’ецца і ўжо ідзе дадому, заплюшчыўшы вочы і па-мужчынску падмахваючы сабе кулаком.

Яе, непрыгожую, замуж ніхто не браў. Нашмат маладзейшая ды нашмат прыгажэйшая за яе сястра Юстына выйшла была ў Зарой (вёска пад Наваградкам) за сляпога на адно вока мужчыну ды праз два тыдні прыбегла дадому. Так і жывуць яны, абедзве сястры, абедзве незамужнія. Юстына ўсё жаноцкае робіць — тчэ, прадзе, шые, каля печы стаіць. Аўдоля ўсё мужчынскае парадкуе — арэ, сее, косіць, дровы сячэ...

Да калгаса я толькі і помню Аўдолю пры каштанавым драбнаватым кані і за плугам, што ляжыць бокам і пазвоньвае жалезнымі ручкамі, а Аўдоля ідзе ззаду, трымаючы лейцы, і злосна пануквае, узмахваючы пугай. Ды яшчэ, бывае, мацюкнецца дзеля гонару і важнасці.

Запісваю жартаўлівае бацькава апавяданне пра неардынарныя і каларытныя варакомскія тыпы і міжволі лаўлю сябе на тым, што калі не напішацца маё апавяданне, то адыдуць яны, нікому не знаныя, і глухі бязгучны час вечнасці праглыне іх, як праглынуў і пахаваў сотні і тысячы да іх...

Як шкадую, ажно да шчымлівага болю, што не магу прачытаць кніжку пра людзей свае зямлі. Ёсць, вядома, «Пан Тадэвуш», «Новая зямля», але гэта чамусьці не суцяшае.

Пятніца, 22 верасня. У нізкіх, па-восеньску ацяжэлых ужо хмарах то выплыве, то зноў схаваецца белаватае, як месяц, сіратлівае сонца. У зялёным бэзе, што заглушыў перад вокнамі вузкі гародчык, пераскоквае з галінкі на галінку шарая з карычнева-жоўтым воллем

пташачка. І неспакойна пацвірквае. На падвязаны кусцік сівага, нібы палын, божага дрэўца завіўся і зацвіў пустацветам шорсткі гарбуз. Каля пазелянелага частаколу шырокім лісцем варушыць гонкі маладзюсенькі клён. Мілы, прыцішаны свет вясковай восені.

І раптам з пранізліва-вострым свістам, а далей з віхраватым гудам і гулам, ажно прылягло і прыгнулася ўсё да зямлі, прыляцеў вайсковы самалёт. Як шмат іх тут, над нашаю смутна-прытоенаю вёскаю, і як бухаюць, узрываючыся, у хатах дзверы, і як трымцяць, пазвоньваюць у вокнах шыбы ад удару магутнай, як цунамі, гукавой хвалі. Як доўга стыне кроў у жылах ад бездапаможнай крыўды і злосці, калі па табе знянацку перуноваю стралою ўдарыць вышынны выбух. Ім, лётчыкам, можа, і радасць ад таго, што чалавека можна забіць нават усемагутнаю гукавою хваляй.

Які, аднак, непапраўны і нязменна грэшны свет ад стварэння яго да нашых дзён і які шкодны, аднак, і злосны на ім усё той жа чалавек!

Надвячорак. На сіняватай пагрозлівай хмары, што засланяе захад, — ружовы акрайчык нізкага сонца. Учуўшы блізкі прыцемак, са страхі каля вугла на начное паляванне спускаецца павук, дарэчы, дагары нагамі. Доўгімі востра-жалезнымі чэргамі чуйную цішыню падразаюць конікі, што пахаваліся ў бэзе. Ад іхняга строкату ажно несціханы звон у вушах.

У хаце так міла і так знаёма па-даўнейшаму пахне газаю — пад столлю гарыць лямпа. За шклом падскоквае залацісты язычок агеньчыку, калі ў хаце, прыляпнуўшы, зачыняць дзверы. Як у старадаўняй казцы, дзікім страшыдлам на жэрдцы за печкаю-грубкаю палохае вывернуты стары кажух. На гліняным току пры печы шчырым радком стаяць чорныя закурэлыя цаганы.

Якія знаёмыя змалку рэаліі беларускага вясковага жыцця, што спадцішка, нібы стромы бераг, абвальваецца і сплывае, падхоплены чарадою нялітасціва-жорсткіх гадоў. Як, бясспрэчна, адплывае і тое, што народжана сённяшнім днём.

Значыць, не намагайся апярэдзіць час — усё роўна калі-небудзь астанешся ззаду.

Без даты. Зноў схадзіў на Янаў хутар, або, як раней называлі гэты падмыты крынічна-сцюдзёнаю імклівую Ятранкаю жоўты пясчаны касагор, — Падліпу. Ліпы, як мне ўжо помніцца, не было і няма. Над цёмна-сіняю і ўжо гнілавата-застоенаю завоінаю — шарэнга чорна-шарых шурпатых алешын з кучаравымі верхавінамі ў шчопцях чорных шышак. Як нечаканае шчасце — тыя самыя кусты шыпшыны ў чырвані спелых ягад. І завоіна ў нерухомых лісцях плывукоў і гарлачыках іхніх адцвіўшых ёдзіста-пахучых жоўтых кветак. Як жа ж не забываецца гэты нязвыклы пах ёду і глею.

Нізкія кусцікі ядлаўцу чуйна стаяць адзін за адным, як пінгвіны. Сумнае і жалосна-расцяжнае пакрумкванне крумкача з высокай

нябеснай цішыні дадае сэрцу яшчэ большага жалю.

Варочаўся дадому — на вачах пяклі слёзы, а ў памяці паўставалі радкі міцкевічаўскага верша:

*Полялы сень лзы мэ чыстэ, ржэньсістэ,*
*На мэ дзеціньство сельске, анельске,*
*На моян млодосьць гурнон і дурнон,*
*Полялы сень лзы мэ чыстэ...*

Яму тады, калі пісаліся гэтыя балючыя і шчымлівыя радкі, было сорак, і ачуціўся ён на далёкай, хоць і прытульнай чужыне. Мне — трыццаць тры, і я дома, у роднай старане. Магу ўявіць, як яму было горка, крыўдна і балюча, і шчымліва адзінока і як хацеў бы ён ступіць на ружовы пляскаты камень пад былым парогам. На той менавіта камень, на які ступалі босыя ногі дзяцінства.

## Год 1968-мы

Пятніца, 15 сакавіка. След ад лыжаў на счарнелым насце замецены новым снегам, сіняватым і чыстым. За пагоркі, у зацішак лагчынаў і яраў туляцца голыя кусты. Вусцішна-нямы, яшчэ не жылы шара-панельны мікрараён падступае да палявое дарогі, абапал якой звініць сухі леташні быльнік. У чорных праймах вокнаў і дзвярэй густа, нібы ў ружова-хваёвым лесе, шуміць вецер. Палявая дарога ў нарасцях мутнага лядку завалена чорнымі трубамі, друзам, бітаю цэглаю, ажно страшна

глядзець на чалавечы прагрэс. Так наступаюць, няшчадна руйнуючы палявыя дарогі, падразаючы пакатыя грудкі, вываручваючы гліну, нібы па-жывому паласаючы цела зямлі, непрытульна-халодныя муры горада на затоеную ў чорных прысадах, знябожаную вёсачку. А за вёсачкаю — ужо на нашу мову, быт, норавы, песні, паданні, забабоны, замовы... Так пакрысе вынішчаемся мы — беларусы. Тут ужо жыцьме іншы чалавек, прагматычны і карыслівы. Яго не будзе абыходзіць ні наша скалечаная мова, ні нашая, зарослая дзяцелінай палявая дарога, што ўзбягае з яру на лабаты грудок.

Як крыўдна і горка думаць, што жывое зялёнае поле ўсё больш і больш залівае гарачы, топкі, як багна, руды асфальт і халодна-цвёрды, як сталь, шары бетон, бо ім, прагматыкам, патрэбна толькі хуткасць, каб нічога не бачыць, каб перад вачмі ўсё злівалася ў шарую безкалёрную стужку.

Але ж куды і насустрач чаму так імкліва шыбуе сённяшні чалавек?

<u>Чацвер, 21 сакавіка.</u> Мужчына ў тралейбусе: белы, амаль бяскроўны твар у жаўтлява-карычневым рабацінні, губы таўставатыя і выцягнутыя, нібы ён хоча пацалавацца, на кончыку даўгаватага носа кусцік чорных валасоў. Зрэшты, самы звыклы чалавек, а запомніўся.

<u>Субота, 18 мая.</u> Каралішчавічы. Росны ранак пасля дождживку, камарыны тугі звон, нібы хто рве тонкую нітачку. Як у грайку — між дзвюх тронак перынка травы, — грае невядомая мне пташачка. Чмель садзіцца на крэ-

мава-карычневы кілішак гравілату. Не ведаю чаму, але нейкай асаблівай, калі не сказаць таямнічай любоўю люблю гэтую непрыкметную раслінку, мо таму, што яна была спадарожнікам маіх дзіцячых і падлеткавых гадоў, мае неадступнае адзіноты і смяртэльнага смутку, як і раскалыханая ветрам слепата (ветраніца) у замшэлых ядлаўцовых кустах, яе белыя, разлітыя вясною азёрцы. Улетку майму шасцігадоваму пастухоўству спадарожнічала конская ў белых кутасіках цыбуля і сівая вострая, што рэзала пальцы, асака, ды жалосна-адчайны плач чубатае кнігаўкі, што да бясконцай нудоты неадчэпна вілася нада мною.

Пры сцежцы, дзе на леташняе дубовае лісце чуйна пакрапвае дажджавая раса, тонкі дубок абвіў маладую елку. На мокрым яловым камлі іскрацца бурштынавыя нарасці смалы. Схаваўшы пад лісце белыя дробныя кубачкі, цвіце бруснічнік. Гэтакія ж кубачкі, толькі ліловыя, і гэтаксама верхам уніз — на светла-зялёным чарнічніку. Зноў скупы, не вельмі прыкметны знак майго дзяцінства. Як помняцца яны, кілішачкі белых і ліловых кветак, а разам з імі кіслы смак цёплых, налітых сонцам цёмна-агністых, трохі сопкіх ягадаў, што вісяць цэлаю жменькаю пад блішчаста-зялёным драпастым лістком. Таксама было не меншае шчасце знайсці іх на лясным прыгрэве сярод кучаравага, гафтаванага ліловымі кветачкамі верасу.

І каля жоўтага драўлянага дамка, рубленага з круглага дрэва, бачыш светла-ліловы куст бэзу. Прыгадваецца ўжо Ван Гог, або магілкі.

Чамусьці яны стаяць поруч — мастацтва і смерць.

Пятніца, 24 мая. Вывадкі маладых, у жоўтым пушку, качанят абгароджаны драцянаю сеткаю. Ім рэжуць траву. А над імі, на сліве, цэлы сівы клубок вусеняў, таксама, мусіць, пражорлівых, бо зараз папаўзуць аб'ядаць лісце. Яно ўсё суладна і гарманічна ў прыродзе.

Панядзелак, 16 чэрвеня. На хвойках ужо вялікія ружовыя стрэлкі, і елкі з ядлаўцом убраліся ў жаўтлява-зялёныя кутасікі. Вось так на некалькі сантыметраў сягнула наперад жыццё. А як жа ж мне ўгнацца за ім? І, між іншым, шпакі пакінулі дупло ў ружовай прыгожай хвойцы каля пясчанай лясное дарогі, і мне, бяскрыламу, хочацца ляцець з свайго дупла на велічны прастор. Як жыве ў чалавечай душы вечнае і неадступнае жаданне волі.

Субота, 20 ліпеня. Фаніпаль. Чыгуначная станцыя. Чырвоны грузавы вагон бяжыць, разагнаны дызелем, і ў яго, як у жарабца пасля злучкі, пацялепваецца тоўсты гумовы шланг. Звесіўшы вецце, знябожаная бярэзінка стаіць каля пышна натапыранай ліпы. На пераездзе, паклаўшы руку на клуб, абыякава пазірае на наш зялёны цягнік смуглявая маладзіца з жоўтым скручаным флажком. Салдаты, паскідаўшы кашулі і паблісквуючы загарэлымі спінамі, капаюць равок — рытмічна ўзмахваюць лапатамі. На папялова-гарачай дарозе невысокі воз з сенам. На ім маладая працавітая пара — напэўна ж мужык з жонкаю. Воз паволі паплыў у запалавелае прытомлена палеглае жыта, як у вечны акіян сялянскага нялёгкага

жыцця. І пара гэтая, чуючы адно аднаго на спакуслівым сене, паплыла ў гэты жытні акіян.

Нядзеля, 25 жніўня. Зазірнуў на наваградскі рынак, нібы зазірнуў у свой будучы твар: слівы ў вялікіх кошыках з накрыўкамі, яблыкі ў скрынях і цэбрах, парасяты трапечуцца ў мяхах, — купцы, прыцэньваючыся, выцягваюць іх за заднія ногі. Яўрэйкі ў сетках носяць чырвона-рабенькіх сытых курэй. Яшчэ не звяліся тутэйшыя майстры — ганчары, лажэчнікі, грабельшчыкі, бондары, кавалі, — яшчэ прадаюць кубельцы, дзежкі, гаршкі, лыжкі, секачы, капашкі... А над усім гэтым нядзельным кірмашом, над кіпуча-гаманкім натоўпам, тутэйшай люднасцю, грузавымі калгаснымі машынамі, прыватнымі «Волгамі», «Запарожцамі», «Явамі» з люлькамі, у якіх ледзьве ўмяшчаюцца сытыя маладзіцы з непрывычнымі для іх шлемамі на галаве, — над усім мурашыным сённяшнім вірам узвышаецца, падняты на зялёным конусе гары старажытны замак — дзве яго чырвона-ліловыя вежы з каменю і цэглы, а перад імі — светлы касцёл з чырвоным чарапічным дахам. Аж боязна думаць, колькі ж нашага люду бачылі яны з вышыні сваіх недасягальных гадоў. Колькі эпох, дзяржаў, уладароў, палітыкаў, забытых і незабытых, прайшло, прамільгнула перад імі. Але спынімся і падумаем пра тое, што яны бачаць і мяне, грэшнага...

Пятніца, 30 жніўня. Кожны вечар настаўляю вуха да светла-жоўтай старое «Сакты» — слухаю і заміраю сэрцам, перажываючы за Чэ-

хаславакію. Надоечы ў рэдакцыі з'явіўся Пестрак, прынёсшы копію свайго даносу на мяне (арыгіналы ён адсылае ў КДБ). Мне тайком далі прачытаць усяго адзін сказ, дзе было напісана, што ў звязку з падзеямі ў Чэхаславаччыне ці не ўкраўся ў «Полымі» вораг у асобе Адамчыка? Першае таемнае пісямцо на мяне склаў і адаслаў у ЦК Бачыла (мне яго копію, ціха паклікаўшы ў машбюро, дала пачытаць машыністка Эма).

Немагчыма працаваць у рэдакцыі: нешта падазронае, пасля зацяжное п'янкі мармыча яшчэ адзін патаемны «охранный осведомитель» ці denuncjator, як кажа старажытная латынь.

Тыя пісьмы, па справе якіх мяне выклікаў Ткачоў, з Саюза пісьменнікаў перасылаліся напэўна ж у жоўты дом дзяржбяспекі.

Пятніца—субота, 6—7 снежня. У людным тралейбусе, вяртаючыся дадому, сцішаны і прытоены, у светлай радасці заснаваў сюжэт аповесці і ўжо, апалены гарачынёю шчасця, запісваю яго ў растрэсены стары сшытак (новага сумысна не бяру, каб не сурочыць, у новым, ды яшчэ прыгожым, звычайна не пішацца), — ажно дваццаць два раздзелы. Назва пакуль што ўмоўная — «Лэдзі Макбет Ятранскай воласці». Працы на цэлы год. Памажы, Божа!

Нядзеля, 15 снежня. Надвячорак. Кальварыя. Неба над дрэвамі яснае, балюча і агністачырвонае. Сонца ўжо не відно. І там, дзе яно было, датлявае пякучы агонь, і дрэвы стаяць голыя, з чорнымі камлямі, як абгарэлыя.

На высокіх кронах — чорныя грачыныя

гнёзды, рыхтык нечыя пазакіданыя шапкі. Гракі сядзяць на тэлеграфных слупах і на яблыньцы каля нечай прыгорбленай хаткі. Яны, мусіць, укладваюцца ўжо нанач.

Чырвань ледзь існее на вежы касцёла. Снег ужо ў вечаровай фарбе, нібы абліты сінькаю. Перад доўгаю, атуленаю чорнымі голымі садамі вёскаю (Цівялі) белае нярушанае поле канчаецца цёмна-жоўтаю, падкопанаю экскаватарам стромаю. Там вуркоча, надрыўна гудзе і пастрэльвае самазвал. Самалёт, як голуб, прытуліўшы крыллі, зніжаецца на пасадку. І чорна-шараю, ачышчанаю ад снегу шашою бяжыць конь, высока выкідваючы пярэднія ногі і нагінаючы галаў. Фыркае, сапучы з ноздраў гарачаю параю.

Фурманка прабегла, абагнаная патокам машын, і пакінула ў душы даўні незабыты смутак па іншым жыцці, палявой, замеценай снегам дарозе, адзінокім хутары, куды я хадзіў праведаць нашмат малодшых за мяне стрыечных братоў: іхняя маці, мая дзядзіна, сабраўшы, як у нас кажуць, падаянку, паехала праведаць хворага на трасцу мужа — майго дзядзьку Юзапа, што сядзеў у перасыльнай аршанскай турме. Чаму фурманка выклікала такую асацыяцыю, не ведаю, бо каня, дарэчы, на тым бедным хутары не было. У хляве стаяла адна закажанелая карова, якую я мусіў быў напаіць і накарміць.

Як варта было б напісаць пра гэтае смутнае маё падарожжа і радасць здзічэлых ад вусцішнай адзіноты дзяцей, калі я ўваходзіў у іхнюю хату. Нібы таксама ў турэмную камеру.

Нядзеля, 22 снежня. Чалавек паляцеў да Месяца. Цікава, што ён там убачыць? А тут, на зямлі, туман, непраглядная адлежная ноч, чорны мужчына на белым снезе, наўкруг ліхтароў ліловыя кругі, як наўкруг месяца, чорная шаша, за ёю — снег, плот, зноў чарната — там немая Кальварыя, дзе пад снегам стынуць магілкі... Так многа і так мала, нарэшце, трэба чалавеку.

Панядзелак, 23 снежня. Чорныя гракі на белым снезе — адлежыць. Чытаю Бальзака, упіваючыся, як кажуць, і фразай, і выразам, і думкай, і дасціпнасцю. А ўсё пачалося з таго, што ў букіністычным аддзеле кнігарні купіў два ўцэненыя бальзакаўскія томікі (па 30 капеек кожны) і захапіўся найперш публіцыстыкай — а вострая ж яна, як наточаная сталёвая шабля, што рэжа нават валасок! — а цяпер зачараваны яго непадкупна геніяльнай навелай пра парыжскіх музыкантаў (ці не таму, што сам колькі месяцаў хадзіў у мястачковую аркестуру?). І ўзвышаны, растрывожаны гэтым адзінокім геніяльным пакутнікам, замануўся напісаць сам і пра мястачковую аркестуру, і пра суседа, вясковага музыканта, што ачуціўся ў горадзе і кожнае суботы на сваёй зялёнай гармоніі выцінае полькі і абэркі — чутно праз калідор, — і кожнае суботы ў яго дапазна бяседа, госці, і кожны раз ён вядзе іх на тралейбусны прыпынак з гэтаю самаю зялёнаю гармоняю і яшчэ ў ліфце пачынае на ўсю моц іграць.

Першы раз я ўбачыў яго, прыйшоўшы агледаць сваю новую кватэру, — ён тады якраз ус-

таўляў замок. Здаецца, тады ён сказаў, што «работае» на фабрыцы цацак. А потым, пазнаёміўшыся бліжэй, прыносіў дарыць маёй жонцы днішчы і таўкачы, мне — казеінавы клей.

Жыве ён не ў ладах з жонкаю. Праўда, яны абое п'юць. А потым, як гэта звыкла бывае, пачынаюць біцца, а назаўтра абое прыходзяць пазычыць рубля. П'яны ён многа гаворыць і кожны раз кажа, што прыйшоў браценік, і кожны раз усё выбачаецца.

Ды як жа ж, як гэта мог і рабіў Бальзак, намаляваць жыццё ў бясконцым змаганні з пакусай і жаданнем; што з'яўляецца пачаткам усялякай страсці? Дзе ж знайсці тыя адпаведныя і належныя словы і перадаць імі ўсё перажытае і пачутае? Дзе?

## Год 1969-ты

Нядзеля, 12 студзеня. Як пачаўся ад новай квадры месяца, так і не злягае мароз. Тэлефонныя правады тоўстыя, як карабельныя канаты. Белая ад інею Кальварыя. Чорныя гракі на фантанах перламутравых дрэў. Бела-сіняватае нярушанае поле. Белая вёска — прысады і стрэхі.

Узбоч чорнага асфальту, канаваю, едзе фурманка — у каня заінелі персі. Фурман ідзе поруч, падняўшы цёплы каўнер.

Прыпамінаюцца даўнейшыя ганарыстыя коні з чырвонымі каснікамі ў грывах і ў холках, чорныя выштукаваныя або прыгожа выплеценыя з ракітніку вазкі, фурманы ў шарых суконных бурках з чырвонымі або блакітнымі

ў сярэдзіне башлыкамі, шастуны ў бурбалках званкоў. І маё маленства, міма якога праімчаліся ганарыстыя коні з мілагучнымі званкамі і шастунамі, каб назаўсёды пакінуць у маёй памяці гэты густы, як гуд пчалінага рою, звон вясёлых шастуноў... І нібы выпадковым кадрам у памяці выплыў мой дзядзька Ян Баравік, якога пазалетась падтаптаў, скінуўшы з сябе, спуджаны жарабец, на вачах у здурнелых п'яных баб, што рашылі падзеразавацца ды пажартаваць, спудзіўшы яшчэ добра неаб'езджанага жарабца. Так іншы раз нечаканаю бядою канчаюцца нашы беларускія вяселлі ды хрэсьбіны... Як палярныя, так і неадлучныя яны — радасць і гора.

Серада, 22 студзеня. Учора было Вадохрышча, даўнейшае свята, калі кідалі ў калодзеж выструганыя драўляныя крыжыкі. Помню, сходзіўшы раненька па ваду, іх прыносіў у вядры бацька. Помню раскалыханую ваду ў вядры і на ёй ружаватыя драўляныя крыжыкі.

У гэты ж дзень аб'язджалі і крапілі святою вадою маладых коней.

Мароз. Пры шашы так міла, па-даўняму ныюць, гудуць тэлеграфныя слупы, і на іх, як шкляныя нітачкі, звіняць намерзлыя правады. Успамінаецца таксама даўнейшае: ідзеш у мястэчка сцежкаю пры шашы ад аднога трымцівага звону да другога — ад слупа да слупа, на якім з дзесятак белых фарфоравых або сініх шкляных кубачкаў і столькі ж правадоў з звінючым гудам. Набягае на памяць і другое — мая адзінота, вячэрняя школа і звінючы гуд шарых, патрэсканых тэлеграфных слупоў, як

даўніх сяброў, што сцераглі і вартавалі мой смутак.

Чытаю пра анкалагічны корпус і, здаецца, ляжу ў бальніцы сам: так праўдзіва выпісаны персанажы і бальнічныя ўмовы і абставіны. Услед за аўтарам думаецца, чаму такі несправядлівы свет, чаму такі помслівы і злы чалавек? У яго ж кароткі век і чаму не пражыць жыццё з дабратою? Які ж д'ябал пасеяў у чалавеку зерне помсты, недаверу і злосці?

І яшчэ: магутны і праўдзівы талент усемагутнай хваляй землятрусу рушыць трон.

Прыкра, сорамна і нават агідна, што той-сёй з беларускіх літаратараў яшчэ ўсё стаіць на задніх лапках, з угодлівай ліслівасцю вычэкваючы, калі ж яму нарэшце дадуць ленту і ключык.

Але ж чаго дзівіцца, так было спакон веку — падалі на колінькі і паўзлі, і складалі ўгодлівыя хаpалы, і ўдавалі адзін аднаго — усё дзеля гэтых лентаў, ордэнаў і фальшывых званняў, а потым з надзьмутай пыхай ганарыліся імі, каб ужо без чаргі дайсці да прывілеяў, кватэр, шматтомных перавыданняў, ні радка не пакідаючы патомкам, каб усяго толькі іншы раз пахваліцца перад сваім жа братам па пяры: «А ў мяне ненадрукаваных твораў няма».

Абдзеленыя талентам, нямоглыя, кволыя духам, бессаромныя, і учэпістыя па ўхватцы, здрадлівыя па натуры — яны, усе разам прытоеныя бязлітаўцы... Але барані, Божа, чапіць іх — уджаляць на смерць.

Чацвер, 23 студзеня. У бяссонную ноч чы-

таю Пушкіна — яго дзённікі. Як смяяліся з чалавека, як ганьбілі і «высочайшей цензурою», і камер-юнкерствам, і за гэтую ганьбу хацелі яшчэ «умиления и благодарности».

Няўжо было, ёсць і будзе на зямлі зло? Няўжо крыўдзілі і будуць крыўдзіць чалавека, і ад бяды і крыўды як не было, так і не будзе ратунку, як быў чалавек бяспраўным, так бяспраўным і застанецца?.. Як горка і неміласэрна цяжка пра гэта думаць.

Субота, 25 студзеня. Зноў чытаю Пушкіна, на гэты раз яго «Гісторыю Пугачова». Для мяне, уласна, гэта Эльдарада, бо колькі ж тут можна знайсці залатых самародкаў. Колькі ж тут нікім не выкарыстанага матэрыялу для ёмкага рамана. А якая незлічонасць сюжэтных вузлоў і фабульных ходаў, нават у заўвагах і дадатку. Які скупы, але які дакладны, без блізарукай дробязнасці, як казаў ён сам, ягоны стыль, як ашчадна і скрупулёзна вывучаныя архіўныя дакументы, якая, зрэшты, у мяне, чытача, даверлівасць да гістарычнай праўды і аб’ектыўнасці. Можа, я перабольшваю і мяркую не кампетэнтна, але як па-зайздроснаму ўдала выхаплены з мінулых дзён гістарычныя асобы — незвычайныя, каларытныя і неардынарныя персанажы будучага мастацкага твора, як трапна падцікаваны праявы тагачаснага жыцця ці, як казалі даўней парасейску, — «какая типическая верность натуре».

Калі часам прыйдзецца пісаць пра Раіну Грамычыну, мушу буду перачытаць «Гісторыю Пугачова» і выдатныя заўвагі да яе, бо бачу не-

шта блізкае да супольнае паміж гвалтоўнай смерці Пугачова і смерцю нашай Ятранскай пакутніцы, пападдзі Раіны Высоцкай, спаленай жыўцом на стосе дроў.

Дарэчы, казакі, што катавалі, забівалі і вешалі людзей у Казанскай, Арэнбургскай і Пензенскай губернях і «ўваходзілі ў храмы божыя ў шапках», нагадваюць мне ўжо ранняе лета 1944 года, калі іхнія праўнукі ці прапраўнукі па-забойску і па-садысцку каралі людзей у нашай Варакомшчыне.

Як праз вякі на зямлі паўтараецца ўсё страшнае — чалавек забівае чалавека. І няўжо ж так павінна быць, як піша той жа самы Пушкін:

*Паситесь, мирные народы!*
*К чему стадам дары свободы?*
*Их должно резать или стричь.*
*Наследство их из рода в роды*
*Ярмо с гремушками да бич.*

Але ж страшна, аднак, з гэтым згаджацца — з ярмом ды бічом.

<u>Пятніца, 31 студзеня.</u> Уначы — туман, адлега, цурчанне і плюскат талай вады з дахаў, раніцаю — вецер, шахканне інею, што ападае з тэлеграфных правадоў. Бела-сівая Кальварыя зліваецца з туманам, толькі відны невыразна цёмныя, як у глыбокай вадзе, камлі блізшых дрэў. І гук ад патоку транспарту з аўтамагістралі сыравата і цяжка асядае ў волкім тумане. А мая душа тым часам пераносіцца да лясных пагоркаў і зялёных лугоў Навааградчы-

ны — я чытаю «Пана Тадэвуша», апынуўшыся ў горкай чаромусе, аплеценай хмелем, пад шатамі ляшчыны з арэхавымі перламі, пад тым дубам, што ўсклаў на свой гарбаты карак ажно пяць вякоў...

Па рэаліях прыроды, быту, усёй панарамы вясковага і шляхотнага жыцця мілейшага твора, акрамя хіба «Новай зямлі», за міцкевічаўскую паэму для мяне няма.

Да Міцкевіча я прычашчаўся змалку, калі маці, пры сваім, здаецца, вечным, бясконцым прадзіве, пачынала па памяці чытаць «Пані Твардоўскую», завучаную ёю ў польскай вясковай школцы ў суседняй ад нас вёсцы Аханянах яшчэ перад першаю сусветнаю вайною. І не толькі Міцкевіча, а поруч з ім і школьныя, з лемантара, вершы Канапніцкай: «Ешчэ снежак прушы, ешчэ хлодны ранэк».

Беларускі Міцкевіч — Якуб Колас — прыйшоў да мяне трохі пазней, ужо ў часе вайны, у местачковай, тады яшчэ беларускай школцы, дзе выкладала былая колішняя польская настаўніца і дзе мы чыталі, як помніцца, коласаўскае апавяданне «У старых дубах», надрукаванае ў танюткім зборніку выбраных твораў віленскага выдання з партрэтам трохі дзіўна-загадкавага аўтара ў капелюшы, пад гальштукам і ганарыста закручанымі вусамі, як у нашага местачковага стрэлачніка-паляка, што хадзіў заўсёды абвешаны чорнымі вялікімі ліхтарамі.

Перачытваўчы «Пана Тадэвуша», я міжволі думаю і пра аўтара для мяне блізкай і непадкупна-шчырай «Новай зямлі», што бярэ свае

вытокі з Прынямоння, з тутэйшага жыцця, звычаяў, фальклору... і, вядома ж, — з шляхецкай гісторыі Адама Міцкевіча. Яны былі палярныя, але, як мне здаецца, і абвеяныя адным і тым жа духам: там — змаганне за старую Польшчу, тут — за маладую Беларусь.

Літва! Айчына мая, ты ёсць як здароўе... Мой родны кут, як ты мне мілы, — ужо гучыць як працяг бессмяротнага «Пана Тадэвуша», каб стаць, нарадзіцца бессмяротнай «Новай зямлёю».

Там рукою генія ўзвалены надмагільны камень, над усім старым і мінулым, тут рукою генія закладзены падмурак пад гмах таго, што мае быць збудавана, «каб новы свет жыцця саткаць».

Субота, 1 лютага. Серабрыстым шнурком цэдзіцца і з вясёлым звонам бубніць па блясе за вокнамі талая вада. Разарванай пазалотай калышацца і па-вясноваму паблісквае на лужынах, слепячы ў вочы, высакаватае ўжо сонца. Тугі, вільготны вецер з поўдня. Звабліваючы чыстым, як вочы ў дзіцяці, блакітам, распагоджваецца неба. Бялюткія, пеністыя хмары сплываюць на ўсход. У ветранай смузе растае лес і чубок высокіх шара-голых дрэў. Нібы дзень вясны. Але настылы касцёл у Кальварыі палохае сівой намараззю, што выступае на яго сценах.

Люблю адлегу, нечаканую яснасць пасля хмурных дзён, далечыню, замярэжаную сіняю смугою, люблю раздражджалы, падточаны сонцам, з сухарыкамі празрыстага лядку, снег, люблю вечар з лёгкім марозікам, з палавінкай

высокага месяца, і свой ліловы цень на снезе, адзінока трывожнае гуканне паравоза, і тады таксама хочацца мець клопат некуды ехаць. А свет той, куды збіраешся ехаць, заўсёды выдае мілейшым, як у дзяцінстве здавалася, што шчаслівейшая і лепшая старана свету тая, дзе ходзіць сонца. Дарэчы, паўднёвую старану свету люблю лепш і цяпер.

Сёння Трахіма ці што? Як піша Даль, загаворваюць мышэй. Але гэта, мусіць, будзе пастарому — 13 лютага. Дарэчы, у нашай вёсцы загаворвалі нават злых сабак, але каб мышэй — не чуў. Ды чаму загаворваць зімою, пасля таго, як яны сточаць збожжа?

Помніцца, як па вёсцы хадзіў жабрак і ў кожнай хаце гугнява-цягучым голасам прасіў у Бога, каб сцярог нас «ад звера бягучага і гада паўзучага». Можа, да гэтых «звяроў бягучых» і належалі мышы. Для мяне ж самы небяспечны «паўзучы гад» той, што звіў гняздо ў рэдакцыйна-начальніцкіх кабінетах. Якую ж замову шукаць ад яго?

<u>Серада, 5 лютага.</u> Як іскры ад порсткага агню, проці сонца мігаціць калючы сняжок, што цярушыць з неба. На прыпынку стаіць тралейбус і падморгвае бакавым вочкам, нібы азіраючыся, ці селі ўсе пасажыры. А спыніўшыся за ім, нецярпліва-злосна гудзе і смуродзіць чадным дымам ад саляркі лабаты бязносы самазвал. Як у характары людзей, так і ў характары машын ёсць розніца.

<u>Субота, 22 лютага.</u> Прайшоўся прыгожа і па-сібірску глыбока заснежанай Кальварыяй. Завея замяла, зараўняла магілы, пакінуўшы

ледзьве прыкметныя горбікі. З-пад белага нярушанага снегу ўздымаюцца чорныя мармуровыя помнікі з белымі слаістымі насыпамі, што нагадваюць маленькія труны. Слаістыя насыпы растаюць, струменячы па мармуру вітыя шнурочкі талай вады. Смутна-жалобная непрытульная цішыня, якую парушае хіба ўзнёслае, веснавое вызвоньванне белашчокай сініцы. Непрытульна-халодны, сцішаны, з выбітымі вокнамі касцёл. На яго старым, памутнелым крыжы адчайна каўкаюць галкі. Голая, нежывая сасна з аблушчанай угары карою ў пакорнай скрусе хіліцца да яго, і чорнымі манашкамі абступаюць старыя, пазелянелыя ў камлях ліпы, і намагаецца падысці струпаваты магутны топаль. На навейшых, ужо змешаных некаталіцкіх магілках, на зеленаватым акрошачным помніку — фатаграфія маладой прыгожай дзяўчыны, як у бунінаўскім апавяданні. Але збуцвелыя стрымбулі леташніх кветак, вянкі на крыжы з сухіх яловых лапак прыпаміналі мне свае местачковыя магілкі за азярцом, на стромым жоўта-пясчаным абрывістым беразе, і маю вячэрнюю школу, куды сабралася местачковая распуста, пераросткі, якіх з польскай гімназіі павыганяла вайна, і недавучаныя савецкія афіцэры з лётнай часці. Мае равеснікі, хлопцы і дзяўчаты з ніжэйшых класаў, што ўжо набыльвалі пра каханне, уцякалі з першых урокаў і засвятла пагульвалі між простых магілак, без агародак, у зацішку кволага бэзу і цянюткіх высокіх вяргіняў. Па-сяброўску пазваны, я схадзіў колькі разоў туды і зразумеў, што каханне і магілкі яшчэ не па

мне. На магілкі найчасцей бегаў хворы на сухоты і закаханы ў жартаўліва-ўсмешлівую рабацiністую венгерку (бацька вугорац, яшчэ з першай вайны застаўся ў мястэчку ў прымах), што іншы раз гуляла з намі, мой аднакласнік Барыс К. Ён нібы выбіраў сабе месца, бо неўзабаве і лёг там. Ці не першы з маіх школьных сяброў?

Толькі пазней я даведаўся, што ў хворых на сухоты бывае нейкае асаблівае, мусіць, абвеянае смуткам і адчаем блізкай смерці найсвятлейшае каханне. Не ведаю, якое яно было ў Багдановіча, але чуў, якое яно было ў хворых на сухоты хлопца і дзяўчыны, што працавалі на пошце ў нашым жа мястэчку. Я помню іх, неразлучных, з прыгожымі, ужо памечанымі адзнакаю блізкай смерці жаўтлява-зеленаватымі схуднелымі тварамі. Яны адышлі на той свет амаль адначасна, адно за адным, праз месяц ці два...

## Год 1981-ы

Пятніца, 15 мая. Варакомшчына. Вярнуўся з роднага поля. Пачужэла ўсё наўкруг. Дзе было поле — пасаджаны лясок, а высечаны там, дзе цяпер ляжыць працавітая карычневая ралля, як прыкмета міла-знаёмага і незабытагадаўняга — белыя грушы на колішніх межах.

Ад багатага, некалі дагледжанага і абгароджанага суседняга хутара з злым, недаступным сабакам на ланцугу — толькі мураваны склеп, сівая вярбіна, а за імі — малады, у ружовых стрэлках падлесак і нямыя, пазвожаныя, ссу-

нутыя на дарогу валуны. Густы басавіты гуд чмялёў, несціханы танюткі струменьчык жаваранкавай песні. І знявечаная ў карычневым кволым яшчэ лісці дзічка каля ружовага каменя з белаватым паскам нарасці, як на чалавечым твары. Тут, справа ад дарогі, пры гэтай скалечанай дзічцы і макаўцы ружовага каменя з белым зігзагам нарасці пачыналася наша поле і... маё дзяцінства. Усё прайшло, знікла, толькі не высыхаюць, высочваюцца на вачах, мае слёзы. Як хацелася калісьці ўцячы адсюль, з гэтага глухога абветранага поля, а як цяпер хочацца вярнуцца!

Няўжо чалавечае жыццё — гэта супярэчнасць, радасна-злоснае памкненне да таго, чаго не можаш дасягнуць?

<u>Пятніца, 27 ліпеня.</u> Варакомшчына. Маці, прыйшоўшы з садка, дзе падварушвала сена, кусае жоўтае яблыка, пацмоквае і садзіцца пры калодзежы на лаўцы.

— Стары чалавек не можа без работы... Мяне аж за сэрца бярэ, калі бачу, як людзі бягуць і робяць. А тут ужо з носа капае, як з страхі, як у дварэцкага Файбы, што анучы збіраў. Я некалі смяялася, бо ў яго пад носам вісіць і вісіць. І не вытра чалавек. А цяпер у самое...

І прызнаецца:

— Я запусціла каўтун, адну пасму валасоў. Можа, ён хваробу выцягне?

Гарачыня. У гародчыку за яловым частаколам звяў і прылёг бурачнік. Над глухою канапелькай (як яшчэ называюць, горкаю ці дзікаю мятай), што неяк бязвольна апусціла лісце, гвіжаць руплівыя пчолы. Ластаўкі,

мільгаючы бела-перламутравымі жыватамі, нізенька снуюць над надворкам між будынкаў. Сіваватае, падобнае да быльніку божае дрэўка, адчайна схіліўшы свае мякенькія ўзорыстыя верхавінкі, струменіць палынова-густы мяккі дух.

Серабрыцца лебяда, апусціўшы прадаўгаватае, нібы лазовае лісце.

— Сёння ўвесь гарод злёг, — кажа маці.

Бацька падыходзіць з пустымі двума вёдрамі:

— Зараз у калодзежы не будзе вады. А ў гаспадарцы вунь колькі яе трэба. Бывала, ідзеш да чужога калодзежа, як красці. За калодзеж, за тое, што бярэш ваду, жалі гаспадару, капалі картоплі. Адным словам, адраблялі. Я Амяльянавым, як зарэжу барана, сцягно насіў. Пры царызме ў вёсцы было пяць ці шэсць калодзежаў. Пытлевыя, Юрачкавыя мелі. Гэта за польскім часам іх болей пачалі капаць. Запусціць у яму зрубок з дубу, а зверху каменнямі выкладзе. Спод заўсёды дубовы. Пазней ужо трубы пачалі рабіць...

— Косамі хмаркі — гэта на дождж, — кажа бацька, прымружваючы вочы і пазіраючы на разбэрсаныя высокія воблакі. — Паказвае, што заўтра зменіцца пагода.

— Знішчылі прыроду, — уздыхнула маці. — Каля нашага садка, дзе лагчынка цяпер, некалі ж завоня была, вада стаяла, каля Бортнікаў — багня гразкая — не прайсці было. Адтуль крыніца цякла. А цяпер Бортнікі зрабілі агарод. А даўней па дошцы хадзілі. Дошкі клалі, як касілі. Я ж і кажу, знішчылі

прыроду. А ўсе кругом на паняў хварэюць. Бабы ў нас — хоць запрагай, а яны на пенсіі. Поўна Наваельня брыды набралася. Хоць махалам махай — не аджанешся. Усё прыязджаюць. Рады няма. А ў нас свая бяда: карова начыста высахла, вымя спухла. Малако на гной выдойваем.

І зноў пра сваё, і зноў жаліцца:

— Як гэта жыць не рабіўшы? Некалі да Наваградка збегаю, а цяпер у сад зайсці не магу. Вунь Антось — камень, а не чалавек. Во ў яго здароўе. Лазу і тую каля шашы павыкошваў. А я перыны ўжо не падыму...

## Год 1987-ы

<u>Пятніца, 17 кастрычніка.</u> Не з меншай цікавасцю, як чужыя, перачытваю ўласныя запісныя кніжкі, вяртаючыся душою да тых шчаслівых і мілых дзён, калі былі жывыя бацькі, і да тых іхніх слоў і выразаў, што гаварыліся мне пад руку ў роднай варакомскай хаце. І нечакана схамянуўся, што якраз сёння бацьку было б 80.

Ён мог, вядома, яшчэ пажыць, але пасля мацерынай смерці пачаў лічыць ужо дні свае.

І мне прыгадаліся дзве астатнія з ім сустрэчы: першая — з жывым, ссутулена-прыгорбленым, схуднелым і расхрыстаным, калі ён выходзіў у настылыя сені, каб прынесці ў грубку вугалю, і ўздрыгваў усім целам ад холаду, і праз месяц ужо другая — з мёртвым, маўкліва-адзінокім — у чорнай труне, што, паднятая на чужыя плечы, праплыла над шарым аблушча-

ным частаколам на заснежаную вуліцу, а ёю ўжо — пад высокі драўляны крыж у канцы вёскі, дзе па даўняй варакомскай традыцыі труна ставілася на ўслон, каб маглі з нябожчыкам развітацца знаёмыя і суседзі. Найбольш маўкліва.

У першую маю з ім сустрэчу ён мне сказаў, нібы ўжо развітваючыся: «Глядзі, сынку і сваю хатку, і сваю Агатку».

У другую сустрэчу за яго ўжо, седзячы пры труне, гаварылі суседкі: «Казаў, хачу лёгкае смерці... І во — лёгка памёр. Да нас перад гэтым прыйшоў, нават прыбраўшыся. Акуратны быў, сам пры сабе».

Два гады мінула, а я ўсё бачу з дрыгатлівым мроем слёз на вачах, як над аблушчаным яловым частаколам, над сіняватым у пазалоце ад нізкага зімовага сонца веграватым снегам плыве бацькава труна.

Нехта на падушку яму паклаў белую ў цёмныя рубчыкі кепку (раней, здаецца, у нас такога звычаю не было), і я прыгадваў тады, у дзень пахавання, і прыгадваю цяпер, як здалёк бялела гэтая кепка, калі ён на ровары, з прывязанаю да рамы касою, вяртаўся з пакосу з няблізкага нашага Азярышча.

Здаецца, у тое лета ён мне і расказваў, як у тым жа Азярышчы за мяжу, за сенажаць сварылася Анюта з старым Антосем. «Яна яму ўсё крычала: «Тваё месца ўжо за рэчкаю!» Гэта — на могілках. А адно ж, як прыйшлося, яна, маладая, памерла, а ён, стары, жыве. Як не ведае чалавек, што з ім прылучыцца».

Антось перажыў і майго бацьку — яму ўжо

за дзевяноста. І летась, калі я ў роснадажджлівы жнівеньскі дзень прыехаў у родную старану, каб схадзіць ужо пакланіцца бацькавай магілцы, ён, Антось, махаў яшчэ касою — абкошваў закурэлую шасейную канаву якраз насупраць векавечнага, як ён і сам, варакомскага крыжа.

Вядома ж, і Антосева дарога не абміне гэтага старасвецкага замшэлага крыжа. Аднак прыемна, радасна і ўсцешна бачыць, што нехта па-суседску блізкі і знаёмы табе змалку, бацька тваіх равеснікаў і таварышаў так доўга пры светлым розуме і здароўі жыве, штодзённа па нялёгкім законе сялянства ходзіць у чорнай працы, дадаючы кожнаму належнага і патрэбнага спадзявання на гэткае ж мудрае і працавітае жыццё.

Нібы Бог, толькі свой, не выдуманы, не з запыленага абраза на покуці.

Аўторак, 27 красавіка. У каторы ўжо раз перагортваю запісныя кніжні і дзённікі Льва Талстога. Адно супадае — «слабость большая телесная в спине и ногах». Ён «начерно» скончыў «Крэйцараву санату».

Колькі ж мне трэба моцы, здароўя, упартасці і душэўнага спакою, каб дапісаць чацвёртую кнігу свайго рамана.

Набокаў у «Новом мире» цікавы не сваёю інтэрпрэтацыяй і тлумачэннем Мікалая Гогаля, а хіба цытаваннем гогалеўскага тэксту. Бо што ж можна падумаць, прачытаўшы яго ўласнае, даволі неінтэлігентнае, напышліва-ганарыстае і зняважлівае для Гогаля: «Надо поблагодарить судьбу за то, что он не обратился

к украинским диалектизмам как к средству выражения, ибо тогда бы он пропал...»

Набокаўскае «прароцтва», мусіць, не вельмі далёкае ад таго, якое, не баючыся граху Божага, вяшчалі з амвона некаторыя віленскія біскупы, што ў касцёле з Богам трэба гаварыць па-польску, а па-беларуску хіба толькі ў хляве з быдлам.

Але Набокаў, мусіць, не першы і не апошні. Успамінаецца рэцэнзія ці, хутчэй, зацемка Бялінскага на ўкраінскі зборнік «Ластаўка», выданы па-ўкраінску ў Санкт-Пецярбурзе. Ці не адтуль, з кароткай нататкі, надрукаванай у раздзеле «Библиографичная хроника» часопіса «Отечественные записки», сочыцца крынічна рускаго фанабэрыста-імперскага нацыяналізму: «...теперь уж нет малороссийского языка, а есть областное малороссийское наречие, как есть белорусское, сибирское и другие, подобные им областные наречия».

А во яшчэ: «...жалко видеть, когда и маленькое дарование попусту тратит свои силы, пишет по-малороссийски». «Какая глубокая мысль в этом факте, что Гоголь, страстно любя Малороссию, все-таки стал писать по-русски, а не по-малороссийски!»

Цяпер разумею і па-іншаму ўспрымаю тыя гнеўныя словы, якія кінуў у адказ на адкрыты ліст Бялінскага ў сваім не адасланым пісьме абражаны і пакрыўджаны Гогаль: «В каком странном заблуждении вы находитесь! Ваш светлый ум отуманился. Нигде не было у меня насмешки, что составляет основание русского характера и его великой силы». Го-

галь хацеў дабра дзеля дабра. Бялінскі — крыві дзеля крыві. «Он (літаратар) должен служить искусству, которое вносит в души мира высшую примиряющую истину, а не вражду, — сцвярджае вялікі і бессмяротны Гогаль. — Любовь к человеку, а не ожесточение и ненависть».

Сёння зусім па-іншаму прачытваюцца як прысудна-пракурорскае пісьмо Бялінскага, так і апраўдальная «Аўтарская аповесць» Гогаля, сёння, ужо з адлегласці часу выразна бачыцца і тое, што затуманены розум спарадзіў яшчэ адну, што бясконца тыражуецца, не менш цытуецца і прымусова вывучаецца, агідна-прапагандысцкую зацемку, — «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура».

Нездарма ж Дастаеўскі ў «Дзённіку пісьменніка» кінуў рэпліку ў адрас Чарнышэўскага: «Ен хацеў, каб яго не слухалі, а слухаліся». Ці не такога ж паслушэнства дамагаўся і Бялінскі, спярша, вядома, гогалеўскага, а потым і ўсёй літаратуры.

Сёння, між іншым, думаў: калі Бог дасць скончыць раман, то прымуся напісаць нешта фантастычна-прыгодніцкае, пераймаючы гогалеўскія «Мёртвыя душы», але ўжо з падарожжам асноўнага персанажа з сённяшніх дзён у мінулае стагоддзе, дзе і ён у вобразе гараднічага, ці, напрыклад, Наздрова можа спаткаць знаёмага старшыню райвыканкама ці дырэктара спіртзавода, з якога, правёўшы за рэчку трубу, нават малакавозам крадуць спірт, а ён, дырэктар, кажа: «Завод перавыканаў план. І п’яныя ў мяне хіба толькі вераб’і».

## Год 1993-ці

Чацвер, 7 кастрычніка. Учора Барыс Ельцын, прачытаўшы па тэлебачанні свой зварот да расіян і масквічоў і назначаючы на сёння дзень жалобы па тых, хто загінуў на вуліцах Масквы, назаўсёды і дарэшты паканаў камунафашызм, а за адным швом і саветы. Голас быў цвёрды, з дыктатарскім, як мне здалося, тонам. Мне за спіну нават быў падкраўся халадок насцярогі, каб ён часам не пачаў вяртаць граніцы былое імперыі. Бо ўсё пачынаецца з упэўненасці...

Мы покуль што астаёмся рэзерватам бальшавізму: «чужакі», крымінальныя элементы з батальёна «Днепр» і былога рыжскага ОМОНу, пра якіх учора казаў Ельцын, як змылкі па рыштоку, сцякаюцца ў Беларусь.

На старонках мінскіх газет з'явіліся заднімі днямі смелыя зборныя пісьмы. Я ж з нейкага часу ўжо не чытаю фальшыва-рызыкоўных, падпісаных напаказ калектыўных пасланняў. Яны мне здаюцца, чамусьці, падобнымі да вершаваных харалаў, што складаліся ў гонар мудрага правадыра таксама ад імя народа.

Бачачы густы, шчодры рой прозвішчаў, што прыліпаюць да прызыўна-шаблоннага тэксту, я кожны раз успамінаю дажджлівы жнівеньскі дзень 1991 года, пляц Незалежнасці, дзе сабраўся нешматлікі мітынг супраць маскоўскага путчу і дзе я ўбачыў з беларускіх літаратараў усяго аднаго, як заўсёды, нязломна-ўпартага, адчайна-рашучага Валодзю Дамашэвіча.

Успамінаю ўжо і Курапаты...

Пятніца, 8 кастрычніка. Па чорна-мокрым і для мяне падобным на заараную раллю, нядаўна спырсканым перакрыжаванымі струменямі жоўтага «вадавоза» няроўным асфальце рослая, танюткая маладзіца вядзе, узяўшы за ручку, трох- ці чатырохгадовага хлопчыка.

На іх з шыфернага даху цагляна-ружовага гаража жоўтымі фарфоравымі вачыма пазірае чорны каток, як пазіраю з свайго акна і я.

Калі бачу малых дзяцей, заўсёды чамусьці думаю пра сваю адзіноту. Колькі ж самотных, горкіх, як восеньскі дым, непрытульных дзён у сваім дзяцінстве перажыў я. Не дай, Божа, зведаць нешта такое ж гэтаму хлопчыку.

Але ж у кожнага свой лёс. Розны, а ўсё ж аднолькавы для ўсіх. Беражы яго, Божа!

# ЗМЕСТ

**РАЗВІТАЛЬНАЯ АПОВЕСЦЬ** . . . . . . . . . . 3

**АПАВЯДАННІ** . . . . . . . . . . 147

**Ці ён адзін?..** . . . . . . . . . . 147

**Маладзіковая нядзелька** . . . . . . . . . . 154

**Удава** . . . . . . . . . . 169

**Вочы поўныя жыцця і страху** . . . . . . . . . . 177

**Сцежка на расходніку** . . . . . . . . . . 187

**Альцiст з местачковай аркестры** . . . . . . . . . . 204

**Сон у калядную ноч** . . . . . . . . . . 234

**ДЗЁННІКІ** . . . . . . . . . . 284

**Берлінскі дзённік** . . . . . . . . . . 284

**На крыллях смутку і адзіноты.**
**Старонкі з дзённікаў** . . . . . . . . . . 335

Літаратурна-мастацкае выданне

**АДАМЧЫК ВЯЧАСЛАЎ УЛАДЗІМІРАВІЧ**
**РАЗВІТАЛЬНАЯ АПОВЕСЦЬ**
*Аповесць, апавяданні, дзённікі*

Рэдактар Г. С. Шупенька.
Мастак А. Р. Барташэвіч.
Мастацкі рэдактар А. Р. Барташэвіч.
Тэхнічны рэдактар І. В. Махнач.
Карэктар М. М. Клімковіч.
Аператар Н. В. Клакоцкая.

Выданне набрана і звярстана на настольна-выдавецкай сістэме выдавецтва «Літаратура».

Падп. да друку 17.11.98.
Фармат $84 \times 108^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура «Школьная».
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 23,52. Ум. фарб.-адб. 23,92.
Ул.-выд. арк. 16,36. Тыраж 1500 экз. Зак.

Выдавецкае дзяржаўнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Джяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 3 ад 19.11.97.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Аддрукавана з арыгінал-макета заказчыка на ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце ВПП імя Я. Коласа.
220005, Мінск, Чырвоная, 23.